Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава"

Репозиторий ВГУ

**Л.В. Каралькова**

# КЛУБНЫЯ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСІ: ГІСТОРЫКА-ПЕДАГАГІЧНЫ ПАДЫХОД

***Манаграфія***

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2014*

УДК 379.81(476)(091)
ББК 77.47(4Беи)
К21

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава". Пратакол № 4 ад 20.02.2014 г.

Адобрана навукова-тэхнічным саветам ВДУ імя П.М. Машэрава. Пратакол № 4 ад 11.04.2014 г.

Аўтар: старшы выкладчык кафедры сацыяльна-педагагічнай работы ВДУ імя П.М. Машэрава **Л.В. Каралькова**

Рэцэнзент:
загадчык кафедры сацыяльна-педагагічнай работы
ВДУ імя П.М. Машэрава, доктар педагагічных навук,
прафесар *Г.П. Арлова*

**Каралькова, Л.В.**

**К21** Клубныя традыцыі Беларусі: гісторыка-педагагічны падыход : манаграфія / Л.В. Каралькова. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2014. – 166 с.
ISBN 978-985-517-462-3.

У манаграфіі разглядаюцца пытанні гісторыі станаўлення і развіцця клубнай традыцыі на тэрыторыі Беларусі.

Выданне адрасуецца студэнтам, настаўнікам, выхавацелям.

**УДК 379.81(476)(091)**
**ББК 77.47(4Беи)**

**ISBN 978-985-517-462-3**

© Каралькова Л.В., 2014
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2014

Репозиторий ВГУ

# ЗМЕСТ

**УВОДЗІНЫ**……………………………………………………… 4

**РАЗДЗЕЛ 1. Гісторыка-тэарэтычныя асаблівасці фарміраван-ня клубных традыцый** ……………………..……………….…………… 6
1.1. Тэарэтычныя падыходы да вызначэння паняцця “клубная традыцыя” …………………………………………………………….. 6
1.2. Сутнасць клуба як сацыяльна-культурнага інстытута ………… 13
1.3. Уплыў клубаў традыцый Заходняй Еўропы і Расіі на развіццё клубаў на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стагоддзя ………………………………………………………..……. 23

**РАЗДЗЕЛ 2. Асноўныя напрамкі развіцця клубных традыцый на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя** ……... 43
2.1. Дваранскія аб’яднанні клубнага тыпу…………………………… 43
2.2. Дзейнасць грамадскіх аб’яднанняў клубнага тыпу на Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя …………………... 51
2.3. Чайныя і народныя дамы як цэнтры сацыяльна-педагагічнай работы на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя. Станаўленне сеткі пазашкольных адукацыйных установаў …… 67

**РАЗДЗЕЛ 3. Тэндэнцыі развіцця клубных традыцый у савецкі і постсавецкі перыяд на Беларусі** ……………………….………. 79
3.1. Асаблівасці функцыянавання клубаў у савецкі перыяд развіцця грамадства ……………………….………………………….……. 79
3.2. Роля дзяржаўнай культурнай палітыкі і гістарычнай памяці ў фарміраванні клубных традыцый сучаснасці ………………... 93
3.3. Трансфармацыя клубнай сістэмы ў постсавецкі перыяд ….…… 103
*3.3.1. Фарміраванне клубных установаў новага тыпу* ……….… 106
*3.3.2. Развіццё клубаў на камерцыйнай аснове* ……...……….…… 121
*3.3.3. Дзейнасць аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах* 135

**ЗАКЛЮЧЭННЕ** ……………………………………..…….…………. 147

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ** ……………..………………. 149

Рэпазіторый ВДУ

# УВОДЗІНЫ

Перабудова сацыяльна-эканамічнага і духоўнага жыцця грамадства канца XX – пачатку XXI стагоддзя вызначыла карэнныя змены і ў сацыяльна-культурнай сферы. Адбываецца перагляд і пераацэнка вопыту і здабыткаў папярэдніх пакаленняў, у сэнсе культурнага адпачынку насельніцтва Беларусі.

На пачатку XXI стагоддзя мы бачым, што гістарычнае мінулае прадстаўляе сабой крыніцу багацейшага вопыту, накопленага многімі пакаленнямі ў сферы арганізацыі вольнага часу, элементы якога могуць быць з поспехам выкарыстаны і ўжо знаходзяць магчымасць рэалізацыі ў сённяшняй рэальнай практыцы арганізацыі культурнай сферы вольнага часу.

Вывучэнне гісторыі сферы вольнага часу як неад’емнай часткі жыцця грамадства мае не толькі вялікае культурнае, але і выхаваўчае значэнне. Яна фарміруе і развівае ў чалавека грамадзянскія каштоўнасці і якасці, прабуджае пачуццё павагі да культурных традыцый свайго народа, спрыяе захаванню і развіццю гістарычнай памяці.

Адной з яскравых прыкмет сучаснасці з’яўляецца аднаўленне клубных традыцый правядзення вольнага часу. Працяглы час клуб ствараў сваю культурную нішу і з’яўляўся адным з унікальных сацыяльных інстытутаў грамадства. Клуб не ўзнік як цэласная з’ява адразу, а ствараўся паступова з блізкіх да яго аб’яднанняў і фарміраванняў, на якія накладвала свой адбітак сацыякультурная сітуацыя, што складвалася ў той ці іншы гістарычны час. Аб’яднанні грамадзян у сферы правядзення вольнага часу выступалі як сродак трансфармацыі сістэмаўтвараючых элементаў культурных традыцый – сэнсаў, ідэалаў, норм і правіл, каштоўнасных арыенціраў, узораў паводзін. Менавіта ў клубе рэалізуецца галоўная функцыя культуры – камунікатыўная, якая служыць найлепшым сродкам паміж людзьмі.

Клубныя фарміраванні грамадзян у сферы правядзення вольнага часу займалі вельмі значнае месца і ў нацыянальнай культуры нашага народа. Таму што з’яўляліся ў большай ці меншай ступені дастаткова моцным фактарам станаўлення і развіцця не толькі сацыяльна-культурных, але і выхаваўчых, асветных традыцый. Мэтай іх дзейнасці ў цэлым можна назваць стварэнне і захаванне культурнага асяродку сферы жыццядзейнасці асобы і грамадства. Калі гаварыць больш падрабязна, то дзейнасць такіх аб’яднанняў значна ўзбагаціла рэальную сацыяльна-культурную практыку духоўна-маральным зместам, папоўніла культурастваральным зместам сферу вольнага



Рэпазіторый ВГУ

часу, станоўча ўплывала на станаўленне рысаў асобы беларускага грамадзяніна, здзяйсняла нарматыўна-каштоўнаснае рэгуляванне ў сістэме ўзаемаадносін асобы і грамадства.

Недаацэнка і паступовая страта традыцыйных форм культурнага жыцця, якія былі напрацаваны папярэднімі пакаленнямі, прывяла да негатыўных і дэструктыўных працэсаў не толькі ў культуры, але і ў жыцці грамадства. Пачынаючы з 1920-х гг., у сувязі з моцнай ідэалагізацыяй культурнага і грамадскага жыцця, імкненнем уніфікаваць культурную сферу вольнага часу, самую складаную і шматвобразную галіну чалавечай дзейнасці, ідзе пераўтварэнне клуба не ў месца цікавага і карыснага адпачынку, рэкрэацыі, грамадскіх зносін, выхавання асобы праз удзел у агульнакалектыўнай справе, а ў клуб-установу. Арганізацыя клубаў-устаноў адбывалася "зверху ўніз" у выглядзе спецыяльных загадаў, нарматываў, распрацовак на аснове сярэдніх паказчыкаў у адпаведнасці з інтарэсамі дзяржаўнага кіравання, што адпавядала як нельга лепш задачам цэнтралізаванага кіравання ёю. Такім чынам назіралася перарыванне клубных традыцый.

Паступовае, але ўсё ж, спантанае, тэарэтычна не вывучанае іх аднаўленне пачынаецца толькі ў 1960-я гг., калі па ініцыятыве "знізу" пачынаюць стварацца клубы па інтарэсах. Найбольш актыўна гэта з'ява пашыраецца ў канцы 1980-х гг., калі практычна пачынаецца якасна новы віток у развіцці клубных фарміраванняў. Тым не менш, гісторыя развіцця клубаў і клубных традыцый на Беларусі пакуль што не з'яўлялася прадметам ні гістарычнага, ні культурнага, ні педагагічнага даследавання, а таму не атрымала цэласнага і паслядоўнага вывучэння, аналізу вопыту дзейнасці і асвятлення ў навуковай літаратуры. Даследаванне клубных традыцый дапаможа прасачыць пераемнасць і паслядоўнасць у станаўленні і развіцці формаў і мадэляў сацыяльных паводзінаў насельніцтва ў сучаснай культурнай сферы вольнага часу, будзе садзейнічаць вывучэнню асаблівасцей арганізацыі адпачынку і аматарскай творчасці, што прадстаўляе значны гісторыка-тэарэтычны і педагагічны інтарэс.

Репозиторий ВГУ

# Раздзел 1. ГІСТОРЫКА-ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ КЛУБНЫХ ТРАДЫЦЫЙ

На сучасным этапе развіцця беларускага грамадства, якое перажыло ў ходзе рэформ сур'ёзныя змены практычна ва ўсіх галінах грамадскай жыццядзейнасці, нельга не адзначыць прынцыпова іншых адносінаў і да сферы вольнага часу грамадзян.

З пункту гледжання арганізацыі дзейнасці ў вольны час, яго мэтай з'яўляецца непасрэднае развіццё асобы як наведвальніка, так і ўдзельніка творчага калектывн (як працэс, так і адносны вынік). Галоўным прынцыпам асабова арыентаванага падыходу з'яўляецца яго гуманістычная накіраванасць, што азначае рэальнае прызнанне каштоўнасці, непаўторнасці, цэласнасці асобы, сцвярджэнне дабрабыту чалавека як крытэрыя ацэнкі ўзаемаадносінаў у грамадстве, таксама прызнаецца ўнікальнасць асобы чалавека ва ўсіх яе праявах. Гуманістычная накіраванасць мае на ўвазе імкненне да будучага, да свабоднай рэалізацыі магчымасцей творчага патэнцыялу, рост і развіццё канструктыўнага пачатку ў чалавеку, сувымяральны з маральнымі нормамі і агульна прынятымі духоўнымі каштоўнасцямі аб'ектыўна-пазітыўнага характару для грамадства ў цэлым.

Акрамя таго ён выступае спосабам далучэння людзей да культурнай дзейнасці і пры гэтым стварае своеасаблівыя культурныя традыцыі. Таму ў рамках дадзенага навуковага даследавання, у мэтах вызначэння паняцця "клубная традыцыя", звернемся да разгляду найбольш грунтоўных падыходаў да трактоўкі паняццяў "клуб" і "традыцыя".

## 1.1. Тэарэтычныя падыходы да вызначэння паняцця "клубная традыцыя"

Клубныя традыцыі нельга разглядаць як асобна размешчаныя, не звязаныя з іншымі паняццямі ("традыцыя", "культурная традыцыя", "звычай", "навацыя"), з'явы. Зразумела, што клубная (як і культурная) традыцыя мае цесныя сувязі з асноўным паняццем – традыцыяй, якая, у сваю чаргу, уяўляе сабой складаную сацыяльную з'яву. Акрамя таго, клубная традыцыя з'яўляецца падсістэмай культурнай традыцыі. Традыцыя ж, у шырокім сэнсе гэтага слова, задае культуры вызначаныя правілы і нормы, накіроўвае дзеянні і паводзіны людзей, фарміруе іх каштоўнасную сістэму, звязвае ў адзінае цэлае індывідуальнае і калектыўнае, рэгулюе працэс выхавання, развіцця і сацыялізацыі чалавека.

Рэпазіторый ВДУ

Магчыма менавіта мнагапланавасцю і шматфункцыянальнасцю традыцый тлумачыцца тое, што ў навуковай літаратуры не існуе агульнапрынятага тлумачэння. Найчасцей тэрмін "традыцыя", нягледзячы на дастаткова багатую гістарыяграфію ў розных галінах ведаў: гісторыі, філасофіі, педагогіцы, этнаграфіі, сацыялогіі і іншых, атасамляўся з паняццямі "звычай", "абраднасць", "сацыяльная норма".

Мы бачым, што ў цэлым існаванне клубнай традыцыі не адмаўлялася даследчыкамі праблем культурнай сферы вольнага часу. Сярод такіх работ можна назваць даследаванні ў галіне педагогікі клубных самадзейных калектываў Ф.А. Саламоніка, А.А. Краснасельскага, А.В. Сасыхава і Ю.А. Стральцова, Я.І. Смірновай, , В.Ф. Чабанага, Г.А. Шапілава [42; 47; 62; 74; 89; 95]. Аўтары надаюць вялікае значэнне традыцыям, якія склаліся ўнутры клубных самадзейных аб'яднанняў і ў межах сваіх работ звяртаюць увагу на тыя або іншыя бакі іх функцыянавання і уплыў на ўдзельніка самадзейнага калектыву.

Тым не менш, дакладныя распрацоўкі сусветна вядомых навукоўцаў ў тэорыі вывучэння і практыкі выкарыстання клубных традыцый, а таксама вызначэнне іх месца ў культурнай сферы вольнага часу, пакуль што не сталі прадметам спецыяльнага навуковага даследавання. Не існуе і канкрэтна вызначанага паняцця "клубная традыцыя" ў культурнай сферы вольнага часу.

У працэсе разгляду сацыяльнай сутнасці традыцый і вывучэння механізмаў іх функцыянавання, мы звярнуліся як да энцыклапедычных выданняў па філасофіі, педагогіцы, сацыялогіі, так і да работ філосафаў, педагогаў, сацыёлагаў і культуролагаў Э.А. Баллера, Л.П. Буевай, А.І. Зелянкова, П.Р. Ігнатовіча, В.М. Каірава, А.Б. Калач, Э.С. Маркарана, Н.С. Сарсенбаева, А.Г. Спіркіна, В.І. Суханава, А.К. Улёдава, В.С. Цітова, Н.П. Дзенісюк, Ю.В. Чарняўскай, Е. Шацкага, Э. Шылза [4; 14; 28; 29; 35; 36; 59; 75; 81; 82; 87; 93; 96; 97; 98; 101].

Найбольш абгрунтаванай, на наш погляд, з'яўляецца філасофская трактоўка паняцця "традыцыя". Тэрмін **"традыцыя"** (ад лац. **traditio – "перадаваць"**) азначае **"перадача, паданне"**. "Традыцыя – гэта элементы сацыяльнай і культурнай спадчыны, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення і захоўваюцца ў пэўным грамадстве, класах і сацыяльных групах на працягу доўгіх часоў. Традыцыі ахопліваюць аб'екты сацыяльнай спадчыны (матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці), а таксама працэс і спосабы яе перадачы; у якасці традыцый выступаюць пэўныя грамадскія законы, нормы паводзінаў, каштоўнасці. Традыцыі не зводзяцца да найбольш стэрэатыпных сваіх разнавіднасцей, такіх, як звычай і абрад, а распаўсюджваюцца на больш шырокую галіну сацыяльных з'яў.



Рэпазіторый ВДУ

Вызначаныя традыцыі функцыянуюць ва ўсіх сацыяльных сістэмах і, у вядомай меры, з'яўляюцца неабходнай умовай іх жыццядзейнасці" [90, с. 663]. Такім чынам, можна заўважыць, што трансляцыя сацыяльнага вопыту (у тым ліку, і педагагічнага) ад пакалення да пакаленне і ад аднаго індывіда да другога ажыццяўляецца менавіта пры дапамозе спецыфічных механізмаў збору, захавання і перадачы інфармацыі, інакш кажучы – традыцыі.

У педагогіцы традыцыі трактуюцца як нормы і правілы жыцця людзей, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення. Яны з'яўляюцца вынікам сацыяльна-псіхалагічнага замацавання і праяўлення асабістых якасцей чалавека: узаемадапамогі, добрасумленнасці, прыветлівасці. Традыцыі ўплываюць на фарміраванне ў людзей асабістых якасцей [68, с. 395]. Стварэнне традыцый адбываецца ў адпаведнасці з трыма тыпамі залежнасці, якія ўсталяваліся ў сістэме грамадскіх адносінаў. Па-першае, паходжанне традыцый абумоўлена здольнасцямі суб'екта і ўяўляюць сабой вынік яго намераў. Па-другое, традыцыі ўзнікаюць як непрадбачаны, незапланаваны, пабочны, ускосны вынік суб'ектнай дзейнасці г. зн., выпадкова. Па-трэцяе, стварэнне традыцый адбываецца аб'ектыўна, як арганічны, сістэмны працэс. У адным выпадку працэс фарміравання традыцый знаходзіцца пад кантролем чалавека, адпавядае яго суб'ектыўным мэтам, жаданням, імкненням; у другім выпадку абумоўлены чалавечай дзейнасцю адносна, выпадкова. Іншымі словамі, маюць месца "свядомыя" і "стыхійныя" традыцыі. "Свядомыя" з'яўляюцца вынікам спецыялізаванай, мэтанакіраванай дзейнасці. Заўважым, што беларуская даследчыца А.Б. Калач разумее пад спецыялізаванай дзейнасцю менавіта творчую дзейнасць, вынікам якой становіцца сама традыцыя, яе зацвярджэнне, развіццё і замацаванне. Пад "стыхійнымі" традыцыямі разумеюцца традыцыі, якія з'явіліся ў выніку неспецыялізаванай дзейнасці чалавека або грамадства. Асаблівасці ж функцыянавання традыцый залежаць ад спосабаў вытворчасці, умоў жыцця народа, асаблівасцей кожнай канкрэтна вызначанай сферы дзейнасці [36, с. 21–22]. Акрамя таго, пералічаныя вышэй даследчыкі ў сваіх работах далі вызначэнне паняццяў "традыцыя" і "звычай". Так, у прыватнасці, Э.С. Маркаран на старонках перыядычных выданняў уступае ў дыскусію аб паняцці "культурная традыцыя". Ён вызначае агульнае і адметнае ў паняццях "традыцыя" і "культурная традыцыя". Калі традыцыя, з пункту гледжання Э.С. Маркарана, гэта спосаб фіксацыі ў сацыяльнай памяці, трансмісіі (перадачы, рэпрадуктавання культуры), то "культурная традыцыя" разглядаецца аўтарам артыкула як сацыяльны, групавы, супольны вопыт, які набывае форму стэрэатыпа, які ў сваю чаргу з цягам часу акумулюецца ў розных калектывах [59, с. 80].

Рэпазіторый ВГУ

Ежы Шацкі вызначае традыцыю як узоры адчування мыслення і паводзінаў, якія па прычыне сваёй рэчаіснасці або мнімай прыналежнасці да грамадскай спадчыны групы ацэньваюцца яе членамі станоўча або адмоўна. Даследчык падзяляе традыцыі на “добрыя” або “дрэнныя” (“пазітыўныя” і “негатыўныя”), гэта значыць, такія ўзоры паводзінаў, якія члены дадзенай групы хацелі б выкараніць са сваёй жыццёвай практыкі. “Аднак, – піша далей польскі навуковец, – толькі гістарычны кантэкст тлумачыць той факт, што ўзоры першапачаткова ўключаныя ў негатыўную традыцыю становяцца пазней або нейтральнымі, або нават функцыянуюць у якасці пазітыўнай традыцыі” [98, с. 359–361]. Аднак здараюцца сітуацыі, у якіх пэўныя элементы грамадскай спадчыны ствараюцца на ўзорах таго, як паступаць не трэба. Гэта можна назваць праявай негатыўных традыцый.

Непарыўна звязанымі з’яўляюцца і паняцці “традыцыя” і “навацыя”. Беларускі даследчык В.С. Цітоў небеспадстаўна сцвярджаў аб тым, што традыцыя функцыянуе ў натуральным асяроддзі 80–100 гадоў, а часцей на працягу стагоддзяў. Менавіта ў гэтым бачыць даследчык яе адрозненне ад навацыі – адносна новай з’явы ў культуры. Большасць навацый не вытрымлівае выпрабаванняў віруючага часу і знікае, не пакінуўшы пасля сябе ўразлівага следу [93, с. 163]. Разам з тым, навацыі, якія прымаюцца большасцю ўваходзячых у тую ці іншую групу людзей, стэрэатыпізуюцца і становяцца самі традыцыяй. Такім чынам, можна сцвярджаць, што самі традыцыі ёсць вынік інавацыйнай дзейнасці, гэта значыць, дзейнасці па стварэнню новага (лац. **innovatio** – **“абнаўленне”**). Крыніцай новага з’яўляецца свядомая творчая дзейнасць чалавека.

В.Я. Кошалева характарызуе традыцыю як механізм, які пастаянна дзейнічае і робіць адбор і ўніфікацыю навацый [47, с. 202].

З’яўленне інавацый указвае на значнасць новых элементаў культуры соцыума для арганізацыі ў ім культурнага ўзнаўлення. Адначасова інавацыі характарызуюць механізм традыцыі, паказваючы, што традыцыі могуць змяняцца (трансфармавацца). Больш таго, дзякуючы здольнасці да інтэграцыі навацый, культура характарызуецца дынамічнай крэатыўнай арыетацыяй (К.В. Чыстоў) і высокім узроўнем інтраверсіі, што забяспечвае доўгае сваё існаванне ў кантынуітэце. Інавацыі выяўляюць творчы патэнцыял культуры ў канкрэтна гістарычны перыяд часу.

Навацыі могуць быць выпадковымі, як не дэтэрмінаванымі мінулым, так і дэтэрмінаванымі, гэта значыць, вызначаным чынам падрыхтаванымі мінулым развіццём сістэмы. Традыцыі вызначаным чынам іх рыхтуюць, служаць асновай, фактарам, які аказвае ўплыў на іх характар і час існавання.

Репозиторий ВГУ

Даследчык А.І. Зелянкоў разглядае традыцыю як механізм аднаўлення тых асноў, на якіх заснавана культура нормаў і каштоўнасцей, дзякуючы чаму яна выконвае стабілізуючую функцыю ў грамадстве. "Традыцыя, – піша ён, – гэта не проста элемент сацыякультурнай спадчыны, якая перадаецца ад пакалення да пакалення, а спецыяльны механізм вытворчасці нормаў і каштоўнасцей. Менавіта таму традыцыя ўвасабляе ў сабе рэпрадуктыўны пачатак, рэалізуе адаптыўную функцыю і з'яўляецца гамеастатычным механізмам ў працэсе развіцця сацыяльных сістэм" [28, с. 79]. Даследчык В.І. Суханаў у рабоце "Звычаі, традыцыі і пераемнасць пакаленняў" падкрэсліваў, што звычаі і традыцыі служаць наступнай мэце – замацоўваюць тое, што было дасягнута ў грамадскім і асабістым жыцці. Яны з'яўляюцца магутнымі сацыяльнымі сродкамі стабілізацыі грамадскіх адносінаў, якія ўсталяваліся, замацоўваюць тое, што ёсць ў дадзены час, выконваюць ролю сацыяльных механізмаў перадачы новым пакаленням адносінаў старэйшга пакалення, аднаўляюць у жыцці маладога пакалення гэтыя адносіны. Прымаючы выгляд масавых звычак, якія падтрымліваюцца сілай грамадскай думкі. Такім чынам, звычаі і традыцыі атрымлівалі вялікую ўстойлівасць, станавіліся свайго роду, захавальнікамі мінулага [82, с. 4].

Пералічаныя вышэй даследчыкі падкрэсліваюць, што "звычай" – гэта першая ступень засваення жыццёвага вопыту, а традыцыі з'яўляюцца больш грунтоўным і абагульняючым паняццем, якое дае больш багатае і пашыранае ўяўленне аб матэрыяльным і духоўным жыцці чалавека. Традыцыі засвойваюцца, замацоўваюцца і перадаюцца пэўнымі групамі людзей і выконваюць ролю трансфарматараў сацыяльнага і культурнага вопыту.

Неабходна падкрэсліць неаднароднасць навуковых падыходаў і ў пытаннях класіфікацыі традыцый. Прывядзём найбольш значныя з іх для нашага даследавання. Абагульняючым можна назваць пункт гледжання даследчыка праблемы Ю.І. Боканя, які вызначае традыцыі ў навуцы, рэлігіі, палітыцы і мастацтве [8, с. 52]. Іншага пункту гледжання прытрымліваецца Ю.В. Брамлей, які падзяляе традыцыі па іх значнасці ў жыцці чалавека на:

- грамадска-грамадзянскія;
- асабіста-грамадзянскія;
- асабіста-сямейныя [13, с. 98].

Нельга абмінуць увагай і пункт гледжання даследчыка В.К. Бандарчыка. Навуковец не толькі абагульняе думкі многіх даследчыкаў адносна гэтай праблемы, але і першы ў нацыянальнай навуцы спрабуе даць класіфікацыю традыцый. У прыватнасці В.К. Бандарчык вылучае традыцыі ў вытворчай дзейнасці, у



Репозиторий ВГУ

матэрыяльнай і духоўнай культуры, у сям'і і сямейным побыце, а таксама падзяляе традыцыі па сацыяльна-саслоўных прыкметах; прафесійных; традыцыі пануючых класаў; інтэлігенцыі; сялян; рамеснікаў; рабочых; сельскага і гарадскога насельніцтва [10, с. 23].

У 1980–1990 гг. у дыскусіі аб традыцыях было сфармулявана сучаснае тэарэтычнае меркаванне аб іх, а таксама аб звычаях як прагрэсіўных формах функцыянавання грамадскіх адносінаў. Гэта, безумоўна, мела станоўчае значэнне ў засваенні тэарэтычных і практычных ведаў аб традыцыі, дало магчымасць яе тэарэтычнага вывучэння і практычнага выкарыстання як ў недзяржаўнай, так і дзяржаўнай сферы правядзення вольнага часу.

Зыходзячы з разгледжаных намі вышэй падыходаў да пытання тэрміналогіі традыцыі, мы вылучылі два асноўныя напрамкі: па-першае, разуменне ролі традыцый як грамадскай з'явы, звязанай з пераемнасцю чалавечага вопыту, культуры і іншых з'яў духоўнага жыцця. Па-другое, у пералічаных намі работах нельга не заўважыць агульнага для ўсіх даследчыкаў разумення ролі традыцый як педагагічнага сродку выхавання асобы.

Традыцыя ляжыць у аснове механізму пераемнасці – закона функцыянавання культуры ў грамадстве. Пры гэтым, з аднога боку, сацыяльна-культурная пераемнасць уключае ў сябе перадачу сацыяльных і культурных каштоўнасцей кожным новым пакаленнем, кожнай новай сацыяльнай сістэмай, а з другога боку адбываецца засваенне гэтых каштоўнасцей. На гэтым будуецца ўся сістэма навучання і выхавання.

Пераемнасць можа быць непарыўнай, калі культурныя каштоўнасці мінулага пастаянна функцыянуюць у жыцці грамадства, і перарванай, калі якія-небудзь каштоўнасці на час знікаюць з культурнага ўжытку. Гэта можна сказаць і пра клубныя традыцыі, што з'яўляюцца адным са складнікам культурнай традыцыі. Яны былі перарваны ў 1920-я гг. пад уплывам сацыяльных фактараў і пачалі паступовае сваё адраджэнне толькі з канца 1960-х гг., прычым па ініцыятыве "знізу" і ў выглядзе клубных аматарскіх аб'яднанняў (пераважна па інтарэсах).

На аснове прыведзеных намі фармуліровак і тэрміналагічных падыходаў, існуючых у іншых галінах навук, зыходзячы з разумення асноўнага паняцця "традыцыя", паспрабуем вызначыць паняцце "клубная традыцыя".

**Клубная традыцыя** – гэта сукупнасць звычаяў, нормаў і правілаў паводзінаў людзей, аб'яднаных для сумеснага правядзення вольнага часу або па сацыяльнаму прынцыпу, або адзінымі інтарэсамі, адзінай мэтай дзейнасці, якія фарміруюцца на аснове самаўзнікнення, самаразвіцця, самарэгуляцыі і самавызначэння. Клубныя традыцыі

Рэпазіторый ВДУ

перадаюцца ад пакалення да пакалення і захоўваюцца ў пэўным грамадстве або сацыяльных групах на працягу доўгага часовага перыяду. Напрыклад, можна вылучыць **клубныя традыцыі**: а) па саслоўнаму прынцыпе: дваранскія, мяшчанскія, купецкія, інтэлігенцкія, рабочыя і іншыя клубы; б) па саслоўна-прафесійнаму прынцыпе: прыказчыцкія, сельскагаспадарчыя, медыцынскія, рамесніцкія, скарняжныя, чыгуначныя, пажарныя і іншыя таварыствы; в) па прынцыпе асабістых інтарэсаў удзельнікаў: літаратурныя, музычныя, спартыўныя і інш.; г) па прынцыпе дабрачыннасці: дабрачынныя таварыствы.

Узаемаадносіны паміж суб'ектамі зносін у клубе рэгулююца нормамі паводзінаў, прынятымі ў тым або ў іншым таварыстве. На думку вучонага-культуролага Э.В. Сакалова, імператыўнасць нормаў падтрымліваецца не індывідуальным розумам, а грамадскай думкай, пачуццём гонару, годнасці. “Роля нормаў у грамадскім жыцці шматвобразная, – піша Э.В. Сакалоў. – Яна падтрымлівае ўстойлівасць традыцый, інстытутаў і асобных узаемаадносінаў; згуртаванасць грамадства; дазваляе ацаніць учынкі; указвае на найбольш разумныя, правераныя на практыцы спосабы дзейнасці” [80, с. 73].

Нормы паводзінаў чалавека ў выглядзе сумы вызначаных правілаў, зразумела, не могуць быць сфармуляваны клубам як сацыяльным інстытутам. Яны складаюцца цэласнай сістэмай выхавання, адукацыі, культурным асяроддзем і сацыяльнамі ролямі, але сканструяваць мадэль паводзінаў чалавека, безумоўна, клуб не толькі можа, але і павінен.

Сутнасць працэсаў утварэнння, замацавання і жыццядзейнасці традыцый (як агульных, так і культурных, і клубных) зводзіцца да наступнага: патрэба, элементарнае правіла, норма, інтарэсы, звычай, традыцыя. Напрыклад, традыцыя дабрачыннасці ўзнікла як жыццёвая неабходнасць дапамогі бедным. У мэтах такой дапамогі ствараліся спецыяльныя касы, якія спачатку папаўняліся за кошт штрафных грошай за гульню ў карты. Пазней гэта неабходнасць пераўтварылася ў патрэбу ажыццяўлення мэтанакіраванай праграмы дабрачыннасці, якая складалася з рознага роду карысных (як адначасовых, так і пастаянных) укладаў, выплату пенсій старэйшым членам клубаў, грашовая падтрымка малазабяспечаных, але таленавітых студэнтаў. Так жыццёвая неабходнасць ператварылася ў правіла, правіла стала нормай, норма пераўтварылася ў стэрэатып, звычай, а потым – стала традыцыяй. Сбор грашовых сродкаў на богаўгодныя мэты (у дзейнасці клубаў XIX – пачатку XX стагоддзя) у асноўным ажыццяўляліся шляхам арганізацыі масавых клубных формаў.

## 1.2. Сутнасць клуба як сацыяльна-культурнага інстытута

Дзейнасць клуба гістарычна спалучаецца з усведамленнем клуба як сацыяльна-культурнага інстытута. Спробы асэнсаваць спецыфіку клуба, выявіць яго сацыяльную прыроду, вызначыць сутнасць гэтага, па словах вядомага расійскага культуролага Э.А. Арловай: "…штучнага, культурнага, інтэрсуб'ектнага фенамена" [63, с. 41], прадпрымаліся неаднаразова з тых часоў, як інстытуты і механізмы чалавечай камунікацыі сталі з'яўляцца прадметам навуковага аналізу.

У гісторыі фарміравання і развіцця клубных традыцый існуе шмат падыходаў да разумення слова **"клуб"**. Цікава, што менавіта ад той ці іншай трактоўкі гэтага тэрміна залежылі адносіны да яго, вызначаліся мэты, задачы, формы і функцыі яго дзейнасці.

Упершыню тэрмін **"клуб"** сустракаецца ў вядомым слоўніку Ф.А. Бракгаўза і І.А. Эфрона. Саксонскае слова **"clubbe"** спачатку азначала **"палку"**, затым – **"складчыну, долю,** якая прыходзілася па раскладу на кожнага ўдзельніка якога-небудзь таварыства, сходу", пасля – **"сход,** або **будынак для грамадскіх сходаў"** [38, с. 424]. Прыметы ўдзельнікаў клуба – у прыналежнасці да адпаведнага класа, людзі якога з пэўнымі мэтамі збіраліся ў вызначаным месцы. Мэты ж маглі быць рознымі: ад палітычных, навуковых, мастацкіх да чыста забаўляльных [39, с. 424].

У "Тлумачальным слоўніку ..." У.І. Даля слова "**Клуб**, або **клоб м.** – анг. **сход**, **пастаяннае таварыства**, якое збіраецца ў асобных памяшканнях для бяседы і забаў: ёсць і палітычныя клубы, суполкі, таварыствы" [41, с. 120–121].

У першай палове ХХ стагоддзя дзеяч пазашкольнай адукацыі А.А. Пятроў трактаваў клуб ужо не з пазіцый англійскага слова "**club**", а з пункту гледжання сацыяльных зносін "...клуб дарагі, як школа сацыяльнага духу, як школа ўзаемнай павагі і цярпення да чужых думак і перажыванняў... Клуб увогуле толькі тады клуб, калі ён прадстаўляе сабой нешта спаянае, цэлае. У гэтых адносінах значна менш каштоўныя клубы, так званыя адкрытыя, з вольным доступам у любы час усіх жадаючых. Але ўвядзенне гасцей у спецыяльна адкрытыя выступленні клуба (спектаклі, канцэрты і т.п.) ва ўсякім выпадку патрэбны як адна з найлепшых формаў яго прапаганды сярод мясцовага насельніцтва" [69, с. 47].

Праблематыцы клуба былі прысвечаны шматлікія работы і Н.К. Крупскай, якая тлумачыла паняцце "клуб" як "аб'яднанне групы асоб для якой-небудзь вызначанай мэты. Ёсць клубы веласіпедыстаў, яхт-клубы і розныя іншыя спартыўныя клубы, клубы спевакоў, клубы чытальнікаў-дэкламатараў, клубы палітычныя і г.д. У гэтых назвах

Рэпазіторый ВДУ

відавочна вызначана мэта кожнага з гэтых клубаў – людзі збіраюцца разам для таго, каб займацца спортам, мастацтвам, палітыкай і г.д. Там, дзе грамадскае жыццё б'е невычэрпнай крыніцай, людзі прывыкаюць аб'ядноўвацца адзін з адным для самых розных мэтаў" [49, с. 7–12].

У многіх з артыкулаў Н.К. Крупскай, прысвечаных аналізу вопыту стварэння і жыццядзейнасці клубных устаноў, гучыць трывога ў сувязі з фармальнымі адносінамі да іх. "Створаны клуб з годнай сцэнай, добрым аркестрам, але людзі туды не ідуць. Побач, у інтэрнаце, яны збіраюцца вечарам, размаўляюць свабодна, без усялякіх вядучых, без усялякіх аратараў аб чым пажадаюць; у тон настрою залівaецца гармонік – і гэта ёсць сапраўдны клуб", – справядліва сцвярджае даследчыца [49, с. 10]. Менавіта яна ўпершыню ўзняла праблему замацавання і развіцця ўнутрыклубнай дэмакратыі, без якой немагчыма стварэнне сапраўднага жывога арганізма, а не функцыянальнай адзінкі. Калі пачалося планамернае фармаванне і развіццё сеткі клубных устаноў культуры, спецыфіка клуба была прадвызначана прынцыпамі развіцця грамадскай, адукацыйнай і мастацкай самадзейнасці працоўных мас. Многія тэарэтыкі клубнай справы гэтага перыяду П.П. Блонскі, В. Кержанцаў, Н.К. Крупская, А.В. Луначарскі, А.С. Макаранка, Я.М. Мядынскі, М.В. Пятроўскі [7; 37; 49; 54; 57; 60; 70] распрацавалі асноўныя палажэнні па арганізацыі і практычнай дзейнасці клубных устаноў культуры. Клуб разглядаўся імі як "камутатар", збіральнік рабочай ініцыятывы і нефармальнай самадзейнасці, месцам сумеснага адпачынку людзей, заснаванага на актыўнай дзейнасці наведавальнікаў клуба. Такім чынам, мы бачым, што клубнае жыццё заўсёды з'яўлялася першапачатковай формай задавальнення камунікатыўных патрэб чалавека. Са станаўленнем і замацаваннем так званай "дыктатуры пралетарыята", адбываюцца відавочныя змены не толькі ў поглядах, але і ва ўзаемаадносінах да клуба, мэтаў і задач яго дзейнасці.

Сацыяльная роля савецкага клуба асэнсоўваецца і на тэарэтычным узроўні. У гэты час выдаюцца кнігі Б. Баровіча, А. Важгальскага, Б. Глан, А. Пятрова, М. Пятроўскага, Б. Фарэсава [12; 17; 21; 69; 70; 89]. Аўтары пералічаных выданняў прапаноўваюць свае тэарэтычныя погляды і метадычны вопыт у арганізацыі клуба новага тыпу.

Клуб разглядаецца імі як "камутатар", "збіральнік" працоўнай ініцыятывы і нефармальнай самадзейнасці, месцам сумеснага адпачынку людзей, заснаванага на актыўнай дзейнасці наведвальнікаў клуба. "Клуб, – пісаў В. Баровіч, – гэта жывая майстэрня, дзе ў непасрэдных зносінах паміж асобамі рэалізуецца патрэба ў творчасці,



Репозиторий ВГУ

самарэалізацыі, дзе праз аматарскую дзейнасць чалавек далучаецца да эстэтычных каштоўнасцей” [12, с. 16]. На яго думку, рабочы клуб гэта “грамадскае прыстанішча, месца адпачынку пасля працы і зносін з сябрамі і прыяцелямі” [12, с. 19].

Але са станаўленнем і замацаваннем так званай “дыктатуры пралетарыята”, адбываюцца і вiдавочныя змены не толькі ў поглядах на клуб, але і ва ўзаемаадносінах да мэтаў і задач яго дзейнасці. У 1930-я гг. у таталітарным грамадстве, якое развіваецца, атрымалі перамогу ўстаноўскія тэндэнцыі ў фарміраванні тэорыі і практыкі клубнай работы. Перагледзіла свае пазіцыі і Н.К. Крупская, якая яшчэ ў 1920-я гг. называла клуб “грамадскім хатнім ачагом”. Цяпер, з яе пункту гледжання, клуб павінен станавіцца “ачагом будаўніцтва сацыялізму” працоўных. Паступовa быў скасаваны інстытут клубнага членства, маладзёжныя клубы трансфармаваліся ў масавыя культурна-асветныя ўстановы – Дамы і Палацы культуры.

Этап сапраўднага навуковага асэнсавання тэарэтычных праблем клуба пачынаецца толькі ў 1960–1970-я гг. з работ А.В. Сасыхава і Ю.А. Стральцова, якія тэарэтычна даказалі ідэолагам культурна-асветніцкай работы дэмакратычную прыроду клуба і сацыякамунікатыўную функцыю як дзейнасную дамінанту.

З больш позніх трактовак клуба цікавай, на наш погляд, з’яўляецца думка Д.М. Генкіна, які называе клуб “...асаблівай формай арганізацыі людзей, якая абапіраецца на іх самадзейнасць і ініцыятыву, стымулюючую самавыхаванне чалавека ў клубе. Да такіх формаў і адносіцца, у першую чаргу, клуб у яго больш вузкім трактаванні як самадзейны ініцыятыўны калектыў людзей, якія аб’ядналіся для сумеснага правядзення вольнага часу” [19, с. 3].

З прыведзеных намі прыкладаў трактовак тэрміна “клуб” асноўным элементам яго сутнасці выступае аб’яднанне людзей на аснове іх самавызначэння і імкнення да самарэалізацыі сябе як асобы. Менавіта асабова-незалежны выбар чалавекам клубнага правядзення часу выходзіць на першы план. Але сам тэрмін “самавызначэннне” ў дадзеным выпадку больш аб’ёмны, чым паняцце толькі свабоднага выбару ён уключае ў сябе таксама і праяўленне не толькі актыўна выражанай пазіцыі чалавека, але і здольнасць рэалізаваць свае імкненні і пабуджэнні. Таму самастойны выбар чалавекам клубнай дзейнасці павінен ажыццяўляцца незалежна ад якога-небудзь знешняга ўплыву.

У працэсе клубнай дзейнасці за самавызначэннем неабходна назваць самаарганізацыю, самакіраванне і самарэалізацыю. Клуб нібы валодае механізмамі запуску самастойна накіраваных дзеянняў суб’екта, дзе дзейнасць кожнага – самадзейнасць – пераўтвараецца ў групавую дзейнасць, якая ў той жа час, і з’уляецца ўмовай для



Репозиторий ВГУ

самарэалізацыі чалавека, гэта значыць, асоба можа рэалізаваць сябе праз калектыўныя дзеянні. Побач з гэтым найбольш яскрава сутнасць клуба, як сацыяльнага інстытута праяўляецца ў працэсе самасцвярджэння асобы, калі пад уздзеяннем калектыўнай клубнай дзейнасці чалавек фарміруе і сцвярджае свае жыццёвыя каштоўнасці. Самарэалізацыя выступае не толькі як механізм развіцця асобы, але і як працэс пераходу патэнцыяльных яе магчымасцей у актуальныя, сацыяльныя, агульначалавечыя.

Усе гэтыя элементы знаходзяцца ў непарыўнай сувязі і заснаваны на "сама" – як "натуральна неабходным спосабе быцця і развіцця" [78, с. 9]. Так, вылучыўшы "самадзеянне" ў асноўнае паняцце прыроды клуба, мы можам сказаць, што клуб толькі тады становіцца клубам, калі простае правядзенне часу асобнага чалавека самастойна, незалежна, дабравольна і свабодна, без уціску зверху, арыентавана на аб'яднанне з другімі людзьмі ў клубную супольнасць.

Вядомы культуролаг Б.С. Ерасаў падкрэслівае, што сацыяльныя інстытуты існуюць у кожнай сферы для забеспячэння каардынацыі дзейнасці людзей, без наяўнасці гэтых інстытутаў "дзейнасць набывае разрозненны, непаслядоўны і няўстойлівы характар" [27, с. 305].

Англійскі сацыёлаг Г. Спэнсэр называе сацыяльнымі інстытутамі комплекс фармальных і нефармальных правілаў, нормаў, прынцыпаў, установак, якія рэгулююць розныя сферы чалавечай дзейнасці і арганізоўваюць іх у сістэму роляў і статусаў, утвараюць устойлівую структуру сацыяльных дзеянняў [46, с. 50].

Даследчык Ю. Левада разглядае сацыяльны інстытут як вузел дзейнасці людзей, які існуе пэўны час і забяспечвае стабільнасць усёй пэўнай сістэме [52, с. 41].

Вядомы беларускі культуролаг А.І. Смолік вызначае, што сацыяльныя інстытуты з'яўляюцца ў грамадстве як буйныя неплануемыя прадукты сацыяльнага жыцця. Яны заклікаюць забяспечыць надзейнасць, рэгулярнасць, задавальненне патрэб суб'ектаў: асобы, груп, грамадства ў цэлым [79, с. 21].

На думку даследчыка развіцця клубных устаноў Беларусі А.А. Макаравай, сацыяльны інстытут выступае як сукупнасць пэўных устаноў, якія адпавядаюць сацыяльнай структуры грамадства і сукупнасці сацыяльных нормаў і культурных узораў, якія вызначаюць устойлівыя формы сацыяльных паводзін і дзеянняў. Праз дзейнасць сацыяльных інстытутаў патрымліваецца грамадскае жыццё: каштоўнасці, нормы, ідэалы, узоры дзейнасці і паводзінаў усіх суб'ектаў сацыякультурнага працэсу [56, с. 15].

Вельмі карыснымі для выпрацоўкі тэарэтыка-метадалагічнай асновы нашага даследавання з'яўляецца выснова культуролага А.І. Смоліка, які абгрунтоўвае працэсы інстытуцыялізацыі ці

Рэпазіторый ВДУ

ўтварэння ў грамадстве сацыяльных інстытутаў: “Сацыякультурны інстытут уяўляе сабой высокаарганізаваную сацыякультурную сістэму, якая характарызуецца ўстойлівай сацыяльнай структурай, глыбінёй інтэграванасці элементаў, разнастайнасцю, гнуткасцю і дынамічнасцю іх функцый, а значыць і ўсёй сістэмы” [25, с. 13].

На працягу тысячагоддзяў у ходзе культурнай эвалюцыі сацыяльныя інстытуты знаходзяцца ў пастаянным развіцці і змяняюць свае формы, так паступова традыцыйныя сацыяльныя інстытуты пераўтвараюцца ў сучасныя сацыяльныя інстытуты. На гэты працэс аказваюць уплыў эндагенныя (унутраныя) і экзагенныя (знешнія) фактары. Што тычыцца апошніх, то да іх ліку можна аднесці змены ў каштоўнасных арыентацыях, якія звязаны з назапашваннем новых ведаў. Эндагенныя змены галоўным чынам адбываюцца таму, што сацыяльны інстытут перастае эфектыўна вырашаць мэты і задавальняць запыты пэўных сацыяльных груп. Традыцыйны сацыяльны інстытут у сваёй аснове абапіраецца на жорсткія прадпісаныя рытуалам і звычаямі правілы паводзінаў і на сваяцкіх сувязях. У ходзе свайго развіцця сацыяльныя інстытуты становяцца больш спецыялізаванымі па сваіх функцыях і менш патрабавальнымі па правілах і рамках паводзінаў.

Даследчык Л.Г. Іонін адзначае: “...гэтыя інстытуты прайшлі доўгі шлях, перш чым набылі сучасны выгляд і змест. Іх асабістае незалежнае развіццё... вызначалася ўздзеяннем двух складаючых – ... чалавечых мэтаў, імкненняў, матываў... і іх асабістай інстытуцыянальнай логікай, гэта значыць, логікай арганізацый, бо сучасныя сацыяльныя інстытуты маюць форму сацыяльнай арганізацыі” [30, с. 218]. Акрамя таго, Л.Г. Іонін лічыць, што сацыяльныя інстытуты фарміруюцца на аснове рытуалізаваных формаў паводзін, што “ў грамадствах са слабаразвітай інстытуцыянальнай сістэмай і сістэмай стратыфікацыі рытуалы практычна выконваюць функцыі сацыяльных інстытутаў, з’яўляюцца зброяй сацыяльнай інтэграцыі, сродкам сацыяльнай мабільнасці, формай аднаўлення сацыяльнай структуры” [30, с. 132].

У ходзе працэса ідэнтыфікацыі індывідаў у рамках сацыяльнага інстытута складаецца група, якая валодае ўсімі прыметамі сацыяльнага інстытута.

1. Спецыфічнае нарматыўнае асяроддзе, а менавіта, нормы адносінаў паміж “сваімі”, нормамі адносінаў да “чужых”, гэта значыць, індывідам, якія не з’яўляюцца членамі групы, нормы ўнутрыгрупавой іерархіі, нормы адносінаў да дзяржавы і ўлады.

2. Свая асаблівая ідэалогія, якая змяшчае больш або менш цэласны і ўсеабдымны вобраз існуючага свету, правілы інтэрпрэтацыі фактаў і з’яў з погляду прынятага групай вобразу сусвету.

Репозиторий ВГУ

3. Асабістае спецыфічнае рэчавае асяроддзе.

У даследаваных намі працах замежных, расійскіх і айчынных культуролагаў і сацыёлагаў мы бачым, што клуб разглядаецца як сацыяльны інстытут, які выконвае вызначаныя функцыі ў грамадстве, што задавальняюць канкрэтныя сацыяльныя патрэбы.

Італьянскі сацыёлаг В. Парэта да ліку сутнастных патрэб адносіць такі імператыў, як схільнасць людзей ствараць клубы. Ён лічыць, што "ўсе людзі схільныя ствараць асацыяцыі, у прыватнасці, добраахвотныя, знешнія па адносінах да пярвічных груповак, у якіх яны непасрэдна інтэграваны. Гэтыя асацыяцыі паступова нараджаюць пачуцці адданасці і лаяльнасці, што ўзмацняюць іх быццё" [65, с. 429].

Французскі сацыёлаг Э. Дзюркгейм лічыў, што "першапрычына ўсялякага сацыяльнага працэсу, які не мае якога-небудзь значэння, неабходна шукаць у арганізацыі ўнутранага сацыяльнага асяроддзя", што "грамадства прадстаўляе не толькі суму індывідаў, а сістэму, створаную іх аб'яднаннямі" [26, с. 319, 327]. У працэсе разгляду розных грамадскіх тыпаў аб'яднання людзей, Э. Дзюркгейм прыходзіць да высновы, што "адзіная грамадская група, якая можа спрыяць выяўленню індывідаў у калектыве – гэта прафесійная група, або, кажучы мовай даследчыка, – "карпарацыя" [26, с. 309].

Навуковец Т. Парсанс у сваёй кнізе "Структура сацыяльнага дзейства" сцвярджае, што "грамадства, у аснове сваёй, прадстаўляе сабой нарматыўную супольнасць" і ўсе ў ім "сацыяльныя дзействы характарызуюцца, тым, чым яно нарматыўна рэгулюецца" [66, с. 44–45]. Гэта нарматыўная супольнасць, лічыць Т. Парсанс, можа быць дасягнута любой сацыяльнай сістэмай, калі сацыяльныя дзействы і сацыяльныя інстытуты ў ёй выконваюць 1 з 4 функцый:

1. Адаптацыя да знешняга асяроддзя.
2. Спасціжэнне мэтаў, якія вядуць да адаптацыі.
3. Інтэграцыя, унутранае адзінства сістэмы.
4. Латэнтнасць: засваенне, захаванне і аднаўленне існуючага парадку.

Гэтым чатыром асноўным функцыям сацыяльнай сістэмы павінны адпавядаць і сацыяльныя інстытуты, якія спрыяюць іх рэалізацыі.

Развіццё сацыяльнай сістэмы праходзіць, па Парсансу, праз 4 "механізмы эвалюцыі" – стадыі:

1. Дыферэнцыяцыя функцый, роляў, дзеянняў.
2. Адаптыўнае павышэнне, новы спосаб суаднесенасці з навакольным асяроддзем, напрыклад, праз новую тэхніку, або новыя формы камунікацыі.
3. Інклюзія, павелічэнне аб'ёму членства ў сацыяльных інстытутах.

Рэпазіторый ВДУ

4. Абагульняючыя каштоўнасці, або пашырэнне сфер іх засваення і ўжывання.

Далей, Т. Парсанс, адпаведна з прыведзенай канцэпцыяй, будуе наступную схему сувязяў паміж функцыямі сацыяльнай сістэмы і механізмамі яе развіцця:

функцыі – механізмы развіцця;
адаптацыя – адаптыўнае павышэнне;
дасягненне мэтаў – дыферэнцыяцыя;
інтэграцыя – інклюзія;
латэнтнасць – абагульненне каштоўнасцей [66].

Гісторыя клуба паказала, што ён выконвае розныя функцыі ў грамадстве, вызначаныя тыпам сацыяльнай сістэмы, узроўнем яе развіцця на канкрэтным гістарычным этапе і механізмам эвалюцыі – стадыі, на якой знаходзіцца ў гэты перыяд сам клуб. Асабліва канструктыўнымі ў гэтай схеме нам ўяўляецца менавіта апошні механізм, які ўказвае на дынамічнасць развіцця і сацыясістэм, іх функцый, і сацыяльных інстытутаў і іх сацыяльных дзеянняў, як абавязковай умовы латэнтнасці той самай аптымальнай і нарматыўнай супольнасці, аб якой вядзе размову Т. Парсанс.

На аснове прыведзенай тэорыі, расійскі навуковец В. Туеў выводзіць сацыядынаміку мэтаў і механізмаў клуба:

мэты клуба – механізмы клубнай дзейнасці;
абасабленне – абмежаванне функцый;
адаптацыя – новыя формы камунікацый;
дасягненне – дыферэнцыяцыя структур і інтарэсаў;
інтэграцыя – інклюзія, пашырэнне членства і функцый;
латэнтнасць – захаванне клубных традыцый і нормаў, гармонія з навакольным асяроддзем [86].

Зыходзячы з прыведзеных вышэй распрацовак Т. Парсанса і В. Туева, можна зрабіць выснову, што сучасны клуб – гэта поліфункцыянальны інстытут, але дамінантнымі яго функцыямі з’яўляюцца функцыі інтэграцыі і латэнтнасці, механізмамі ж, якія асабліва неабходна развіваць клубам (як толькі што створаным, так і даўно існуючым, функцыяніруючым як аб’яднанні) павінна быць, на наш погляд, дыферэнцыяцыя і інклюзія.

Прынцып стадыйнасці сацыяльных інстытутаў камунікатыўнай культуры знаходзіцца ў аснове канцэпцыі культуролага Н. Смэлзара. Група, якую ён, спасылаючыся на Р.К. Мэртана, вызначае як “сукупнасць людзей, якая вызначаным чынам, узаемадзейнічаюць адзін з адным, асэнсоўваюць сваю прыналежнасць да пэўнай групы і лічацца яе членамі з пункту гледжання людзей” [77, с. 147], клуб валодае наступнымі сутнаснымі рысамі:

1) вызначаны пэўным чынам спосаб узаемадзеяння паміж яго членамі;



Рэпазіторый ВГУ

2) членства, пачуцце прыналежнасці менавіта да гэтай групы;

3) ідэнтычнасць групы і яе членаў з пункту гледжання пабочных асоб.

4) Як дабравольная асацыяцыя, клуб мае наступныя відавыя рысы:

1) створаны для задавальнення інтарэсаў яго членаў;

2) членства ў клубе з'яўляецца добраахвотным;

3) арганізацыя такога тыпу, як правіла, не звязана з мясцовымі, рэгіянальнымі, або федэральнымі органамі [77, с. 171].

Акрамя групы "добраахвотных асацыяцый" Н. Смэлзар называе яшчэ і "харызматычныя групы". Мы лічым, што клуб можна аднесці і да гэтай групы ў сувязі з тым, што "ўзначальвае іх лідэр, які адрозніваецца прывабнасцю і вялікай прыцягальнай сілай, або харызмай" [77, с. 170].

У гэтым выпадку можна прасачыць тры стадыі пераходу пярвічнай групы ў арганізацыю, або ад групавой да арганізацыйнай структуры. Н. Смэлзар называе гэты працэс фарміраваннем значна больш упарадкаванай арганізацыі:

1) стадыя "крышталізацыі", калі кожная група асэнсоўвае патрэбы грамадства і прымае рашэнні па іх задавальненню;

2) стадыя "прызнання", калі група і яе лідэры ўступаюць у кантакт з іншымі арганізацыямі і атрымліваюць іх прызнанне;

3) стадыя "інстытуалізацыі", калі дзейнасць групы пачынала здзяйсняцца агульнапрынятым спосабам і ўсталяваліся ўстойлівыя формы ўзаемадзеяння паміж членамі групы, а таксама паміж імі і прадстаўнікамі іншых арганізацый [77, с. 271].

Клуб, як сацыяльны інстытут прамых міжасабовых зносін, як камунікатыўны механізм культуры фарміраваўся на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва. Адзін з першых даследчыкаў гісторыі клуба, англічанін Джон Цімбс, яшчэ ў XVIII стагоддзі пісаў: "Клуб, у самым агульным разуменні слова, можа разглядацца як адзінае са старажытнейшых праяўленняў першапачатковай схільнасці чалавека да зносін і прыклад такой незвычайнай улады, якую сілы Прыроды аказваюць на лёс чалавецтва. Сляды клуба наўрад ці можна знайсці ў той час, калі Адам араў, а Ева прала. Але можна дапусціць, што з узрастаннем колькасці людзей, павялічваецца іх цяга да аб'яднання ў імя якой-небудзь агульнай мэты. Гэта магло быць, перш за ўсё, агульнае імкненне да асноўных задавальненняў жыцця..." [84].

Другі даследчык клубнай дзейнасці А.А. Пятроў лічыць клуб сацыяльнай формай зносінаў людзей, якія задавальняюць такія "патрэбы чалавека, якія не могуць задаволіць майстэрня, сям'я, царква, тэатр, але, якія з веку ў век, застаюцца невычарпальнымі" [69, с. 20].



Рэпазіторый ВДУ

На любым гістарычным узроўні пэўнага адрэзку часу клуб як сацыяльна-культурны інстытут з’яўляецца практычным праяўленнем узроўню культуры, адлюстроўвае працэс культурнай дзейнасці самога чалавека, які накіраваны на перабудаванне і пераўтварэнне яго асобы. І гэты пераўтваральны працэс адбываецца праз віды дзейнасці, асноўным з якіх выступаюць духоўныя зносіны паміж асобамі, як “дасягненне духоўнай супольнасці людзей” [44, с. 292].

Духоўныя зносіны ў клубе з’яўляюцца шматфункцыянальнымі і выступаюць у якасці дзейнасці як працэсу, яны выконваюць функцыі, звязаныя з прадметам гэтай дзейнасці. Яны дапамагаюць зняць псіхафізічнае напружанне, інакш кажучы, выконваюць рэкрэатыўную функцыю, кампенсуюць недахоп чалавечых узаемаадносін па-за межамі клубнага жыцця, калі тая ці іншая асоба пазбаўлена сяброўскага ўдзелу і разумення, неабходнага для паўнаты адчування самога жыцця. Такім чынам, мы можам гаварыць, што духоўныя зносіны рэалізуюць кампенсатарную функцыю. У самым працэсе ўзаемаадносін чалавека з чалавекам з яго здымаецца груз штодзённых клопатаў. Чалавек расслабляецца і ўступае ў дзеянне функцыя рэлаксацыі. Зносіны дастаўляюць чалавеку радасць, пачуццё задавальнення ад размовы, абмену думкамі, гэта значыць, рэалізуюць гедэністычную функцыю. Акрамя таго, чалавечыя ўзаемаадносіны – пазнавальныя. У іх працэсе ажыццяўляецца пазнанне суб’екта зносін, прадмета і самога сябе. Зносіны ў клубе па віду можна таксама падзяліць на інфарматыўныя, камунікатыўныя і выхаваўчыя.

Асноўным сродкам, інструментам камунікацый у клубе выступае размова. Згодна з пунктам гледжання нямецкага філосафа канца XX стагоддзя Г.Г. Гадамера, у гісторыі філасофскага мыслення феномен размовы і асабліва выдатная яго форма – размова адзін на адзін, якая называецца дыялогам, – сыграла сваю ролю ў якасці ўсеагульнага культурнага феномену. Даследчык пісаў і аб тым, што абмен думкамі пры сустрэчы двух чалавек – гэта ўжо сустрэча двух сусветаў, двух поглядаў на свет, двух вобразаў думак. “Размова здольна пераўтвараць чалавека. ...Калі яна ўдалася, то пакідае што-небудзь нам, ...пакідае ў нас, і гэта што-небудзь змяняе нас. Толькі ў размове сябры могуць знайсці адзін аднаго ...калі людзі дамаўляюцца паміж сабой – яны ствараюць агульную мову і пры гэтым абапіраюцца на яе” [18, с. 87].

Агульная мова – тое, што ляжыць у аснове размовы ў клубе. Яна знаходзіцца, калі да яе імкнуцца, калі на яе нацэліцца, калі ў гэтым ёсць свая жыццёвая неабходнасць, якая і прыводзіць чалавека ў клуб. Роля размовы ў клубе вельмі важная. Чалавек ідзе ў клуб не таму, што яму няма з кім паразмаўляць наогул, а таму, што менавіта там яго выслухаюць, і ён зможа гаварыць аб тым, што яго хвалюе не на



Рэпазіторый ВДУ

ўзроўні звычайных мадэляў зносін (гэта ён можа зрабіць і дома), а на ўзроўні асаблівых, нязвыклых сітуацый, гэта значыць, у створаных умовах патэнцыяльнага разумення. Каштоўнасць клубнай размовы ў тым, што яна падымаецца над штодзённасцю і падымае суб’ектаў размовы да ўзроўню філасофскага разумення жыцця.

Аналізуючы матывацыі аб’яднанняў людзей у клубы ў розныя перыяды чалавечай гісторыі, англійскі навуковец Дж. Цімбс, спасылаючыся на іншыя крыніцы, прыходзіць да высновы, што “...усе знакамітыя клубы былі створаны на аснове сумеснай ежы і піцця, што можа быць кропкай сутыкнення інтарэсаў большасці людзей: вучоных і непісьменных, сумных і вясёлых, філосафаў і марнатраўцаў жыцця” [84].

Мы бачым, што асноўным элементам сутнасці клуба выступае аб’яднанне людзей на аснове іх самавызначэння і імкнення да самарэалізацыі як асобы. Менавіта асабова-незалежны выбар чалавекам клубнага правядзення часу выходзіць на першы план.

Зыходзячы з гэтага, можна вывесці тры ўзроўні ўзаемаадносінаў клуба і соцыума [45, с. 7].

На мікрасацыяльным узроўні клуб і грамадства ўступаюць у цесны кантакт, узаемадзеянне. Іх адносіны маюць устойлівы характар, але з яўным дамініраваннем сацыяльнага над культурным, што ў выніку парушае нармальнае функцыянаванне сацыякультурнага працэсу. На гэтым узроўні сацыяльнае можа нават “падаўляць” культуру, навязвае ёй свае правілы ўзаемаадносін. Гэта асабліва ярка праявілася ў рэвалюцыйных палітычных клубах, дзе культура знаходзілася ў яўным падчыненні грамадска-палітычным інтарэсам.

На макрасацыяльным узроўні клуб і грамадства дыстанцыруюць адзін ад аднаго. Соцыум і клуб існуюць абасоблена, кожны сам па сабе. Яны жывуць уласнымі праблемамі і інтарэсамі, не перасякаючыся, не ўзаемадзейнічаючы, не аказваючы ніякага значнага ўплыву адно на аднаго. На гэтым узроўні культура стаіць вышэй грамадскага жыцця, што праяўляецца на прыкладзе дзейнасці дваранскіх клубаў і салонаў у XIX стагоддзі на Беларусі, дзе яны былі “макрамірамі”, аазісамі ў жыцці дваран.

Паказчыкам мезаўзроўню выступае інтэгральнасць, дзе знойдзены суадносіны паміж клубамі і грамадствам. Гэты ўзровень характарызуецца збалансаванасцю сацыяльна-культурнага працэсу, калі грамадства зацікаўлена ў жыцці клубаў, выкарыстоўвае творчы патэнцыял і не ўмешваецца ў сферу іх дзейнасці, а клубы накіроўваюць сваю дзейнасць на інтарэсы соцыўма. Пры гэтым узроўні ўзаемаадносін “сама” “...грамадства здольна існаваць і развівацца толькі пры ўмове пераадольвання супярэчнасцей паміж культурай і сацыяльнымі адносінамі, толькі пастаянна аднаўляючы іх адзінства” [3, с. 14].



Рэпазіторый ВДУ

Клуб, як з’ява шматгранная, уключае ў сябе розныя формы дзейнасці чалавека і калектыву. Радыус сучаснай клубнай жыццядзейнасці дастаткова шырокі: ад індывідуальных монаформ, звязаных з дзейнасцю асобнага чалавека, да паліфанічных калектыўных дзеянняў і грамадскіх акцый.

Як паказвае вопыт сучаснага развіцця сацыяльна-культурнай сферы Беларусі, тут адбываецца пераасэнсаванне мэтаў, формаў і задач у сферы культурнай арганізацыі і правядзення вольнага часу як у жыцці грамадства, так і асобнага чалавека. Вольны час пазбаўляецца ад шэрагу штучна навязаных яму функцый, вяртае сабе спаконвечныя каштоўнасці, захоўваючы выкананне рэкрэацыйнай і гедэністычнай функцый, а таксама мэтанакіраванасць на самарэалізацыю і самаразвіццё асобы.

Такім чынам, мы бачым, што у абагульняючай сваёй характарыстыцы, вылучанай з прыведзеных вышэй трактовак разумення клуба, менавіта цікавае і разумнае правядзенне вольнага часу, прэваліруе як вядучая і асноўная мэта. У большасці сваёй, клуб з’яўляецца формай правядзення вольнага часу, адлюстроўвае яго традыцыі і прадстаўляе ў вызначаным сэнсе ўзровень культуры адпачынку.

Клуб валодае такім структурным элементам, як абмеркаванне мэты, якое звязана не толькі са зместам канкрэтнай групавой дзейнасці, але і мае сацыяльна значны сэнс. Таму ў імя якіх мэтаў аб’ядноўваюцца людзі – праблема, якая выходзіць далёка за рамкі дзейнасці мікрасоцыума. Па-сутнасці, яна суадносіцца з інтарэсамі макрасоцыума ў цэлым.

## 1.3. Уплыў клубных традыцый Заходняй Еўропы і Расіі на развіццё клубаў на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX стагоддзя

Клуб як цэласная з’ява, узнік не адразу, а фарміраваўся пастурова, у працэсе выкрышталізацыі з блізкіх яму аб’яднанняў людзей у розныя гістарычныя эпохі.

Ужо ў першабытную эпоху зафіксавана з’яўленне першых разнавіднасцей клубных формаў у выглядзе мужчынскіх і жаночых дамоў. На іх з’яўленне аказалі ўплыў 2 галоўныя прычыны: у выніку развіцця тэхнікі ў чалавека познерадавой абшчыны з’явіўся вольны час і пастурова сфарміраваліся 4 асноўныя сацыяльныя групы (дзеці, падлеткі, дарослыя мужчыны і жанчыны).

Першымі ў старажытнай гісторыі з’явіліся мужчынскія дамы, якія можна назваць правобразам сучасных клубаў. Гэтыя дамы былі цэнтрамі гаспадарчага, грамадскага і ідэалагічнага жыцця. У іх

Рэпазіторый ВДУ

таксама адбывалася своеасаблівая рэкрыацыя, зняцце эмацыянальнага напружання, абмен паляўнічым вопытам, навінамі, выпрацоўка асабістых адносінаў да навакольнага свету і яго з’яў, далучэнне юнакоў да грамадскіх і гаспадарчых спраў і інш. Але галоўнае, што адбывалася ў працэсе дзейнасці мужчынскіх дамоў – гэта сацыялізацыя першабытнаабшчыннага чалавека і своеасаблівае яго выхаванне праз калектыў, які ўжо выпрацаваў свае нормы і правілы паводзінаў.

Вядома, напрыклад, што першыя традыцыі выхавання дзяцей з’явіліся ў дамах моладзі (“хата ў лесе”, “шалашы ў стэпу”), успаміны аб якіх захаваліся ў рускіх, украінскіх і беларускіх чарадзейных казках [2, с. 180]. У дамах моладзі старэйшыя людзі (“старцы”) прывівалі падлеткам першыя працоўныя навыкі, передавалі запаветы продкаў, вучылі звычаям і абрадам роду. Такое навучанне працягвалася 10 год: выхаванне моладзі адбывалася шляхам ініцыяцыі. У першую чаргу гэта былі абрады, праз якія вызначалася фізічная і маральная гатоўнасць падлетка да дарослага жыцця. Вусная народная творчасць, якая перадавалася з пакалення ў пакаленне, вызначыла пэўную мараль і сістэму маральных каштоўнасцей, у перадачы якіх і складаўся сэнс выхавання.

Галоўнай задачай старажытных славян, якія жылі ў першабытнай грамадзе, было выхаванне якасцей, неабходных у нялёгкай працоўнай дзейнасці для пераадолення варожых сіл прыроды і абароны грамады ад чужынцаў. У пэўнай ступені гэтую функцыю ажыццяўляла народная педагогіка, якая ўводзіла маладое пакаленне ў акаляючы свет, перадаючы векавыя прыкметы, якія дапамагалі пазбегнуць неўраджаю, выратавацца ад прыродных стыхій. Асаблівая роля ў выхаванні надавалася абрадам і ініцыяцыям. Функцыяй якіх была перадача дзецям пэўных парад паводзінаў у паўсядзённым жыцці. Шматвекавыя ісціны маральнага і працоўнага выхавання перадаваліся вусна, шляхам разнастайных прыказак і прымавак.

У часы матрыярхату, як першыя сацыяльныя арганізацыі жанчын, больш актыўна пачынаюць развівацца жаночыя дамы. Мэты і задачы дзейнасці гэтых дамоў мала адрозніваліся ад мужчынскіх, з той толькі розніцай, што жанчыны прыводзілі ў жаночы дом дзяцей, для якіх быў абсталяваны спецыяльны вугал. Жанчыны папаўнялі свае духоўныя і фізічныя сілы, адпачывалі пасля выканання дамашніх абавязкаў, абменьваліся навінамі, пераймалі нормы і правілы паводзін, выпрацаваных у дадзеным грамадстве. Але вельмі значным, на наш погляд, з’яўляецца той факт, што менавіта ў жаночых дамах зараджалася, перадавалася і ўзбагачалася прыкладная творчасць: пляценне, ткацтва, выраб хатніх рэчаў; фарміравалася і развівалася

Рэпазіторый ВГУ

вусная народная творчасць: свяшчэнныя міфы, песні, апавяданні, бытавыя і фантастычныя казкі, паданні. Гэтыя дамы можна назваць правобразам сучасных дамоў рамёстваў, фальклору і народнай творчасці. Яшчэ ў першабытнаабшчыннай грамадзе ўсходніх славян узнікла вусная абрадавая паэзія – вясенні, летні асенні, зімні цыклы. Зыходзячы з язычніцкіх рэлігійных вераванняў, продкі беларусаў абогатваралі стыхійныя з’явы прыроды, а таксама – сонца, месяц, рэкі, азёры, дрэвы і камяні – усё акаляючае значнае, што ўплывала на іх жыццё.

Аднак, калі на змену матрыярхату прыйшоў зноў патрыярхат, жаночыя дамы не атрымалі падтрымкі і развіцця, а мужчынскія дамы, наадварот, атрымалі шырокае распаўсюджанне. Зараз у іх кола дзейнасці ўключана стварэнне тайных мужчынскіх саюзаў, якія мелі на мэце барацьбу супраць мацярынска-радавых парадкаў, тайныя трапезы, з’яўленне традыцыі ўшанавання духаў-пакравіцеляў, абрадаў, якія мелі сімвалічнае значэнне “смерці” мацярынскага і “ўваскрашэння” бацькоўскага роду.

Новы віток развіцця клубная справа атрымлівае ў Старажытнай Грэцыі, асабліва ў перыяд яе росквіту – знакамітай афінскай дэмакратыі і дзяржаўнага кіравання Перыклам (каля 490–429 да н.э.). Тэрмін “вольны час” (schole) у старажытных грэкаў атрымаў трактоўку “сур’ёзнай дзейнасці без ціску неабходнасці” [11, с. 172]. Яны ўжо разглядаюць вольны час як від дзейнасці ў сферы культуры, як пэўную самакаштоўнасную катэгорыю. Таму ў Грэцыі паступова адбываецца працэс, які ад вольных размоў, спрэчак на філасофскія тэмы прыводзіць да стварэння вялікай колькасці мужчынскіх клубаў, членамі якіх былі ўсе дарослыя мужчыны арыстакратычнага паходжання.

Стварэнню гэтых клубаў, выхаванню і замацаванню ідэі супольнасці грамадзян мужчынскага полу спрыяла ўся сістэма выхавання і адукацыі ў Старажытнай Грэцыі, калі дзяцей ад 7 і да 18 (а ў Спарце і на востраве Крыт – да 20 год) выхоўвалі не ў сям’і, а спецыяльныя выхаваці-педагогі. Галоўным у дзейнасці клубаў вольных грэкаў былі калектыўныя грамадскія абеды, у якіх бралі ўдзел да 15 чалавек. Саюз мужчын аб’ядноўваў 100–150 чалавек. Кожны саюз меў сваю прыслугу і распарадчыкаў, якія займаліся арганізацыяй і правядзеннем трапез. Пераважна абеды праходзілі за кошт сатрапезнікаў, але на Крыце і ў Спарце існавала практыка дзяржаўных адлічэнняў (за кошт падаткаў і некаторых відаў штрафаў). Права ўступлення ў саюз належыла толькі свабоднанароджаным грамадзянам і перадавалася ад бацькі да сына, разам з вінаграднікамі, зямельнымі надзеламі і іншай маёмасцю. Грэчаскія мужчынскія саюзы ўяўлялі сабой правобразы заходнееўрапейскіх клубаў закрытага тыпу.

Репозиторий ВГУ

Яшчэ адной формай старажытнагрэчаскага клуба можна назваць майстэрні (металічныя, зброевыя, тэкстыльныя, жывапісныя, ганчарныя, скульптурныя і інш.), у якіх акрамя бясед на бытавыя і філасофскія тэмы, адпачывалі, абменьваліся навінамі, жыццёвым і працоўным вопытам. Акрамя майстроў, занятых працай, у іх прымалі ўдзел і наведвальнікі – філосафы, рытары, мастакі і проста свабодныя ў гэты час людзі. Клубы-майстэрні можна назваць своеасаблівым правобразам клубаў адкрытага тыпу, кшталту сучасных дамоў рамёстваў.

Простыя людзі таксама распрацавалі сваю клубную форму правядзення часу. Гэта былі так званыя "фантомныя клубы" або клубы пад адкрытым небам. Яны былі раскіданы па ўсіх Афінах (парталы храмаў, крытыя каланады, рыначныя плошчы, на якіх спантана збіраліся невялікія групы людзей). Фантомныя клубы не мелі вызначаных арганізацыйных пачаткаў і мэтаў дзейнасці. Іх роданачальнікам лічаць Сакрата, які на працягу 24 год выкладаў сваю філасофію на вуліцах і плошчах.

Жанчыны ж, як і рабы, у старажытнагрэчаскім грамадстве не мелі грамадскага статусу, былі выключаны з палітычнага і культурнага жыцця Афін – буйнейшага грэчаскага поліса. Адзіным фактам існавання своеасаблівага жаночага клуба з'яўляецца сведчанне Плутарха [72, с. 306] аб стварэнні другой жонкай-гетэрай Перыкла Аспасіяй своеасаблівага клуба ў доме Аеін, куды збіраліся самыя знакамітыя грамадзяне Афін для размовы, спрэчак, абмену навінамі і філасофскіх бясед. Сярод удзельнікаў гэтага клуба – вядомыя драматург Сафокл і філосаф Сакрат. Да гэтага прыклада можна дадаць і своеасаблівую школу прыгожых манер, адкрытую на востраве Лесбасе ў горадзе Міцілене вядомай паэтэсай Сафо, якая вучыла жанчын спевам, музыцы, танцам, паэзіі і філасофіі для таго, каб яны "ажыўлялі жыццё гарадоў сваім абаяннем, сваёй вопраткай і сваім мастацтвам" [11, с. 175]. Па прыведзеных прыкладах добра відаць, што менавіта ў Старажытнай Грэцыі зарадзілася так званая салонная форма, якая пазней атрымала вялікую папулярнасць на заходнееўрапейскіх, рускіх і беларускіх землях.

Пасля захопу Грэцыі Рымам пачынаецца новы этап у развіцці клубных традыцый гэтай краіны. Больш удалым "залатым векам" і для развіцця грамадства, і для культурнага жыцця ў гэты час быў перыяд Рымскай рэспублікі. Грамадзяне Рыма аб'ядноўваліся дзяржаўнай сістэмай абрадаў, цэрымоній, форумам, законамі, правамі і абавязкамі, сумесна прынятымі рашэннямі, удзелам у выбарах, а таксама звычкамі, сяброўскімі і сваяцкімі сувязямі.

Вольны час рымлян – частка дзяржаўнай праграмы. З другогу боку, рымскае грамадства мела значны сацыяльны падзел: сенатары, коннікі, муніцыпальная знаць, заможныя грамадзяне, уладальнікі



Рэпазіторый ВДУ

рабоў, майстэрняў, буйныя гандляры, судаўладальнікі. Галоўнай формай правядзення вольнага часу старажытных рымлян-мужчын была лазня – тэрма, у якой не толькі адпачывалі, але і выршалі пытанні дзяржаўнай палітыкі, улады і іншыя, трапезнічалі пад акампанемент арф і танцы гетэр.

Рымляне з сярэднім дастаткам – дробныя рамеснікі, ліхвяры, гандляры, настаўнікі, урачы – стваралі свае свабодныя саюзы або калегіі – спачатку неафіцыйна, а пазней іх стварэнне ўжо патрабавала дазволу сенатараў. Акрамя сацыяльных, былі і прафесійныя калегіі (шаўцоў, краўцоў, лодачнікаў, пагоншчыкаў мулоў і інш.). Існавалі калегіі-зямляцтвы, якія аб’ядноўвалі суседзяў, гараджан, іншагародніх. Напрыклад, у Пуцеолах існавала калегія выхадцаў з фінікійскага горада Берыта, а ў Малазе – дзве калегіі азіяцкіх гандляроў. Былі калегіі, якія аб’ядноўвалі прыхільнікаў тых ці іншых багоў, а таксама калегіі, у склад якіх уваходзілі грамадзяне, жадаючыя ў складчыну набыць сабе месца на могілках або ў калумбарыі [31, с. 138].

Калегіі, якія ствараліся на лакальным узроўні і арганізацыя якіх была выклікана неабходнасцю самавыяўлення асоб, якія ў іх уваходзілі, з’яўляліся альтэрнатыўнымі дзяржаўным формам арганізацыі вольнага часу. Яны праіснавалі 600 гадоў, але не атрымалі вялікага распаўсюджвання магчыма па прычыне паступовага прыцяснення з боку імператараў Юлія Цэзара, Аўгусціна, Клаўдзія, Нерона, Траяна.

Тым не менш, рымскія калегіі мелі шмат агульных рыс з клубнымі фарміраваннямі больш позняга часу: а) створаны па асабістай ініцыятыве, па ўнутрана неабходных матывах людзьмі, якія займалі аднолькавае сацыяльнае палажэнне; б) зносіны і калектыўная трапеза, якія стваралі атмасферу ўзаемаразумення, узаемапавагі і сяброўства, былі асноўным відам дзейнасці; в) наяўнасць унутранай структуры (кіраўнікі і члены) і калегіяльнае вырашэнне фінансавых праблем; г) наяўнасць памяшкання і маёмасці, якая набывалася пераважна за членскія ўзносы (грошы выкарыстоўваліся як для арганізацыі калегіальных трапез, рэлігійных культаў, так і для матэрыяльнай дапамогі малазабяспечаным грамадзянам); д) неабходнасць выбару дазволу на арганізацыю калегіі, наяўнасць устава і спіска ўдзельнікаў калегіі, якіх магло быць да 2000 чалавек.

Для рымлян беднага саслоў’я былі адчынены харчэўні, якія наведвалі пераважна адны і тыя ж асобы, што таксама набліжала рымскія харчэўні да клубных аб’яднанняў: рэлаксацыя, адпачынак, абмен навінамі, жыццёвым і працоўным вопытам і інш.

Новы віток развіцця клубных фарміраванняў назіраецца ў эпоху заходнееўрапейскага сярэдневякоўя. Своеасаблівымі цэнтрамі культуры з пашырэннем хрысціянства, яго этыкай, мараллю, правам, звычаямі і светаўспрыманнем, сталі манастыры, пры якіх адчыняліся



Рэпазіторый ВДУ

школы і бібліятэкі, і якія станавіліся цэнтрамі культуры і адукацыі. Адным з найбуйнейшых быў манастыр, створаны квестарам і магістрам Касіадорам на поўдні Італіі ва ўласным маёнтку "Віварыі". У ім аб'ядноўваліся школа, майстэрня і бібліятэка. У сучасны перыяд развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці па такім прынцыпе ствараюцца адукацыйна-культурныя цэнтры. Прыняцце хрысціянства суправаджалася распаўсюджанасцю пісьменнасці. Культура ў сваёй аснове злучала язычніцкую і візантыйскую традыцыі. У манастырах пісаліся летапісы, перапісваліся набажэнскія кнігі, творы сусветнай літаратуры. Праз хрысціянскую культуру Беларусь увайшла ў еўрапейскую цывілізацыю. Сталі з'яўляцца творы старажытнарымскай і старажытнагрэчаскай літаратуры.

У той час важнейшымі культурна-асветніцкімі цэнтрамі на тэрыторыі Беларусі былі манастыры: Тураўскі (Варварынскі), Мазырскі (Петрапаўлаўскі і Параскевы), Полацкі (Барысаглебскі). Адкрыццё ў манастырах своеасаблівых майстэрняў (скрыпторыяў) па перапісванні кніг садзейнічала распаўсюджванню пісьменнасці. У скрыпторыях перапісваліся Святое Пісанне і працы патрыярхаў царквы, патэрыкі і жыцці святых, візантыйскія хронікі і мясцовыя летапісы. Вядома, што ў XI ст. пры епіскапскіх кафедрах у Полацку і Тураве працавалі манастырскія школы, дзе манахі перадавалі дзецям заможных гараджан асновы ведаў па пісьме, чытанні, матэматыцы. У XII стагоддзі такая школа працавала пры жаночым манастыры ў Полацку.

Манастыры сталі першымі культурнымі цэнтрамі, дзе былі створаны бібліятэкі, заснаваны школы, ствараліся летапісы і кнігі. Менавіта дзеячы царквы ў гэты перыяд былі першымі людзьмі з адукацыяй.

Галоўнымі прадаўжальнікамі клубных традыцый у эпоху сярэдневякоўя з XII стагоддзя былі рыцары, што стварылі рыцарскія ордэны і аб'яднанні, якія ў сваю чаргу адлюстроўвалі тэндэнцыі рыцарскай культуры. Галоўныя патрабаванні да члена рыцарскага аб'яднання – катэгорыя адданасці служэння васалу, кодэксу гонару, даме сэрца. Вельмі важным быў знешні бок – этыкет, рытуалы, сімволіка, атрыбутыка. Рыцарскія аб'яднанні былі пэўнай сацыяльнай сістэмай з яркавыражанай іерархічнай лесвіцай, мэтанакіраванай на поўнае падпарадкаванне асобнага рыцара групавым інтарэсам ордэна і больш жорсткага кіравання ўнутры ваенна-феадальнага саслоўя. Галоўнымі формамі работы рыцарскіх аб'яднанняў былі святочныя піры, якія аб'ядноўвалі прадстаўнікоў аднаго сацыяльнага кола, давалі адпачынак пасля ратных подзвігаў, задавальняла іх неабходнасць у зносінах, самавыяўленні. Рыцарскія фарміраванні мелі закрыты характар, што з цягам часу прывяло да пэўнай «каставасці» рыцарства. Пазней гэта тэндэнцыя стане асновай для арганізацыйных прынцыпаў многіх клубаў, што працуюць як закрытыя аб'яднанні.

Репозиторий ВГУ

Сёння маладыя грамадзяне, якія цікавяцца сярэдневяковай гісторыяй, ствараюць рыцарскія, клубы, дзе збіраюцца са сваімі аднадумцамі.

Акрамя рыцарскіх аб'яднанняў, у эпоху сярэдневякоўя назіраліся і класава-сацыяльныя фарміраванні, якія імкнуліся не толькі да аб'яднання, але і да фінансавага і юрыдычнага замацавання саюзаў. Узнікалі сельскія і гарадскія абшчыны, купецкія гільдыі, саюзы ўзаемадапамогі і клятвенныя згуртаванні. Аб'яднаныя ідэяй самаабароны, яны мелі вызначаную арганізацыйную структуру, зафіксаванае членства і існавалі за кошт уласных грашовых сродкаў. Усе яны, у той ці іншай ступені, утрымлівалі элементы клуба, якія выяўляліся ў ідэях салідарнасці, узаемадапамогі і адданасці кодэксу свайго таварыства. Нельга абмінуць увагай і студэнцкія фарміраванні: зямляцтвы і ўніверсітэцкія таварыствы, якія пачынаюць развівацца пасля XII стагоддзя, калі школы сталі ўніверсітэтамі.

Напрыканцы XV ст. у Еўропе настае новы этап у развіцці гісторыі і культуры, які прыйшоў на змену сярэдневякоўю. Гэту эпоху пачалі называць Адраджэннем, або Рэнесансам (XIV–XVI стст. для заходняй Еўропы і XIV – 1-я палова XVII ст. для ўсходняй). У эканамічным, палітычным і ідэалагічным жыцці адбыліся змены, якія былі звязаныя з разбурэннем феадальных адносінаў і складаннем капіталістычных. З умацаваннем буржуазіі і развіццём яе ідэалогіі на змену панавання царкоўнай культуры прыйшла культура свецкая. Гэта быў час вялікіх геаграфічных адкрыццяў, кнігадрукавання, развіцця мастацтва і г.д. У кожнай краіне з'явіліся свае мастакі, вучоныя, асветнікі. З адраджэннем звязаны гуманізм. Гэта сістэма поглядаў, якая сфарміравалася ў эпоху Адраджэння і складала аснову яго культуры, мастацтва, літаратуры. Гуманізм зацвярджаў высокую значнасць чалавека, абараняў ідэал справядлівасці, свабоды, чалавечай значнасці. У XV–XVII стст. склаліся ўмовы для станаўлення культуры ўсходніх славян у складзе ВКЛ: рост гарадоў, развіццё таварна-грашовых адносін, нацыянальнае самасвядомасць. У гэты час на Беларусі з'яўляецца свецкі накірунак ў літаратуры, жывапісе, ствараюцца бібліятэкі. З'яўляецца спецыфічная рыса таго часу – верацярпімасць, або талерантнасць. Быў зроблены новы крок у галіне справаводства і юрысдыкцыі – створаны статуты ВКЛ. Пачало фарміравацца беларускае мастацтва, беларуская літаратура, беларуская мова. У першай палове XVI стагоддзя адбыліся змены ў звычаях і маралі тагачаснага грамадства. З'явілася цяга да больш раскошнага жыцця. Разам з царкоўнымі і святочна-абрадавымі формамі баўлення вольнага часу жыхары беларускіх гарадоў шырока выкарыстоўвалі і іншыя: хадзілі ў госці да суседзяў, сяброў і радні, запрашалі на каляцыю (абед, пачастунак), гулялі ў косці і карты, усталёўвалі рамесніцкія агульнацэхавыя трапезы – складкі. Мясцовая шляхта пачынае пераймаць звычаі і моду Заходняй Еўропы, адкуль на

Рэпазіторый ВГУ

тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы пранікаюць карты. Азартныя картачныя гульні былі вядомы з глыбокай старажытнасці – яшчэ Герадот паведамляў, што карты існавалі ў Мідзіі ў VIII–VII стагоддзяў да нашай эры. Існуе думка, што ў Заходнюю Еўропу іх завезлі ўдзельнікі крыжацкіх паходаў.

У другой палове XVIII ст. у асяроддзі магнацка-шляхецкай вярхушкі Рэчы Паспалітай узрастае цікавасць і да форм еўрапейскага тэатра. Двары буйных магнатаў становяцца цэнтрамі свецкага жыцця. Радзівілы, першыя пасля польскіх каралёў, арганізуюць прыдворны тэатр. Першыя звесткі аб тэатральным відовішчы ў Нясвіжы датуюцца 13 мая 1746 года, калі Міхаіл Радзівіл запісаў у сваім дыярыушы: “Пасля абеду я з усёй кампаніяй ездзіў у Альбу; там пад адкрытым небам адбылася вельмі прыемная камедыя «Дасціпнае каханне», якую напісала мая жонка (Францішка Уршуля. – *Л.К.*), ігралі мае дзеці, паненкі і прыдворныя, чэсныя людзі, пад пахвалу ўсіх прысутнічаючых. Потым пад шатрамі была вячэра, за ёй пры цудоўнай ілюмінацыі быў фейерверк…” [74, с. 187]. Прэм’еру першай п’есы, якую паставілі ў нясвіжскім тэатры, Францішка Уршуля прымеркавала да дня нараджэння мужа. Прыдворны тэатр Радзівілаў першы час быў аматарскім, а ў другой палове XVIII ст. пачалі з’яўляцца замежныя акцёры, артысты з прыгонных сялян, якія атрымалі адпаведную адукацыю. Мода на тэатры распаўсюдзілася і на паветы. Там агульнымі сіламі суседзяў-шляхціцаў наладжваліся аматарскія спектаклі, а найбольш маёмасныя запрашалі ў свае маёнткі “музыку” – часцей за ўсе з двух-трох прыгонных музыкантаў-скрыпачоў [15, с. 36].

У XVI ст. з Германіі ў Расію трапляюць французскія ігральныя карты. Аляксандр I у 1801 г. пісаў санкт-пецярбургскаму ваеннаму губернатару Кутузаву, што “сіе зло прізнается вреднейшім в своіх последствіях, нежелі самое открытое грабітельство” [22, с. 96]. У Германіі XIV–XV стагоддзя нараджаюцца новыя клубныя формы – карпарацыі спевакоў. А ў Галандыі і па ўсёй паўночна-заходняй частцы Еўропы пачынаюць распаўсюджвацца літаратурна-мастацкія аб’яднанні – камер-рытары. У 1561 г. на фестывалі ў Амстэрдаме выступілі каля 1500 камер-рытараў – удзельнікаў гэтых літаратурна-мастацкіх аб’яднанняў. Такім чынам, мы можам сцвярждаць, што менавіта з эпохі сярэднявякоўя пачынаюць сваю сусветную гісторыю мастацкія клубныя аб’яднанні.

Аднак клуб як сацыяльна-культурная і педагагічная з’ява атрымлівае сваё развіццё менавіта ў Англіі. Галоўнымі фактарамі для стварэння і замацавання англійскіх клубаў можна назваць: а) палітычныя, якія замацавалі ў грамадскай свядомасці свабоду на арганізацыю рознага роду сацыяльных згуртаванняў; б) высокі ўзровень прамысловай вытворчасці, які даў англічанам вольны час і

Рэпазіторый ВДУ

магчымасць яго выкарыстання ў залежнасці з асабістымі запатрабаваннямі; в) дэмакратычныя зрухі (пасля 1689 г.), якія далі англічанам магчымасць свабоднай арганізацыі клубаў, без якога-небудзь умяшання і кантролю з боку ўлад; г) асаблівае імкненне англічан да аб'яднанняў, да праяўлення сваёй індывідуальнасці менавіта ў гэтых згуртаваннях, або клубах.

Да стварэння клуба як сацыяльна-культурнага аб'яднання яго ролю (як у старажытным Рыме – харчэўні) у Англіі выконвалі таверны, якія наведвалі пераважна адны і тыя ж людзі. Менавіта пры таверні Мермайд (прыкладна 1590–1610-я гг.) быў створаны першы клуб пад кіраўніцтвам Вальтэра Ралея. У ліку яго наведвальнікаў былі знакамітыя Шэкспір, Бамон і Флетчар. Вядомым у Лондане быў і другі клуб – "Д'ябал", адчынены пры таверні Тэмпель Бара Бэн Джонсанам.

У XVII стагоддзі пачынаюць сваю радаслоўную палітычныя клубы – "кругагаловых" і "кавалераў" (прыхільнікаў парламенту і караля). У XVIII стагоддзі адчыняе свае дзверы першы мастацкі клуб у Англіі, створаны Джонсанам, аўтарам "Слоўніка англійскай мовы". У ліку яго лідэраў быў Прэзідэнт Акадэміі мастацтваў, вядомы мастак Рэйнальсан. Пазней гэты клуб пераўтвараецца ў літаратурны.

Адным з буйнейшых арыстакратычных клубаў Лондана быў "Атэніўм" у квартале Пэль-Мэль, заснавальнікам і першым членам якога быў Вальтэр Скот. Гэты клуб размяшчаўся ў цудоўнейшым будынку, меў шырокі штат членаў і добра выхаванай прыслугі, бібліятэку ў 40 тыс. тамоў, чытальную залу, газеты і часопісы на розных мовах свету. Традыцыйнымі формамі жыццядзейнасці гэтага, таксама як і іншых англійскіх клубаў, былі публічныя абеды. Аднак, у арыстакратычных англійскіх клубах, у спецыфіку асаблівасцей характару англічан, моўныя зносіны амаль што не ігралі такой значнай ролі, як у французскіх або рускіх клубах. Толькі за абедамі ў час вымаўлення тостаў англічане практыкаваліся і спаборнічалі ў красамоўстве.

Значна большую ролю адыгрывалі моўныя зносіны і абмен каштоўнасцямі і ідэаламі ў другіх арыстакратычных клубах, дзе збіраліся "арыстакраты па духу". Такія клубы аб'ядноўвалі вядомых вучоных, мастакоў, журналістаў, літаратараў, музыкантаў і інш. Яны таксама мелі замкнуты характар, але адыгралі значна большую ролю ў жыцці грамадства, чым клубы "арыстакратаў па паходжанні".

Прыналежнасць да таго ці іншага элітнага клуба адыгрывала вельмі вялікую ролю ў выхаванні асобы арыстакрата: тут і выхаванне ў стылі "англійскага вобразу жыцця" з непарыўнасцю такіх каштоўнасцей, як якасць і стыль жыцця, фарміраванне вытанчаных манер, адпрацоўка карэктнасці ў размове, спрэчцы, праяўленне і развіццё густу да дарагіх і раскошных рэчаў. Такім чынам мы бачым,



Рэпазіторый ВДУ

што ў англійскіх элітных клубах адбывалася захаванне не толькі клубных, але і культурных традыцый.

Менавіта ў Англіі пачынаецца зараджэнне і развіццё першых рабочых клубаў, якія першапачаткова выконвалі функцыі сучаснага прафсаюза і насілі пераважна палітычны характар. Напрыклад, клубы для рабочых, створаныя Робертам Оўэнам – уладальнікам паперапрадзільнай фабрыкі, філантропа, сацыяліста-утапіста. Пры яго клубах працавалі бібліятэкі і праводзіліся бяседы. Чарцісцкія клубы мелі ярка выражаны палітычны характар, хоць і былі таксама бібліятэкі, арганізоўвалі лекцыі, бяседы, адпачынак, спрыялі сацыялізацыі рабочых.

У 1862 г. пад кіраўніцтвам вядомых грамадскіх дзеячаў быў створаны “Саюз рабочых клубаў”, які “аб’яднoўваў 1500 клубаў у 500-тысячны саюз членаў” [38, с. 107]. Палітычныя клубы адыгралі вельмі важную ролю ў фарміраванні клубнага руху не толькі Англіі. Яны сталі часткай палітычнага жыцця краіны XIX стагоддзя, аказалі ўплыў на фарміраванне і развіццё грамадскай думкі, на станаўленне прынцыпаў самакіравання, а таксама дапамагалі фарміраванню тыпу палітычнай культуры, які найбольш адпавядаў сацыяльнай групе, якой належалі яе члены, распаўсюджвалі палітычныя веды, стваралі палітычныя каштоўнасці і ідэалы.

Адметнай рысай рабочых клубаў у Англіі была іх арганізацыя па ініцыятыве “знізу” і вялікае пашырэнне. Асноўнай мэтай іх адкрыцця і дзейнасці было стварэнне ўмоў для паўнавартаснага адпачынку людзей. У кожным клубе быў більярд, сталы для гульні ў карты, буфеты, арганізоўваліся канцэрты. У выніку рэкрэацыйнай дзейнасці гэтых клубаў рабочыя задавальнялі патрэбу ў зносінах з людзьмі адпаведнага кола, пазбаўляліся ад эмацыянальнага напружання, дзяліліся навінамі і інш. Акрамя таго, членства ў такім клубе дапамагала рабочаму фарміраваць культуру мовы, вучыцца праводзіць размову, замацоўвала пэўныя каштоўнасна-арыентацыйныя нормы паводзінаў, што ў выніку значна павышала іх агульную культуру.

Трэба сказаць, што ў Англіі развіваліся і жаночыя клубы. Існавалі клубы для арыстакратак, якія не толькі стваралі свае аб’яднанні, але і выступалі фундатарамі і спонсарамі жаночых клубаў для больш беднага маёмаснага саслоўя. Сярод арыстакратычных вылучалася “Ліга Пралескі” – арганізацыя кансерватараў, якая займалася стварэннем жаночых клубаў у Англіі. Дамы-арыстакраткі арганізоўвалі для ўдзельнікаў свайго таварыства чаяпіцці ў садзе свайго замка або памесця, канцэрты, экскурсіі па аглядзе радавога замка, аматарскія спектаклі моладзі, раздачу брашур і правядзенне агітацыі [38, с. 107].

Репозиторий ВГУ

Мэта стварэння жаночых рабочых клубаў, акрамя арганізацыі культурнага правядзення вольнага часу і адукацыі, мела і маральнае выхаванне: утрыманне маладых работніц ад вінаўжывання, маральнага падзення. Аднак і тут назіраліся значныя перакосы, таму што побач з арэндай памяшканняў і іх абсталяваннем фундатары практычна падбіралі склад членаў таго ці іншага клуба, і толькі пасля стваралі статут. Тым не менш, у грамадскім жыцці гэтыя клубы таксама адыгралі значную ролю. Сродкамі і метадамі работы жаночых рабочых клубаў былі асветныя і прафесійныя бяседы, адукацыйныя вячэрнія класы, танцы, чытанне літаратуры (самастойнае і групавое), заняткі спевамі і танцамі, музычна-літаратурныя вечарыны, заняткі па англійскай мове, рукадзеллі, маляванні, гімнастыцы. Акрамя таго жаночыя, як і мужчынскія, клубы мелі свае бібліятэкі, чытальныя залы, бясплатнае харчаванне, невялікія грашовыя ўзносы. Такім чынам, добра відаць, што жаночыя клубы мелі ў большай ступені адукацыйную мэтанакіраванасць, чым мужчынскія. У іх для маладых жанчын ствараліся ўмовы далучэння да каштоўнасцей англійскага грамадства (веданне мовы, чытанне літаратуры і інш.), замацаванне разумення праведнага вобразу жыцця, фарміраванне культуры паводзінаў і быту, прывіццё добрага густу і манер.

Акрамя гарадскіх, ствараліся і вясковыя клубы, якія працавалі па той жа схеме, што і гарадскія. Адрозніваліся яны дастаткова высокім узроўнем і пастаянным тэрмінам наведвання, уяўлялі сабой своеасаблівы прататып сучаснага вясковага дома культуры або клуба, працавалі кожны дзень. Справамі клуба займаўся выбраны камітэт з 10 членаў клуба. Аб высокім грамадскім статусе англійскага вясковага клуба-згуртавання сведчыць і факт актыўнага ўдзелу членаў клуба ў вясковым жыцці, вырашэнні спрэчных пытанняў. Звычайна яны атрымлівалі назву ад тых мясцовасцей, у якіх працавалі. Формамі работы вясковага клуба былі вечарыны, дыспуты, лекцыі, чытанне (дома і ў клубе), класы па навучанні садаводстве і агародніцтве.

Такому пашырэнню клубаў у Англіі, шматлікасці формаў і метадаў іх дзеяння спрыяла і сістэма адукацыі, адпаведна з якой малады англічанін быў далучаны да клубнай дзейнасці практычна з дзяцінства. Пры школах і ўніверсітэтах ствараліся рознага роду клубы: спартыўныя, гульнявыя, дыспутныя, мастацкія і іншыя. Усё гэта дапамагала мэтанакіраванаму выхаванню асобы з рысамі самасцвярджэння і пачуццём чалавечай годнасці, развітымі маральнымі арыенцірамі і пачуццём справядлівасці. Гэтыя з’явы можна назваць найбольш яркім праяўленнем клубнай традыцыі.

У Францыі клубы пачыналіся з салоннай формы работы. Сам тэрмін “салон” сведчыць аб французскім паходжанні. Паняцце “салон” узнікае яшчэ ў XVI стагоддзі і першапачаткова азначае толькі пакой для прыёму гасцей. Пазней гэтым словам сталі называць і



Рэпазіторый ВДУ

своеасаблівыя творчыя сустрэчы з паэтамі, якія арганізоўвалі Маргарыта Шатландская і Маргарыта Наварская. Гэты факт сведчыць, што перадгісторыя стварэння дадзенага своеасаблівага тыпу культурнага ўтварэння мела першапачаткова на мэце не столькі забаўляльную, колькі мастацка-развіваючую функцыю.

Пашыранае стварэнне салонаў на тэрыторыі Францыі выпадае на канец XVI – пачатак XVII стагоддзя, калі жанчына ў вышэйшым свеце становіцца своеасаблівым прадметам пакланення і ў яе з'яўляецца мноства прыхільнікаў. Цікава, што нават славуты драматург эпохі класіцызма П. Карнэль быў у ліку наведвальнікаў салона мадам Рамбуж'е – аднаго з самых вядомых у Францыі XVII стагоддзя [51, с. 357].

Аднак, у XVIII стагоддзі французскія салоны пад уплывам набліжэння буржуазнай рэвалюцыі становяцца цэнтрамі палітычнай адукацыі, дзе абмяркоўваюцца філасофска-палітычныя пытанні. З цягам часу французскія салоны ўсё часцей набываюць палітычны характар і пачынаюць нагадваць рэвалюцыйна-палітычныя клубы. Буйнейшым у сацыяльна-палітычным жыцці быў Якабінскі клуб, у склад якога ўваходзілі будучыя буйнейшыя дзеячы рэвалюцыі Мірабо, Рабесп'ер і інш., а таксама ўрачы, адвакаты, настаўнікі, вучоныя, літаратары, купцы, а колькасць членаў – больш 1200 чалавек. Галоўнымі з формаў работы былі палітычная агітацыя і агітацыйныя мітынгі.

Безумоўна, што ўсе французскія палітычныя клубы (“Якабінскі клуб”, “89”, “Сябры манархічнай Канстытуцыі”, “Пантэон” і інш.) адыгралі вельмі вялікую ролю ў ходзе Вялікай французскай рэвалюцыі. Яны былі не толькі цэнтрамі сацыяльных зносін, але і выпрацоўвалі нормы палітычнага выхавання, былі ўжо сфарміраванай палітычнай сілай, якая ў многім прадвызначыла лёс сваёй краіны, дастаткова трагічны.

У часы Парыжскай камуны развіццё палітычных клубаў атрымлівае новы віток, ствараюцца так званыя народныя сходы, вулічныя і вандроўныя клубы. Адметнай рысай рэвалюцыйных клубаў Францыі было і тое, што ўпершыню ў гісторыі клубы маглі праводзіць паседжанні ў памяшканнях, прызначаных для выканання рэлігійных культаў (клубы-цэрквы). Камунальны клуб III округу, які размяшчаўся ў царкве св. Мікалая-на-Палях нават выдаваў сваю газету “Камунальны Бюлетэнь”. Жанчыны прымалі самы актыўны ўдзел не толькі ў рэвалюцыі, але і ў стварэнні і дзейнасці рэвалюцыйных клубаў, як разам з мужчынамі, так і асобна.

Для вывучэння клубных форм арганізацыі вольнага часу ў Польшчы мы звярнуліся да гістарычнай літаратуры такіх аўтараў, як М.І. Кастамараў, П.А. Кулакоўскі, А.В. Ліпатаў, Л.А. Абрушанкава, Я.Д. Ахотскі; мастацтвазнаўчай І.І. Свірыда, літаратуразнаўчай

Рэпазіторый ВДУ

Р. Калета, М. Фукса; мемуараў С. Панятоўскага, К. Скібіньскага. Значныя змены, якія адбыліся ў канцы XVIII – 1-й палове XIX стагоддзя закранулі і такую форму клубных фарміраванняў, як салоны. У эпоху Асветніцтва яны атрымалі вялікае распаўсюджанне на тэрыторыі Польшчы і аказалі вельмі значны ўплыў на развіццё культуры не толькі Заходняй Еўропы, але і Расіі.

У 60-я гг. XVIII ст. адчыніў свае дзверы клуб літаратараў і вучоных, створаны Адамам Казімежам Чартарыскім. Гэта мастацкае аб'яднанне працавала пры яго палацы ў Варшаве. Не менш папулярным быў другі літаратурны клуб "князя паэтаў" Ігнацыя Красіцкага [102, с. 44], створанага ў 1768 г. і знакамітыя "чацвярговыя абеды" караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага [104, с. 63–68]. Па сведчанні польскага літаратуразнаўцы Калета, нараджаліся значныя ідэі і пачынанні таго часу, галоўнай мэтай якіх было развіццё польскай мовы [103, с. 20–21]. Па серадах у караля абедалі мастакі-жывапісцы і архітэктары [103, с. 20]. Наведвальнікамі польскіх салонаў пры палацах буйнейшых магнатаў у 2-й палове XVIII стагоддзя былі пераважна выхадцы з арыстакратычных колаў і вышэйшае духавенства. Калі ў магнацкіх салонах і з'яўляліся мастакі, то яны ўсё ж не былі паўнацэннымі партнёрамі, а выконвалі хутчэй забаўляльную функцыю. Галоўнай мэтай дзейнасці салонаў пры палацах магнатаў была рэкрэацыя і адпачынак, аднак, у некаторых дамах збіралася публіка, якая запаўняла свой вольны час дыскусіямі аб літаратуры і мастацтве.

На рубяжы XVIII–XIX стагоддзяў у Варшаве атрымалі распаўсюджанне ў асноўным мастацкія і навуковыя салоны (напр., "Варшаўскае таварыства сяброў навук"). Прыкладам такога, у поўным сэнсе мастацкага салона, можа таксама служыць салон А. Гюнтэравай, якая ў сваім палацы ў Дабраўлянах прымала мастакоў, чыя творчая дзейнасць была звязана з Віленскім універсітэтам (Дамель, Рустэм, Бахматовіч). Да таго ж у палацы аматаркі-мастачкі мелася багатая калекцыя твораў выяўленчага мастацтва [106, с. 521].

У першай трэці XIX стагоддзя ствараецца аснова для сапраўдных мастацка-літаратурных салонаў, створаных на аснове ўласна мастацкіх інтарэсаў і адбываецца дэмакратызацыя салона. У ролі арганізатараў пачынаюць выступаць не толькі арыстакраты, але і інтэлігенцыя, а таксама прадстаўнікі мяшчанскага саслоўя [105, с. 61]. Агульнасць духоўных інтарэсаў, а не знатнае паходжанне становіцца ўсё большай асновай для традыцыйных рэгулярных сустрэч. У гэты перыяд назіраецца далейшае замацаванне ўнутраных сувязяў у асяродку інтэлігенцыі, развіццё сяброўскіх кантактаў. Характэрнай формай зносін становяцца абеды, прысвечаныя ўшанаванню заслуг асобных дзеячаў. У гэты перыяд, у параўнанні з арыстакратычнымі салонамі, ствараюцца новыя цэнтры сяброўска-мастацкага жыцця,

Репозиторий ВГУ

звязаныя з прафесійнай інтэлігенцыяй і адыграваючыя ўсё большую ролю ў сацыяльна-культурным жыцці Польшчы.

К. Скібіньскі ў сваіх мемуарах піша, што творчую інтэлігенцыю збіраюць вакол сябе выдаўцы, так у пэўныя часы зыходзіліся пісьменнікі, літаратары, паэты, навукоўцы, мастакі да віленскага выдаўца Ю. Завадскага [105, с. 135].

Тэндэнцыя пераадолець замкнутасць, якая ўласціва кожнаму прыватнаму салону, у якім збіралася толькі вузкае кола знаёмых, праявілася ва ўзнікненні агульнадаступных месцаў для прыватных сустрэч. Імі становяцца кафэ, якія адначасова выконваюць і функцыю прафесійнага клуба па інтарэсах (літаратурныя, тэатральныя, эстэтычныя, палітычныя і інш.). Так у Варшаве месцам зносін творчай інтэлегенцыі было кафэ “Под Копцюшкем” (“У Папялушкі”), дзе ў пакоях, аздобленых карцінамі мастакоў, можна было знайсці замежныя і польскія газеты, сустрэць пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў. Кафэ Баўца атрымала назву “Літэрацке”, таму што яго частымі наведвальнікамі былі многія людзі літаратурнага і тэатральнага свету. Кафэ з’яўляюцца і месцам адкрыцця мастацкіх выстаў (традыцыя дайшла і да нашых дзён). Менавіта ў кафэ студэнцкая моладзь вяла дыспуты не толькі на эстэтычныя, але і на палітычныя тэмы. Тут збіраліся прадстаўнікі тых слаёў польскага грамадства, у асяродку якіх выспелі планы паўстання, з якой выйшлі найбольш актыўныя члены. Па сведчаннях Цеханавецкага, у 1796 г. у Слоніме адкрыты “Кафейны дом”. Клубы-кафэ знаходзіліся пад пільным наглядам паліцыі (асабліва падчас лістападаўскага паўстання) [76, с. 97]. Паступова мастацкія клубы-кафэ сталі характэрнай рысай польскага культурнага жыцця. І па сённяшні дзень яны адыгрываюць вельмі значную ролю ў сацыяльна-культурным жыцці польскага народа.

У першай чвэрці XIX стагоддзя назіраецца дзейнасць палітычных тайных таварыстваў, што існавалі ў Царстве Польскім і ў паўночна-заходніх губернях Расіі. У 1817–1822 гг. у Вільні дзейнічае літаратурнае аб’яднанне шубраўцаў (гулякаў). Паседжанні аб’яднання носяць жартаўліва-парадыйны характар. Мэта аб’яднання зводзіцца да барацьбы з закаранелымі заганамі шляхецкага грамадства ў форме сатыры [32, с. 457]. У Віцебску ў 1833 г. дзейнічае таварыства аматараў айчыннай славеснасці з мэтай удасканалення сябе ў веданні польскай мовы. Адзін раз у два тыдні адбываюцца сходы, на якіх кожны з членаў даваў справаздачу, што ён напісаў на польскай мове або зрабіў пераклад на польскую [83, л. 172]. 1 кастрычніка 1817 года адбылося першае паседжанне другога тайнага згуртавання віленскіх студэнтаў, мэтай якога была ўзаемадапамога ў паглыбленні адукацыі, у творчым удасканальванні, “грамадская праца для дабра заняволенай Айчыны” [91, с. 8]. Назвалі студэнты сваю арганізацыю – Таварыства філаматаў (сяброў навук). Таварыства такога ж накірунку ўжо існавала

Репозиторий ВГУ

ва ўніверсітэце раней. І называлася яно “Навуковае”, а потым – “Філаматычнае таварыства” – па аналогіі з вядомым у гісторыі філаматычным таварыствам, што дзейнічала ў Францыі напярэдадні і ў час Вялікай французскай рэвалюцыі.

Згодна са статутам, “кожны з чынных членаў на працягу чатырох тыдняў мусіў падрыхтаваць адну працу – арыгінальную ці пераклад, вершам ці прозай, сур’ёзную, навуковую ці вясёлую, прызначаную для пагулянак” [91, с. 9]. Адзін раз на тыдзень філаматы збіраліся на так званыя “навуковыя паседжанні”, дзе чыталі свае навуковыя даследаванні, паэтычныя творы. Тут жа выступаў хто-небудзь з рэцэнзіямі на іх, падрыхтаванымі загадзя. Потым ішлі дыскусіі, спрэчкі, у час якіх кожны мог выказаць сваю думку. Заканчваліся спрэчкі галасаваннем, якім ухвалялі ці адхілялі прачытаную навуковую працу альбо мастацкі твор.

Ужо ў 1818 годзе яны падзяляюцца на два аддзелы: аддзел літаратуры і вызваленых навук і аддзел фізікі, матэматыкі і медыцыны. Кожны аддзел збіраўся на свае «навуковыя паседжанні» роўна праз два тыдні і яшчэ адзін раз на месяц – на арганізацыйны сход. Праз кожныя два месяцы абодва аддзелы збіраліся на агульнае паседжанне. Былі яшчэ “вялікія” паседжанні, якія скліканіся адзін раз на год і на якіх выбіралася кіраўніцтва аддзелаў і агульны “ўрад”. Паставіўшы перад сабой вялікія задачы асветы народа, яны імкнуцца супрацоўнічаць з іншымі апазіцыйнымі ўладам арганізацыямі. Дзеля гэтага звязваюцца з шубраўцамі, масонамі, з віленскім згуртаваннем польскага патрыятычнага таварыства.

Па ініцыятыве Адама Міцкевіча яшчэ ў 1819 годзе было ўтворана першае адгалінаванне Таварыства філаматаў – Саюз сяброў. З 1822 года членаў Саюза сяброў пачалі называць філадэльфістамі (браталюбцамі) [91, с. 13].

Сярод філаматаў былі спробы стварыць і іншыя прадстаўнічыя арганізацыі. Так, Тэадор Лазінскі на аснове літаратурнага гуртка студэнтаў Віленскага ўніверсітэта арганізаваў Навуковае таварыства, Францішак Малеўскі – Саюз маладых адвакатаў, Тамаш Зан – Саюз айчынных натуралістаў, Ануфры Петрашкевіч спрабаваў стварыць згуртаванне “масістаў” – працаўнікоў канцылярыі для ўпарадкавання спадчыны Радзівілаў – пад назвай “Рэч Паспалітая”. Міхал Рукевіч з Францішкам Малеўскім рабілі спробу стварыць Саюз літоўскай моладзі.

Для таго каб прывабіць моладзь, трэба было знайсці нешта больш цікавае. Тамаш Зан намерыўся арганізаваць згуртаванне, мэтай якога хаця б напачатку было толькі адно маральнае ўдасканаленне, не абцяжаранае навуковымі задачамі. Задуманую арганізацыю ён назваў Таварыства прамяністых. Сэнс “прамяністасці” ён растлумачваў так: кожны добразычлівы, высокай маралі чалавек выпраменьвае святло і тым самым дабратворна ўздзейнічае на іншых. Форму дзейнасці



Рэпазіторый ВДУ

Таварыства Зан выбірае – маёўкі, агульныя пагулянкі, з выкарыстаннем урачыстых, часам таямнічых рытуалаў.

Пасля роспуску (1820 г.) адкрытае Таварыства прамяністых пераўтварылася ў тайнае Таварыства філарэтаў (прыхільнікаў маральнай чысціні). Узначаліў яго Тамаш Зан. У новае аб'яднанне залічылі толькі найбольш надзейных і адданых яму. Пашырыліся і задачы абноўленай арганізацыі. Цяпер яе члены не абмяжоўваліся толькі маральным удасканальваннем. Узяліся і за ўласную асвету, самаадукацыю. Таварыства філаматаў імкнулася арганізоўваць філарэцкія філіі на ўсёй тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага. Такія філіі спрабаваў стварыць у родным Навагрудку і ў Коўне Адам Міцкевіч, у Шчучыне – Ануфры Петрашкевіч.

Невядома, у якім кірунку пайшла б далей дзейнасць філаматаў і філарэтаў, як бы шырока яна разгарнулася, калі б не разгром у 1823 г. На жаль, пасля гэтай падзеі члены гэтых згуртаванняў ужо ніколі не змаглі сабрацца разам. Параскіданыя па свеце, яны і ў разлуцы, перапісваючыся паміж сабой, заўсёды адчувалі сябе членамі адной філамацка-філарэцкай сям'і, засталіся вернымі ёй да канца жыцця.

У 1813 г. пры школе на Жалібожы ўтвараецца "Таварыства моладзі, якая займаецца навукамі". Штомесяц адбываюцца паседжанні членаў таварыства з рэфератамі. Пры таварыстве арганізавана бібліятэка, якая складаецца з ахвяраванняў членаў таварыства [67, с. 194].

Выгаднае геаграфічнае становішча Беларусі дазваляла ёй знаходзіцца ў шматбаковых кантактах у галіне культуры з многімі краінамі, што заканамерна прывяло да паглыблення ў ёй працэсаў інтэрнацыяналізацыі. Шлях беларускай культуры ў Еўропу і еўрапейскай на Беларусь ляжаў пераважна праз Польшчу. Да таго ж, беларусы і палякі жылі ў адной федэратыўнай дзяржаве – Рэчы Паспалітай.

У другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя палац магната выступае асноўным ачагом культуры. У эпоху Асветніцтва ў дамах магнацкай вярхушкі польска-літоўскага грамадства існавалі салоны ў Казімежа Сапегі, Ігнація Патоцкага, Антонія Тызенгаўза.

Першыя клубы-салоны, якія адыгралі вялікую ролю ў развіцці нацыянальнай музычнай культуры і літаратуры, трапілі на тэрыторыю Беларусі яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай. Першае на тэрыторыі Беларусі клубнае аб'яднанне салонага тыпу з'явілася дзякуючы намаганням і талентам княгіні Францішкі Уршулі Радзівіл у Нясвіжы, гэта быў – літаратурны салон. Яго ўладальніца непасрэдным чынам уплывала на фарміраванне эстэтычных густаў прадстаўнікоў радзівілаўскага арыстакратычнага асяроддзя [62, с. 60]. У першай чвэрці XIX стагоддзя вызначаліся салоны графа Рудольфа Тызенгаўза ў Жалудку Гродзенскай губерні, графа Людвіка Ракіцкага ў Гарадзішчы Мінскай



Репозиторий ВГУ

губерні, генерала Завішы ў Кухцічах Мінскай губерні, князя Міхала Казіміра Клеафаса Агінскага ў Залессі – "Паўночных Афінах" Беларусі. Вечары карысталіся вялікай папулярнасцю ў наведвальнікаў, а на музычных вечарынах Ракіцкага і Завішы ігралі вялікія аркестры. Дом мастака Ваньковіча ў Мінску ў 1820–1840-я гг. быў цэнтрам культурнага жыцця. Сюды прыходзілі мастакі, паэты, музыканты, прадстаўнікі дваранскай інтэлігенцыі. Тут гучалі вольналюбівыя вершы Адама Міцкевіча і Антона Гарэцкага, тут побач з мастаком былі Ян Дамель, Чэслаў Манюшка [76, с. 108].

Княгіня Аляксандра Агінская імкнулася запрасіць у свой палац найбольш вядомых людзей таго часу. У 1793 годзе яе салон у Гродне належаў да найбольш прэстыжных. Яго часта наведваў "усемагутны рускі пасол" Северс [92, с. 40]. У Свіслачы дзейнічаў салон. "Сцены салона выклеены блакітнай папераю, а ўздоўж сцен – канапкі і альховыя столікі, пакрытыя чорным. На вокнах белыя муслінавыя фіранкі. Пасярод – більярдны стол на два локці даўжыні і на локаць шырыні" [67, с. 31–32]. Пані рэферэндарыня Тышкевіч арганізавала тэатр аматараў, якія разыгрывалі французскія п'есы [67, с. 34].

У цэлым беларускія клубы-салоны не вельмі адрозніваліся ад польскіх, мелі той жа прынцып стварэння і кіравання. Але калі ў мужчынскіх дваранскіх сходах былі дастаткова строгія нарматыўна-прававыя палажэнні, замацаваныя ўставам, то салон уяўляў сабой больш вольнае ўтварэнне. Безумоўна, што кожны салон меў свае "неписанные правила", якія ўстанаўлівала яго гаспадыня, а мэтанакіраванасць яго дзейнасці залежала ад яе інтарэсаў і густаў. Салоны аб'ядноўвалі просты этыкет з душэўным і прыемным адпачынкам. Галоўнае адрозненне прыватнага салона ад клуба выяўляецца ў тым, што размова тут ідзе ў пазачасавым, практычна аморфным баўленні часу са звычайна ўстаноўленымі перыядычнымі прыемнымі днямі, а таксама ў адсутнасці запрашэнняў. У такіх салонах збіраўся звычайна пастаянны кантынгент, якому было прадастаўлена права запрашаць новых гасцей для правядзення гутарак на тэмы мастацтва, літаратуры, музыкі, філасофіі, а таксама і палітыкі. Іншымі заняткамі маглі стаць гульні, чытанні, лекцыі і нават тэатральныя інсцэніроўкі [107, с. 250].

З другой паловы XVIII ст. шырокае распаўсюджванне ў прыватнаўласніцкіх гарадах Беларусі атрымалі маскарады (рэдуты) як спецыфічная форма святочнага баўлення часу прывілеяванага саслоўя. На маскарады для ўсіх гасцей стала абавязковым правілам з'яўляцца пераапранутымі ў маскарадныя касцюмы "машкары" з маскамі і ўдзел у танцах, гульнях, забавах. У Агінскіх у Слоніме і ў Зорыча ў Шклове на маскарады дапускаліся ўсе слаі грамадства, акрамя прыгонных, тады як на "рэдутныя забавы" Г.Ф. Радзівіла запрашалася толькі вузкае кола багатай шляхты. На маскарадах выступалі балетныя трупы, хоры



Репозиторий ВГУ

пеўчых, ансамблі прыгонных спевакоў і артыстаў, музыкаў [5, с. 93–94]. Аднак самай урачыстай, шматлюднай і любімай святочнай формай баўлення часу багатай шляхты федэратыўнай Рэчы Паспалітай у XVII–XVIII стст. сталі балі. Баль – гэта з'ява французскай культуры, а Францыя ў гэты перыяд з'яўляецца заканадаўцай мод, густу і свецкіх паводзін у Еўропе. Баль абавязкова ўключаў акрамя танцаў раскошную вячэру (каляцыю) і магчымасць для аматараў камерцыйных картачных гульняў сустрэцца з партнёрамі.

Аднак, развіваючыся ў рэчышчы агульнаеўрапейскай традыцыі, Беларусь выяўляла ў сабе многія рысы і тэндэнцыі, што ядналі яе як з культурай Захаду (пераважна польскай), так і Усходу (Расіі). Асабліва гэта тэндэнцыя ярка праявіла сябе пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай.

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793 і 1795 гг.) тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. На яе тэрыторыі былі ўведзены тыя ж прынцыпы кіравання, што і ў Расіі. Акрамя гэтага, Кацярына II перадавала расійскім дваранам і беларускія землі. Так, толькі ў перыяд з 1772 па 1796 год, яна перадала ва ўласнасць расійскіх дваран 150 і 550 тысяч сялянскіх душ. Павел I на працягу 1796–1801 гадоў працягваў гэту палітыку і перадаў рускім дваранам 28 тысяч душ беларускіх сялян. У выніку гэтых даравнняў удзельная вага расійскіх памешчыкаў – уладальнікаў беларускіх зямель – у сярэдзіне XIX стагоддзя склала 1%, а агульная плошча іх землеўладанняў – 21,7% [20, с. 269]. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай рускія афіцэры з расквартараваных на Беларусі войскаў унеслі ў побыт шляхты звычаі рускіх багатых паноў. Акрамя таго, у губерні на кіруючыя пасады, як правіла, прызначаліся менавіта расійскія дваране, што таксама спрыяла ўкараненню на тэрыторыі Белай Русі і новых формаў арганізацыі вольнага часу. Напрыклад, у Нясвіжы ў доме бацькі Ф. Булгарына амаль кожны вечар займаліся музыкай, танцамі, ігралі ў карты… Чырвонцы пры гэтым ставілі не лікам, а мераю – стаканамі. У кватэрах рускіх афіцэраў гулялі ў карты і на рэчы: жэмчуг, дыяменты, сярэбраны і залаты посуд, гадзіннікі, пярсцёнкі, завушніцы, каштоўную зброю і конскую збрую [15, с. 56–57]. Што тычыцца ладу жыцця правінцыяльнага дваранства Расійскай дзяржавы, то яно прынцыпова не адрознівалася ад ладу жыцця беларускай павятовай шляхты [9, с. 50–53].

У сваю чаргу, нельга не адзначыць практычна выключную ролю заходнееўрапейскіх культурных традыцый у станаўленні клубных форм на тэрыторыі рускіх зямель. Пераўтварэнні Пятра I, якія ахапілі палітычную, сацыяльную, гаспадарчую, эканамічную і культурную сферы жыцця рускага насельніцтва, у рэшце рэшт прывялі да існавання на Русі і такіх першых клубных формаў, як "журфіксы" і "асамблеі". Тэрмін "журфікс" таксама паходзіць з французскай мовы і



Рэпазіторый ВДУ

спачатку азначаў “вызначаны дзень”, гэта значыць – прыём гасцей у пэўны дзень тыдня. Першыя журфіксы з’явіліся яшчэ ў дапятроўскую эпоху. Станоўчай рысай іх дзейнасці была не толькі забаўляльна-рэкрэацыйная функцыя сходаў рускай знаці, але і задавальненне ўсё ўзрастаючых духоўных запатрабаванняў, зараджэнне цікавасці да ведаў, імкненне да абмеркавання асабліва важных падзей у жыцці грамадства.

Што тычыцца салоннай формы правядзення вольнага часу ў Расіі, то яна атрымлівае найбольшае распаўсюджанне толькі ў XIX стагоддзі. Іх дзейнасць цесна звязана са знакамітымі рускімі жанчынамі сваёй эпохі: С.Д. Панамаровай, Э.Ф. Радэн, вялікай княгіняй Аленай Паўлаўнай, а дзейнасць салонаў Е.А. Карамзіной, Зінаіды Валконскай, княгіні Е.І. Галіцынай, А.П. Елагінай і іншых аказала вельмі значны ўплыў на развіццё рускай літаратуры і ўвогуле, мастацкай культуры. Аб гэтым красамоўна сведчаць гістарычныя факты. Напрыклад, салон С.Д. Панамаровай (“Общество любителей премудрости и словесности”) наведавалі І.А. Крылоў, Н.І. Гнедзіч, Н.І. Грэч, П.А. Каценін, О. Кіпрэнскі, П. Якаўлеў і іншыя, а салон княгіні Е.І. Галіцынай у Пецярбургу цікавіў маладых – А.С. Пушкіна, В.А. Жукоўскага, П.А. Вяземскага, К.Н. Бацюшкава і іншых [45, с. 127]. Трэба падкрэсліць і тое, што названыя намі ўладальніцы салонаў былі самі вельмі таленавітымі і высокаадукаванымі асобамі. Але, на жаль, гэтая культурная з’ява на тэрыторыі Расіі мела хутчэй спантаны, чым усеагульны характар.

Палітыка Кацярыны II у сваю чаргу ў Расіі дапамагла стварэнню шырокай сістэмы ахопу рускага дваранства і грамадства рознага рода клубамі, якія давалі магчымасць праяўлення і станаўлення культуры розных слаёў грамадства. Так было, напрыклад, з Англійскім клубам, створаным па ініцыятыве Ф. Гарднера ў Пецярбургу 1 сакавіка 1770 года. Гэты клуб стаў узорам, нязменным элементам у структуры культуры рускага грамадства. “Англійскі сход” у сталіцы на Няве абрусеў з першых жа год свайго стварэння, але назву сваю не змяніў. Наведвальнікі Англійскага клуба праводзілі вольны час у вясёлых размовах, за чытаннем газет або гульнёй у карты. Не выключалася ўжыванне спіртных напояў: віна і піва. Стварэнне такіх клубаў паказала магчымасць выкарыстання вольнага часу не толькі як забавы, але і як пэўнага роду культурнай дзейнасці, дзякуючы увядзенню ў адпачынак бяседы і змястоўнай размовы.

Паступова капіталістычныя адносіны, якія ўсталёўваліся ў гарадах, дыктавалі новы, іншы рытм жыцця і паводзін, хаця адбывалася гэта павольна, спакваля. У XIX стагоддзі паняцці “клуб” – “сход” – “таварыства” разумеліся як тоесныя з’явы, у іх найбольш ярка прасочваюцца вертыкальна-грамадскія сувязі. Члены такіх аб’яднанняў акрамя палажэння ў грамадстве валодалі і грашовымі

Репозиторий ВГУ

сродкамі, бо ўваходная цана ў арыстакратычны клуб – 2 рублі срэбрам, а падпісная гадавая цана на літаратуру – 10 рублёў срэбрам [88]. Клубы характарызаваліся выбранасцю сваіх членаў, каставасцю, насілі закрыты тып дзейнасці. Спачатку новае пранікала ў вярхі гарадскога грамадства, а пасля элементы гэтага новага траплялі ў больш дэмакратычнае асяроддзе гараджан.

У 1784 г. у тым жа горадзе на Няве, у мэтах даць біржавому купецтву магчымасць збірацца для правядзення нарад па камерцыйных справах і правядзення часу ў бяседзе і гульні ў карты, было заснавана Камерцыйнае таварыства ды такія ж таварыствы дзейнічалі да сярэдзіны XIX стагоддзя амаль што ва ўсіх губернскіх гарадах Расіі і, адпаведна, Беларусі. “Зімой у гэтым клубе для пастаянных членаў і іх сем’яў ладзіліся балі. Госці абавязкова плацілі за ўваход. У першы час заснавання клуба было прынята правіла, што дамы павінны былі прыязджаць не інакш, як у паркалёвых сукенках. Пазней гэтыя балі атрымалі назву “паркалёвых” (“ситцевых”), хаця само правіла пратрымалася толькі да першай зімы” [73, с. 286]. Традыцыя правядзення “паркалёвых баляў” захавалася аж да Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Такім чынам, мы бачым, што далучэнне Беларусі да Расіі садзейнічала ўключэнню яе ў агульнарасійскую гаспадарчую сістэму, умацаванню сувязей з рускімі губернямі, што ў сваю чаргу аказала ўплыў і на пашырэнне клубнага руху на тэрыторыі Беларусі.

Развіццё клуба ад спарадычных форм клубных зносін да традыцыйна абумоўленых клубных інстытутаў – працэс не толькі гістарычны, але і генетычны. Абодва накірункі гэтага працэсу маюць магчымасць развівацца не толькі па вертыкалі, паслядоўна, але і па гарызанталі, паралельна. У першым выпадку, пярвічныя неінстытуіраваныя стадыі развіцця клуба можна ўбачыць на больш ранніх канкрэтна-гістарычных этапах развіцця грамадства, а больш высокія па ўзроўні арганізацыі стадыі інстытуцыяналізацыі клуба – на наступных этапах грамадскага развіцця.

Рэпазіторый ВДУ

# РАЗДЗЕЛ 2. АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ КЛУБНЫХ ТРАДЫЦЫЙ НА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

## 2.1. Дваранскія аб'яднанні клубнага тыпу

Канец XVIII – пачатак XIX стагоддзя характарызуецца вострым крызісам феадальных, фарміраваннем і ўзмацненнем буржуазных адносін. Пад уплывам капіталістычнага ладу жыцця адбываецца размыванне саслоўнай замкнёнасці. Безумоўна, што гэтыя працэсы не маглі не адбіцца і не паўплываць на сферу адпачынку.

У працэсе палітычных, эканамічных і сацыяльна-культурных пераўтварэнняў у гэты перыяд вылучылася як пануючае саслоўе і замацавала свой статус дваранства. Яно таксама распрацавала пэўную сістэму каштоўнасцей, структуру сацыяльных паводзін, якая ўключыла ў сябе і формы свецкага культурнага жыцця. Гэтую ж думку мы сустракаем і ў рабоце пра быт і традыцыі рускага дваранства ў вядомага даследчыка-культуролага Ю.М. Лотмана, які ў прыватнасці пісаў: "Формы адпачынку, узаемаадносінаў моладзі, каляндарнага рытуалу, якія былі ў асноўным агульнымі і для народнай, і для баярска-дваранскай сям'і, павінны былі саступіць месца спецыфічнаму дваранскаму асяроддзю" [36, с. 91].

XIX стагоддзе мы з поўным правам можам назваць "стагоддзем клубаў і таварыстваў", якія сталі адной з новых і асноўных формаў правядзення вольнага часу прывілеяванай часткі жыхароў Беларусі. У вышэйшых слаях насельніцтва губернскіх гарадоў пануе "вытанчанасць Парыжа", расце праслойка прадстаўнікоў творчых прафесій. Яны прымаюць удзел у розных дабрачынных і добраахвотных таварыствах, саслоўных і саслоўна-прафесійных клубах, што адыграла значную ролю ў грамадскім, палітычным і культурным жыцці грамадства. Клуб для кожнага двараніна XIX стагоддзя – гэта спосаб жыцця. Клуб вызначаў паўсядзённыя паводзіны, характарызуючы сувязь чалавека з грамадствам.

Вярхі гарадскога грамадства бавілі час у "шляхетных сходах", якія па сваёй структуры нагадваюць клуб. Іх мэтай было "прыемнае баўленне часу пры дапамозе грамадскіх забаў і пацяшанняў" [83, арк. 6]. Бачым, што іх дзейнасць мэтанакіравана на сумесны адпачынак, фарміраванне культурных зносін і рэкрыяцыйных забаў. Дваранскія клубы (або "шляхетных сходы") дзейнічалі ва ўсіх губернскіх і некаторых павятовых гарадах. Клубы (дваранскія, "англійскія", афіцэрскія і г.д.) звычайна аб'ядноўвалі людзей аднаго сацыяльнага

Рэпазіторый ВДУ

кола. У члены “шляхетнага сходу” і іншыя арыстакратычныя клубы прымаліся дваране, ваенныя і цывільныя чыны, ганаровыя грамадзяне, купцы першых дзвюх гільдый. Клубы насілі замкнуты характар, у іх пераважалі асабістыя зносіны. Такі ж маладаступны для іншых саслоўяў, а таксама, і жаночага полу, характар мелі і афіцэрскія клубы (або афіцэрскія сходы). Акрамя гульні ў карты, размоў на палітычныя, мастацкія і іншыя тэмы, у клубах праводзіліся маскарады і розныя дабрачынныя мерапрыемствы.

Прычыну такой папулярнасці “шляхетных сходаў” можна растлумачыць і тым, што ў першай палове XIX стагоддзя ў краіне адсутнічалі нарматыўна-юрыдычныя перашкоды для арганізацыі клубаў і адзінае, што неабходна было зрабіць, гэта падаць прашэнне ў Міністэрства ўнутраных спраў, якое і займалася зацвярджэннем статута таго ці іншага клуба. У ім вызначалася, “якія асобы могуць быць прыняты ў лік яго членаў” [87, арк. 1]. Гэта было адзіным патрабаваннем, змены ж маглі адбывацца згодна з рашэннямі агульнага сходу, які на 2/3 галасоў зацвярджаў або адхіляў якія-небудзь прапановы або палажэнні.

Калі зрабіць аналіз статутаў беларускіх дваранскіх клубаў XIX стагоддзя, то відавочным будзе тое, што ўсе яны, за невялікімі выключэннямі, мелі аднолькавую структуру і змест работы. Справа ў тым, што Міністэрства ўнутраных спраў у Цыркуляры № 140 ад 18 снежня 1874 г. прапанавала адзіны ўзор статута грамадскага сходу, па якому потым стваралі свой асноўны дакумент усе сходы [87, арк. 1]. У кожнага клуба была свая пячатка з подпісам назвы ўстановы.

“Шляхетныя сходы” арганізоўваліся з мэтай даць сваім удзельнікам і членам іх сем’яў магчымасць праводзіць вольны ад асноўнага занятку час не толькі з прыемнасцю, але і з карысцю.

Усе знакамітыя людзі таго часу, у тым ліку і дзяржаўныя дзеячы, нягледзячы на сваю занятасць на дзяржаўнай і царскай службе, лічылі за гонар быць старшынямі клубаў або займацца яго гаспадарчымі справамі.

На прыкладзе Слуцкага Таварыства шляхетнага сходу [58, арк. 10] (адчынена ў 1848 г., да гэтага мела назву таварыства “Сямейных вечароў”), “Сямейных вечароў” у Навагрудку [52, арк. 21] (ў 1875 г. перайменавана ў Навагрудскі грамадскі сход), Лепельскага грамадскага сходу 16 мая статут зацверджаны Міністэрствам унутраных спраў [32, арк. 44] (з 9 верасня 1916 г. Лепельскі клуб “Сямейны гурток” – заснавальнікі: правадыр дваранства А.У. Галынец, падатны інспектар П.А. Пікоўскі і інш. [29, арк. 53]), Віцебскага шляхетнага сходу [12, арк. 3] (было адкрыта ў 1806 г. як “Таварыства сямейных вечароў”, а з 1857 г. было перайменавана ў Віцебскі шляхетны сход), Мінскага рускага грамадскага сходу;



Рэпазіторый ВГУ

Гродзенскага шляхетнага сходу [19, арк. 26], Мінскага купецкага сходу [80, арк. 33–45], Брэст-Літоўскага гарадскога шляхетнага сходу [8, арк. 583–584; 78, арк. 1–15] і іншых клубных аб'яднанняў падобнага тыпу, можна ў той ці іншай ступені прасачыць гісторыю стварэння і развіцця дваранскіх клубаў на тэрыторыі Беларусі. Іх дзейнасць характарызавалася тыповым наборам формаў арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Па-першае, гэта аднатыпнасць унутрыклубнага жыцця: абавязковыя абеды (як штодзённыя, так і святочныя) і гульні (у карты, шашкі, даміно, лато, кеглі, більярд). Кожны клуб меў спецыяльна прыстасаваныя асобныя пакоі для розных відаў гульні. Цікава, што ў клубах дазваляліся любыя картачныя гульні, акрамя азартных, якія былі катэгарычна забаронены. Тлумачэнні, якая гульня носіць камерцыйны або азартны характар, а якая – не, уваходзілі ў абавязкі старшыні клуба. Цікава, што за ўдзел у гульні члены клуба павінны былі заплаціць грашовы ўзнос. Напрыклад, у Віцебскім дваранскім клубе за глазентавую гульню плацілі срэбрам 2 руб. 10 кап.; за атласную – 1 руб. 90 кап.; за адборную – 1 руб. 60 кап., а звычайная каштавала 1 руб. 30 кап. Існавалі свае тарыфы на гульню ў даміно (50 кап. срэбрам) і більярд (днём – 5 кап., а пры свечках – 10 кап. срэбрам). Бясплатнымі былі толькі гульні ў шашкі і шахматы, што таксама сведчыць аб своеасаблівым заахвочванні ўдзельнікаў клуба да больш "інтэлектуальных" гульняў [13].

Нормы грамадскага жыцця ў клубах часам пераўтвараліся ў нормы паводзін у грамадстве. Так, напрыклад, паняцце картачнай запазычанасці ў клубах вырашалася вельмі строга, і калі член клуба своечасова не мог яе выплаціць, то ён назаўсёды пазбаўляўся членства. Акрамя таго і іншыя сходы ўводзілі ў свае статуты палажэнне, што чалавек, які быў выключаны з якога-небудзь клуба (гэта значыць, меў дрэнную рэпутацыю), не мае права балаціравацца нават у кандыдаты для пазнейшага залічэння. Калі ж нехта з іншых членаў клуба спрабаваў паручыцца за такога чалавека, то і ён таксама мог быць выключаны. Таму паняцце гонару не насіла абстрактнага значэння і нормы ўзаемаразлікаў пры гульні ў карты былі не толькі нормамі клуба, але і нормамі дваранскага жыцця ў XIX стагоддзі.

Для бясед звычайна выкарыстоўвалі асобныя пакоі з камінам, дзе клубмэны, якія не гулялі ў карты або пасля карцёжных партый, паразмаўляць, абмяняцца думкамі, навінамі з палітычнага, грамадскага, эканамічнага, свецкага і культурнага жыцця горада або краіны.

Газеты і часопісы як айчыннага, так і замежнага выдання былі прадстаўлены ў поўным аб'ёме, аднак карыстацца імі можна было толькі ў сценах клуба. Парушальніка гэтага правіла чакаў штраф.



Рэпазіторый ВДУ

Многія клубы мелі дастаткова багатыя кнігазборы, якія ўтрымліваліся за кошт членскіх узносаў або дадатковых спецыяльных субсідый, якія плацілі тыя ж удзельнікі клуба. Напрыклад, у бібліятэцы Віцебскага шляхетных сходу ў 1864 годзе налічвалася 400 тамоў перыядычных выданняў [51, с. 114]. У бібліятэцы Гродзенскага шляхетнага сходу акрамя перыядычных выданняў былі таксама творы на рускай, польскай, французскай, нямецкай мовах. Яна працавала штодзённа з 10 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара. Асобы, якія не прымалі ўдзел у ахвяраванні (а гэта складала 1% ад жалавання дваран), плацілі ў год 6 рублёў, а ў месяц – 75 кап., у дзень – па 10 кап. срэбрам [7, с. 791].

Штодзённы ход падзей у жыцці клубаў рэдка калі парушаўся. Звычайна перад днём узнаўлення членскіх квіткоў у кожным клубе арганізоўвалася «бязштрафная ноч». Што тычыцца штрафаў, то тут існавала свая строга вызначаная сістэма іх узаемадзеяння, якая падрабязна распісвалася ва ўставе клуба. Напрыклад, курыць дазвалялася толькі ў буфеце, пакоях для гульні і більярднай, прычым з парушальнікаў гэтых правіл упершыню ўтрымлівалі штраф 2 руб. на карысць бедных, у другі раз калі парушальнік быў членам клуба, то яго выключалі, а калі госцем, то яму забаранялі далейшы ўваход у гэты сход.

Знаходжанне ў сходзе дазвалялася да 2 гадзін пасля поўначы. Наведвальнікі, якія засталіся пасля дазволенага часу, плацілі пры выхадзе на карысць сходу штраф, але яго памер адрозніваўся так: напрыклад, у Лепельскім грамадскім сходзе плацілі ад 2 да 3 гадзін – 25 кап., ад 3 да 4 гадзін – 50 кап., ад 4 да 5 гадзін – 1 руб. У 5 гадзін сход абавязкова зачыняецца [32, арк. 44]. У Брэст-Літоўскім шляхетных сходзе штрафы пачыналіся таксама з 2 гадзін пасля поўначы, але за ¼ гадзіны па 25 капеек. Так у 5 гадзін штраф быў ужо 5 рублёў. Яшчэ адна асаблівасць Брэст-Літоўскага гарадскога шляхетнага сходу выражалася ў тым, што згодна параграфа 19 статута ў бібліятэцы забаранялася мець кнігі і газеты, а роўна і весці ўсялякую размову ў сходзе на польскай мове [8, арк. 583–584].

Наведванне клуба каштавала дастаткова дорага: заснавальнікі плацілі па 10 руб. срэбрам у год; разавы ўваход каштаваў 50 кап.; квіток на баль – 1 руб. або 1 руб. 50 кап. срэбрам [13]. Аднак жанчыны на балі запрашаліся бясплатна.

Па-другое, арганізацыя пазаклубнага жыцця была прадстаўлена абавязковымі маскарадамі, балямі, танцавальнымі, музычнымі і літаратурнымі вечарамі, на якія члены клубаў запрашалі сваіх гасцей. У XIX стагоддзі клубныя балі былі ўключаны ў структуру забаў грамадства.

Репозиторий ВГУ

Па той прычыне, што ўсе клубы былі пераважна мужчынскімі, жанчыны маглі трапіць толькі ў час баляў, маскарадаў і розных вечароў.

Але нават у тыя дні, калі жанчыны маглі наведаць клуб, старшыня павінен быў строга сачыць за тым, каб тая ці іншая жанчына, якую запрасіў член клуба, мела «прекрасную репутацию». Многія статуты адводзілі гэтаму пытанню асобныя параграфы, у якіх рэгламентаваліся правілы запрашэння жанчын у клуб.

У дні, вызначаныя для агульнага сходу членаў, для танцавальных вечароў і маскарадаў, для гадавых або іншых юбілееў, сход зачыняўся ў 5 гадзін пасля поўначы і штраф да гэтага часу для наведвальнікаў не спаганяўся.

На аснове параўнальнага аналізу дзейнасці розных клубаў, можна заўважыць, што графік іх работы меў некаторыя адрозненні. Напрыклад, Віцебскі шляхетны сход працаваў кожны дзень (акрамя панядзелка), слуцкія дваране сустракаліся ў клубе па аўторках, чацвяргах і суботах, а ўдзельнікі Гродзенскага шляхетнага сходу – па панядзелках, чацвяргах і суботах.

Рэпутацыя клуба ў многім залежала ад узроўню правядзення баляў. Таму ў статутах клубаў сустракаюцца параграфы, якія даюць пэўныя прадпісанні па арганізацыі і правядзенню гэтай формы баўлення вольнага часу. Колькасць баляў, якія давалі на працягу года, залежала найперш ад фінансавага становішча клуба. Па сведчанні даследчыка Нікіфароўскага, у Віцебскім шляхетным сходзе з дня заснавання 16 верасня 1857 года і па 1 лістапада 1859 года адбылося 65 танцавальных вечарын; а з гэтага часу да 1 студзеня 1861 года даходу было атрымана 17 106 руб. 26 кап. срэбрам, пры ўмовах расходаў у памеры 15 504 руб. 65 кап. срэбрам [51, с. 47]. Клубныя балі выконвалі культурную місію не толькі з пункту гледжання арганізацыі забавы гарадскіх саслоўяў, але і фармавалі іх танцавальную культуру. Баль, як цэласная сістэма “грамадскага прадстаўніцтва”, непасрэдна аказваў прамое або пабочнае ўздзеянне на ўключаных у яго дзейства людзей.

Статуты клубаў мелі параграфы, дзе былі дакладна прапісаны патрабаванні да формы адзення. Напрыклад, па прадпісанні статута (параграф 41) Слуцкага шляхетнага сходу на балі неабходна было з'яўляцца ў фраках (для чыноўнікаў) і ваенных мундзірах (для вайскоўцаў). Сюртукі апраналі толькі на мужчынскія сходы [58]. Дамы павінны былі з'яўляцца на баль апранутымі вытанчана і шыкоўна па апошняй модзе ў бальныя сукенкі з выразнымі ліфамі, упрыгожаныя кветкамі. І дамы, і кавалеры не здымалі на балі пальчатак і ніколі без іх не танцавалі. Танцавальныя вечарыны ў гэтым клубе арганізоўвалі толькі ў час карнавалаў (ад Каляд да Вялікага посту) адзін раз на тыдзень (параграф 2) [58].

Рэпазіторый ВДУ

У Гродзенскім шляхетным сходзе сямейныя танцавальныя вечары (ressursy) адбываліся адзін раз на тыдзень, і толькі па суботах [7, с. 795].

Распараджаліся на балях і танцавальных вечарах, а таксама сачылі за парадкам, спецыяльныя асобы (адна або некалькі), якіх прызначалі старшыні. Ніхто не меў права змяніць вызначаны старшынёй парадак танцаў або ўмяшацца ў распараджэнне музыкай [52, арк. 21].

Па сваёй прыродзе баль – шматфункцыянальная забаўляльная форма. Валодаючы вялікай рухомасцю і дынамікай, правядзенне балю ўключала ў сябе чаргаванне розных відаў дзейнасці – ад пасіўнага сузірання агульнай карціны балю да актыўнага праяўлення індывідуальных якасцей асобы ў танцах. На балях надавалася магчымасць паіграць у карты, пазабавіцца ў мімалётным флірце, атрымаць задавальненне ад свабоднай лёгкай размовы. Важкую ролю іграла музыка, якая не толькі суправаджала танцы, але і стварала святочную атмасферу. Акрамя таго, балі выклікалі пачуццё дастасаванасці да калектыўнай весяласці, дазваляючы асэнсоўваць сябе ўдзельнікам агульнай урачыстасці.

Шматфункцыянальная існасць балю адказвала лакальнаму характару баўлення часу. Клубы з'явіліся тымі формамі, якія працягвалі танцавальныя традыцыі грамадства, фарміруючы танцавальную культуру гарадскіх саслоўяў. Таксама яны былі дзейсным сродкам самафінансавання клубаў.

Культуролаг Ю.М. Лотман акцэнтуе ўвагу на тым, што менавіта – "баль быў галіной грамадскага прадстаўніцтва, формай сацыяльнай арганізацыі, адной з нешматлікіх формаў дазволенага ў Расіі калектыўнага быту таго часу" [36, с. 91].

Паступова баль ператварыўся ў своеасаблівае тэатралізаванае прадстаўленне, у якім кожнаму элементу, пачынаючы ад уваходу ў залу і да раз'езду гасцей, адпавядалі строга вызначаныя формы зносін дваранскай моладзі. Танцы ў цэнтры шумнай урачыстасці надавалі свабоду і вольнасць размове паміж мужчынам і жанчынай, немагчымыя ў іншых умовах. Па традыцыі клубны баль адчыняўся велічным паланэзам, у якім прымалі ўдзел і пажылыя госці, якія звычайна не танцавалі. Гэты танец называўся "прагулкай", бо ён дазваляў гасцям бліжэй пазнаёміцца і абмяняцца прывітаннямі.

У некаторых клубах існавалі свае традыцыі адкрыцця танцавальных вечароў. Напрыклад, у слуцкім сходзе «вечар адкрываўся танцам з першай замужняй дамай, якая ўвайшла ў залу» (гл. параграф 37 статуту Слуцкага благароднага сходу) [58, арк. 10].

З цягам часу балі пачнуць набываць не толькі забаўляльную, але і дабрачынную мэтанакіраванасць. Так лепельскі клуб "Сямейны гурток" меў мэтай даць сваім членам і іх сем'ям магчымасць

Рэпазіторый ВДУ

праводзіць вольны час. З гэтай мэтай клубу, з захаваннем належных узаконьванняў, надавалася магчымасць арганізоўваць для сваіх членаў і іх гасцей балі, маскарады, танцавальныя, музычныя, літаратурныя вечары і драматычныя прадстаўленні, выпісваць кнігі, газеты, іншыя перыядычныя выданні, а таксама запрашаць асоб, якія спецыялізаваліся па розных навуках, з мэтай чытыння лекцый, якія спрыялі б распаўсюджанню паміж членамі клуба карысных ведаў. Клуб “Сямейны гурток” адчыняўся штодзённа з 10 гадзін раніцы [29].

У другой палове XIX стагоддзя на шляхетных сходах Беларусі па жаданні грамадства замест сямейных пачалі ладзіцца музычныя вечары. Удзел бралі члены і госці клуба абодвух палоў, якія складалі своеасаблівыя музычныя гурткі і прымалі ўдзел у музычнай частцы. Члены клуба разам з сем’ямі мелі права на бясплатны ўваход, а госці плацілі па 1 руб. 50 кап. Любоў да музыкі, магчымасць, якую атрымалі маладыя музыканты, – раскрыць свой талент, хутка зрабілі гэтыя вечары дастаткова папулярным відам правядзення вольнага часу ў сходах. У апошняй чвэрці XIX стагоддзя не меншую папулярнасць атрымалі і канцэрты. Яны праходзілі ў памяшканнях гэтых дваранскіх клубаў і ўключалі ў сябе не толькі музычныя імпрэзы, але і выступленні замежных тэатральных труп і музыкантаў. У канцы XIX стагоддзя да гэтых забаў далучыліся дзіцячыя балі і навагоднія ёлкі са святочнымі частаваннямі і падарункамі.

Арыентацыя клубаў на сацыяльныя праблемы грамадства найбольш ярка праявіліся ў дабрачыннай дзейнасці. У XIX стагоддзі арганізацыя збору грошай на карысць бедных склалася як клубная традыцыя. Акрамя стварэння кас для сірот, удоў, якія папаўняліся за кошт штрафных клубных сродкаў, ажыццяўлялася мэтанакіраваная дабрачынная праграма. Яна ўключала ў сябе розныя адрасныя дапамогі, пенсіі, стыпендыі, а таксама правядзенне масавых культурных мерапрыемстваў, збор ад якіх ішоў на богаўгодныя мэты.

Члены клубаў разглядалі клубную дабрачыннасць як натуральнае накіраванне дзейнасці. Клубы не толькі арганізоўвалі аднаразовую дапамогу, але і стваралі пастаянна дзейнічаючыя фонды ў мэтах аказання матэрыяльнай падтрымкі асабліва маючым патрэбу людзям, трапіўшым у кола іх дзеяння, а таксама немаёмным і абяздоленым.

З першых гадоў заснавання клубаў пры іх адчыняліся касы на карысць бедных, якія папаўняліся за кошт штрафных грошай. Гэта была традыцыя. Так, напрыклад, у Віленскім афіцэрскім клубе (Ваенным сходзе) 27 снежня 1899 г. на карысць Чырвонага Крыжа быў наладжаны баль, а 30 студзеня 1900 года адбыўся дабрачынны вечар “з жывымі карцінкамі” і музычна-вакальным аддзяленнем, у якім прымаў удзел аркестр мясцовых навучальных устаноў [4, с. 13].

Мэта правядзення вечара – матэрыяльная дапамога небагатым навучэнцам гімназіі [5, с. 10]. У Гродзенскім шляхетным сходзе за зіму 1860 года ў дабрачынных мэтах былі праведзены 4 маскарады [7, с. 795]. У Віцебскім клубе ў 1864 годзе быў арганізаваны маскарад, сродкі ў памеры 200 руб. срэбрам былі перададзены на карысць інвалідаў, а 29 чэрвеня 1845 года ў дваранскім сходзе было арганізавана своеасаблівае святкаванне дня нараджэння цара Мікалая Паўлавіча, на якім ігралі два аркестры, выступаў хор, была арганізавана шыкоўныя ілюмінацыя і феерверк, а для простага люду на вуліцах былі ўстаноўлены арэлі. Гулянне паўтарылася 30 чэрвеня, а ўсе атрыманыя ад іх сродкі былі перададзены "зале-прытулку" для дзяўчынак-сірот [51, с. 248]. У 1851 годзе з мэтай збору матэрыяльных сродкаў на карысць яўрэйскага шпіталя быў арганізаваны баль у Мінску [84, арк. 1]. У дачным памесці "Адамава" ў Старасельскай воласці Віцебскага ўезда купцы Б.І. Гершун і Н.А. Бернштэйн 6 ліпеня 1910 года на карысць пагарэльцаў у Магілёве арганізавалі "паркалёвы баль". У яго праграму ўваходзілі танцы ў суправаджэнні аркестра ваеннай музыкі, канфеці і серпанцін, кветкі і "лятучая" пошта. Кошт квітка складаў 1 руб. 50 кап., з якіх 10 кап. – дабрачынны сбор. Чыстага даходу было атрымана 111 руб. 43 кап. [3, арк. 162–163].

Дабрачынная дзейнасць насіла ўстойлівы характар, змяняўся толькі памер грашовых сум, які залежаў ад таго, наколькі добра ішлі справы ў той перыяд часу ў тым ці іншым клубе. Мы не ставілі на мэце падрабязнае вывучэнне гэтага боку дзейнасці клубаў, таму разглядаем толькі агульную тэндэнцыю, і то ў гістарычным разрэзе. Аднак і на прыведзеных намі прыкладах відаць, што дабрачынная работа дваранскіх і афіцэрскіх клубаў – з'ява маштабная і традыцыйная для элітарнага беларускага грамадства XIX стагоддзя.

Паказальным прыкладам беларускага жаночага салона больш позняга часу з'яўляецца салон Соф'і Пятроўны Галіцынай, які працаваў у Віцебску ў 1846–1853 гадах. Сучаснікі характарызавалі яе як абаяльную, энергічную жанчыну, якая мела еўрапейскую адукацыю і, да таго ж, была жонкай генерал-губернатара, мела сувязі з вышэйшым светам дзвюх сталіц. Вакол яе асобы сталі збірацца не толькі заможныя дваране і купцы, але і літаратурна-мастацкая эліта Віцебска. Дзейнасць гэтага салона і асабіста яго гаспадыні выклікалі да жыцця пастаянную акцёрскую трупу пад кіраўніцтвам сп. Морыца, якая праславілася сваім мастацтвам і аркестр сп. Яганава, які абслугоўваў тэатральныя пастаноўкі і розныя балі. Пры гэтым узровень такога «культурнага адпачынку» быў настолькі высокім, што, як сцвярджае Н.Я. Нікіфароўскі, "…сцэнічныя і музычныя навіны таго часу аднаўляліся ў Віцебску настолькі паспяхова, што нядаўнія шукальнікі сталічных прыемнасцей з ліку багатых і радавітых дваран,



Рэпазіторый ВГУ

лічылі дастатковым і тое, што даваў Віцебск, а цудоўныя «живые картинки", якія ствараліся дзякуючы вынаходніцтву сп. Морыца... прыцягвалі ўвагу аматараў і знатакоў нават з Варшавы" [51, с. 15].

Акрамя таго, княгіня С.П. Галіцына была арганізатарам загарадных пікнікоў, розных гулянняў у садах і парках. Але побач з арганізацыяй рознага роду забаў для прадстаўнікоў "вышэйшага свету" яна не забывала і аб простым насельніцтве Віцебска. Для яго арганізоўваліся канцэрты бульварных аркестраў, выступленні скараходаў і канатаходцаў, "дзяды", "пятрушкі" ў розных бойкіх месцах (у асноўным, насупраць "палаца"), стаялі каруселі, а зімой ладзілі бульварную горку з музыкай і пацешнымі агнямі ўвечары [51, с. 16].

Акрамя таго, княгіня значную ўвагу надавала дабрачыннасці. Яна рабіла візіты найбольш значным асобам і прадавала ім квіткі-запрашэнні на дабрачынныя спектаклі і канцэрты, або латарэі. Напрыклад, квіток на спектакль ці канцэрт у ложу каштаваў 25–100 руб., а крэсла ў партэры – 25 руб. [51, с. 19].

Аднак трэба заўважыць, што як у Расіі, так і ў Беларусі жаночыя салоны не атрымалі такога шырокага распаўсюджання, як мужчынскія дваранскія сходы. Магчыма гэта было звязана з той нязначнай сацыяльнай роллю, якая адводзілася жанчыне ў буржуазным грамадстве. Але салонам было суджана адыграць больш значную ролю ў дваранскай культуры толькі дзякуючы асабістаму фактару гаспадыні гэтых салонаў (і гэта красамоўна відаць на прыведзеных намі прыкладах). Салоны сталі нязменным элементам быту і культуры таго часу, якія да таго ж адлюстроўвалі норавы, прынцыпы, сацыяльныя і мастацкія тэндэнцыі развіцця беларускага дваранства ў XIX стагоддзі.

Падводзячы вынік, падкрэслім, што клуб для любога двараніна XIX стагоддзя быў не проста месцам адпачынку ў вольны час ад грамадскага і сямейнага жыцця, а хутчэй уяўляў сабой вобраз жыцця, а членства ў клубе ўваходзіла ў сістэму сацыяльна-культурных зносін людзей аднаго кола і мастацка-творчых інтарэсаў. Дзейнасць салонаў плённа паўплывала на станаўленне літаратуры, музычнага і сцэнічнага мастацтваў, іх развіццё і прафесіяналізацыю.

## 2.2. Дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў клубнага тыпу на Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя

У другой палове XIX стагоддзя вызначылася тэндэнцыя да стварэння клубаў "новай хвалі", першапачаткова звязаная з сацыяльнай накіраванасцю на дабрачыннасць. Узнікненне новых клубаў праходзіла з іншымі прыярытэтамі ў прынцыпах яднання. Мэтавыя ўстаноўкі прадугледжвалі, у першую чаргу, аказанне



Рэпазіторый ВДУ

матэрыяльнай дапамогі прадстаўнікам "сваіх" саслоўяў. Найбольш ярка гэта праяўлялася ў купецкіх клубах, якія сталі інтэнсіўна ўзнікаць у грамадстве пасля рэформ 60–70-х гадоў. Архаічныя клубныя мэты, якія сфарміраваліся напрыканцы XVIII стагоддзя і звязаныя з "прыемным бауленнем часу", змяніліся сацыяльна-арыентаванымі: "аказванне матэрыяльных дапамог асобам, якія належалі да саслоўяў ганаровых грамадзян купцоў і купецкіх прыказчыкаў, якія былі членамі дадзенага таварыства" [80, арк. 33–45].

На аснове дадзеных архіўных дакументаў Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіву Беларусі (фонды 24; 295; 1430; 2555; 2649), Нацыянальнага гістарычнага архіву Беларусі ў г. Гродна (фонды 103; 1), аналізу перыядычнага друку дарэвалюцыйнага часу ("Вестник Могилевского земства", "Вестник Минского губернского земства", "Виленский вестник", "Гомельская мысль"), а таксама работ беларускіх этнографаў (П.В. Баброўскага, П.І. Шпілеўскага, М.Я. Нікіфароўскага, А.П. Сапунова) можна зрабіць вывад, што менавіта з другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя назіраецца перыяд росквіту аб'яднанняў, фарміраванняў клубнага тыпу (не ў сэнсе месцазнаходжання, а ў сэнсе формаў арганізацыі).

У другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя на Беларусі пачынаюць паступова з'яўляцца і пашырацца грамадскія аб'яднанні з надзвычай шырокім спектрам дзейнасці: **аб'яднанні ўзаемадапамогі і гаспадарча-эканамічнага накірунку** (камерцыйныя таварыствы і таварыствы спажыўцоў, якія аб'ядноўвалі купцоў, служачых прамысловых прадпрыемстваў, чыноўнікаў; прыказчыцкія, членамі якіх былі гандляры і дробныя служачыя); **саслоўныя і прафесійныя** (чыгуначныя, пажарныя, фармацэўтычныя, будаўнікоў, рамеснікаў, кушнерскія, клуб хатняй прыслугі ў Віцебску і інш.); **навуковыя і асветніцкія таварыствы; дабрачынныя і нацыянальныя; клубы і аб'яднанні, па інтарэсах** (спартыўныя, музычныя, літаратурныя, артыстычныя і інш.); **грамадскія аб'яднанні, звязаныя з царквой.** Да гэтага перыяду стварэнне аб'яднанняў (таварыстваў) клубнага тыпу па пералічаных вышэй накірунках мела спантанны, адзінкавы характар.

Пашырэнне дыяпазону формаў клубнай дзейнасці паказвае якасныя змены сацыяльнай ролі клубаў у жыцці рускага грамадства XIX стагоддзя. Традыцыйныя рэлаксацыйныя забаўляльныя мэты змяніліся асветніцка-адукацыйнымі, што сведчыць аб высокім узроўні ўключэння клубаў у сацыяльна-культурнае жыццё грамадства.

У 80–90-я гады XIX стагоддзя ў працэсе стварэння і развіцця клубаў узнікалі новыя плыні і накірункі, звязаныя з адыходам ад саслоўнага прынцыпу яднання. Асаблівасць пазасаслоўных клубаў заключалася ў тым, што яны сталі ўзнікаць у правінцыі. Шматлікасць



Рэпазіторый ВДУ

пазасаслоўных клубаў сведчыць пра пачатак фарміравання культурных традыцый на пазасаслоўным узроўні. У нарматыўна-прававых дакументах выяўляюцца іншыя арганізацыйныя азначэнні: “Членамі клуба могуць быць асобы ўсіх саслоўяў і нацыянальнасцей; колькасць членаў клуба неабмежавана”. Агульнадаступныя клубы сапраўды станавіліся цэнтрамі культурнага жыцця губернскіх і павятовых гарадоў Расіі. Яны арганізоўвалі балі і маскарады, драматычныя выступленні, літаратурныя і музычныя вечары і г.д.

Асноўная маса беларускай інтэлігенцыі гуртавалася вакол музеяў, прыватных бібліятэк, перыядычных выданняў, якія да гэтага часу паступова пачалі страчваць сваю элітарнасць, або збіралася на вечарыны ў прыватных кватэрах. Напрыклад, у Э. Ажэшкі ў 1869–1910 гг. (у гэты час жыла ў Гродне) збіралася прагрэсіўная інтэлігенцыя. Гэта форма правядзення вольнага часу была перанята беларускай інтэлігенцыяй ад сялянскай моладзі, якая збіралася вечарамі па суботах, нядзелях або святочных днях на танцы і гульні ў прасторнай хаце або карчме. Вечарыны, якія ладзіла гарадская і мястэчковая інтэлігенцыя, спрыялі папулярызацыі літаратурнага, музычнага, драматычнага і іншых відаў мастацтва на Беларусі, прычым не толькі беларускага, але і рускага, і заходнееўрапейскага. Напрыклад, у Нясвіжы, па сведчанні П.І. Шпілеўскага, былі ў пашане хатнія музычныя і літаратурныя вечарыны інтэлігенцыі, дзе чыталі і абмяркоўвалі творы М. Гогаля, В. Жукоўскага, Ч. Дзікенса, У. Тэкерэя, навіны заходнееўрапейскага музычнага жыцця [91, с. 63]. Гэта традыцыя захавалася яшчэ з канца XVIII стагоддзя.

Вялікай папулярнасцю ў колах чыноўнікаў карысталіся чытанні. Можна нават сказаць, што гэта была адна з асноўных формаў сяброўскіх зносін паміж сабой. Па сведчаннях Нікіфароўскага, «…чыноўніцтва чытала значна больш, чым можна было чакаць; чыталі групамі, пры гэтым абменьваліся думкамі і ўражаннямі аб прачытаным; шляхам чытання некаторыя асобы папаўнялі вучэбныя прабелы, спецыялізаваліся ў пэўнай галіне ведаў…» [51, с. 113].

Менавіта чыноўнікам належыць адкрыццё першых прыватных бібліятэк-чытальняў на тэрыторыі Беларусі. Так, напрыклад, малады чыноўнік былой палаты дзяржаўнай маёмасці, віцяблянін Іван Феліксавіч Місюра, які атрымаў хатнюю адукацыю, стварыў прыватную чытальню (1864 г.). У яе фондах налічвалася 539 тамоў розных твораў (205 – на рускай, 327 – на польскай і 7 – на французскай мовах). За карыстанне літаратурай з чытальні І. Місюры плата была дастаткова даступнай 30 кап. у месяц, таму ў ёй налічвалася 80 пастаянных чытачоў [51, с. 114–115].

17 кастрычніка 1905 года падчас найвышэйшага пад’ёму Першай рускай рэвалюцыі цар выдаў маніфест, дзе абяцаў народу стварыць



Репозиторий ВГУ

Дзяржаўную думу і даць шэраг грамадзянскіх свабод: недатыкальнасць асобы, свабоду слова, свабоду сходаў, саюзаў і г.д. У мэтах узмацнення кантролю над арганізацыяй сходаў і саюзаў 4 сакавіка 1906 года былі апублікаваны часовыя правілы, у якіх агаворвалася сістэма рэгістрацыі, разгляду праектаў статута і кантролю за дзейнасцю таварыстваў і саюзаў. Юрыдычна гэтыя абавязкі ўскладаліся на спецыяльна створаныя губернскія камітэты па справах аб таварыствах прысутнасці (дзяржаўныя установы). Згодна з правілам, таварыствам лічылася аб'яднанне некалькіх асоб, якія не ставілі на мэце атрыманне матэрыяльных прыбыткаў, а да саюзаў адносілі аб'яднанні двух або некалькі таварыстваў. Забаранялася ствараць таварыствы або саюзы, якія "…преследовали цели, противозаконные общественной нравственности, запрещенные уголовным законом, угрожающие общественному спокойствию и безопасности, управляемые учреждениями или лицами, находившимися за границей, а также… преследующие политические цели" [42, арк. 1].

Статуты таварыстваў заўсёды зацвярджаліся ў Міністэрстве ўнутраных спраў, але спачатку для таго, каб падаць праект статута, арганізатар таварыства павінен быў падрыхтаваць пісьмовую заяву на імя губернатара. У ёй указвалася назва таварыства, мэта яго стварэння, раён і спосабы (формы) яго дзеяння, прозвішча, імя і імя па бацьку заснавальніка, месцазнаходжанне таварыства, парадак прыняцця і выбыцця членаў, памер членскіх узносаў, парадак іх выплаты і інш. Да заявы прыкладаўся праект статута, які належаў рэгістрацыі. Цікава, што дабрачынныя таварыствы (пахавальныя касы, згуртаванні ўзаемадапамогі і інш.) карысталіся прывілеямі. Адкрыццё іншых таварыстваў (спартыўных, літаратурных, артыстычных і інш.) адбывалася складаней, за кожнае адступленне ад статута таварыства зачынялася. Палітычныя саюзы і арганізацыі наогул не дазваляліся.

**Аб'яднанні (таварыствы) ўзаемадапамогі і гаспадарча-эканамічныга накірунку**

Таварыства беспрацэнтных пазык ламавым рамізнікам г. Мінска 21 студзеня 1910 г. у Віцебску, Таварыства добраўпарадкавання месцаў Баранавічы, Навагрудскага павета 1914 г., Чашніцкае таварыства спажыўцоў 1915 г., Акцыянернае таварыства домаўладальнікаў гор. Двінск 1907 г. [42, арк. 1] мелі на мэце матэрыяльную падтрымку і абарону інтарэсаў асобных сацыяльных і прафесійных груп, страхаванне і абарону маёмасці. Пры аб'яднаннях, напрыклад Пінскім прафесійным таварыстве, існавала ашчадная каса і "весьма порядочная библиотека" [54, арк. 3]. Час ад часу таварыствы ўзаемадапамогі арганізоўвалі для сваіх членаў публічныя курсы чытанняў, займаліся, такім чынам, яшчэ і асветніцкай дзейнасцю.

Рэпазіторый ВГУ

**Таварыствы, заснаваныя на адзінстве прафесійных або аматарскіх інтарэсаў**

Яшчэ адзін тып грамадскіх аб'яднанняў, якія існавалі ў гарадах Беларусных або аматарскіх інтарэсаў. Самым старэйшым з іх было Віленскае медыцынскае таварыства, створанае пры Віленскім універсітэце ў 1805 г. і ўяўляла сабой тып навукова-грамадскай арганізацыі. Яно аб'ядноўвала выкладчыкаў універсітэта і медыкаў-практыкаў не толькі з Вільні, але і з іншых гарадоў Беларусі ды Літвы і праіснавала да 1939 годзе. У 1886 г. узнікла Мінскае медыцынскае таварыства, якое, як і Віленскае, выдавала свой часопіс. У 1903 годзе ўзнікла Брэсцкае таварыства ўрачоў, якое аб'ядноўвала 28 чалавек. Адным з напрамкаў дзейнасці гэтага таварыства было наладжванне публічных чытанняў, выданне папулярных твораў для распаўсюджання ў народзе ведаў па праблемах агульнай і асабістай гігіены.

У чэрвені 1898 года Брэсцкі павятовы прадвадзіцель дваранства піша да яго правасхадзіцельства Бацюшкава Д.М. аб адкрыцці ў г. Брэсце клуба пажарнага таварыства.

Згодна вопісаў за 1906–1917 гады па Мінскай і Віцебскай губернях мы бачым вялікую колькасць прафесійных аб'яднанняў, напрыклад: Прафесійнае таварыства фармацэўтаў г. Мінска, Нясвіжскае прафесійнае таварыства будаўнічых рамеснікаў "Культура" (1907–1915 гг.), Пінскае прафесійнае таварыства прыказчыкаў і канторшчыкаў, Віцебскае таварыства хатняй прыслугі (1906) і інш. Прафесійныя таварыствы маюць на мэце: а) высвятленне і абарону эканамічных і прававых інтарэсаў сваіх членаў і паляпшэнне ўмоў іх працы; б) садзейнічанне разумоваму, прафесійнаму і культурна-маральнаму іх развіццю; в) матэрыяльную падтрымку сваіх членаў [54, арк. 3]. Згодна з Часовымі правіламі (1906 г.) прафесійныя таварыствы маюць права ладзіць курсы і чытанні толькі прафесійнага характару.

23 студзеня 1902 года адкрыты гурток фатографаў у Віцебску, у якім на 1904 годзе ўжо налічвалася 41 чалавек [14, арк. 21].

Вялікае распаўсюджванне атрымалі сельскагаспадарчыя таварыствы, у склад якіх уваходзілі пераважна памешчыкі і заможныя сяляне. Яны праводзілі выстаўкі пародзістай жывёлы і сельгаспрадукцыі, абменьваліся агранамічнымі навыкамі. У Вільні такое таварыства было адкрыта ў 1899 годзе. Статут Віцебскага таварыства сельскіх гаспадароў быў зацверджаны 2 чэрвеня 1895 года. Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі налічвала 140 чалавек [43, арк. 82–95]. Таварыства складалася з аддзелаў па садаводстве, агародніцтве, пчалярстве, жывёлагадоўлі, вінакурэнні, конегадоўлі, а таксама з агранамічнага і ляснога аддзяленняў.

Рэпазіторый ВДУ

У 1877 годзе гурток ідэйных інтэлігентных памешчыкаў Магілёўскай губерні, якія мелі цікавасць да садаводства і да культурных прыёмаў яго вядзення, заснаваў сельскагаспадарчае таварыства, пры якім у 1900 годзе была арганізавана “Школа садовых рабочых”. Дзякуючы гэтаму сярод беларускіх памешчыкаў з’явіліся вучоныя-садаводы і “садовыя рабочыя” – практыкі сярод сялян [72, с. 10]. Так Быхаўскае таварыства сельскай гаспадаркі ўзнікла ў 1908 г. і аб’ядноўвала 100 дробных землеўладальнікаў і сялян [15, с. 15].

Менавіта ў канцы XIX стагоддзя сельскагаспадарчымі таварыствамі пачынаюць актыўна падтрымлівацца і развівацца традыцыі народных рамёстваў, асабліва ткацтва. З іх дапамогай у вёсцы адбываецца распаўсюджванне новых ткацкіх тэхнік і тэхналогій. Такія школы-майстэрні былі адчынены ў Клецку і Койданаве Мінскай губерні, у м. Барок Дзвінскага павета, ткацкія майстэрні пры Слуцкім аддзяленні Мінскага сельскагаспадарчага таварыства, у м. Брамчыцы і Каты Мінскай губерні, у Дзісне Віцебскай губерні і інш.

Папулярызацыі народнага ткацтва спрыялі розныя выставы, пераважна сельскагаспадарчага накірунку, якія звычайна дэманстравалі вырабы саматужнікаў і рамеснікаў. Шэраг выстаў быў арганізаваны ў гарадах Беларусі ў пачатку XX стагоддзя, прычым найбольш багатыя і змястоўныя раздзелы складала ткацтва. Магчыма, што ўзоры ткацтва было лягчэй збіраць, а з другога боку, арганізатараў выстаў несумненна вабіла яркая дэкаратыўнасць ткацкіх вырабаў у параўнанні, напрыклад, з драўлянымі або ганчарнымі вырабамі. Інфармацыя з такіх выстаў нязменна ўтрымлівала словы захаплення гэтым відам народнага мастацтва.

Асабліва багата і разнастайна было прадстаўлена беларускае ткацтва на саматужна-прамысловай выставе ў Вільні (1911 год) і II Усерасійскай саматужнай выставе ў Пецярбургу ў 1913 годзе. Тут дэманстраваліся сотні ўзораў адзення, разнастайных дэкаратыўных і абрадавых тканін з Вілейскага, Ашмянскага, Лідскага, Дзісненскага і іншых паветаў Паўночна-Заходняй Беларусі. Багатыя традыцыі ткацтва і вышыўкі, іх шырокае распаўсюджванне сталі асновай для арганізацыі мастацкіх промыслаў у канцы XX стагоддзя.

У пачатку XX стагоддзя побач з сельскагаспадарчымі таварыствамі атрымалі сваё развіццё і “Таварыствы дапамогі хатнім рамёствам і народным промыслам”. Напрыклад, у Варшаве такое таварыства ўпершыню было створана ў 1907 годзе, у Вільні – у 1912 годзе, у Брэсце – у 1924 годзе, а ў Навагрудку арганізавана “Рамесніцкая хата” або “Дом рамёстваў”. “Таварыствы дапамогі хатнім рамёствам і народным промыслам” ставілі на мэце вырашэнне не толькі культурна-прапагандысцкіх, але і гаспадарчых задач.



Репозиторий ВГУ

Заўважым, што найбольшую ўвагу гэтыя таварыствы надавалі развіццю ганчарнага майстэрства. З гэтай мэтай яны арганізоўвалі заняткі ў зімовыя месяцы, імкнуліся да рацыянальнага выкарыстання мясцовай сыравіны, навучалі ганчароў прагрэсіўным дасягненням у галіне керамічнай вытворчасці, аказвалі дапамогу ў збыце вырабаў. У 1920-я гады гэтымі таварыствамі была арганізавана выстава ў Брэсце, у 1929 годзе – у Познані, дзе высокую ацэнку атрымаў белагліняны посуд з Агароднай і "чорналешчаныя сівакі" з Міру і Івянца [93, с. 738].

Камісія па кераміцы Варшаўскага таварыства арганізоўвала пастаянныя курсы для ганчароў, якія пражывалі на тэрыторыі Польшчы і Заходняй Беларусі, якая на той перыяд таксама адносілася да польскіх земляў (да 1939 года). Іх навучалі навыкам абпалу вырабаў, нанясенню палівы і дэкарыраванню. Аднак, магчымасці гэтых курсаў былі абмежаваны: на іх навучаліся толькі некалькі беларускіх ганчароў. Больш прадуктыўнай была арганізацыя курсаў на месцах, у буйных ганчарных цэнтрах, дзе можна было ахапіць найбольшую колькасць майстроў. Так, у 1924 годзе Віленскае таварыства правяло ганчарныя курсы ў Крэве, у 1926 – у Ракаве і ў 1937 годзе – у Маладзечна.

У 1840–1850-я гады сярод шматлікага кола мясцовай інтэлігенцыі ўзнікла цікавасць да вывучэння фальклору і побыту карэннага насельніцтва і гісторыі Беларусі. Дзеячы літаратуры і мастацтва групаваліся вакол гурткоў А. Кіркора ў Вільні, В. Дуніна-Марцінкевіча ў Мінску і А. Вярыгі-Дарэўскага ў Віцебску. Менавіта ў гэтых гуртках была закладзена аснова для развіцця беларускай мастацкай культуры.

Асноўным заняткам гурткоў інтэлігенцыі былі духоўныя зносіны, якія выяўляліся ў форме гутарак, спрэчак. Хатнія гурткі былі больш лакальнымі, чым клубы, пастаянны склад іх удзельнікаў напаўняў сустрэчы цёплым духам сяброўства. Нефармальнасць, неафіцыйнасць як асноўная прыкмета такіх гурткоў дапамагала ў стварэнні сяброўскай атмасферы.

Пад уплывам грамадска-дэмакратычных рухаў канца XIX – пачатку XX стагоддзя ліберальныя і дэмакратычна настроеныя колы інтэлігенцыі пачалі ствараць разнастайныя культурна-асветніцкія і навуковыя таварыствы.

22 лістапада 1912 года ў г. Брэсце па вуліцы Мядовай–вугал Збірагоўскай быў адкрыты брэст-літоўскі гурток "Дасуг" для асоб інтэлігентных прафесій [9]. Які аб'ядноўваў урачоў, юрыстаў, інжынераў, настаўнікаў, архітэктараў, артыстаў, літаратараў. Членскі ўзнос складаў 10 руб. у год. Існаваў яшчэ дадатковы "бібліятэчны" узнос – 1 руб., на які куплялі літаратуру для бібліятэкі клуба. Вялікая ўвага надавалася падтрымцы небагатай, але таленавітай моладзі, якая атрымлівала вышэйшую адукацыю, дзякуючы грашовым стыпендыям



Репозиторий ВГУ

ад клуба. Галоўнымі формамі яго работы былі семінары, гутаркі, музычныя і сямейныя вечары. Уваход на іх для гасцей быў платны – 25 кап., плата за гульню ў більярд – 30 кап. у час, плата за гульню ў карты – 2 руб. і дзве свечкі, але нягледзячы на гэта дзейнасць клуба карысталася вялікай папулярнасцю ў гарадской інтэлігенцыі.

У пэўнай ступені прафесійным аб'яднаннем можна лічыць і жаночыя клубы, напрыклад, клуб, адкрыты 28 кастрычніка 1909 года ў Віцебску [11]. Заснавальнікі жаночага клуба – жонка прысяжнага паверанага М.І. Шулепнікова, жонка дантыста К.І. Коган, жонка лекара Ж.М. Ідэльсон, жонка прысяжнага паверанага В.С. Држэвінская паказваюць, што статут Віцебскага жаночага клуба складзены па ўзоры Маскоўскага жаночага клуба зацверджанага 11 студзеня 1907 г.

Мэта клуба – садзейнічаць адносінам сваіх членаў як на глебе сумеснага вывучэння пытання аб раўнапраўі жанчын, так і наогул ўзаемнага разумовага, палітычнага і маральнага развіцця, шляхам арганізацыі дакладаў, чытанняў, гутарак і разумных забаў. Пры яго праўленні працавалі пастаянныя камісіі: бібліятэчная, дзіцячых забаў, гаспадарчая. Клуб арганізоўваў лекцыі, даклады, гутаркі, а па нядзелях – навукова-папулярныя чытанні і літаратурна-музычныя вечары. Прыём у члены клуба адбываўся па рэкамендацыі 5 членаў і аднагалосна абранай адкрытай балятыроўкай. Арганізацыйны ўзнос складаў 5 рублёў (бедныя асобы маглі быць па пастанове праўлення клуба вызвалены ад выплаты ўзносу, або плаціць узнос з растэрміноўкай). Уваходная плата для гасцей складала 10 кап. Па чацвяргах адбываліся "чаепития", на якіх прысутныя вялі гутаркі на літаратурныя, грамадскія, культурныя і педагагічныя тэмы. Устройвалі так званыя "падпісныя вечары", камерныя канцэрты, дзіцячыя ранішнікі і ёлкі. Жаночы клуб быў адчынены з 12 дня да 2-х гадзін ночы.

Члены камісіі жаночага клуба па арганізацыі дзіцячых забаў імкнуліся да таго, каб дзяўчынкі і хлопчыкі найбольш плённа і з карысцю для развіцця сваёй асобы праводзілі вольны час. Работа з дзецьмі вялася дэферэнцыравана, з улікам узросту і іх здольнасцей. Малодшыя займаліся 1 раз у 2 тыдні па нядзелях, а старэйшыя – кожную суботу. У клубе іх навучалі пляценню кошыкаў, разьбе па дрэве, пераплётнай справе, лепцы з гліны, спевам і маляванню. Акрамя гэтага праводзіліся розныя рухавыя гульні, наладжваліся экскурсіі. Пры клубе была бібліятэка.

У 1907–1914 гг. у Гродне дзейнічала педагагічнае таварыства.

**Таварыствы і аб'яднанні клубнага тыпу па інтарэсах**

Культурныя ініцыятывы атрымалі магчымасць інтэнсіўна рэалізоўваць свой патэнцыял у сацыяльна-культурнай практыцы і



Репозиторий ВГУ

садзейнічалі з’яўленню шматлікіх клубаў па інтарэсах. Пачатак XX стагоддзя вызначыўся захапленнем маладых гараджан веласпортам і футболам, а ў гарадах пачалі ствараціца гурткі і таварыствы аматараў гэтых відаў спорту. Напрыклад, у 1894 годзе было створана Дзвінскае таварыства веласіпедыстаў. У Гомелі ў 1909 годзе ўзніклі 2 гурткі (каманды): “Спорт” і “Надзея”. У 1910 годзе ў Гомелі іх было 10, а ў Беліцы – 4, налічваючы наогул каля 300 чалавек. Мінскае таварыства аматараў спорту, якое ўзнікла ў 1895 годзе, займалася добраўпарадкаваннем велатрэка і спартыўнага павільёна, арганізацыяй дзіцячых спартыўных гульняў, спаборніцтваў па гімнастыцы і веласпорту, наладжвала калектыўныя выезды за горад. У 1899 г. таварыства налічвала 196 чалавек. 9 ліпеня 1914 года ў г. Гродна быў зарэгістраваны рачны яхт-клуб, мэтай якога было развіццё ўсіх відаў воднага спорту і садзейнічанне памяншэнню няшчасных выпадкаў на вадзе. Для забаўлення сваіх членаў і гасцей яхт-клуб праводзіў сямейныя вечары, канцэрты, спектаклі і іншыя відовішчы. У члены яхт-клуба прымаліся асобы мужчынскага полу ўсіх саслоўяў і нацыянальнасцей. Узначальваў гэта аб’яднанне камандор. Пры клубе працаваў буфет і дапускаліся ўсе дазволеныя гульні [79, арк. 5–11].

У канцы XIX стагоддзя ў гарадах вялікую папулярнасць атрымалі аматарскія літаратурныя, музычныя, драматычныя таварыствы, якія ўзнікалі не толькі ў губернскіх гарадах Расіі і Паўночна-Заходняга краю, але і ў невялікіх павятовых гарадках. Яны наладжвалі публічныя лекцыі, канцэрты, музычныя вечарыны, спектаклі па п’есах прагрэсіўных беларускіх, рускіх і замежных драматургаў.

Клубы дадзенага напрамку садзейнічалі фарміраванню забаўляльнай культуры сваіх членаў, а таксама аказвалі вялікі ўплыў на станаўленне і развіццё культурных традыцый рэгіёнаў, дзе яны функцыянавалі. Сацыяльная і культурная значнасць клубаў вызначалася грамадскімі інтарэсамі. Клубы спачатку стваралі культурны асяродак сваіх членаў, а потым прадуктыўна аказвалі ўплыў на фарміраванне культурнага макраасяродку ў грамадстве, што ўвачавідку бачна з клубных статутаў.

Папулярнасцю карысталіся і аркестры чыноўнікаў, у склад якіх уваходзілі пераважна 5–6 інструментаў. Вядомыя, напрыклад, віцебскія аркестры пад кіраўніцтвам братоў Д. і С. Шароўскіх, братоў Целіца і іншых. Акрамя аркестраў выступалі і асобныя чыноўнікі – аматары музыкі – гітарысты, флейтысты, выканаўцы музыкі на раялі і інш. Аматарскія хары з чыноўнікаў выступалі ў сваіх прыхадскіх цэрквах, а тыя, хто быў больш здатным да вакальных спеваў, станавіліся рэгентамі ў тых жа цэрквах. Прычым усе гэтыя канцэрты і выступленні ладзіліся на дабрачыннай аснове, без усялякай

Репозиторий ВГУ

матэрыяльнай карысці [51, с. 116]. У тым жа Віцебску ў 1878 годзе па ініцыятыве мясцовых чыноўнікаў было закладзена Таварыства аматараў тэатральнага мастацтва, а ў 1883 – Таварыства аматараў музычнага і драматычнага мастацтваў. З 1906 па 1914 гг. у Віцебску існаваў музычна-драматычны гурток. Яго мэта – садзейнічаць развіццю ў горадзе музычнага і драматычнага мастацтва. Сярод арганізатараў быў вядомы кампазітар і педагог М. Анцаў. Гурток аб'ядноўваў 150 прадстаўнікоў мясцовай інтэлегенцыі (старшыня М. Штэйнберг). У кожным сезоне з кастрычніка да мая праводзілася 20–30 музычных і тэатральных вечароў, большасць з якіх былі праграмнымі. Мерапрыемствы гуртка карысталіся папулярнасцю ў жыхароў горада. Музычная секцыя ў сваім складзе мела квартэт і сімфанічны аркестр (кіраўнік М. Лерман). Асноўнымі формамі дзейнасці Гомельскага музычна-драматычнага таварыства (1906–1914 гг.) з'яўляюцца літаратурныя лекцыі, дыспуты, сходы аматараў. У 1880 годзе ў Мінску створана музычнае таварыства, якое ставіла на мэце распаўсюджванне музычнай адукацыі і развіцця ўсіх галін музычнага мастацтва, арганізацыю дабрачынных канцэртаў з мэтай аказання матэрыяльнай дапамогі музыкантам, якія жылі ў нястачы, і прызначэнне стыпендыі маладым таленавітым музыкантам. Узнос складаў 5 руб. У 1883 г. членамі таварыства былі 215 чалавек [8, с. 24]. Літаратурна-музычнае аб'яднанне працавала і ў г. Гродна. Створанае ў 1883 годзе сваёй мэтай мела вывучэнне твораў лепшых кампазітараў як свецкіх, так і духоўных; садзейнічаць развіццю нацыянальнай музыкі; знаёмства з творамі літаратуры і прыгожага пісьменства. Удзельнікі аб'яднання збіраліся два разы на тыдзень у вызначаныя дні для спеваў і рэпетыцый. Акрамя літаратурна-музычнага аб'яднання ў г. Гродна з 1907 года дзейнічаў гурток аматараў ігры на мандалінах і гітарах, мэтай якога была арганізацыя і ўдасканаленне аркестравай гульні на ўдарных струнных інструментах. Членскія ўзносы складалі 1 руб. у год. З 1907 года ў Гродне таксама пачынае дзейнічаць і аб'яднанне драматычна-музычна-вакальнае, якое знаходзілася ў доме на Банкавай вуліцы. У 1908 годзе яно рэарганізуецца ў аб'яднанне аматараў драматычнага і музычнага мастацтваў “Муза” і аб'ядноўвае 129 аматараў. Паступова колькасць удзельнікаў павялічваецца і ў 1911 годзе складае 170 чалавек. Пры аб'яднанні працуе бібліятэка-чытальня, дзе спачатку налічвалася 616 кніг, а ў 1911 годзе кніжны фонд складаўся з 274 твораў навуковага зместу і 826 белістрычнага жанру. Асноўнымі відамі дзейнасці была арганізацыя аматарскіх спектакляў і правядзенне літаратурна-музычных і танцавальных вечароў [21, арк. 16]. У сакавіку 1884 года да пана гродзенскага губернатара звяртаецца з рапартам брэсцкі паліцмайстар з просьбай даць дазвол на зацвярджэнне ўстава

Рэпазіторый ВГУ

аматараў музыкі, спеваў і драматычнага мастацтва ў г. Брэсце, а сама ідэя зыходзіла ад камандзіра 2-й батарэі 16-й артэлерысцкай брыгады палкоўніка Фёдара Валюжэніча. У 1885 годзе брэст-літоўскае музычна-драматычнае аб'яднанне аматараў налічвала ў сваіх радах 71 удзельніка [45, арк. 33]. Літаратурна-драматычнае і музычнае аб'яднанне дзейнічае з лютага 1905 года і ў г. Слоніме, дзе штотыднёва праводзяцца сямейныя вечары, штогадовы членскі ўзнос складаў 3 рублі. У Бабруйску ў 1892 г. заснаваны музычна-драматычны гурток, галоўнай мэтай якога было эстэтычнае выхаванне дэмакратычных колаў насельніцтва, пашырэнне музычных ведаў, садзейнічанне развіццю аматарскага і прафесійнага мастацтва.

Вышэйшыя чыноўнікі з ахвотай наведвалі аматарскія спектаклі, што рэхам адгукнулася і ў дваранскіх клубах. Напрыклад, у Полацку ў канцы XIX стагоддзя ў Дваранскім клубе, які знаходзіўся на Невельскай вуліцы ў доме Кісіна, быў арганізаваны гурток аматараў драматычнага мастацтва. Удзельнікі тэатра займаліся непасрэдна пастаноўкай спектакляў.

Вялікую ролю ў развіцці беларускай культуры адыграла Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў, створанае ў Мінску ў 1899 годзе. У хуткім часе яно стала цэнтрам літаратурнага і тэатральна-музычнага жыцця горада. Яно ставіла на мэце спрыяць збліжэнню мясцовых дзеячаў, якія працавалі ў галіне прыгожых мастацтваў, дапамагаць жыхарам горада, якія жадалі ўдасканальвацца ў розных жанрах прыгожых мастацтваў, актывізаваць развіццё культуры насельніцтва. Таварыства мела 4 секцыі (літаратурную, драматычную, музычную і мастацкую), імкнучыся ахапіць асветнай дзейнасцю і працоўны народ. Літаратурная секцыя рэгулярна праводзіла нядзельныя чытанні, літаратурныя "серады" і гутаркі, папулярныя лекцыі па гісторыі і літаратуры. На яе пасяджэннях абмяркоўваліся творы вядомых пісьменнікаў, чыталіся рэфераты, выступалі вядомыя крытыкі. Музычная секцыя таварыства мела свой аркестр і арганізоўвала суботнія вечары з музычнымі і літаратурнымі аддзяленнямі, а з 1903 года ладзіла агульнадаступныя канцэрты, музычныя вечары, лекцыі аб жыцці і творчасці вялікіх кампазітараў і выканаўцаў. Пры садзейнічанні таварыства з канца XIX стагоддзя пачалі адчыняцца музычныя школы.

Не менш актыўна з 1899 г. працавала і драматычная секцыя таварыства аматараў прыгожых мастацтваў. Ёй кіравалі прафесійныя акцёры, а рэпертуар складаўся з лепшых твораў рускай і замежнай драматургіі (А. Астроўскі, А. Чэхаў, М. Горкі, К. Гучкоў, Г. Ібсен і інш.). Перад спектаклямі звычайна ладзіліся лекцыі на актуальныя тэмы, а з пачатку XX стагоддзя на сцэне таварыства адбываліся гастролі выдатных майстроў рускай сцэны і сусветна вядомых спевакоў.



Репозиторий ВГУ

Дзякуючы рабоце мастацкай студыі, якая працавала пад эгідай таго ж таварыства, у Мінску значна ажывілася дзейнасць выстаў. Толькі ў 1899 годзе адбыліся выставы майстроў-“перадзвіжнікаў” і экспазіцыя работ І.Я. Рэпіна. У 1901, 1902 і 1904 гг. побач з карцінамі рускіх мастакоў экспанаваліся і работы беларускіх майстроў пэндзаля Я. Кругера, Ф. Рушыца, Ю. Пэна, Я. Дамеля, І. Хруцкага, І. Трутнева і інш.

Не менш значнай падзеяй для абуджэння культурнага жыцця горада было стварэнне ў 1899 г. публічнай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна, асноўны фонд якой, дарэчы, быў сабраны на ўступныя ўзносы членаў таварыства. У 1908 г. яе кнігазбор налічваў 5272 асобнікі [1, с. 23].

7 студзеня 1902 года адкрыта Віцебскае таварыства прыгожых мастацтваў, у якім прымала ўдзел 60 чалавек [14, арк. 21].

**Дзейнасць культурна-асветных таварыстваў**

Дзейнасць культурна-асветных таварыстваў у мэтах “абароны” ўзнікнення і пашырэння на тэрыторыі Беларусі рэвалюцыйнага руху (асабліва ў 1905–1907 гг.) падвяргалася мэтанакіраванаму цэнтралізаванаму кантролю з боку царскага ўраду [55; 71].

Але, нягледзячы на абмежаванні, дзейнасць большасці беларускіх клубных фарміраванняў усё больш пачынала атрымліваць палітычны, рэвалюцыйна-вызваленчы напрамак. Па гэтай жа прычыне кіраўнікі дзяржавы, напалоханыя рэвалюцыйнымі падзеямі ў Расіі, пасля правядзення лекцыі, прысвечанай творчасці А.П. Чэхава, на якой прысутнічала больш за тысячу чалавек, прымусова спынілі работу Мінскага таварыства аматараў прыгожых мастацтваў (1906 г.). Аднак прагрэсіўная інтэлігенцыя горада хутка аднавіла яго работу пад назвай “Літаратурна-артыстычнае таварыства”, дзейнасць якога працягвала культурна-асветныя і рэвалюцыйныя традыцыі таварыства, створанага ў 1899 г. У культурна-асветніцкім клубе М. Міхайлоўскага ў Мінску на Койданаўскай, 19 адбылася музычна-ілюстратыўная лекцыя свабоднага мастака маскоўскай кансерваторыі Д. Строганава, на тэму “Руская вакальна-канцэртная музыка” [31, арк. 437]. У 1913 годзе было закрыта таварыства “Адукацыя” ў Віцебску па прычыне шкоднага напрамку дзейнасці [57, арк. 31]. З 1918 года існуе культурна-асветніцкі клуб Мінскага ўчастка службы цягі Лібава-Роменскай чыгуначнай дарогі. Клуб ставіў сваёй мэтай садзейнічаць падняццю культурна-асветніцкага ўзроўню і развіцця літаратурнай самасвядомасці сваіх членаў шляхам арганізацыі разумнага адпачынку. Арганізоўваў для сваіх членаў і іх гасцей лекцыі, літаратурныя чытанні, курсы і гутаркі па розных грамадска-культурных, літаратурна-асветніцкіх, эканамічных пытаннях, літаратурныя, музычныя, сямейныя вечары, святочныя ёлкі, спектаклі, прагулкі, агляды музеяў, гульні ў шашкі і шахматы. У памяшканні

Рэпазіторый ВДУ

клуба меліся бібліятэка і чытальня. Гульні ў карты і іншыя азартныя гульні забараняліся. Уступны ўзнос у памеры 1 рубель, членскі – штомесяц – 50 капеек.

У Віцебскай губерніі ў жніўні 1908 года дзейнічала 6 асветніцкіх таварыстваў [71, арк. 24–24 адв.]: у Віцебску – Віцебскі бацькоўскі гурток, Віцебскае таварыства па вывучэнню яўрэйскай гісторыі і літаратуры, Віцебскі аддзел таварыства аматараў яўрэйскай мовы, Дзвінскае таварыства распаўсюджвання прафесіянальнай і рамесленнай адукацыі сярод дзяцей яўрэяў г. Дзвінска, Дзвінскі педагагічны гурток, Нямецкае літаратурнае таварыства ў г. Дзвінску і яго ваколіцах.

Гродзенскі гурток беларускай моладзі дзейнічаў у Гродне з верасня 1909 г. да вясны 1914 г. (кіраўнік Ф. Грынкевіч). Членамі гуртка пераважна былі вучні мясцовых школ, гімназій і падзяляліся на секцыі паводле ўзросту. Гурткоўцы наладжвалі вечарыны, на якіх заслухоўвалі рэфераты на тэмы беларусазнаўства, славянскай супольнасці, чыталі, абмяркоўвалі новыя творы беларускіх пісьменнікаў, а таксама творы саміх гурткоўцаў. На вечарынах выступалі створаныя ўласнымі сіламі струнны аркестр, хор, дуэты. Старэйшыя гурткоўцы праводзілі культурна-асветніцкую работу з дзецьмі, членамі малодшай секцыі. Члены гуртка беларускай моладзі наладжвалі святочныя ёлкі для вясковых дзяцей [23, с. 4].

Пад час Першай сусветнай вайны ў вялікіх і маленькіх гарадах на неакупаваных тэрыторыях Беларусі пачалі дзейнічаць розныя нацыянальныя па змесце і дзейнасці арганізацыі, у асноўным, культурна-асветніцкага напрамку. Маладая беларуская інтэлігенцыя аб’ядноўвалася ў таварыствы, клубы, гурткі. Асноўнымі цэнтрамі такіх згуртаванняў былі «беларускія хаткі». Як правіла, па суботах у іх адбываліся вечарыны, на якіх абмяркоўваліся палітычныя навіны і пытанні, разбіраліся і асэнсоўваліся нацыянальныя справы, арганізоўваліся спектаклі і іншыя культурна-асветныя мерапрыемствы.

Напрыклад, па сведчанні гісторыка М. Шчаўлінскага, у Мінску адным з такіх пунктаў, які аб’ядноўваў беларускіх пісьменнікаў, паэтаў і іншых культурных дзеячаў, была “Беларуская хатка”, створаная па ініцыятыве Мінскага аддзела “Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны”. У яе рабоце, таксама як і ў дзейнасці самога таварыства, бралі актыўны ўдзел М. Багдановіч, У. Фальскі, А. Смоліч, Л. Дубейкаўскі, З. Бядуля, Ядвігін Ш. (А. Лявіцкі), А. Паўловіч, Я. Лёсік, Ф. Шантыр, З. Верас (Л. Сівіцкая), В. Лявіцкая. У шматлікіх культурна-асветніцкіх мерапрыемствах, якія рыхтавала і праводзіла “Беларуская хатка” абмяркоўваліся вострыя сацыяльныя і актуальныя праблемы грамадскага і палітычнага жыцця беларускага народа [11, с. 161]. 21 верасня 1918 года ў “Беларускай хатцы”

Рэпазіторый ВДУ

адбыўся канцэрт 1-га беларускага нацыянальнага хора пад кіраўніцтвам В. Цераўскага. Збор грошай пайшоў на дапамогу дабрачынным установам [31, арк. 437].

У Рэжыцы ў лютым 1917 г. арганізуецца Рэжыцкі гісторыка-этнаграфічны гурток [73, арк. 10]. Яго мэтай выступае вывучэнне Віцебскай губерні па гістарычным, археалагічным, антраполага-этнаграфічным, натуральна-гістарычным, геаграфічным напрамках. Пры гуртку адкрыты свой публічны музей, бібліятэка. Гурткоўцы актыўна займаюцца экскурсійнай дзейнасцю.

**Дабрачынныя і апякунскія таварыствы**

Найбольш прэстыжным лічыўся ўдзел у філантрапічнай дзейнасці розных дабрачынных таварystваў і папячыцельстваў. Некаторыя з іх, напрыклад, “Таварыства імператрыцы Аляксандры Фёдараўны” і іншыя былі агульнарасійскімі і мелі філіі ў гарадах, а мясцовыя падраздзяляліся на губернскія, павятовыя і гарадскія. Сабраныя ад дзейнасці гэтага таварыства сродкі ішлі на дапамогу малазабяспечаным вучням гімназій, апекунства і выхаванне сірот, адкрыццё «дамоў працавітасці» на культурна-асветніцкія і забаўляльныя мерапрыемствы «для простага народа», якія заўсёды прымяркоўваліся да дат царкоўнага календара або найбольш значных падзей у жыцці грамадства.

Гродзенскае і Брэсцкае дабрачынныя таварыствы былі заснаваны пасля зацвярджэння Сенатам статута таварыстваў 17 снежня 1854 г., і ўяўлялі сабой установы сфармаваныя на аснове добраахвотнай дабрачыннай дзейнасці, але якія носяць афіцыйны характар. У аснове дзейнасці дабрачынных арганізацый ляжалі тры прынцыпы:

- самастойнасць мясцовых дабрачынных устаноў;
- прыцягненне да кіравання імі мясцовага насельніцтва;
- забеспячэнне грашовымі сродкамі.

Па статуце мэтай таварystваў з’яўляўся догляд людзей бедных, сірот і састарэлых. Грамадства распараджалася прытулкамі, багадзельнямі, сіроцкімі дамамі [2; 25].

Яшчэ ў першай палове XIX стагоддзя з мэтай даць біржаваму купецтву магчымасць збірацца для правядзення нарад па камерцыйных справах і правядзення часу ў бяседзе і гульні ў карты амаль ва ўсіх губернскіх гарадах былі заснаваны “Камерцыйныя таварыствы”. У гэтых таварыствах паступова склалася традыцыя правядзення “паркалёвых баляў”, якая захавалася аж да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Хутка такія балі набылі не толькі забаўляльную, але і дабрачынную мэту. Напрыклад, у маёнтку “Адамава” ў Старасельскай воласці Віцебскага павета купцы Б.І. Гершун і М.А. Бернштэйн 6 ліпеня 1910 года на карысць пагарэльцаў у Магілёве арганізавалі “паркалёвы баль”. У яго праграму ўваходзілі танцы ў суправаджэнні аркестра



Рэпазіторый ВДУ

ваеннай музыкі, канфеці і серпанцін, кветкі і “лятучая” пошта. Кошт квітка складаў 1 руб. 50 кап., з якіх 10 кап. – дабрачынны сбор. Чыстага даходу было атрымана 111 руб. 43 кап. [3, арк. 162–163].

25 ліпеня 1910 г. у памяшканні гарадской Ратушы г. Віцебска адбыўся дабрачынны танцавальны вечар, на карысць Віцебскага вольна-пажарнага таварыства, уваход каштаваў 55 капеек [59, арк. 48]. У гэты ж дзень у Гарадку ў памяшканні народнай чайной адбыўся спектакль на карысць бедных [59, арк. 75].

Часта дабрачынная дзейнасць насіла саслоўна-прафесійны характар, аб’ядноўвала прадстаўнікоў пэўнай прафесіі або нацыянальнасці, напрыклад, кушняроў, прыказчыкаў, шаўцоў, пажарнікаў і г.д. Працавалі таксама і яўрэйскія таварыствы, якія дапамагалі найбольш бедным сем’ям яўрэяў выдачай беспрацэнтных пазык або аднаразовых грашовых дапамог. Гэтыя таварыствы мелі спецыяльныя фонды для дабрачынных мэт. Што тычыцца Гродзненскага яўрэйскага дамскага аб’яднання “Дапамога падаючым” – “Сеймейх-Нейфлім”, то акрамя дапамогі бедным яўрэйскім сямействам яны яшчэ дапамагалі і парадзіхам [2].

Насельніцтва Беларусі заўсёды ўяўляла, у поўным сэнсе слова, «кангламерат» прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей. Таму амаль ва ўсіх буйных гарадах існавалі таксама клубы, якія аб’ядноўвалі людзей той ці іншай нацыянальнасці. У яўрэйскія клубы ўваходзілі пераважна людзі, якія былі прадстаўнікамі свайго роду “вышэйшага саслоўя” – крамнікі, карчмары і гандляры. Дарэчы, адным з напрамкаў іх дзейнасці быў збор сродкаў і аказанне дапамогі больш бедным яўрэйскім сем’ям. Яўрэйскія літаратурныя, музычна-артыстычныя таварыствы дзейнічалі амаль у кожным населеным пункце, дзе пражывалі прадстаўнікі гэтай нацыянальнасці. У Пінску, напрыклад, працавала яўрэйскае музычна-літаратурнае таварыства “Газамір”, а ў Нясвіжы – літаратурна-артыстычнае таварыства [66, арк. 4].

Асноўным месцам грамадскіх зносін яўрэяў-рамеснікаў былі сінагогі, якія ў нейкім сэнсе выконвалі ролю клубаў, прытым не толькі рэлігійных, але і прафесійных. Цікава, што ў многіх мястэчках Беларусі працавалі сінагогі гандляроў, краўцоў, шаўцоў і іншых прадстаўнікоў “нізкіх” прафесій, куды ніколі не заходзілі прадстаўнікі “вышэйшых” прафесій – крамнікі, карчмары, якія ўяўлялі своеасаблівую яўрэйскую шляхту. Там даведваліся пра гарадскія навіны, абменьваліся думкамі, прадказвалі змяненне цэн на рыначныя тавары, заключалі гандлёвыя здзелкі.

У Віцебску прадстаўнікі латышскай нацыянальнасці таксама стварылі свой клуб, дзе для правядзення розных асветных і культурных мерапрыемстваў збіраліся латышы. Не выключэннем была і дзейнасць польскіх клубаў і таварыстваў. Напрыклад, у

Рэпазіторый ВДУ

Нясвіжы працаваў грамадскі сход “Агніска”. На 1 студзеня 1910 г. “Агніска” налічвала 170 чалавек, у склад сходу ўваходзяць князі Радзівілы Альберт, Карл, княгіня Мар’я. Ініцыятарам стварэння сходу быў лекар калежскі асэсар Ф.Л. Бароўскі. Асноўная мэта дзейнасці гуртка – прывіць насельніцтву цвярозыя погляды на падзеі грамадскага і дзяржаўнага жыцця, стварыць дзейнасцю гуртка процівагу мясцовай падпольнай агітацыі супрацьурадавых партый, як арганізацыя “Бунда” і іншыя, праводзіць ідэі яднання ўсіх славянскіх народнасцей [50, арк. 71, адв., 72]. Нацыянальныя аб’яднанні фармаваліся з разнастайных груп насельніцтва і сумяшчалі ў сваіх аб’яднаннях функцыі духоўных зносін і дабрачыннасці.

На тэрыторыі Беларусі ў пэўны час пры цэрквах дзейнічаюць рэлігійныя брацтвы, такія як, напрыклад, – Віцебскае праваслаўнае Брацтва імя св. Роўнаапостальнага князя Уладзіміра, якое дзейнічае на аснове Статута зацверджанага 3 верасня 1887 г. Згодна з параграфам 30 статута Брацтва, кіраванне справамі пад кіраўніцтвам Яго Праасвяшчэнства належыць: а) агульнаму сходу членаў пад старшынствам Яго Праасвяшчэнства і б) Савету Брацтва, які складаецца – пад старшынствам Рэктара Віцебскай духоўнай семінарыі – з сямі членаў, якія выбіраюцца на тры гады агульным сходам [55, арк. 16–17]. А ў горадзе Лепелі Віцебскай губерні дзейнічала ўезднае аддзяленне гэтага брацтва. Аб’яднанні такога накірунку ставілі на мэце асвету і рэлігійна-маральнае выхаванне народных мас.

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што прафесійныя, дабрачынныя, спажывецкія і іншыя аб’яднанні ў вольны час задавальнялі патрэбу ў нефармальных зносінах, стваралі ўражанне сацыяльнай роўнасці ўдзельнікаў аб’яднання, што было значным ва ўмовах саслоўнага падзелу грамадства. Большасць разгледжаных намі грамадстваў узнікалі як вынік ініцыятывы знізу, без умяшання мясцовых улад, аднак пры іх поўнай падтрымцы. Сведчанні аб датацыях з боку ўлад сустракаюцца рэдка і носяць адзінкавы характар, накіраваны на праекты, якія мелі гамадскую значнасць. Яскравым прыкладам гэтага з’яўляецца тое, што многія арганізацыі знікалі, каб саступіць новым, або, праз некаторы час, узнікнуць зноў. Усё вышэй азначанае паказвае, што кожнае з разгледжаных аб’яднанняў мела па прыродзе натуральнае паходжанне. Аднак уплыў дзяржавы на грамадскае жыццё быў надзвычай моцны. Гэта праяўлялася не толькі ў праследаванні і прафілактыцы ніякага іншадумства, але і ў патрабаваннях самадзяржаўнага патрыятызму, і ўкараненні формаў грамадскага жыцця, якое прапаноўвала дзяржава. Нельга забываць аб тым, што розныя сацыяльныя слаі гарадскога насельніцтва былі прыцягнены да дзейнасці самадзейных грамадскіх арганізацый вельмі неаднолькава. Відавочнай была патрэба ў агульнагарадскіх

Репозиторий ВГУ

ўсесаслоўных аб’яднаннях. Але існуючы саслоўны лад і нізкі ўзровень жыцця асноўнай масы насельніцтва з’яўляліся моцнай перашкодай для ўключэння шырокіх слаёў насельніцтва ў грамадскае жыццё.

## 2.3. Чайныя і народныя дамы як цэнтры сацыяльна-педагагічнай работы на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя. Станаўленне сеткі пазашкольных адукацыйных устаноў

Напрыканцы XIX стагоддзя ў своеасаблівую культурна-асветную дзейнасць уключаюцца таварыствы народнай цвярозасці, якія пачалі сваю работу з 1 ліпеня 1897 г., калі ў беларускіх губернях быў уведзены казённы продаж напояў.

Для гараджан простага саслоўя, дарэчы, як і для сялян, апроч традыцыйных кірмашоў, святаў і абрадаў, як трапна заўважыў А. Кіркор, “карчма складала і клуб і раўт” [24, с. 25]. Карчма была месцам сустрэч і нефармальных зносін. Напрыклад, у Віцебску ў 1825 годзе працавала 8 корчмаў, 150 шынкоў на 16,9 тысяч жыхароў [64].

У карчме пасля працоўнага дня збіраліся навакольныя жыхары, але цягнула іх туды не столькі выпіўка, колькі магчымасць даведацца пра мясцовыя і сусветныя навіны, паразмаўляць, падзяліцца вопытам вядзення гаспадаркі і г.д. Для народа большасць устаноў гэтага тыпу ўяўлялі сабой нешта накшталт “народнага клуба”, дзе акрамя выпіўкі, гульні ў більярд або ў карты па выхадных днях ладзіліся танцы. На вялікія святы ў карчму ішлі ўсе ад мала да вяліка, у хатах заставаліся толькі старыя, нават 5-гадовых дзяцей бацькі бралі з сабой. Як пра гэта піша этнограф П.В. Шэйн “…пасля заканчэння абедні дзясяткі саней пад’язджаюць да карчмы і дзясяткі пешаходаў разам з прыезджымі ўвальваюцца ў яе абагрэцца… Колькасць гасцей павялічваецца, уваходзіць і “блазнота”, гэта значыць халастыя маладыя хлопцы і дзяўчаты, і пад вечар плошча перад карчмой уяўляе сабой ужо базар, а ў карчме – адзін беспярапынны і цяжкі гул…” [90, с. 109]. Некаторыя гарадскія тракціры падымаліся да ўзроўню своеасаблівых саслоўна-прафесійных клубаў і мелі пастаянных наведвальнікаў. З развіццём капіталістычных адносін беларуская карчма страчвала свой традыцыйны характар, набываючы значэнне піцейнай установы.

Таварыствы народнай цвярозасці ажыццяўлялі нагляд за продажам спіртных напояў. Гэтыя аб’яднанні ставілі сваёй мэтай асвету і маральнае выхаванне народных мас. Яны распаўсюджвалі спецыяльную літаратуру, праводзілі гутаркі – народныя чытанні аб шкодзе алкагалізму, спрыялі адкрыццю чытальняў, бібліятэк, Народных дамоў, што з’яўлялася значным праяўленнем педагагічнай арганізацыі забаў з боку царскай улады і кіравання на месцах.

Рэпазіторый ВДУ

Камітэтамі папячыцельства аб народнай цвярозасці ўсё шырэй прызнаецца мэтазгоднаць дзейнасці чайных як месца грамадскага збору. Для іх узводзілі асобныя будынкі, як напрыклад, у г. Дзвінску (сучасны г. Даўгапілс, Латвія), або прыстасоўвалі памяшканні. Напрыклад, Заслаўскім камітэтам 1 студзеня 1900 года ў сяле Вялікія Пупыркі Мінскай воласці ў памяшканні, якое было бескарысна аддадзена прадстаўленым мясцовым прычтам, была адчынена чайная-чытальня [88, арк. 25].

1 жніўня 1899 года ў памяшканні другой чайной, якая знаходзілася на Занёманскім фарштаце г. Гродна, папячыцельствам аб народнай цвярозасці быў праведзены народны танцавальны вечар, на які дапускаліся асобы абодвух палоў усіх класаў грамадства. На вечары іграў ваенны аркестр, плата за ўваход з улікам дабрачыннага збору складала 15 капеек [76, с. 13]. Праз месяц, 5 верасня 1899 г., папячыцельства аб народнай цвярозасці г. Гродна арганізавала літаратурна-танцавальны вечар ужо ў першай чайной. На вечар сабралася 137 чалавек: салдаты, пакаёўкі, кухаркі, сямейныя ўнтэр-афіцэры, чыноўнікі, а таксама начальнік гродзенскай паштова-тэлеграфічнай акругі, сапраўдны стацкі саветнік з жонкай, натарыус, жонка інжынера шляхоў зносін і г.д. Вечар пачаўся лекцыяй з ілюстрацыямі пры дапамозе праекцыйнага ліхтара [34, с. 4].

У 1899 годзе ў гарадах Беларусі шырока адзначалася стагоддзе з дня нараджэння А.С. Пушкіна. З гэтай нагоды лекцыі-чытанні былі арганізаваны ў Гродне [26, с. 3]. На станцыі Картуз-Бяроза адбыўся літаратурна-вакальны вечар, дзе сабралася больш 300 чалавек, у тым ліку шмат сялян з навакольных вёсак. На ім была прачытана біяграфія Пушкіна, выканана больш 20 песень, вершы, маналогі і ўрыўкі з яго твораў. У антрактах іграў аркестр [35, с. 3]. Народныя чытанні на тэмы аб узнікненні хрысціянства на Русі і смутных часах сабралі ў мястэчку Індуры каля 400 чалавек: праваслаўных, яўрэяў, дарослых і дзяцей, мужчын і жанчын [46, с. 4].

Віцебскі губернатар Чапялеўскі неабходнай умовай паспяховай дзейнасці чайных лічыў неабходным набліжэнне формаў работы чайных да дзейнасці народных клубаў. Для гэтага "... пры чайных, дзе па мясцовых умовах не могуць быць створаны бібліятэкі і чытальні, неабходна арганізаваць карцінныя насценныя бібліятэкі; завесіць сцены карцінамі і даведачнымі аб'явамі. Усе гэтыя насценныя выданні могуць пасля пэўнага часу перавозіцца з адной чайной да другой, і такім чынам, для наведвальнікаў кожнай чайной будзе пастаянна новы матэрыял для чытання і агляду. Пажадана арганізацыя ў чайных танцаў, вечароў, ёлак, розных гульняў" [88, арк. 35 а].

Кіраванне чайнымі, бібліятэкамі, чытальнямі віцебскі губернатар лічыў найбольш мэтазгодным ускладаць на найбольш

інтэлігентных дам, якія, па ягоназіраннях, сталі дастаткова карыснымі кіраўнікамі гэтага роду ўстаноў [88, арк. 31]. Народныя чытанні арганізоўвалі з 1 кастрычніка да 1 мая па нядзелях і царскіх днях у чайных, народных вучылішчах, валасных управах, вёсках, і памагчымасці, у маёнтках. Асноўнымі тэмамі для чытанняў былі: рэлігійна-духоўная, па гісторыі Расіі, па прыродазнаўстве, па геаграфіі, па сельскай гаспадарцы, па творах рускіх класікаў (А.С. Пушкін, М.В. Гогаль і іншыя). Чытанні для народа праводзіліся бясплатна, усе расходы па іх арганізацыі камітэт прымаў на свой кошт. У кожны павет паступала па тры тэмы і праз тры тыдні яны перадаваліся ў суседні раён, такім чынам за сем месяцаў усе тэмы абыходзілі ўвесь уезд. Часта лекцыі “разбаўляліся” харавымі спевамі і дэкламацыяй вершаў і прозы. Напрыклад, у Рэжыцкай чайной артыстам Ліпаўскім быў дадзены літаратурна-гумарыстычны вечар, які прынёс 24 руб. 70 кап. чыстага даходу [88, арк. 36]. У Віцебску папячыцельства аб народнай цвярозасці наладжвала народныя балі з танцамі і музыкай, якія карысталіся вялікай папулярнасцю як у гарадской моладзі, так і ў юнакоў і дзяўчат з прыгарадных вёсак. Летам у святочныя дні віцебскае папячыцельства арганізоўвала на Юр’евай горцы народныя гулянні, якія збіралі тысячы гараджан. Праграма гэтых гульняў уключала танцы пад аркестр і грамафоны, выступленні народнага хору, куплетыстаў і апавядальнікаў, феерверкі і г.д. У час гуляння народная чайная бойка гандлявала квасам, прахаладжальнымі напоямі, таннымі закускамі [48, с. 7].

Грунтуючыся на дадзеных Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Беларусі, можна гаварыць аб тым, што губернскія камітэты клапаціліся і аб матэрыяльным забеспячэнні арганізацыі і правядзення забаўляльных мерапрыемстваў для жыхароў горада, раёна і вёскі. Напрыклад, Мінскім губернскім камітэтам у 1899 годзе было пералічана 10 руб. 75 кап. на набыццё спецыяльных сродкаў для ўездных камітэтаў. З гэтых сродкаў на набыццё 7 чароўных ліхтароў было выдзелена 1 руб. 50 кап.; на ўзнагароджанне кіраўніка харавых спеваў – 9 руб. 25 кап. Між асобнымі ўезднымі камітэтамі грошы раздзелены наступным чынам: Бабруйскаму – 565 руб.; Барысаўскаму – 485 руб.; Ігуменскаму – 1 015 руб.; Мінскаму – 1 235 руб.; Мазырскаму – 560 руб.; Навагрудскаму – 2 555 руб.; Пінскаму – 1 202 руб.; Слуцкаму – 484 руб. У сваю чаргу, Ігуменскім уезным камітэтам на выпіску карцін і брашур для чытанняў ў бібліятэкахчытальнях было выдзелена: Бярэзінскай – 200 руб., Смілавічскай – 200 руб., Якшыцкай – 50 руб. Для арганізацыі чытанняў у Магілёве для набыцця “чароўных ліхтароў” і карцін да іх выдзелена 1 000 руб., а на падтрымку народнага хору – 280 руб. [88, арк. 36].



Рэпазіторый ВДУ

У распаражэнне Аршанскага камітэта землеўладальніцай Е.А. Азідавай былі перададзены ўсе яе прадпрыемствы ў мястэчку Любавічы, на сродкі з якіх утрымліваліся чайныя і праводзіліся народныя чытанні.

На першым плане пасля стварэння чайных паўстала праблема арганізацыі народных чытанняў, якія карысталіся вялікім поспехам сярод насельніцтва і, на думку папячыцельства, “служаць не толькі забавай для народа, але і спрыяюць пад’ёму разумовага і маральнага яго развіцця; пры гэтым пажадана арганізоўваць і спецыяльныя чытанні па пытанню аб шкодзе п’янства” [88, арк. 5].

У Рэжыцкім уездзе Віцебскай губерні камітэтам была арганізавана спецыяльная Рада з удзелам настаўніцкага персаналу па пытанні аб распаўсюджанні народных чытанняў у павеце. Яна распрацавала падрабязную праграму чытанняў “на пачатках узаемнага абмену тэмамі і карцінамі між 14 раёнамі, на якія з гэтай мэтай быў падзелены уезд, прычым лектарамі выступалі настаўнікі народных і царкоўнапрыходскіх школ” [88, арк. 31 а]. Па звестках Пінскага ўезду “народныя чытанні і гутаркі заўсёды прыцягваюць народу больш, чым дазваляе памяшканне, асабліва калі яны разбаўляюцца спевамі” [88, арк. 32 а]. Аднак пры некаторых чайных адчыненыя народныя бібліятэкі зусім не дзейнічалі, паколькі прадаўцы чаю лічылі іх прызначанымі для інтэлігенцыі і, каб “не гразнілі” падлогі ў чытальных пакоях, не пускалі туды мужыкоў і салдат [26, с. 3].

Значнае месца ў дзейнасці папячыцельстваў займае арганізацыя народных хароў, якія таксама карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Рэчыцкі і Слуцкі камітэты аддавалі перавагу не дарагім гарадскім харам, а арганізавалі цэлую сетку дробных хароў пры цэрквах і школах. На выдаткі па стварэнні хароў і на ўзнагароду выкладчыкаў спеваў і народных настаўнікаў, якія арганізоўвалі хары ў 1899 годзе, было ў агульнай колькасці асігнавана да 5 500 руб. [88, арк. 32 а].

Акрамя таго, у мэтах прадстаўлення народу магчымасці запоўніць вольны час, прадпісвалася ладзіць “танцавальныя вечары, ёлкі, гульні ў шашкі і іншыя забавы”. Вялікай папулярнасцю сярод народных мас карысталіся пераважна танцавальныя вечары, гулянні і тэатралізаваныя прадстаўленні.

Пры некаторых гарадскіх чайных-народных клубах ладзіліся бясплатныя кансультацыі для беднага люду па праваых і юрыдычных пытаннях [88, арк. 32 а].

Зразумела, што арганізаваць падобныя ўстановы магчыма было толькі там, дзе мелася для гэтага благадатная глеба з ліку мясцовых юрыстаў, а ініцыятыва ў першую чаргу павінна была зыходзіць ад папячыцельстваў.



Репозиторий ВГУ

Такім чынам, першым крокам, які прынялі царскія ўлады ў накірунку стварэння сеткі клубных устаноў для народа ў мэтах замены “дзікага разгулу неабходным духоўным пажыткам”, была менавіта арганізацыя і дзейнасць камітэтаў папячыцельстваў аб народнай цвярозасці, якія займаліся непасрэдна адкрыццём, дзейнасцю і матэрыяльным забеспячэннем чайных, бібліятэк, чытальняў і г.д. Другім значным крокам у напрамку да мэтанакіраванай арганізацыі і дзейнасці культурна-дасугавых устаноў для народа быў клопат аб пашырэнні агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню насельніцтва, што ў рэшце рэшт прывяло да ставарэння Народных дамоў.

У 1911 годзе Першы маскоўскі агульназемскі саюз па народнай асвеце закрануў пытанне аб пазашкольнай адукацыі і вынес пастанову: “Правільнае і паспяховае развіццё гаспадарчага і грамадскага жыцця магчыма толькі пры высокім культурным узроўні ўсяго насельніцтва. Школа, нават пры самай дасканалай яе арганізацыі і значнай працягласці курсу, не можа задавальняць запыты насельніцтва, якія павышаюцца..., так як яна абслугоўвае ў кожны момант параўнальна невялікую частку насельніцтва і пры гэтым яшчэ тую, якая не прымае актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, ... а атрыманыя ў школе веды без далейшага замацавання і папаўнення іх хутка забываюцца, у выніку чаго затраты на школьную адукацыю без арганізацыі пазашкольнай адукацыі з’яўляюцца малавытворчымі. У сувязі з гэтым пазашкольная адукацыя павінна заняць самастойнае месца ў шэрагу мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне культурнага ўзроўню насельніцтва і быць прызнанай з боку грамадскасці і дзяржавы, і ва ўсялякім выпадку, не менш каштоўнай, чым адукацыя школьная, і павіна быць прызнанай аднолькава неабходнай [16, с. 12].

Перад губернскімі і павятовымі ўправамі паўстала пытанне аб распрацоўцы мадэлі пазашкольных адукацыйных устаноў. “Складанасць задачы – ажыццяўленне пазашкольнай адукацыі – было абумоўлена markednoрознабаковасцю яе відаў, неабходнасцю захаваць між імі сувязь і ўзгадніць іх дзеянні, разлічыць па складу і памеры кола асоб, і ўвогуле, адрозненасць умоў і асаблівасцей работы ў гэтай справе” [22, с. 14].

У якасці прыкладу вырашэння праблемы стварэння сеткі пазашкольнай адукацыі і асветы разгледзім праект павятовай управы м. Быхаў Магілёўскай губерні, якая спраектавала для пазашкольнай адукацыі наступныя віды ўстаноў:

а) установы адукацыйнага тыпу:

1. Нядзельныя, або вячэрнія школы для дарослых і падлеткаў,

Репозиторий ВГУ

якія мелі на мэце вучыць непісьменных чытанню, пісьму і ліку, паўтараць і дапаўняць з дарослымі і падлеткамі, якія закончылі ў школе пройдзены курс з такім разлікам, што праз 2 гады школы будуць пераносіцца ў іншыя месцы.

2. Народныя чытанні, якія ілюстраваліся нагляднымі дапаможнікамі, светавымі карцінкамі, кінематографам, грамафонам і якія прымалі формы гутарак са слухачамі, асобных лекцый і цэлых курсаў.

3. Бібліятэка, якая адкрывала доступ да кнігі насельніцтву, якое атрымлівала магчымасць часова карыстацца ёю ў сябе дома, у чытальні, або набываць сабе ва ўласнасць.

4. Музеі і выставы, якія дасягалі адукацыйных мэт наглядным шляхам, пры дапамозе прадметаў, што ілюструюць розныя віды мастацтва, навукі і тэхнікі, а таксама розныя бакі духоўнага жыцця мясцовага краю;

б) мерапрыемствы выхаваўчага характару: спектаклі і канцэрты, кінематограф і “чароўны ліхтар”, якія не толькі задавальнялі эстэтычныя запатрабаванні насельніцтва, але і спрыялі замацаванню і пашырэнню навуковых і прыкладных ведаў.

У Быхаўскім павеце сетка ўстаноў культуры пазашкольнай адукацыі складалася па раённым прынцыпе: у цэнтры простых сельскіх ячэек, якія абслугоўвалі кожны свой населены пункт, размяшчаўся раённы цэнтр, больш складаны па сваім саставе, які забяспечваў ячэйкі кнігамі, карцінамі, дапаможнікамі, а таксама дасылаў у вёскі выкладчыкаў і лектараў.

У мэтах забеспячэння “культурнымі прадуктамі” найбольшай колькасці насельніцтва, павет дзяліўся на 10 раёнаў па колькасці валасцей – яго натуральных цэнтраў прыцягальнасці, якія да таго ж мелі эканамічнае, культурнае і адміністрацыйнае значэнне. У цэнтры кожнага раёна знаходзіўся Народны дом, які сумяшчаў у сабе ўсе віды пазашкольнай адукацыі, а менавіта: раённую чытальню, музей наглядных вучэбных дапаможнікаў, кінематограф, класы для дарослых, кнігагандлёвы склад. У астатніх паселішчах працавалі простыя ячэйкі, прычым у адной мясцовасці раёна, якое займала найбольш цэнтральнае і зручнае становішча (адносна астатніх) размяшчалася раённая бібліятэка-чытальня, “чароўны ліхтар”, курсы для дарослых; у двух – раённыя “ліхтары” і курсы для дарослых, а ў астатніх – толькі “ліхтары”. Узначальваў усю арганізацыю павятовы цэнтр, які кіраваў усімі відамі пазашкольнай адукацыі, меў на мэце дапаўняць адукацыйна-асветніцкія дапаможнікі і асабісты склад ячэек на месцах і служыў даведачнай, пасрэдніцкай і паказальнай арганізацыяй у педагагічных адносінах ніжэйшым ячэйкам. Да ўезднага цэнтра адносіліся таксама 2 рухомыя кнігагандлёвыя склады.



Рэпазіторый ВГУ

Згодна з гэтым праектам, павятовыя і раённыя цэнтры павінны былі мець уласныя памяшканні, а сельскія ячэйкі знаходзіліся пры пачатковых школах або ў арэндаваных памяшканнях, бібліятэкі – таксама ў арэндаваных спецыяльных будынках.

Пасады загадчыкаў – бібліятэкараў, лектараў і іншых дзеячаў пазашкольнай адукацыі – асноўнымі раённымі ячэйкамі, у ведамстве якіх павінны былі знаходзіцца галіны, што патрабавалі спецыяльных навыкаў і ведаў, па праекце сеткі, павінны былі аплачвацца вызначаным зместам. Тэрмін жыццядзейнасці сеткі вызначаўся 15-цю гадамі, а на першы час прадугледжвалася абмежаванне ўстаноў аднымі бібліятэкамі-чытальнямі, арганізацыяй заняткаў з дарослымі і падлеткамі і народных чытанняў [15, с. 16].

Менавіта дзейнасць камітэтаў папячыцельства аб народнай цвярозасці, якая выклікала да жыцця і шырокую сетку пазашкольных устаноў, спрыяла стварэнню такой значнай формы культурна-асветніцкай дзейнасці, як Народны дом. Першыя звесткі аб іх адкрыцці на тэрыторыі Беларусі адносяцца да 1899 г. (в. Ліпна Люцынскага ўезда Мінскай губерні) [88, арк. 35а]. Адзначым, што ініцыятарам стварэння Народнага дома было зноў жа папячыцельства аб народнай цвярозасці, а будынак для яго быў прадстаўлены прыватнай асобай – Р.І. Зары. Пазней менавіта Народныя дамы сталі любімымі тыпамі ўстаноў культуры для народа, якія адчыняліся і дзейнічалі пад патранажам папячыцельстваў. Пазней такія ж Народныя дамы былі адкрыты ў Ваўкавыскім і Купянскім паветах.

Неабходнасць стварэння Народных дамоў выцякала з трох галоўных патрэбаў:

- асвеце;
- пашырэнні кола зносін;
- эканамічнай узаемадапамозе адзін аднаму.

Народныя дамы маюць таксама дастаткова багатую гісторыю. Ідэя іх стварэння з'явілася ў Англіі ў канцы XIX стагоддзя. Народны дом, нешта накшталт завешчанага англійскім сацыялістам Фур'е "фаланстэра Палаца будучыні", у якім павінна сканцэнтравацца ўся матэрыяльная і духоўная культура народа, яго сямейнае і грамадскае жыццё. Першы Народны дом быў арганізаваны ў 1887 годзе ў Лондане па ініцыятыве пісьменніка Вальтэра Бэнзага. Затым падобныя ўстановы з'явіліся і ў Францыі, Бельгіі і іншых краінах і дзяржавах, у тым ліку, і ў Расіі. На тэрыторыі Беларусі (якая ў той час мела назву "Паўночна-Заходні край Расіі"), Народныя дамы сталі адчыняцца з 1898 года. Нярэдка ініцыятыва іх стварэння ішла знізу, ад народа. У многіх месцах яны ствараліся на аснове чайных-чытальняў, як, напрыклад, у в. Карсава, і ахоплівалі сваёй дзейнасцю ўсё наваколле.

Рэпазіторый ВДУ

Па прынцыпе арганізацыі існавалі тры віды Народных дамоў:

а) арганізаваных земствамі;

б) створаных аб'яднаннямі кааператараў і асветных таварыстваў;

в) самастойныя таварыствы "Народны дом".

Яны былі не столькі клубамі, а хутчэй, менавіта таварыствамі, якія ахоплівалі сваёй дзейнасцю вялікія тэрыторыі, а калі-нікалі – і цэлыя рэгіёны.

Грунтуючыся на архіўных дадзеных ЦДГА і перыядычнага друку гэтага часу можна зрабіць выснову, што кожнае таварыства "Народны дом" як і любое іншае аб'яднанне або клуб, мела свой статут, у якім вызначаліся мэты стварэння і асноўныя формы яго дзейнасці, арганізацыя і кіраванне справамі таварыства, яго склад, юрыдычныя правы і абавязкі, памер грашовых укладаў і ўмовы прыняцця і выключэння членаў таварыства, будаўніцтва спецыяльных памяшканняў, яго фінансаванне і кантроль за выкарыстаннем грашовых сродкаў, а таксама ўмовы закрыцця.

На тэрыторыі Беларусі Народныя дамы ствараліся "по образу и подобию" расійскіх. Таму як прыклад такога дакумента можна прывесці праект статута Пермскага Народнага дома, надрукаванага ў "Весніку" як узор для стварэння статутаў беларускіх устаноў адпаведнага тыпу. Мэтай яго стварэння было "развіццё культурна-асветніцкіх пачаткаў сярод мясцовага насельніцтва і дастаўлення яму разумнага выкарыстання святочнага і вольнага часу" [16, с. 12]. У гэтых мэтах было зацверджана стварэнне бібліятэкі-чытальні, арганізацыя спектакляў, лекцый, сістэматычныя курсы чытання, якія суправаджаліся "туманнымі і кінематаграфічнымі карцінкамі", кніжны склад, нядзельныя школы, спецыяльныя класы і т.п.

У адрозненне ад дваранскіх клубаў і салонаў, гэта таварыства атрымлівае юрыдычныя правы па набыцці і продажу нерухомай маёмасці, наследаванні па тэстаментах, уступленню ў дазволеныя законам дагаворы, і ўвогуле, дзейнасці на правах юрыдычнай асобы. Цікавы і той факт, што сродкамі ўтрымання Народнага Дома былі не толькі членскія ўзносы, як у клубах, але і адлічэнні з платных вечароў, спектакляў, канцэртаў, грашовыя выдаткі мясцовых кааператыўных і грамадскіх арганізацый, а таксама, дабравольныя ўклады прыватных асоб.

Членства ў таварыстве Народны дом насіла даступны ўсім слаям насельніцтва характар. Не абмяжоўвалася і колькасць удзельнікаў. Забарона тычылася толькі вучняў ніжэйшых і вышэйшых навучальных устаноў, якія не дасягнулі 21 года, ваеннаслужачых і юнкераў, а таксама, асоб, якія падлягалі абмежаванню правоў па суду. Члены таварыства падзяляліся на тры катэгорыі: 1) ганаровыя – асобы, вядомыя культурна-

Рэпазіторый ВГУ

асветнай дзейнасцю; 2) пажыццёвыя – асобы, якія ўносілі адначасова вызначаны ўзнос; 3) сапраўдныя, якія штогод уносілі не менш 25 кап. Усе пытанні (акрамя набыцця і продажу нерухомасці, выбрання ганаровых членаў, выключэння з ліку членаў, для чаго патрабавалася 2/3 галасоў), вырашаліся агульным сходам шляхам галасавання (пры большасці галасоў членаў таварыства).

Праўленне складалі 5 асоб, сярод якіх прызначаўся старшыня, сакратар і казначэй. Яны ж вялі грашовую справаздачу, форму якой вызначаў таксама агульны сход. Тэрмін іх кіравання – 1 год. Штогод на чарговым сходзе выбіралі і рэвізійную камісію, якая сачыла за дзейнасцю кіравання і прадстаўляла даклад агульнаму сходу членаў таварыства. Пытанні ўнясення змен у статут або закрыцця таварыства таксама вырашалі на агульным сходзе.

Побач са статутам Пермскі губерскі сход зацвердзіў і вельмі каштоўны дакумент – правілы выдачы грашовай дапамогі з ліку спецыяльнага фонду губернскага земства. У ім сказана, што памер выдаткаў на будаванне Народных дамоў у сельскай мясцовасці даходзіў да паловы сабекошту будынку, але не перавышаў 5000 руб., а астатнія сродкі збіраліся сіламі мясцовай арганізацыі. Вызначэнне памераў такіх выдаткаў адбывалася на земскім губернскім сходзе.

Да хадайніцтва аб выдзяленні сродкаў са спецыяльнага фонду на будаўніцтва Народных дамоў неабходна было прыкласці: а) генеральны план мясцовасці (у 2 экз.), дзе планавалася будаўніцтва з указаннем існуючых паблізу будынкаў і вуліц; б) смету і праект будынку (2 экз.); в) памер сродкаў, сабраных на месцы для гэтых мэтаў. Абавязковым для ўсіх (і гарадскіх і сельскіх) Народных дамоў было патрабаванне наяўнасці гардэроба і прыбіральні. Сродкі на будаўніцтва Народных дамоў выдавалі і тым паселішчам, дзе зараджалася ініцыятыва стварэння такога таварыства “знізу”, і дзе мясцовае насельніцтва, або грамадскія ўстановы бралі на сябе арганізацыю таварыства, матэрыяльны ўдзел у будаўніцтве і далейшага яго ўтрымання [16, с. 12].

Праўленне Нежкаўскага крэдытнага таварыства, ідучы насустрач народнай плыні ва ўсіх галінах жыццёвых патрэб як у культурна-гаспадарчым ўздыме насельніцтва, а таксама і ў асветніцкіх адносінах да яго, мае намер пабудаваць уласны будынак, які будзе адказваць патрэбам насельніцтва: называць будынак Народным домам Нежкаўскага крэдытнага таварыства Магілёўскага павета (1916) [47, арк. 30].

Прагрэсіўныя земскія дзеячы бачылі мэтазгоднасць стварэння сеткі Народных дамоў – губернскіх, уездных, валасных і сельскіх, якія і сталі цэнтрамі пазашкольнай адукацыі і асветы. На тэрыторыі Беларусі гэтыя таварыствы адрозніваліся багаццем і featureзнабаковасцю



Рэпазіторый ВДУ

формаў арганізацыі і дзейнасці. Па форме арганізацыі яны ўключалі ў сябе бібліятэку, чытальні, вячэрнія класы для дарослых, нядзельныя школы, рамесніцкія майстэрні, дзе навучалі практычнаму авалоданню якім-небудзь рамяством, сцэны, лекцыйныя і глядзельныя залы для спектакляў, канцэртаў і кінапраглядаў, чайную, гімнастычныя залы, кнігандлёвыя лаўкі і склады, хары і аркестры і г.д. Галоўнымі формамі работы былі лекцыі, гутаркі, канцэрты, спектаклі, літаратурна-мастацкія гурткі, народныя чытанні для дзяцей і дарослых, экскурсіі, спартыўныя заняткі, распаўсюджанне кніг, выставы. Пры некаторых Народных дамах дзейнічалі школы кройкі і шыцця, арганізоўваліся танцавальныя вечары і дзіцячыя ёлкі [18, с. 11].

Так, Слонімскі Народны дом папячыцельства аб народнай цвярозасці праводзіў "забаўляльныя" вечары для простага народа, здаваў у арэнду памяшканні для прыезджых артыстаў, пад канцэрты і выступленні слонімскіх аматарскіх літаратурна-драматычнага і музычнага таварыстваў. У Народным доме працавалі чайная і буфет [75, с. 14].

Па Гродзенскай губерні згодна з Памятнай кніжкай на 1907 год налічвалася клубаў: Ваенны сход, Грамадзянкі шляхетны сход, Вольнае пажарнае таварыства, Сход чыноўнікаў, Народны дом [63, с. 254].

Такім чынам, мы бачым, што Народныя дамы будаваліся па ўсёй Расіі, у тым ліку і на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю. Народныя дамы дапамагалі будаваць органы ўлады і земства, дваранскія грамадствы і прадпрымальнікі, грамадскія арганізацыі. За вялікімі гарадамі да працэсу падключаюцца невялікія гарады і вёскі. Трэба адзначыць, што дзяржаўныя органы ўлады выступалі гарантамі станаўлення народных дамоў: альбо ім належала ініцыятыва пабудовы дома і пошук партнёраў і мецэнатаў, альбо яны маральна і матэрыяльна падтрымлівалі ўжо праяўленую ініцыятыву, альбо яны выступалі пасрэднікам у пошуках магчымых гаспадароў Народных дамоў, народных чайных. Дзяржава дэкларавала абавязкі матэрыяльнай абароны народных дамоў і кантралявала адэкватнасць утрымання іх працы патрабаванням, якія вылучаліся пры іх фінансаванні. Адначасова з гэтым вялікую ролю ў стварэнні і дзейнасці Народных дамоў мелі дабрачынныя акцыі прыватных асоб і грамадскіх арганізацый (папячыцельства аб народнай цвярозасці).

Ідэя Народнага дома была прывабная тым, што падмуркам для яго стварэння служылі: дабрачыннасць; стаўка на прыватную ініцыятыву; агульнадаступнасць; дэмакратызм; заахвочванне і падтрымка любых творчых праяў, ініцыятыў насельніцтва, арганізацый і прадпрыемстваў; садзейнічанне выхаванню дзяцей праз актыўную дзейнасць; арыентацыя на групы асаблівай увагі (сацыяльна неабароненыя і "напружаныя" катэгорыі насельніцтва).



Репозиторий ВГУ

Мы паказалі толькі малую частку таго, што будавалася па ўсёй краіне для народа. У грамадстве ў той час велізарную папулярнасць мела дабрачыннасць. Маштаб дзейнасці ўсіх дабрачынных таварыстваў, простых грамадзян, практычна ўсіх слаёў насельніцтва дзівіць па сваіх памерах.

Такім чынам, мяжа стагоддзяў была адзначана абвостранымі духоўнымі пошукамі інтэлігенцыі, якія суправаджаліся яе ідэалагічнай палярызацыяй, своеасаблівым выбухам творчай энергіі ў самых розных відах дзейнасці і мастацтва.

У XX стагоддзе Расія ўступіла са сфарміраванымі клубнымі традыцыямі, якія эфектыўна структуравалі сацыяльнае і культурнае жыццё грамадства.

Стварэнне і дзейнасць грамадскіх арганізацый з'явілася праявай працэсу фарміравання грамадзянскай супольнасці ў дарэвалюцыйнай Расіі. У даследаванні класіфікаваны і разгледжаны групы грамадскіх аб'яднанняў, вызначана сувязь паміж кірункам іх дзейнасці і асноўным сацыяльным складам. Выяўлены інтарэсы і патрэбы розных сацыяльна-саслоўных груп, рэалізацыя якіх выяўлялася ў форме арганізаванай грамадскай дзейнасці. Усе гэтыя таварыствы адлюстроўвалі эканамічныя, культурна-асветныя і рэлігійныя інтарэсы гараджан. Заканамернасць стварэння такіх таварыстваў (аб'яднанняў) прадстаўнікамі розных саслоўных груп паказвае, што саслоўны фактар саступаў перад грамадскай патрэбай часу і не меў вядучай ролі. У той жа час, саслоўныя аб'яднання працягвалі сваю дзейнасць. Гэта, у сваю чаргу, сведчыць аб тым, што паслярэформеннае грамадства не хацела і не магло адмовіцца ад прымянення саслоўнага прынцыпу пры вырашэнні некаторых пытанняў, напрыклад, асабістых зносін або ўзаемадапамогі. Гэта было актуальна для дваранства, якое не жадала губляць сувязі са сваёй саслоўнай групай, і для духавенства, якое хацела абараніць сябе і свае сямейства ад матэрыяльнай неўладкаванасці. Хоць прадстаўнікі гэтых саслоўяў разам з іншымі сацыяльнымі групамі вырашалі многія сацыяльныя і духоўныя праблемы. Не варта таксама выпускаць з-пад увагі, што ў паслярэформенны перыяд апынуліся актуальнымі: забаўляльныя, духоўна-асветніцкія і дабрачынныя аб'яднанні нацыянальнага складу.

Такім чынам, некаторыя з аб'яднанняў ствараліся як саслоўна-замкнутыя, іншыя ж, якія складалі большасць, як афіцыйна ўсесаслоўныя. Гэта, з аднаго боку, дае падставу казаць аб захаванні традыцыйных грамадскіх адносін, а з другога боку, сведчыць аб распачатым працэсе павольнага фарміравання элементаў грамадзянскай супольнасці, якія праявіліся ў пашырэнні мясцовай

Рэпазіторый ВДУ

ініцыятывы па забеспячэнні сваіх інтарэсаў і вырашэнні сацыяльна значных праблем. Асноўную ролю ў стварэнні ўсесаслоўнасці грамадскіх аб’яднанняў вызначалі актыўныя прадстаўнікі саслоўяў, часцей дваране, духоўныя асобы, купцы, а таксама мясцовыя чыноўнікі і асобы інтэлектуальных заняткаў, якія стваралі ініцыятыўныя групы па інтарэсах у якой-небудзь сферы дзейнасці – прафесійнай або культурнай сферы вольнага часу. Напрамкі і формы дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў вызначаліся статутамі, якія зацвярджаліся адпаведнымі міністэрствамі. Гэта, у сукупнасці з існаваўшымі формамі праверкі і штогадовай справаздачнасці, дазваляе казаць аб падкантрольнасці арганізаванай грамадскай дзейнасці. Абмежаванасць магчымасцей таварыстваў шмат у чым вызначалася іх фінансавым бокам, якая акрамя членскіх узносаў і ахвяраванняў таксама залежала ад субсідзіравання міністэрствамі і органамі мясцовага самакіравання. Асабліва гэта было характэрна для тых таварыстваў, асноўнымі мэтамі якіх з’яўляліся: клопат аб дапамозе ў грамадска значных сферах для жыцця гарадоў, такіх напрыклад, як тушэнне пажараў або дабрачыннасць групам гараджан, якія жывуць у нястачы.

Репозиторий ВГУ

# Раздел 3. ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ КЛУБНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У САВЕЦКІ І ПОСТСАВЕЦКІ ПЕРЫЯД НА БЕЛАРУСІ

## 3.1. Асаблівасці функцыянавання клубаў у савецкі перыяд развіцця грамадства

Рэвалюцыя прынесла новыя погляды на навакольны свет і аб'явіла аб магчымасці яго перабудовы, галоўным зместам якой стала пашырэнне партыйнай ідэалогіі.

Арганізацыя і дзейнасць Народных дамоў, хат-чытальняў, клубаў па інтарэсах працягваецца і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Аднак арганізоўваць сетку пазашкольных устаноў на той час было складана. Паслярэвалюцыйная анархія, акупацыны слоўнік нямецкіх і белапольскіх войск, праз якія прыходзілася весці беларускую культурна-асветніцкую дзейнасць і нанава адраджаць тое нямногае, што дзейнічала ў галіне пазашкольнай адукацыі.

На пачатку 1918 года ў Петраградзе ствараецца Таварыства аматараў беларускага народнага мастацтва, мэтай якога было “садзейнічаць развіццю беларускай літаратуры, тэатра, славеснасці, архітэктуры, музыкі. Таварыства павінна было аказваць дапамогу ў арганізацыі аховы помнікаў культурнай і гістарычнай спадчыны на беларускіх землях” [56, арк. 1].

В. Фальскі ў запісцы ў Белнацкам вызначаў, што за два гады дзейнасці ідэйная аснова таварыства выглядае як “выдатны праваднік ідэй Савецкага ўраду” [41, арк. 2]. У лістападзе на дзейнасць гэтага таварыства было выдзелена 5 тысяч грошай дзяржаўнай падтрымкі.

На 15 мая 1918 г. было зарэгістравана 60 беларускіх арганізацый у розных рэгіёнах Беларусі [38, арк. 46].

У чэрвені 1918 года ў Бярозаўскай воласці Клімавіцкага павета настаўнікамі былі арганізаваны народны дом і аматарскі тэатр. Мазырскім павятовым рэвалюцыйным камітэтам былі арганізаваны хор, духавы аркестр, бібліятэка, дзве драматычныя секцыі. 16 лютага 1919 года спектаклем “Жаніцьба Бялугіна” была распачата дзейнасць народнага тэатра [39, арк. 9].

VIII з'езд РКП(б) разглядаючы пытанні палітычнай прапаганды і культурна-масавай работы ў вёсцы адзначаў, што “камуністычная партыя адносіцца з вялікай сур'ёзнасцю да асветы вёскі ў шырокім сэнсе слова” [17, с. 81].

Далей указвалася, што “пры кожнай школе або пры вясковым народным доме павінна працаваць бібліятэка-чытальня. Для



Репозиторий ВГУ

непісьменных было рэкамендавана ўсталёўваць пры школах перыядычныя чытанні дэкрэтаў з «папулярнымі тлумачэннямі»” [17, с. 82]. Гэтыя чытанні павінны былі суправаджацца дэманстрацыяй матэрыялаў пры дапамозе кінематографа або паказам канцэртных нумароў.

У красавіку 1919 года ў вызваленым ад акупантаў Навагрудку былі створаны дзве працоўныя школы, літаратурна-асветніцкі гурток, бібліятэка і школа для дарослых. Дзісненскі культурна-асветніцкі гурток у сакавіку-красавіку 1919 года налічваў некалькі дзясяткаў удзельнікаў, пры ім працавала мастацкая студыя.

У адрас партыйных і савецкіх кіраўнікоў дасылаліся шматлікія пісьмы ад сялян з просьбамі і рэзалюцыямі аб адкрыцці новых культурна-асветніцкіх устаноў.

Да мая 1919 года ў Раднянскай воласці Клімавіцкага павета дзейнічалі 4 хаты-чытальні, у Рэчыцкім – 9 клубаў і 10 бібліятэк-чытальняў. У снежні 1919 года ў Полацкім павеце, Юровіцкай, Клясціцкай, Мікалаеўскай валасцях дзейнічалі культурна-асветныя гурткі. У Гомельскім павеце ў 1919 годзе было адчынена 120, у Рэчыцкім – 276, Рагачоўскім – 32 хаты-чытальні.

Мастацка таленавітая моладзь Ашмян, якая аб’ядналася ў культурна-асветніцкі гурток, амаль кожны дзень давала прадстаўленні для мясцовага насельніцтва. У Гродне мясцовым рэўкомам былі створаны: музычная, мастацкая, драматычная студыі.

Дзяржаўная сетка ўстаноў культуры Беларусі пачала складвацца і развівацца на аснове прыняцця ў 1919 годзе Палажэння Наркамасветы “Аб арганізацыі сістэмы пазашкольнага выхавання” і пачаткам правядзення палітыкі нацыяналізацыі ў 1920 годзе пасля вызвалення краіны ад белапалякаў.

На першым пасяджэнні Усерасійскага сходу ў лістападзе 1919 г. Н.К. Крупская зачытала даклад, у якім прапанавала свой план стварэння і развіцця сеткі клубных устаноў культуры на вёсцы, які, дарэчы, быў заснаваны на вопыце дзейнасці Народных дамоў, якія працавалі да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пазней асноўныя палажэнні сталі грунтам для культурнага будаўніцтва ў нашай краіне. Для ўпарадкавання сеткі ўстаноў культуры і больш якаснай яе работы, Н.К. Крупская прапаноўвала 2 асноўныя формы: “цвёрдую” – якая ствaралася, кіравалася і дзейнічала на дзяржаўныя сродкі і пад дзяржаўным кантролем і “мяккую” – якая стваралася сіламі грамадскасці. “Цвёрдая” сетка разумелася як аснова ўсёй сеткі, будавалася і размяшчалася па тэрытарыяльна-адміністрацыйнаму прынцыпу з цэнтрам у воласці. “Мяккая” стваралася пераважна па вытворчаму прынцыпу і задавальняла, пераважна, запыты розных груп насельніцтва або працоўныя калектывы. Іх існаванне павінна

Рэпазіторый ВГУ

было быць цесна звязаным: “мяккая” падпарадкоўвацца “цвёрдай”, планаваць сваю работу адпаведна з ёй, карыстацца неабходнай дапамогай, у тым ліку, і метадычнай.

Для вясковых жыхароў Н.К. Крупская прапаноўвала ствараць не профільныя культурна-асветніцкія ўстановы (як у горадзе), а адзіныя культурныя комплексы, цэнтрам якіх была хата-чытальня, якая была “...у той жа час, і клубам, і сталом-даведкай, і ячэйкай, вакол якой ствараецца школа для дарослых, і экскурсіі, і спектаклі, і розныя практычныя мерапрыемствы культурна-асветніцкага характару” [19, с. 29]. У цэнтры ж воласці яна бачыла Народны дом, які павінен быў стаць “сумай усіх культурных устаноў. А менавіта “...асаблівай бібліятэкай, асаблівым клубам, асаблівай школай, выстаўкай...” [19, с. 29]. Пры гэтым яны не абавязкова павінны былі знаходзіцца пад адным дахам, але іх дзейнасць павінна была ўзмацняцца менавіта ўзаемадапамогай, узаемадзейнасцю, аб’яднаннем сіл і сродкаў.

Такім чынам, у вызначаны гістарычны перыяд асноўнымі прынцыпамі дзяржаўнай культурнай палітыкі сталі:

- фарміраванне дзяржаўнай сеткі ўстаноў культуры;
- арганізацыя цэнтралізаванай сістэмы кіравання;
- стварэнне адпаведнай заканадаўчай базы.

Асновай сеткі пазашкольных устаноў клубнага тыпу сталі шматлікія працоўныя і чырвонаармейскія клубы, дамы асветы, народныя дамы, хаты – і бібліятэкі-чытальні, “чырвоныя куткі”. Напрыклад, у Віцебскай губерні колькасць пазашкольных устаноў на 1 ліпеня 1919 года ўяўляла сабой наступную карціну (табл. 1).

Табліца 1

**Пазашкольныя ўстановы Віцебскай губерніі ў 1919 г.**

| Паветы | Бібліятэкі | Хаты-чытальні | Культ.-асветн. гурткі | Курсы для дарослых | Народныя дамы |
|---|---|---|---|---|---|
| **Сенненскі** | 15 | 272 | 22 | – | 3 |
| **Невельскі** | 44 | 221 | – | 6 | 15 |
| **Дрысенскі** | 20 | 296 | 18 | 4 | 6 |
| **Лепельскі** | 39 | 227 | 26 | 49 | 2 |
| **Віцебскі** | 30 | – | – | 20 | 28 |
| **Себежскі** | 15 | 53 | 23 | 2 | 5 |
| **г. Віцебск** | 22 | – | 27 | 9 | 3 |

Акрамя гэтага, у Віцебску на прадпрыемствах горада працавалі 3 клубы для рабочых. Гэта былі савецкія клубныя ўстановы першага пакалення. У многім яны захоўвалі сувязь з дарэвалюцыйнымі

Репозиторий ВГУ

пазашкольнымі ўстановамі, размяшчаліся ў іх памяшканнях, але ўжо набывалі адзнакі новага часу: былі пастаўлены цалкам на дзяржаўнае забеспячэнне, значна пашырылася іх аўдыторыя, змяніўся характар і змест дзейнасці.

Для таго, каб надаць большую эфектыўнасць дзейнасці культурна-асветніцкіх устаноў і дэцэнтралізаваць кіраўніцтва палітыка-асветніцкай работай, восенню 1920 года пры Наркамасвеце БССР быў створаны Глаўпалітасвет, які павінен быў стаць адзінай планамернай арганізацыяй, якая ажыццяўляла культурнае будаўніцтва ў краіне, аб'ядноўвала на сваёй базе розныя ведамствы і ўстановы культуры, каардынавала дзейнасць на тэрыторыі пэўнага рэгіёна (Расіі, Беларусі, Украіны і г.д.).

Згодна з загадам № 119 па Глаўпалітасвету Беларусі 16 верасня 1921 года ў мэтах урэгулявання клубнай работы на тэрыторыі Мінска, згодна з пастановай калегіі Глаўпалітасвету, лічыць функцыянальнымі наступныя клубы:

– **грамадзянскія клубы:**
  Цэнтральны працоўны клуб імя Міжсаўпрафа "Дом Працы";
  Працоўны клуб Ляхаўскага раёна;
  Працоўны клуб раёна Аляксандраўскай чыгункі "Чырвоны шлях";
  Працоўны клуб раёна Заходняй чыгункі імя У.І. Леніна;
– **ваенныя клубы:**
  Клуб Імя Луначарскага;
  Клуб імя Троцкага;
– **спецыяльныя клубы:**
  Клуб мінскага дома прымусовых работ;
  Клуб цэнтральнага лагера;
  Белэвака (Клуб сувязі);
  Клуб падлеткаў (прафтэхнічных школ);
  Клуб К.С.М;
– **нацыянальныя клубы:**
  Беларуская хатка;
  Беларускі рабочы клуб;
  Яўрэйскі рабочы клуб імя Браніслава Гросера;
  Польскі працоўны клуб імя Розы Люгсембург.
– **партыйныя клубы:**
  Клуб імя Карла Маркса [43, арк. 2].

Паводле поглядаў тэарэтыкаў клубнай справы гэтага перыяду (Н.К. Крупскай, А.В. Луначарскага, М.В. Пятроўскага, П.П. Блонскага, В. Кержанцава, А.С. Макаранкі, Я.М. Мядынскага), клуб разглядаўся як збіральнік рабочай і сялянскай творчай ініцыятывы, месца сумеснага адпачынку, асновай якога павінна стаць дзейнасць саміх наведвальнікаў. Аднак у 1920-я гады паняцці "клуб" і

Репозиторий ВГУ

“клубныя установы” сталі атаясамліваццa. Калі да Кастрычніцкай рэвалюцыі паняцце “клуб” азначала вольную самадзейнасць і самаарганізаваную супольнасць грамадзян, якія аб’ядноўваліся на аснове агульных інтарэсаў. XI з’езд РКП(б) ужо патрабаваў пeратварыць клубы ў асноўныя цэнтры партыйнай і палітыка-асветніцкай працы ў масах. Кіруючыся гэтым, ЦК РКП(б) у цыркуляры “Аб умацаванні клубнай работы” (ліпень 1922 года) [18, с. 148–149] абавязаў камуністаў стаць актыўнымі членамі клубаў сваіх прадпрыемстваў. У лістападзе 1922 года ў пісьме да рабочых і служачых дзяржаўнай электрастанцыі “Электраперадача” У.І. Ленін, вітаючы адкрыццё клуба, выказаў надзею, што ён будзе пераўтвораны “ў адну з важнейшых пазіцый для асветы рабочых” [23, с. 271]. Менавіта з гэтага часу асвета працоўных мас стала галоўным накірункам клубнай дзейнасці.

Пачала рэалізоўвацца суб’ект-аб’ектная мадэль арганізацыі клубнай работы, разлічаная на многія дзесяцігоддзі, якая была звязана з ідэалагічным выхаваннем працоўных і атрымала афіцыйную назву “культурнае абслугоўванне насельніцтва”.

Тут мелі месца як самадзейнасць і аматарская творчасць, так і ініцыятыва адміністратыўна-камандных метадаў кіравання.

У Савецкай Беларусі культурнае жыццё развівалася без асаблівых перашкод, пры гэтым духоўна напаўняючы жыццё народа новымі культурна-асветніцкі напрацоўкамі. Так у культурным жыцці Мінска сваёй выдатнай дзейнасцю быў адзначаны аматарскі гуртоk моладзі пад кіраўніцтвам А. Захара і Л. Туманавай. У ліку першых культасветустаноў у шэрагу гарадоў Беларусі пасля акупацыі былі чырвонаармейскія клубы. У іх для мясцовага насельніцтва праводзіліся лекцыі і справаздачы, былі арганізаваны выступленні самадзейнасці. У Гомельскай губерні да пачатку 1920 года працавала 12 такіх клубаў. Сталі адчыняцца партыйна-рабочыя клубы, якія сваёй мэтай мелі фарміраванне марксісцкага светаўспрымання членаў партыі. Вялікую работу вялі і камсамольскія клубы. Яны арганізоўвалі маладзёжныя сходы, лекцыі, даклады, дыспуты, самадзейныя спектаклі. Хлопцы і дзяўчаты ў гуртках развучвалі рэвалюцыйныя песні, вучыліся грамаце. Напрыклад, чытальню Мінскага камсамольскага клуба штодзённа наведвала ад 150 да 250 чалавек. Да студзеня 1921 года ў рэспубліцы ўжо працавала 1130 хат-чытальняў. Хата-чытальня з’яўляецца цэнтрам палітыка-асветніцкай работы ў вёсцы. 30 ліпеня 1921 года ў “Хатцы беларускага мастацтва”, якая ўяўляла сабой рабочы клуб, было абвешчана імкненне да прапаганды і развіцця беларускага тэатральнага мастацтва.

Згодна з рашэннямі XII з’езда РКП(б) клубы павінны былі стаць “дзейснымі цэнтрамі прапаганды і развіцця творчых здольнасцей

Рэпазіторый ВДУ

рабочага класа” [23, с. 456]. Шмат месца на XII з’ездзе РКП(б) было адведзена “ўзнаўленню першаснай формы асветработы ў вёсцы хат-чытальняў, па прычыне недахопу значных вынікаў у іх культасветрабоце” [23, с. 457]. Было загадана “для патрэб ў асветрабоце на сяле хат-чытальняў, школ і бібліятэк накіраваць не менш паловы партыйных сіл, якія павінны быць перакінуты ў вёску” [23, с. 460].

У рэчышчы рашэнняў ВКП(б) па пытаннях культуры дзейнічала і КП(б)Беларусі, рашэнні з’ездаў якой абавязвалі мясцовым партыйным арганізацыям “прыцягваць шырокія масы да самадзейнай культасветработы з мэтай стварэння раённых і валасных камуністычных клубаў, хат-чытальняў і бібліятэк” [16, с. 48]

З 1923 г. у краіне пачынае развівацца шэфская работа. У Слуцку, напрыклад, было створана спецыяльнае бюро, якое займалася усёй шэфскай работай у акрузе. У Аршанскім павеце, напрыклад, шэфскія арганізацыі скамплектавалі для вёскі 27 бібліятэк, усталявалі 5 хат-чытальняў, 2 чырвоныя куткі.

Пры Віцебскай акружной камісіі дапамогі дзецям у 1926 годзе ствараецца Віцебскае таварыства “Прыхільнікі дзяцей”, дзе ўвесь прыбытак ішоў на барацьбу з дзіцячай беспрытульнасцю [7, арк. 30–32].

У заходніх раёнах, якія ўвайшлі ў склад буржуазнай Польшчы (сакавік 1921 г.), мясцовыя культурныя ўстановы былі зачынены.

Значную цікавасць для нашага даследавання прадстаўляюць і дадзеныя аб складзе сеткі культурна-асветніцкіх устаноў за перыяд з 1921 па 1925 год, прыведзеныя гісторыкам М.Д. Тацішчавай [50] (гл. табл. 2):

Табліца 2

**Дадзеныя аб складзе сеткі культурна-асветніцкіх устаноў (з 1921 па 1925 год)**

| **Тып установы** | **1921** | **1922/23** | **1923/24** | **1924/25** | **1925/26** |
|---|---|---|---|---|---|
| Бібліятэкі | 445 | 394 | 404 | 376 | 349 |
| Хаты-чытальні | 2321 | 177 | 355 | 479 | 589 |
| Клубы | 136 | 137 | 176 | 241 | 246 |
| Пункты ліквідацыі непісьменнасці | 3547 | 295 | 234 | 2502 | няма дадзеных |
| Народныя дамы | 151 | няма дадзеных | 51 | 67 | 95 |

З сярэдзіны 1920-х гадоў у рэспубліцы разгарнулася антырэлігійная прапаганда, якая нанесла жорсткі ўдар па дзеючым храмам і па традыцыях беражлівых адносінаў да гісторыка-



Репозиторий ВГУ

культурнай спадчыны. Узамен старажытных царкоўных абрадаў – хрэсбін, вянчання, адпявання – уводзіліся новыя: "чырвоныя хрэсьбіны", "камсамольскія шлюбы" і г.д. У дні рэлігійных святаў праводзіліся тэматычныя мерапрыемствы – Дзень лесу, Дзень ураджаю і інш. Новая абраднасць не знаходзіла падтрымкі ў насельніцтва, таму што не выкарыстоўвалася багатая спадчына народа, яго сфарміраваныя стагоддзямі традыцыі. Цэнтрам аб'яднання ўсіх атэістычных сіл з'яўляліся структуры "Саюза ваяўнічых бязбожнікаў" (СВБ), якія дзейнічалі на ўсіх узроўнях.

Саюз ствараўся як культурна-асветніцкая арганізацыя, але часцей за ўсё менавіта з яго выходзілі ідэі гвалтоўных мер барацьбы з царквой. Гэта тэндэнцыя паглыблялася ідэяй "нацыянальнага нігілізму", у выніку чаго пачалося згортванне дзейнасці краязнаўчых таварыстваў. У краіне замацавалася арыентацыя на ўсебаковае рэгуляванне культуры, якая выключала магчымасць яе самаразвіцця.

Адзін з вядучых тэарэтыкаў культурна-асветніцкай працы 20–30-х гг. Я.М. Мядынскі раскрыў адметныя асаблівасці клуба ў параўнальным аналізе з Народным домам. Народны дом уяўляе сабой суму ўсіх культурных устаноў: бібліятэку-чытальню, розныя віды школ для дарослых, прафесійныя курсы, клуб і г.д. Няцяжка заўважыць, што сучасны Дом культуры, захаваў асноўныя рысы Народнага дома. У тэорыі і практыцы клубнай працы, клуб атаясамліваецца з Домам культуры, гэта значыць з Народным домам. Я.М. Мядынскі разводзіць паняцці "клуб" і "Народны дом". Ён лічыў, што Народны дом выказвае ідэю пашырэння асветніцкай працы, а клуб – ідэю паглыблення яе. Народны дом спрыяе папулярызацыі ведаў, клуб – самаадукацыі. Таму Народны дом жыве галоўным чынам штуршкамі, рэдкімі, але яркімі выступленнямі, якія вабяць як мага больш людзей: мітынгамі, спектаклямі, канцэртамі, лекцыямі, выставамі. Клуб жыве паўсядзённай працай сваіх членаў, самая галоўная частка яго дзейнасці – гуртковая праца. Адна і тая ж дзейнасць атрымлівае ў Народным доме і клубе розныя напрамкі. Напрыклад, дэкарацыі для спектакля ў Народным доме могуць быць выкананы пастароннімі асобамі, а ў клубе гэта вынік працы яго членаў. Мядынскі лічыць, што большасць арганізатараў рабочых і сялянскіх клубаў зразумелі сваю задачу няправільна. "Працоўны клуб з'яўляецца завяршэннем развіцця Народнага дома" [35, с. 121–122]. Народныя дамы былі перайменаваны ў працоўныя клубы і развіццё клубных устаноў пайшло па шляху развіцця Народных дамоў, г.зн. па шляху культурнага абслугоўвання насельніцтва, падрыхтоўкі яго штатам мерапрыемстваў выхаваўчага характару.

ЦК РКП(б) у сакавіку 1926 года рэкамендуе усім клубным камісіям вылучаць на першы план задачу здзяйснення ідэалагічнага

кіраўніцтва клубнай работай. Партыйнае кіраўніцтва з'ўяўляецца рашаючай умовай клубнай работы. З вышэйсказанага вынікае, што клуб становіцца цэнтрам культурна-асветніцкай работы.

У пачатку 1930-х гадоў пачынаецца фарміраванне сістэмы творчых саюзаў, асноўная ідэалагічная функцыя якіх – кантроль за творчай інтэлігенцыяй і арганізацыя яе дзейнасці ў патрэбным партыйна-ідэалагічным напрамку. З гэтага часу дзяржаўная палітыка абсалютна дамінуе ў дзейнасці сеткі ўстаноў культуры. Здзяйсняецца вызначаная падпарадкаванасць у катэгорыях саюзнага, рэспубліканскага, абласнога і мясцовага значэння. Паказчыкі культурнага абслугоўвання насельніцтва ўключаюцца ў пяцігадовыя планы развіцця народнай гаспадаркі, замацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база культуры, складаецца сістэма падрыхтоўкі кадраў.

У 1929 годзе ў Мінску ствараецца таварыства "Музыка – масам", мэтай якога было "стварэнне мастацкай самадзейнасці рабочых клубаў і хат-чытальняў у падборы паўнацэннага музычнага рэпертуару з дапамогай кіраўнікам у павышэнні прафесійнага майстэрства".

У 1928–1930 гадах у Віцебску дзейнічала аб'яднанне моладзі "Асацыяцыя мастакоў рэвалюцыі", адным з арганізатараў быў скульптар А. Глебаў.

Узрасла і колькасць культурна-асветніцкіх устаноў: з 1930 па 1940 год колькасць клубаў у краіне павялічылася з 266 да 1776, хат-чытальняў – з 461 да 1387. Значную ролю ў росце сеткі сельскіх культурных устаноў адыгравала тое, што многія калгасы ўводзілі іх сваімі сіламі [27, с. 321].

Такім чынам, нельга не заўважыць, што клубныя ўстановы ў 1920–1930-я гады фарміраваліся пад уздзеяннем разуменняў "сацыялістычнай культуры" і яе задач, якія складаліся ў гэты перыяд. Таксама паступова ўсталяваўся погляд на культуру, як на з'яву, для якой характэрна ідэалагічна-выхаваўчая функцыя і калектывізм. Менавіта тады фарміруецца ўяўленне аб культурна-асветніцкай рабоце, якая разумеецца як "ідэалагічна-арыентаванае асветніцтва мас", арганізацыя іх культурнай актыўнасці ў калектыўных формах, прапаведзь сацыялістычнага ладу жыцця і сацыялістычных каштоўнасцей з дапамогай новага мастацтва. Паколькі ў 1920–1930-я гады культурныя працэсы ў цэлым збліжаліся з вытворчымі, то на ўстановы культуры аўтаматычна пераносілася і вытворчая схема адміністрацыйнага кіравання.

А.С. Макаранка вылучае тры напрамкі клубнай працы на 1930–1931-я гг.: клубна-вытворчая, спартыўная, адпачынку і агульнага развіцця. Практычная рэалізацыя кожнага напрамку ажыццяўляецца



Репозиторий ВГУ

сіламі гурткоў. Для агульнага кіравання клубнай працай А.С. Макаранка лічыў неабходным мець савет старастаў. На агульным сходзе выбіраўся старшыня – сакратар. Савет старастаў ажыццяўляў усё кіраўніцтва клубнай працай [31, с. 473–479].

Да сярэдзіны 1930-х гадоў клуб, замест мабільнай творчай самадзейнай структуры, арыентаванай на нефармальныя сацыяльна-культурныя зносіны, стаў прамым праваднікам афіцыйнай ідэалогіі.

Развіваецца будаўніцтва калгасных клубаў. Так, напрыклад, у 1940 г. іх налічвалася – 1104, а ў 1946 г. – 148 [47, арк. 61]. За гады Вялікай Айчынай вайны ў акупаванай Беларусі фашысты знішчылі 5340 клубаў і чырвоных куткоў, 219 бібліятэк, 13 музеяў і шмат іншых аб'ектаў культуры [33, с. 210].

Галоўнай задачай галіны культуры ў 1940–1950-я гады было спрыянне паспяховаму вырашэнню гаспадарча-палітычных задач, якія паўсталі перад нашай краінай. У Беларусі ў 1949 годзе налічвалася 169 раённых Дамоў культуры, 740 калгасных клубаў, 171 сельскі Дом культуры, 2516 хат-чытальняў і сельскіх клубаў [33, с. 252]. Аднаўленне культасветустаноў здзейснялася не толькі дзяржавай, але і сіламі грамадства. За 1948–1949 гады толькі ў заходніх абласцях рэспублікі метадам народнай будоўлі было пабудавана звыш 300 будынкаў для клубаў [33, с. 252].

Культурна-асветніцкая работа трактавалася як складаючая частка ідэалагічнай дзейнасці дзяржавы па камуністычным выхаванні працоўных. Да гэтага часу ўсе існуючыя грамадскія, грамадска-палітычныя, сацыяльна-культурныя арганізацыі былі цалкам злучаны з дзяржаўнымі інтарэсамі, усё культурнае жыццё было падпарадкавана дзяржаве і ідэялагізавана. Незалежнай ад дзяржавы сацыяльна-культурнай дзейнасці быць не магло.

Арганізацыя культурнага адпачынку насельніцтва базіравалася на суб'ект-аб'ектнай аснове, пры якой насельніцтва краіны разглядалася не ў якасці суб'екта арганізацыі асабістага вольнага часу (і тым больш суб'екта сацыяльна-культурнай дзейнасці), а ў якасці аб'екта ўздзеяння з боку ідэалагічных і кіраўнічых структур. Гэты стэрэатып склаўся яшчэ ў 1920-я гады, а калі замацаваўся, то стаў адной з найбольш устойлівых дамінацый, якія вызначалі і змест, і методыку, і прынцыпы арганізацыі культурна-асветніцкай работы і ўсёй дзейнасці ў сферы арганізацыі і правядзення вольнага часу.

З сярэдзіны 1950-х гг. бюракратычная сістэма кіравання культурай набыла формы замкнутай галіны, упісалася ў агульную сістэму кіравання краінай, дзе фармальна паўната ўлады належала Саветам народных дэпутатаў усіх узроўняў, але кантралявалася партыйнымі органамі. У 1953 годзе ў Беларусі працавала 2107 хат-чытальняў, 637 сельскіх клубаў і 224 сельскіх Дамоў культуры, 175 раённых Дамоў

Рэпазіторый ВДУ

культуры, 12 гарадскіх Дамоў культуры, 1266 калгасных клубаў. У параўнанні з 1953 г. – на 1 ліпеня 1954 г. калгасных клубаў было ўжо 1427, гэта на 5416 калгасаў у БССР [46, арк. 16].

Дзяржаўная рэформа другой паловы 1950-х гг., так званая, "хрушчоўская адліга", не маглі не закрануць і сферу культуры, але, на жаль, чаканых змен не адбылося. Станоўчым бокам гэтых пераўтварэнняў было толькі тое, што яны дазволілі захаваць у культурным жыцці краіны шматпланавасць і разнастайнасць. Нават наступнае ўзмацненне жорсткасці ідэалагічнага рэжыму ўжо не дасягала поўнага кантролю над сітуацыяй. Усё гэта ўзмацняла творчую энергію інтэлігенцыі, якая не толькі ў іншасказальным сэнсе выказвала сваё непагадненне з афіцыяльнай ідэалагічнай культурнай палітыкай, а ўжо стала выступаць больш адкрыта.

З канца 1950 – пачатку 1960-х гадоў фаміруецца новая мадэль устаноў культуры. На першы план выступаюць задачы рацыянальнага размяшчэння ўстаноў культуры. Пастунова змяняецца і погляд на "прыроду" культуры. Жыццебудаўнічыя і ідэалагічна-выхаваўчыя ўяўленні аб культуры паступова адыходзяць на другі план, а першачарговай становіцца задача культурнага абслугоўвання насельніцтва.

У 1960-я гады пачалі складавацца новыя культурныя традыцыі ў грамадскім жыцці, якія ў многім вызначылі і сённяшнюю сацыяльна-культурную сферу нашай краіны. У першую чаргу – гэта пашырэнне дзейнасці шэрагу клубаў, бібліятэк, універсітэтаў і школ культуры, музычных і літаратурных лекторыяў, якія працавалі на грамадскіх пачатках. Напрыклад, толькі ў 1965 годзе ў рэспубліцы налічвалася 878 такіх клубаў і бібліятэк. Аднак, ініцыятыва па іх стварэнні і напрамкам дзейнасці зыходзіла не "знізу", а была спушчана "зверху".

Аднак формы работы многіх культурна-асветніцкіх устаноў не змяняліся дзесяцігоддзямі, адставалі ад запатрабаванняў часу, агульнаадукацыйнага ўзроўню людзей. Часта дубліраваліся і мерапрыемствы, якія праводзіліся культурна-асветніцкімі, спартыўнымі і грамадскімі арганізацыямі.

З канца 1970 – пачатку 1980-х гадоў можна гаварыць аб фарміраванні новай мадэлі ўстаноў культуры. Неабходнасць пераходу да яе была выклікана тым, што менавіта ў гэты перыяд у сферы культурнага абслугоўвання вызначыўся шэраг негатыўных тэндэнцый.

Па-першае, ужо з канца 1960-х гг. стала зніжацца наведвальнасць многіх устаноў культуры, у тым ліку, і клубных. Гэта можна растлумачыць многімі прычынамі, сярод якіх, канкурэнцыя тэлебачання. Па-другое, канкурэнцыя, выкліканая насычэннем сеткі прадпрыемстваў культурнага абслугоўвання, якое дазволіла наведвальніку самому выбіраць прадпрыемствы з больш высокім узроўнем культурнага абслугоўвання, больш зручна размешчаныя

Репозиторий ВГУ

тыя, што маюць больш цікавы рэпертуар. Па-трэцяе, адсутнасцю ўмоў (будынкаў спецыяльнага прызначэння, якасці паслуг, цікавага рэпертуару і інш.), якія дазвалялі б весці дыферэнцыраванае абслугоўванне насельніцтва з улікам узроўню жыцця, мастацка-творчых густаў і запатрабаванняў таго ці іншага грамадзяніна.

Напрацягу ўсяго савецкага перыяду павышаўся адукацыйны і агульнакультурны ўзровень насельніцтва. Галіна культуры значна ўмацавалася матэрыяльна-тэхнічна, павысіўся ўзровень падрыхтоўкі кадраў, адбылося станаўленне культурна-асветніцкай работы як навукі. На 1 студзеня 1966 г. усяго ў краіне налічвалася клубных устаноў – 5482, у сістэме Міністэрства культуры 3503, клубы калгасаў – 1348, клубы прафсаюзныя – 517, клубы іншых ведамстваў – 114 [47, арк. 61]. У гэты перыяд ідзе пераўтварэнне хат-чытальняў у сельскія клубы, таму іх колькасць падае. На 1 студзеня 1971 г. у сістэме Міністэрства культуры налічвалася 4326 клубных устаноў, 117 раённых, 80 гарадскіх, 516 сельскіх дамоў культуры, 3570 сельскіх клубаў [40, арк. 1]. З улікам прафесійных інтарэсаў, узроўню адукацыі і культуры, узроставых асаблівасцей на разгледжаны перыяд у рэспубліцы дзейнічае больш 20 розных аматарскіх аб’яднанняў. Напрыклад, клубы разведчыкаў будучага, рэвалюцыйнай, вайсковай, працоўнай славы, аматараў музыкі, тэатра, паэзіі, прыроды, дамаводства, такія, як клуб “Арлёнак” пры Сапоцкінскім ГДК Гродзенскага раёна, “Сяброў прыроды” ў Рэчыцкім раёне Гомельскай вобласці, “Равеснік” у Касцюковіцкім раёне Магілёўскай вобласці, “Старшакласнік” пры Віцебскім ГДК і інш. [40, арк. 10–11].

Мы бачым, што з развіццём сучасных сродкаў сувязі і інфармацыі значная частка насельніцтва ўспрымала культурныя каштоўнасці ў абход ідэалагічных бар’ераў. Найбольш ярка гэта тэндэнцыя праявіла сябе ў практыцы “самвыдата” і распаўсюджання самадзейных музычных запісаў у 1970–1980-я гады. Менавіта назапашванне падобных тэндэнцый падзяліла культуру на “афіцыйную” і “неафіцыйную” і забяспечыла апошняй вядучую ролю ў сферы культуры ў рэформах сярэдзіны 1980-х гадоў.

Сярэдзіна 1970-х гадоў у рэспубліцы характарызавалася працэсамі цэнтралізацыі, у выніку якіх відавочна звузіліся магчымасці сацыяльна-культурнай дзейнасці насельніцтва Беларусі, так як яна з’явіліся вынікам агульнадзяржаўных цэнтраімклівых працэсаў адміністравання ў афіцыйнай культуры, а дзейнасць клубных устаноў увайшла ў супярэчнасць з сапраўднымі інтарэсамі і запытамі насельніцтва, яго імкненнем да нефармальных зносін, атрымання аб’ектыўнай інфармацыі. Значны ўклад у гісторыю пытанняў культурнага будаўніцтва культурна-асветніцкай работы на Беларусі ўнеслі навукоўцы С.З. Ешын, С.В. Марцылеў, П.П. Сіліванчык,

В.А. і Г.І. Каспяровіч, а таксама, дысертацыйныя даследаванні С.К. Ганцовай, В.У. Сафонавай, М.Д. Тацішчавай, А.М. Пацыенкі. Ужо ў гэтых працах клубы разглядаюцца ў гістарычным кантэксце культурна-асветніцкай работы. Значны ўклад у развіццё клубазнаўства ў 1970–1980-я гг. унеслі працы Д.М. Генкіна, У.Я. Трыодзіна.

У.Я. Трыодзін лічыцца заснавальнікам сучаснай педагогікі клуба. Сутнасць яго канцэпцыі – вызначэнне клуба як выхаваўчага інстытута, як педагагічна-арганізаванай самадзейнасці людзей. У.Я. Трыодзін размяжоўвае паняцці “клуб” і “клубная ўстанова”. “Клуб – гэта людзі. Клубная ўстанова – гэта спецыяльна абсталяваны будынак са штатнымі работнікамі, якія накіроўваюць свае веды, уменні, навыкі, спецыяльна выдадзеную дзяржавай смету на задавальненне культурных патрэб насельніцтва, развіццё яго самадзейнасці і кіраванне ёй. ...Клубная ўстанова – спецыяльны механізм кіравання клубным рухам” [53, с. 27]

У канцы 1980-пачатку 1990-х гг. цікавасць да тэорыі і практыкі клубнай дзейнасці пачынае зніжацца. Гэта было звязана з распадам СССР і пераацэнкай культурных каштоўнасцей у сувязі з зараджэннем новага тыпу грамадска-палітычных і эканамічных адносін – рыначнай эканомікі. Клубы, асноўнай часткай грамадства, успрымаліся як анархічныя інстытуты, як тыповыя ідэалагізаваныя ўстановы адміністрацыйна-каманднай сістэмы, якая жорстка выконвае ідэйна-выхаваўчую функцыю ў сферы вольнага часу. Лідэры новых, у большасці маладзёжных арганізацый і аб’яднанняў, імкнуцца пазбягаць нават самога слова “клуб” у сваіх, па сваёй сутнасці і прынцыпу арганізацыі, клубных арганізацыях. Яны называюць іх “цэнтр”, “асацыяцыя”, “фонд”, “абшчына”, “група”, “грамадства”, “суполка”, “таварыства”. Таму нельга не згадзіцца са слушнай думкай С.С. Камісаранкі, што як у XVIII–XIX стагоддзях, так і напрыканцы XX стагоддзя, паняцці “клуб” – “грамадства” – “таварыства” з’яўляюцца тоеснымі паміж сабой.

Крызісная сітуацыя ў сацыякульурнай сферы адлюстравалася і ў навуцы. Навукоўцы загаварылі аб крызісе, а то нават і аб знікненні савецкага клуба. Неабходна была новая парадыгма клуба. Сапраўдным прарывам у культуралагічнай адукацыі можна лічыць распрацоўку тэарэтычных асноў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Адкрыццё новай, адэкватнай сучасным сацыяльна-культурным рэаліям, і, у той жа час, перспектыўнай навуковай спецыяльнасці стымулявала і навукова-тэарэтычную актыўнасць спецыялістаў. У праграмным вучэбным дапаможніку “Асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці” Т.Г. Кісялёвай і Ю.Д. Красільнікава клуб адносяць да ліку суб’ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці, да тых сацыяльна-



Репозиторий ВГУ

культурных інстытутаў, чыя задача заключаецца ў стварэнні неабходных умоў для задавальнення грамадскіх патрэб у адпачынку, аздараўленні, навучанні, развіцці культуры, творчасці, шматлікіх формаў правядзення вольнага часу. У дапаможніку з новых пазіцый разглядаюцца функцыі клуба, які заўсёды быў і застаецца цэнтрам дзейнасці ў вольны час.

Новыя канцэптуальныя падыходы да вывучэння і аналізу дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў вылучаюць сучасныя працы і іншых, як расійскіх, так і беларускіх навукоўцаў. Расіянін А.Д. Жаркоў суб’екты і аб’екты сацыякультурнай дзейнасці, у тым ліку і клуб, разглядае зыходзячы з распрацаванага ім метадалагічнага інструментарыя – тэхналогіі дзейнасці ў культурнай сферы вольнага часу. Вядомы культуролаг М.А. Арыярскі адносіць сацыякультурную дзейнасць да галіны чалавеказнаўства і з гэтых пазіцый ён і прапаноўвае разглядаць клуб як структуру, што адлюстроўвае адзінства дзяржаўнага і грамадскага пачаткаў у культурнай сферы вольнага часу.

Другі расійскі даследчык А.П. Маркаў, крытычна ацэньваючы тэндэнцыі кіравання, якія склаліся ў 1970–1980-я гг., падкрэслівае, што ў выніку ўзнікла “парадаксальная сітуацыя”, калі “клуб – супольнасць” быў вымушаны пакінуць свой родны дом “клуб – установу” і прапаноўвае заканадаўча аформіць правы клубных аб’яднанняў на набыццё “статуса дабравольнага грамадства, гэта значыць, самастойнай грамадскай арганізацыі, на якую распаўсюджваецца ўвесь копмлекс праў і абавязкаў, прадугледжаных заканадаўствам аб грамадскіх арганізацыях”.

Сярод аўтараў-сучаснікаў тэарэтычныя праблемы клуба даследавалі Е.А. Клюско, Е.Ю. Кудзінава, Л.Л. Новікава, Е.Н. Селязнёва, З.В. Чаруха. Клубныя аб’яднанні і праблемы іх узаемадзеяння з іншымі ўстановамі культуры, зносіны ў клубах вывучаюць А.С. Запясоцкі, Ю.Н. Кротава, С.С. Камісаранка, В.А. Разумны, С.Б. Сінецкі, В.І. Шаронаў.

Сярод пералічаных аўтараў асобна хацелася б вылучыць канцэптуальныя дысертацыйныя даследаванні Л.Л. Новікавай і Е.Н. Селязнёвай. Што тычыцца работы філосафа Л.Л. Новікавай, то яна ў сваіх працах мэты клуба дэтэрмініруе сутнаснымі патрэбамі асобы ў самадзейнасці, у культурным правядзенні вольнага часу, зносінах са знешнімі ўмовамі існавання клуба, вызначае ўнутраную і знешнюю задачы. У выніку даследчыца прапаноўвае, па-сутнасці, універсальную функцыянальную мадэль клуба, абумоўленую неабходнасцю рэалізацыі гэтых задач. Каштоўнасць мадэлі Л.Л. Новікавай – у яе функцыянальнай дынамічнасці, што дазваляе выкарыстоўваць канструктыўны механізм гэтай мадэлі для падтрымкі стабільнасці клубнага феномену.

Рэпазіторый ВДУ

Другая даследчыца Е.Н. Селязнёва ў размове аб функцыянальнай мадэлі сучаснага клуба даказвае, што клуб нельга разглядаць толькі як сукупнасць самадзейных калектываў і малых груп, таму што акрамя сістэмы міжасабовых групавых адносін, ён прадстаўляе сабой і адміністрацыйную (фармальную) структуру, развіваючую ўжо адносіны тыпу "асоба – грамадства".

Сярод беларускіх навукоўцаў, якіх цікавяць сучасныя праблемы клуба, трэба адзначыць А.М. Боганеву, Т.І. Стружэцкага, А.А. Макараву, якая да таго ж у сваім дысертацыйным даследаванні разгледзіла савецкі перыяд развіцця клубных устаноў на Беларусі [28; 29; 30; 49].

Сярод гісторыкаў становішча сучаснага клуба разглядаюць у сваёй фундаментальнай працы "Гісторыя культуры Беларусі" навукоўцы Л. Лыч і У. Навіцкі [27].

Сярод культуролагаў да праблем сацыякультурнай дзейнасці клубных устаноў звяртаецца вядомы беларускі культуролаг А.І. Смолік.

З мэтай вывучэння пытанняў аб далейшым развіцці клубнай установы ў 1995 г. у Мінску была праведзена рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Культурная сфера вольнага часу", у рамках правядзення якой была наладжана праца творчай лабараторыі "Клуб: мадэль XXI стагоддзя". Да ўдзелу ў гэтай лабараторыі былі запрошаны 72 вядучыя спецыялісты краіны ў сферы вольнага часу і народнай творчасці. На падвядзенні вынікаў работы творчай лабараторыі ўдзельнікамі былі вызначаны асноўныя прынцыпы, на якіх павінна будавацца дзейнасць клубных структур сучаснасці:

- уся работа клуба будучыні павінна ажыццяўляцца на асновах добраахвотнасці, самакіравання, ініцыятывы насельніцтва, уліку культурна-гістарычных традыцый, дыферэнцыяцыі і спецыялізацыі;
- клубныя ўстановы могуць выбіраць розныя напрамкі дзейнасці. У залежнасці ад мясцовых умоў, патрабаванняў насельніцтва, матэрыяльных, кадравых і інфармацыйных рэсурсаў яны вызначаюць свой профіль і спектр сацыяльна-культурных паслуг для насельніцтва свайго рэгіёна;
- з'яўляючыся юрыдычна самастойнымі ўстановамі, клубы будучыні павінны мець самыя розныя фінансава-эканамічныя мадэлі і механізмы кіравання [30].

У выніку можно адзначыць, што першапачаткова ўсімі навукоўцамі клубы разглядаліся пераважна як савецкія ідэалагічныя ўстановы, нягледзячы на багатую гісторыю фарміравання і развіцця, на багацце формаў, мэт і задач.

Репозиторий ВГУ

## 3.2. Роля дзяржаўнай культурнай палітыкі і гістарычнай памяці ў фарміраванні клубных традыцый сучаснасці

Вельмі значным фактарам для фарміравання напрамкаў далейшага развіцця культурнай сферы вольнага часу ў нашай краіне з'яўляецца культурная палітыка.

"Нашы галоўныя задачы ў сферы культурнай палітыкі складаюцца ў тым, каб, па-першае, падтрымліваць патрыятычную лінію ў беларускай культуры, ствараць умовы для развіцця яе традыцыйных і сучасных напрамкаў і, па-другое, выкарыстоўваючы гэты патэнцыял, умацоўваць міжнародны прэстыж краіны," – адзначыў у Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка [14].

Сёння культурная палітыка праводзіцца адпаведна двум асноўным дзяржаўным заканадаўчым актам: "Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь" (арт. № 51 і 54) [12] і Закона Беларускай Сацыялістычнай Рэспублікі "О культуре в Белорусской ССР" [3]. У артыкуле № 51 дэкларуецца права кожнага грамадзяніна на ўдзел у культурным жыцці. "Гэта права забяспечваецца агульнадаступнасцю каштоўнасцей айчынай і сусветнай культуры, якія знаходзяцца ў дзяржаўных і грамадскіх фондах, развіццём сеткі ўстаноў культуры сферы вольнага часу" [12]. Там жа гарантуецца свабода мастацкай, навуковай, тэхнічнай творчасці і выкладання; ахова інтэлектуальнай уласнасці; спрыянне з боку ўлады развіццю культуры, навуковых і тэхнічных даследаванняў [12]. Артыкулам жа № 54 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прадугледжваецца абавязак кожнага грамадзяніна "берагчы культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці" [12]. Адпаведна з артыкулам № 31 другога заканадаўчага акта ў мэтах арганізацыі культурна-асветніцкай дзейнасці, эстэтычнага выхавання і забеспячэння адпачынку насельніцтва, паўнацэннага выкарыстання вольнага часу на Беларусі гарантуецца развіццё разнастайных па тыпах і відах устаноў культуры: Палацаў (Дамоў) культуры, клубаў, Паркаў культуры і адпачынку, культурных Цэнтраў для моладзі і інш. [3].

Мы падзяляем думку даследчыка П.Р. Ігнатовіча, які лічыць, што на сучасным этапе грамадска-культурнага жыцця Беларусі можна вызначыць 4 асноўныя мэты і задачы дзяржаўнай культурнай палітыкі:

1. Асэнсаванне ролі культуры і яе месца ў жыцці грамадства.
2. Фарміраванне інтэлектуальных і маральных асноў стварэння дэмакратычнай прававой дзяржавы сродкамі культуры.
3. Стварэнне рэальных сацыяльна-палітычных і эканамічных умоў для станаўлення і развіцця на тэрыторыі рэспублікі

Рэпазіторый ВДУ

нацыянальнай культуры, захавання і папулярызацыі беларускай нацыянальнай спадчыны.

4. Ажыццяўленне рацыянальнай моўнай палітыкі, што забяспечвае высокую культуру беларускай мовы, стварэнне ўмоў для развіцця моў нацыянальных меншасцей, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі [11, с. 15–16].

Да дасягнення гэтых мэт і вырашэння пастаўленых задач даследчык П.Р. Ігнатовіч прапаноўвае наступныя шляхі:

- ажыццяўленне пераемнасці і непарыўнасці традыцый, апоры на фундаментальныя агульначалавечыя каштоўнасці, культурную і гістарычную спадчыну;
- гуманізацыю, умацаванне асобаснага зместу сацыяльнай і культурнай дзейнасці;
- раўнапраўнае развіццё культур прадстаўнікоў усіх этнасаў, якія жывуць у Беларусі;
- навуковую распрацоўку праблем культуры, творчай дзейнасці навуковых і навучальных устаноў, творчых аб’яднанняў і саюзаў па прагназаванні развіцця беларускай культуры;
- дэмакратызацыю кіравання культурай, умацавання самадзейных асноў культурнай дзейнасці, распрацоўкі і ажыццяўлення новых падыходаў, якія ўлічваюць сучасныя тэндэнцыі і накірункі яе развіцця;
- устанаўленне і развіццё шырокіх знешніх сувязей з замежнымі партнёрамі, перш за ўсё ў рамках Саюза Беларусі і Расіі і Садружнасці Незалежных Дзяржаў;
- гарманізацыя ўзаемаадносін паміж культурамі розных этнасаў, якія складаюць беларускі народ [11, с. 16].

Такім чынам, зыходзячы з галоўных мэт і задач сучаснай культурнай палітыкі добра відаць, што прыярытэтнымі накірункамі культурнай сферы вольнага часу з пачатку 1990-х гадоў з’яўляюцца захаванне і развіццё традыцыйных формаў народнай творчасці, уздым нацыянальнай самасвядомасці беларускай нацыі, стварэнне ўмоў, пры якіх мог бы свабодна выяўляцца яе нацыянальны характар. Гэта, у сваю чаргу, дазволіць прадстаўнікам іншых этнасаў, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі, плённа развіваць сваю культуру.

Прыярытэтнае значэнне ў сучасным жыцці грамадства пачынае набываць этнічная і рэлігійная ідэнтыфікацыя асобы. Беларускі культуролаг П.Р. Ігнатовіч у артыкуле “Культурная палітыка Рэспублікі Беларусь на этапе трансфармацыі грамадства” справядліва піша: “Кожны народ праз успрыманне і пераўтварэнне культурнай спадчыны выпрацоўвае аптымальную сістэму каштоўнасцей, стварае выхаваўчы ідэал, які адпавядае яго менталітэту, яго традыцыйным

Рэпазіторый ВДУ

уяўленням аб дасканалай асобе. Народны ідэал увасабляе ўсё багацце гістарычнай спадчыны, этнасу, яго адметны менталітэт” [11, с. 14].

У сувязі са зменамі і адпаведнай сацыяльна-культурнай сітуацыяй, у апошнія гады з’явілася шэраг рознага роду законаў, якія паслужылі асновай для фарміравання і развіцця рознаўзроўневай і шматпрофільнай культурнай інфраструктуры. Да ліку асноўных заканадаўчых актаў кіраўніцтва дзяржавай таксама можна аднесці: “Аб ахове гісторыка-культуранй спадчыны” [3] і “Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь” [3]. Акрамя таго быў распрацаваны і зацверджаны рад палажэнняў: “Палажэнне аб Цэнтры (Доме) рамёстваў” [3]; “Палажэнне аб народным майстры” [3]; “Палажэнне аб нацыянальнай выставе твораў народнага мастацтва” [3]; “Палажэнне аб дзяржаўным фондзе падтрымкі народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў” [3]; “Палажэнне аб аўтэнтычным фальклорным гурце ў Рэспубліцы Беларусь” [3] і іншыя.

Трэба сказаць, што на сучасным этапе культурная палітыка стала больш “гібкая” ў параўнанні з культурнай палітыкай савецкага перыяду жыццядзейнасці беларускага грамадства. Акрамя агульнадзяржаўнай, усё большае пашырэнне атрымлівае рэгіянальная культурная палітыка. Яна цесна звязана з тымі формамі, метадамі і напрамкамі ў засваенні і памнажэнні мастацкай народнай спадчыны, якія па-свойму склаліся ў кожным з шасці рэгіёнаў нашай краіны (Паазер’і, Падняпроў’і, Панямонні, Усходнім і Заходнім Палессі, Цэнтральнай Беларусі). Такі разнастайны і неаднародны падыход – нармальная з’ява для жывога працэсу, які не можа і не павінен быць уніфікаваным і аднолькавым на розных тэрыторыях.

На сённяшні дзень у рэспубліцы дастаткова выразна вызначыліся **два шляхі** развіцця рэгіянальнай культурнай палітыкі. Першы – ініцыіраванне грамадскіх і дзяржаўных структур, якія займаюцца вывучэннем і папулярызацыяй традыцыйнай культуры. Гэта новыя тыпы ўстаноў (Дамы і Цэнтры рамёстваў, фальклору, народнай творчасці і інш.), грамадскія аб’яднанні (напрыклад, клубы майстроў), школы народнай творчасці, аддзяленні і спецыялізацыі ў дзіцячых мастацкіх школах, майстэрні па відах рамёстваў пры музеях і інш. Другі шлях – фарміраванне рэгіянальных праграм і мэтавае іх фінансаванне.

Рэгіянальная праграма мае на ўвазе мэтанакіраваную паэтапную дзейнасць у выбраным накірунку, вызначае адпаведную базу для далейшай работы, прадугледжвае ўдасканаленне альбо пераарыентацыю дзейнасці існуючых устаноў культуры, альбо стварэнне новых структур, якія будуць выконваць задачу захавання культуры сваёй мясцовасці. Праграмны падыход дазваляе вызначыць

Рэпазіторый ВДУ

этапы, неабходныя для стварэння ўстаноў новага тыпу. Прыкладна яны выглядаюць такім чынам: даследчая работа – выяўленне адпаведных асяродкаў – мерапрыемствы – вызначэнне базы – стварэнне структуры.

Такім чынам, вынікае, што вельмі значным фактарам для вырашэння вызначаных задач, захавання і развіцця культурных традыцый нашай краіны трэба назваць гістарычную памяць. Актуальнасць яе навуковага даследавання і практычнага выкарыстання ў рабоце клубных устаноў культуры і дзейнасці аматарскіх аб'яднанняў значна ўзрасла пасля атрымання Беларуссю суверэнітэту і незалежнасці. Разам з тым, ва ўмовах пазнавальна-інфармацыйнай свабоды і культурнага выбуху ў Беларусі пачаўся інтэнсіўны пошук сваёй культурнай ідэнтычнасці, сапраўдных духоўных арыенціраў. У працэсе трансфармацыі грамадства адбываюцца змены адносна ўнутранага свету чалавека, яго сацыя-культурных пазіцый і каштоўнасных арыентацый. У сваю чаргу, гістарычная памяць цесна звязана з тэмай нашага даследавання таму, што яна аказала значнае ўздзеянне на станаўленне і напрамкі развіцця сацыякультурнай (клубнай) дзейнасці на тэрыторыі Беларусі.

Гістарычная памяць – адзін з элементаў духоўнага жыцця грамадства, які выступае як спосаб жыццядзейнасці людзей. Пры гэтым духоўнае жыццё пранізвае ўсе без выключэння грамадскія сферы, педагогіку, сацыяльна-культурную дзейнасць. Яна ўключае ў сябе таксама ідэалогію і псіхалогію. У той жа час, духоўнае жыццё грамадства – з'ява адносна самастойная. Дакладнае яго разуменне патрабуе разгляду вынікаў духоўнай вытворчасці, гэта значыць, стварэння духоўных прадуктаў (ідэй, каштоўнасцей), якія перадаюцца не толькі "вертыкальна" (з пакалення ў пакаленне, ад аднаго народа да другога), але і "гарызантальна" – ад адной групы грамадства да другой. Яны з'яўляюцца як бы сацыяльнай памяццю грамадства ў яго гістарычным развіцці. У той жа час духоўнае жыццё ўключае ў сябе не толькі духоўную вытворчасць, але і кажучы мовай сацыялогіі, "выкарыстанне" яго "прадуктаў": іх перадачу, узнаўленне, рэгуляванне для таго, каб яны маглі функцыянаваць у сучасным грамадстве. Гэту задачу трансляцыі ідэй, каштоўнасцей і вырашае гістарычная памяць.

Аналіз станаўлення і функцыянавання гістарычнай памяці патрабуе дакладных метадалагічных асноў. Адна з іх – выяўленне духоўнай, ідэальнай структуры працэсу гістарычнага развіцця народа, краіны, рэгіёна, горада або сяла. Элементам жа ўсяго гэтага працэсу і з'яўляецца гістарычная памяць. Яе характарыстыка дазваляе грунтоўна пашырыць традыцыйныя ўяўленні аб працэсе гістарычнага развіцця, узнаўленне якога не зводзіцца да апісання матэрыяльных формаў жыцця, сацыяльных адносін, палітычных інстытутаў, з'яў



Рэпазіторый ВДУ

культуры. Усё гэта абсалютна неабходна, але недастаткова для ўсёабдымнага асэнсавання гісторыі таго ці іншага аб'екта ва ўсёй паўнаце яго адрозненняў. Каб дапоўніць гэта паняцце духоўнай структуры, недастаткова абмежавацца аб'ектам, тут неабходны ўлік і таго суб'екта, які ўспрымае гэты гістарычны працэс.

Гістарычная памяць адносіцца менавіта да тых сацыяльна-культурных уяўленняў людзей, якія закладаюцца і падтрымліваюцца ў працэсе маўленчай сацыялізацыі індывіда, яго непасрэднай сацыялізацыі матэрыяльнай і духоўнай культурай, мастацтвам, рэлігіяй. Гэты працэс ажыццяўляецца спецыфічна на розных стадыях развіцця індывіда, пачынаючы з дзяцінства. Неабходнасць непарыўнасці працэсаў функцыянавання памяці, адным з падвідаў якой з'яўляецца і памяць гістарычная, глыбока раскрыта ў манаграфіях балгарскіх даследчыкаў І. Ніколава і Г. Нешава [36, с. 54]. "Загадкай тысячагоддзяў" назвалі яны памяць, гэта своеасаблівае дзіва прыроды. Па-за яе межамі чалавек не быў бы чалавекам у поўным сэнсе гэтага слова, так як ён страціў бы тое, што было б з ім, з яго існаваннем, і з відавочным светам, які ён успрымае [36, с. 57]. Чалавек быў бы выключаны з патоку часу, усё яго мінулае памерла б для будучыні.

Памяць – неабходная ўмова функцыянавання культуры, так як па-за межамі памяці чалавек не змог бы абапірацца ў працэсе свайго жыццёвага шляху на вопыт папярэднікаў, іх веды, уменні, працоўныя і сацыяльныя навыкі. Без памяці не можа існаваць паўнацэннае псіхічнае жыццё асобы, яе непарыўнае навучанне і ўдасканаленне.

Неабходна заўважыць, што навуковы аналіз катэгорыі "гістарычная памяць" і, дарэчы, суадносіны дзвюх яе складаючых частак – памяці і гісторыі – і па сённяшні дзень прыцягваюць увагу пераважна замежных культуролагаў, філосафаў і гісторыкаў, але сацыяльна-педагагічны аспект гэтай праблемы пакуль што не знайшоў адлюстравання ў іх работах.

"Існаванне гістарычнай свядомасці па-за межамі паняцця «памяць» – немагчыма, – сцвярджае ў артыкуле «Памяць гісторыі» Ю. Афанасьеў і дае ёмкую формулу – «Памяць – Гісторыя – Свядомасць»" [2, с. 467]. Гэта памяць уласціва як супольнасці людзей, так і індывідам. У выніку такія агульназначныя формы адлюстравання гісторыі, як звычаі, традыцыі, сімвалы, якія існуюць у духоўнай сферы, дастаткова аб'ектыўна, незалежна ад індывідуальнай свядомасці, у той жа час праламляюцца ў свядомасці асобных людзей. Тут сумяшчаюцца дыялектыкі агульнага і асобнага, абсалютнага і адноснага. Інакш кажучы, гістарычная памяць – з'ява шматгранная, а шматлікае яе праяўленне ўяўляе суму аднолькавых прадстаўленняў аб мінулым. Менавіта гэта рыса і з'яўляецца асновай сучаснай сацыякультурнай дзейнасці.

Репозиторий ВГУ

Нам прадстаўляецца тыповым суджэнне сучаснага нямецкага даследчыка Хальбванса, які лічыць, што “відаў памяці столькі ж, колькі і груп людзей”. Для сацыяльнай педагогікі гэты вывад надзвычай значны – з яго вынікае неабходнасць канкрэтнага падыходу да розных груп людзей у працэсе фарміравання гістарычнай памяці. Дакладная характарыстыка суадносінаў гісторыі і памяці сустракаецца ў манаграфіі М.М. Трубнікава [54, с. 17].

Гісторыя і памяць, на яго думку, займаюць розныя месцы ў часовым радзе і падпарадкоўваюцца розным храналагічным прынцыпам. Гісторыя адносіцца да мінулага, а памяць – заўсёды толькі ў сучасным. Мінулае, дзякуючы памяці, пастаянна знаходзіцца ў сучаснасці, складае яго змест, “тлее ў сучаснасці і аддае нам сваё цяпло... Яна захоўваецца ў сучасным не толькі як “сляды на пяску”, але і як выток, корань, як зерне сучаснага, як яго семя і як яго стрыжань, накшталт унутраных слаёў у ствале дрэва, або ў падкорцы чалавечага мозгу. Мінулае складае глебу, у якой “«спее» будучыня” [54, с. 17].

Сацыяльная памяць, хоць і існуе як элемент духоўнага жыцця індывіда і грамадства, мае дастаткова рэальныя і матэрыяльныя асновы і фіксацыя іх прадстаўляецца асабліва значнай для сацыяльнай педагогікі. Выхаванне людзей ажыццяўляецца не толькі ў сферы слоў або вербальнай сферы. Гэта – толькі знешняе выяўленне рэальных асноў гістарычнай памяці. Яно, гэта выхаванне, заснавана на прызнанні ролі аб’ектыўных носьбітаў гістарычнай памяці. Да іх адносяцца: а) прылады працы і агульныя вынікі працы, якія падчас выражаны ў такіх паняццях як “другая прырода” і “матэрыльная культура”, у тым ліку і помнікі архітэктуры; б) аб’ектыўныя сацыяльныя адносіны, якія ў выніку маюць у якасці сваёй першаасновы вытворчыя адносіны; в) мова ў шырокім сэнсе гэтага слова (маецца на ўвазе як мовы натуральныя, так і ненатуральныя (штучныя), а таксама шматвобразныя па-за моўныя семіятычныя сродкі (знакі, сімвалы і г.д.)” [44, с. 45–46].

Для сацыяльнай педагогікі архіважнай з’яўляецца характарыстыка дакладнага, лакальнага характара дзеяння гістарычнай памяці, аб чым ідзе гаворка ў калектыўнай рабоце французскіх вучоных “Месца памяці” [1, с. 73]. У адпаведнасці з традыцыйнымі ўстаноўкамі школы Аналаў, якая ўплывае на ўсю Францыю, гісторыя разглядаецца не як адзіны цэласны працэс для ўсёй краіны, а як сукупнасць асобных фрагментаў, элементаў – “месцаў”. Адпаведна і гістарычная памяць не можа зберагчы і аднавіць агульную і непарыўную гісторыю горада, краіны, але асобныя “месцы” гэтай гісторыі. Дыяпазон гэтых канкрэтных “месцаў” дастаткова разнастайны – тут і нацыянальны архіў, і помнікі, і музеі. Але тут і мова, і людзі, якія выконваюць функцыю сімвалаў, носьбітаў пэўных

ідэй і каштоўнасцей. У гэтай якасці яны – увасабленне гістарычнай памяці. Увесь шырокі дыяпазон аб'ектаў гістарычнай памяці – адпаведна "месцаў" – утрымлівае, на думку аўтараў манаграфіі, тры сэнсы: матэрыяльны, сімвалістычны і функцыянальны.

Гэтыя тры сэнсы нельга падзяліць па прасторавых межах. Яны могуць сумяшчацца ў адным аб'екце. Храм, палац, былы маёнтак – усё гэта цалкам матэрыяльныя аб'екты, але кожны з іх мае функцыянальнае прызначэнне, выконвае вызначаную сацыяльную ролю. Гэта месца і пражывання, і навучання, і мастацкай дзейнасці і рэлігійных абрадаў. Але, што асабліва важна для разумення гістарычнай памяці, – гэта месца з'яўляецца ў той жа час і носьбітам сімвалічнага сэнсу: дом, палац, храм нагадваюць аб пэўных падзеях, аб людзях, аб комплексах ідэй і ідэалаў, якімі гэтыя людзі кіраваліся.

П. Нора вызначае, што "хуткае знікненне нашай нацыянальнай памяці, ...патрабуе інвентарызацыі месцаў, у якіх яна ўвасоблена і якія па волі людзей або ў выніку векавой працы застаюцца толькі бліскучымі сімваламі: гэта святы, эмблемы, урачыстасці ў гонар людзей або падзей, а таксама хвалебныя прамовы, школьныя слоўнікі і музеі" [1, с. 73].

У выніку сувязь у гісторыі і яе цэльнасць забяспечваюцца гістарычнай памяццю. Без узнаўлення памяці развіццё гісторыі проста немагчыма, бо мінулага як рэальнасці ужо не існуе, будучае яшчэ не прыйшло, і толькі гістарычная памяць дае нам магчымасць асэнсаваць плынь часу, сувязь сённяшняга і мінулага з будучым.

Нягледзячы на існаванне некаторых даследаванняў, паняцце гістарычнай памяці застаецца недастаткова даследаваным. У той жа час яно мае несумненнае тэарэтычнае і практычнае значэнне. Па-за межамі асэнсавання гістарычнай памяці як сацыяльна-культурнага фенамена, немагчыма зрабіць аналіз такога інтэгральнага паняцця, як гістарычная традыцыя, немагчыма і здзяйсненне патрыятычнага выхавання, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця прыналежнасці да каштоўнасцей нацыянальнай культуры.

У працэсе аналізу фенамена гістарычнай памяці неабходна звярнуцца да дадзеных з галін агульнай псіхалогіі і гісторыі філасофіі, дзе праблема памяці распрацавана дастаткова глыбока і грунтоўна. У антычнай філасофіі памяць разглядалася як вынік "успамінаў" (Платон), выяўляліся таксама такія рысы памяці, як актыўнасць, сувязь ідэй з часам (Арыстоцель); у філасофіі Новага часу была выяўлена роля асацыяцый у структуры памяці (Габэ, Юм), вызначана структура памяці ў плане суадносін у ёй "рухомай", "фізіялагічнай" і "вобразнай" прыроды (Бергсан, экзістэнцыялісты), характарызавалася эмацыянальная сутнасць памяці (фрэйдызм). У ХХ стагоддзі вызначыліся шляхі зразумення гістарычнай памяці: сацыяльна-



Рэпазіторый ВДУ

псіхалагічная школа Дзюркгейма суаднесла памяць з аб'ектыўнымі сацыяльнымі з'явамі этнічнага і рэлігійнага характару.

Сучасная псіхалогія трактуе памяць як форму псіхічнага адлюстравання рэчаіснасці, якая заключаецца ў замацаванні, зберажэнні і наступным узнаўленні чалавекам свайго вопыту. Адрозніваюць віды памяці: рухомую, вобразную, славесна-лагічную і эмацыянальную. Гэтыя прынцыпы з'яўляюцца грунтоўнымі для разумення і памяці гістарычнай як разнавіднасці памяці. Яе характарыстыка адрозніваецца некаторымі асаблівасцямі. Па-першае, у ёй аднаўляюцца не толькі і не столькі калектыўны вопыт той ці іншай сацыяльнай групы або этнаса; па-другое, выключаецца рухомая памяць і ў поўнай меры функцыянуюць іншыя яе тры віды: вобразная, лагічная і эмацыянальная. Прычым, у адрозненне ад памяці індывідуальнай, гістарычная памяць функцыянуе ў адзінстве ўсіх трох разнавіднасцей. Ні адна не можа рэальна існаваць па-за межамі адзінства мысліцельных і эмацыянальных пачаткаў.

Акрамя псіхалагічнага падыходу паняцце гістарычнай памяці патрабуе для свайго аналізу і дадзеных сацыяльнай антрапалогіі. Антрапалогія, якая вывучае цэласнага чалавека, дастаткова заканамерна даследуе: а) асвету, адукацыю, культурнае станаўленне чалавека; б) сукупнасць і цэласнасць звычаяў, традыцый, звычак, іх трансляцыю і пераемнасць; в) своеасаблівае развіццё пэўнай культуры, яе адрозненне ад іншых культурных цэласнасцей.

Антрапалогія ў яе філасофскім і сацыяльным разуменні хоць і звяртаецца да дадзеных натуральных навук, аднак, яе ядро, яе сутнасць, яе сэнс – гэта разуменне культуры і ўсіх механізмаў, якія абумоўліваюць станаўленне і формы перадачы культуры. Таму што чалавек – як прадмет пазнання антрапалогіі – абавязкова ўключаны ў вызначаную культурную супольнасць, цэласнасць, па-за яе межамі ён, як чалавек, не існуе, адпаведна, не функцыянуе. Гэта ў поўнай меры адносіцца і да гістарычнай памяці.

Аб'ектам гістарычнай памяці могуць выступаць з'явы і працэсы ў шырокім дыяпазоне – ад буйных гістарычных падзей у масштабах краіны або асобнага рэгіёна да з'яў матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія выклікаюць вызначаныя сітуацыі. Гістарычная памяць цесна звязана з патрыятычнай свядомасцю, многім служыць яе зместавай асновай, яна ж забяспечвае пераемнасць пакаленняў.

Карані патрыятызму, як асновы і ў вядомай ступені вынікі гістарычнай памяці, ідуць з глыбіні тысячагоддзяў. Патрыятызм – адно з найбольш глыбокіх пачуццяў, якое замацавана стагоддзямі. Таму зусім натуральна, што гэта глыбокае пачуцце было і застаецца адным з самых дзейсных фактараў уплыву на масы, іх унутраным пабуджальным стымулам да дзейнасці.

Рэпазіторый ВДУ

Патрыятызм мае сваю аснову – Любоў да Айчыны. Пад Айчынай разумеецца вызначаны сінтэз прыродных, этнічных і сацыяльных элементаў. У структуру ўваходзяць як сістэмы грамадскіх зносін, так і прыродная аснова грамадства на канкрэтнай тэрыторыі, дзе ажыццяўляецца працэс жыццядзейнасці насельніцтва. У той складанай і шматгранай структуры ёсць элементы з дакладна выражанай сацыяльнай характарыстыкай (грамадскі і дзяржаўны слой), але ёсць і элементы, якія не носяць сацыяльнага характару (асаблівасці прыродных ландшафтаў, мова народа, яго псіхалагічны склад – менталітэт). Наяўнасць такіх сацыяльна-нейтральных элементаў робіць іх аб’ектам патрыятычнага пачуцця прадстаўнікоў розных класаў. Таму пры ўсёй выбарачнасці гістарычнай памяці, яе сацыяльнай дэтэрмінацыі, яна ў кожнага народа мае агульную для ўсіх яго прадстаўнікоў аб’ектыўную аснову.

На працягу шэрагу дзесяцігоддзяў гістарычная памяць беларусаў была істотным чынам дэфармавана, а ў адносінах некаторых з’яў і ўвогуле страчана. Гэта адбывалася пад уплывам гістарычных працэсаў першых паслярэвалюцыйных гадоў, змен маральных каштоўнасцей, панавання сацыялістычнай ідэалогіі. У грамадскай свядомасці фарміравалася новае прадстаўленне аб мінулым. Вынік яго – знішчэнне важнейшай часткі таго, што складала духоўную культуру нацыі. Разрыў з мінулым азначаў разрыў пераемнасці пакаленняў, страту грунтоўных элементаў традыцыйнай нацыянальнай культуры.

Ідэалагічнае аднаўленне новай палітычнай сістэмы знайшло сваё адлюстраванне ў фарміраванні скажонай грамадскай гістарычнай свядомасці. З памяці народа аказаліся выкрэсленымі звычаі, сімвалы і іншыя з’явы духоўнага жыцця. Назвы гарадоў, вуліц, гістарычных месцаў, нават святаў, замяняліся новымі тэрмінамі і назвамі якія, як правіла, мелі ідэалагічны характар. Усё, што складала гістарычную спецыфіку асобнага рэгіёна, траціла сваю індывідуальнасць. У свядомасці людзей гэта нарадзіла прадстаўленне аб пачатку новай гістарычнай эры, якая не мае пераемнасці і сувязі з мінулым. Таму зусім заканамерна, што імкненне адгарадзіцца ад мінулага выяўлялася ў першую чаргу ў вынішчэнні гістарычнай памяці, у “барацьбе” супраць рэчаў, якія ўвасаблялі гэтую памяць. Менавіта так адбывалася ў 1920–1930-я гг. у Савецкай Беларусі, калі шырока распаўсюджваліся псеўдарэвалюцыйныя ідэі поўнага разрыву з “проклятым прошлым”. Імкненне хутчэй вызваліцца ад путаў мінулага прыводзіла да крайнасцей, часта пераносілася на адносіны да рэчаў, твораў мастацтва, якія толькі знешне нагадвалі аб мінулым, а на самой справе ніяк не былі звязаны з ім.

Знакі гістарычнай памяці маюць розныя маштабы – гэта не толькі асобныя рэчы, але і цэлыя гарады, рэгіёны, у якіх найбольш

Рэпазіторый ВДУ

арганічна гісторыяй “узвязаны” духоўныя і гістарычныя каштоўнасці, якія з’яўляюцца асновай сацыякультурнай практыкі.

Фарміраванне і захаванне памяці ажыццяўляюцца ў ходзе сацыяльна-педагагічнага працэсу. Адукацыя, у шырокім сэнсе гэтага слова, фармальная і нефармальная з’яўляецца неад’емнай часткай культуры грамадства. Яна вызначае трансляцыю ведаў, ідэй, уменняў, ацэнак як у гарызантальнай, так і ў вертыкальнай плоскасці. Пад “гарызантальнай” разумеецца распаўсюджанне наяўных ведаў у розных формах – пачатковай, сярэдняй, вышэйшай адукацыі, у лекцыях, экскурсіях, конкурсах, у розных прасторавых граніцах – ад камерных (група) да нацыянальных і транснацыянальных сродкамі сучасных тэхнічных дасягненняў распаўсюджання ведаў (тэлебачанне, камп’ютарызацыя, дыстанцыйная адукацыя). Пад “вертыкальнай” разумеецца перадача ведаў ад пакалення да пакалення. Таму фенамен гістарычнай памяці, які з’яўляецца складаючым элементам культуры, можа разглядацца ў розных ракурсах – інфармацыйным, навуковым, сацыялагічным, педагагічным.

Дыялог культуры зацвярджаецца не толькі як узаемадзеянне ў гарызантальнай плоскасці, гэта значыць, узаемасувязь існуючых у сённяшнім часе культур, але і як уключэнне ў гэты дыялог культурных каштоўнасцей мінулага, кожная з якіх мае свае годнасці. Гэта і ёсць увасабленне гістарычнай памяці. На ўзроўні сучасных навуковых прадстаўленняў аб сутнасці гістарычнай памяці яе далейшае вывучэнне немагчыма без суаднясення яе з асноўнымі тэндэнцыямі развіцця цывілізацыі (як у агульначалавечым маштабе, так і ў лакальным, у дадзеным выпадку – канкрэтна-гістарычнай беларускай цывілізацыі), калі пад словам “цывілізацыя” разумець спосаб існавання буйной сацыяльнай супольнасці людзей, які склаўся гістарычна, спецыфічную форму яе самаарганізацыі і рэгулявання працэсаў [37, с. 14].

У гэтай сістэме гістарычная памяць выконвае тры найбольш значныя **функцыі**, такія, як:

1. Абагульненне, зберажэнне і перадача гістарычнага вопыту пакаленняў.

2. Акумуліраванне яго ў выглядзе сістэмы каштоўнастных арыентацый.

3. Рэгуляванне жыццядзейнасці грамадства каштоўнаснымі арыентацыямі сацыяльна-культурных нормаў калектыўнага і індывідуальнага вобразу жыцця.

Інструментарый гістарычнай памяці, які выкарыстоўваецца для гэтага, як ужо адзначалася намі вышэй, дастатова вялікі: выхаванне, адукацыя, асвета, рэлігія, мастацтва – уся сутнасць сацыяльна-арыентаванага вобразу жыцця.



Рэпазіторый ВГУ

Таму гістарычная памяць заўсёды з'яўляецца, па-першае, неад'емнай часткай дзяржаўнай палітыкі ў цэлым, адлюстроўвае яе духоўна-каштоўнасны і маральна-нарматыўны аспекты, па-другое, асаблівым кірункам кантролю дзяржавы над грамадскай дзейнасцю па стымуляванні і наладжаных сацыяльна-дапушчальных і духоўных традыцый, якія пераважаюць у канкрэтнай краіне або яе рэгіёне. Менавіта на гэтым узроўні сукупнасці сацыяльна-культурных сіл магчыма найбольш аптымальная запатрабаванасць гістарычнай памяці, неабходная насельніцтву ў станаўленні адпаведных новым умовам параметраў вобразу жыцця, нацыянальна-культурнай, сацыяльна-эканамічнай і дзяржаўна-палітычнай ідэнтычнасці, формаў духоўнага самавызначэння і самавыяўлення, грамадскага і індывідуальнага сацыякультурнай свядомасці.

## 3.3. Трансфармацыя клубнай сістэмы ў постсавецкі перыяд

На новым этапе развіцця грамадства ўзнікае неабходнасць стварэння такіх арганізацый і клубных фарміраванняў для правядзення вольнага часу грамадзян, дзе індывідуальныя мэты і запыты чалавека з'яўляліся б асноўнай каштоўнасцю, дзе чалавек разглядаецца не як аб'ект культурнага абслугоўвання, культурнага ўздзеяння і культурна-масавай работы, а як актыўны суб'ект, раўнапраўны партнёр у вялікім доме пад назвай "установа культуры". Выяўленне, задавальненне і развіццё культурных запатрабаванняў і інтарэсаў, якое адбываецца ў сістэме ўстаноў і арганізацый, якія служаць менавіта гэтай мэце, непарыўна звязаны з задавальненнем і развіццём культурных запатрабаванняў і інтарэсаў грамадства ў цэлым. Гэтыя працэсы аказваюць вызначальны ўплыў на сучаснае развіццё сеткі клубных устаноў культуры.

У 1991 годзе крызіс савецкай палітычнай і эканамічнай сістэм дасягнуў свайго апагею. У рэспубліцы вырасла цікавасць да гісторыі і народнай культуры; ад проціпастаўлення розных культурных слаёў – афіцыйнага і андэграўндскага, бытавога да засваення полікультурнай прасторы, якая ахоплівае традыцыйны фальклор, аматарскую культурна-мастацкую дзейнасць і розныя ініцыятыўныя формы і накірункі мастацка-творчай актыўнасці насельніцтва, як індывідуальныя, так і групавыя. На базе ўстаноў культуры пачалі ствараюцца фальклорныя калектывы, клубы народных майстроў, якія перараслі ў новы тып устаноў культуры – Дом рамёстваў, Дом фальклору. Гэты ж перыяд адзначаецца значным ростам аматарскіх аб'яднанняў, якія ствараюцца па ініцыятыве "знізу", што выклікае

Рэпазіторый ВДУ

неабходнасць перабудовы арганізацыі і дзейнасці сацыяльна-культурнай сферы па прынцыпу суб’ект-суб’ектных адносін.

Сацыяльна-культурная сітуацыя ў рэспубліцы на рубяжы стагоддзяў складалася ў залежнасці ад сацыяльна-эканамічных рэформ, якія праводзіліся кіраўніцтвам дзяржавы і таму падуладны ўплыву як пазітыўных, так і негатыўных вынікаў дадзенага працэсу. З аднаго боку, назіраюцца пазітыўныя перамены, звязаныя з актывізацыяй сацыяльна-культурнай творчасці, узбагачэннем спектру культурных ініцыятыў за кошт развіцця рознага роду грамадскіх аб’яднанняў, рухаў, клубаў, асацыяцый.

Мадэрнізацыйныя працэсы апошняга дзесяцігоддзя нарадзілі новыя аб’екты культуры, пашырылі сферу паслуг, значна павялічылі культурны патэнцыял грамадства. З другога боку, набіраюць сілу тэндэнцыі і працэсы, якія негатыўна характарызуюць сённяшнюю сацыяльна-культурную сітуацыю. Павялічваецца разрыў паміж інавацыйным патэнцыялам культуры, масавай здольнасцю яго засваення і выкарыстання ў штодзённай сацыяльна-культурнай практыцы. Дынамізм грамадскага культурнага жыцця выклікаў значнае ўскладненне структуры і зместу адносін людзей адзін да аднаго, з прыродным і ненатуральным наваколлем, якое выяўляецца як у аб’ектыўных паказчыках (у колькасным павялічэнні якасна розных прадметаў, мастацкіх вобразаў, узораў паводзінаў і ўзаемадзеяння), так і ў суб’ектыўнай плоскасці ўскладнення.

Тэарэтычны аналіз нешматлікіх работ айчынных даследчыкаў гісторыі і тэорыі сучаснай сацыякультурнай сферы ў першую чаргу работ А.А. Макаравай [30] паказвае, што аптымальны варыянт развіцця, які мабільна рэагуе на перамены ў сацыяльна-культурнай сітуацыі рэгіёна, магчымы менавіта на ўзроўні правядзення рэгіянальнай культурнай палітыкі. Перспектыўнае развіццё сеткі ўстаноў культуры і ўсёй сферы правядзення вольнага часу павінен грунтавацца на аднаўленнні культурна-гістарычных каранёў, уліку ўмоў жыцця насельніцтва пэўнага рэгіёна Беларусі з аднога боку, і пашырэння клубнага руху – з другога.

Улічваючы, што нацыянальная культура з’яўляецца асновай сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства, выхад з сённяшней крызіснай сітуацыі трэба шукаць, перш за ўсё, у самой духоўнай сферы. Для гэтага культура (асабліва рэгіянальна), павінна вярнуць страчаную цэласнасць, адрадзіць гістарычную пераемнасць, асэнсаваць сваю духоўную самабытнасць. “Аднаўленне цэласнасці і арганічнасці нацыянальна-культурнага свету – задача, – пісаў Д.С. Ліхачоў, – не менш істотная, чым захаванне навакольнага асяроддзя, яна неабходна для «духоўнай аседласці» чалавека, яго маральнай дысцыпліны і сацыяльнасці” [25, с. 51].



Репозиторий ВГУ

Усё гэта дазваляе выявіць і некаторыя агульныя сацыяльна-культурныя тэндэнцыі, якія склаліся ў рэспубліцы ў перыяд рэфарміравання грамадства.

Таму мы прапаноўваем выдзяляць тры канцэптуальныя напрамкі, якія характарызуюць увесь зместавы стан сучаснай сацыяльна-культурнай сітуацыі.

1. Вызваленне ад ідэалагічнага дыктата.
2. Акумуляцыя гістарычнага вопыту ў выглядзе сацыяльна-культурных каштоўнасных арыентацый.
3. Рэгуляванне практычнай жыццядзейнасці грамадства з дапамогай заснаваных на каштоўнасных арыентацыях сацыякультурных норм калектыўнага і індывідуальнага вобразу жыцця.

Унутраннае развіццё гэтых напрамкаў вызначаецца закладзенымі ў іх супрацьлегласцямі, рэалізацыя якіх вызначае будучае беларускай цывілізацыі. Яны суадносяцца з іх рэгіянальнымі праявамі, як агульнае з прыватным, дзе ў спецыфіцы і самабытнасці канкрэтнай тэрыторыі вызначаюць асаблівасці сацыяльна-культурнай сітуацыі рэгёнаў.

Заканамерна характарыстыку сацыякультурнай сітуацыі пачынаць з працэсу кардынальнага змянення светапоглядных установак і агульнаметадалагічных прынцыпаў. Са стратай манаполіі таталітарнай ідэалогіі, якая панавала як агульнадзяржаўная і абавязковая, у тым ліку ва ўсіх сферах духоўнага, грамадскага і культурнага жыцця дамінуючымі становяцца агульначалавечыя каштоўнасці. Змяняюцца адносіны да культурнай спадчыны, рэлігіі, дасягненняў культуры "заходнееўрапейскага" грамадства і эміграцыі, пачынаецца працэс вяртання культуры Беларусі ў адзіную сусветную культурную прастору. Разам з тым, у сучасным грамадстве не паспелі сфарміравацца высокаўстойлівыя духоўна-маральныя арыенціры, прасочваюцца тэндэнцыі дэгуманізацыі жыцця, культуры і мастацтва, нігелізму, грамадскай апатыі.

Наступным напрамкам з'яўляецца гістарычны паварот да чалавека, яго запатрабаванняў, інтарэсаў, запытаў. У Канстытуцыі чалавек як асоба абвяшчаецца вышэйшай каштоўнасцю. У "Законе аб культуры" [3] зацвярджаецца яго прыярытэт ва ўсіх сферах і формах культурнай дзейнасці, гарантуецца свабода творчасці, інтэлектуальная ўласнасць знаходзіцца пад аховай закона. Аднак сацыяльная безабароннасць работнікаў культуры, праблемы ў фарміраванні рынку культурных паслуг і мастацкіх каштоўнасцей прынеслі ў жыццё многія негатыўныя з'явы, у тым ліку, збяднеласць мастацкай інтэлігенцыі, падзенне прэстыжу культуры ў грамадстве ў выніку чаго адбываецца і значная пераарыентацыя грамадскай свядомасці – з духоўных каштоўнасцей на каштоўнасці матэрыяльнага дастатку.



Репозиторий ВГУ

Трэцім накірункам з'яўляецца развіццё рынавых адносінаў, што нарадзіла новую парадыгму гаспадарчага механізму, і менавіта тут узнікае адна з галоўных супярэчнасцей працэсу мадэрнізацыі ў сферы культуры – паміж неабходнасцю дастаткова хуткага абнаўлення створаных культурных набыткаў і сістэмы духоўнай рэгуляцыі, якая ўжо не адпавядае памкненням новага грамадства, і зберажэннем таго каштоўнага, што падтрымлівае жыццязначныя функцыі грамадства ў яго шматвобразнай і шматузроўневай сістэме вытворчасці і дзейнасці.

Пачынаючы з пачатку 1990-х гг. у дзейнасці ўстаноў клубнага тыпу назіраецца перавага забаўляльнага зместу над духоўна-пазнаваўчым, адбываецца свядомы адыход ад выхаваўчых функцый, узмацняецца ўплыў замежнай культуры, яе узораў маралі, правілаў і норм паводзінаў. Найбольш яскрава гэта праявілася ў дэмакратызацыі яе межавых установак, формах арганізацыі, умовах функцыяніравання, змесце і методыцы дзейнасці.

У правядзенні вольнага часу насельніцтва адбыўся пераход сацыяльна-культурнай сферы Беларусі да рынавых адносінаў, які абумовіў пераўтварэнні ў яе сістэме, з'яўленне новых крыніц фінансавання, пераарыентацыю кадравага патэнцыялу, у першую чаргу прывёў да перабудовы арганізацыйна-кіраўнічых механізмаў. Побач з дзяржаўнай сеткай клубных устаноў з'яўляюцца камерцыйныя клубныя ўтварэнні. Пачынаюць дзейнічаць клубы, членамі якіх з'яўляюцца матэрыяльна забяспечаныя грамадзяне краіны, ідзе стварэнне рознага роду "элітных" аб'яднанняў і клубаў закрытага тыпу, мэтай дзейнасці якіх з'яўляецца рэкрэацыя, аднаўленне духоўных і фізічных сіл, а часам – і дабрачыннасць.

### *3.3.1. Фарміраванне клубных устаноў новага тыпу*

Адной з важных складаючых частак беларускай культуры і мастацтва застаюцца традыцыйныя віды мастацкай творчасці. Менавіта традыцыйная народная культура стала асновай, жыватворчай крыніцай для пошуку новых напрамкаў дзейнасці ўстаноў культуры ў сучасных умовах. Вывучэнне і ўключэнне традыцыйных формаў народнай творчасці ў сучасны культурны працэс у якасці роўназначных складнікаў магчыма па той прычыне, што Беларусь, як ні адна іншая сучасная еўрапейская краіна, здолела зберагчы да пачатку XXI стагоддзя ў "жывым выглядзе" аўтэнтычнасць усіх асноўных відаў сваёй карэннай культуры, хоць і была доўгі час "выключана" са сферы афіцыйнага функцыянавання, трапляючы пад моцнае ўздзеянне то паланізацыі, то русіфікацыі. Цікава, што пад гэта ўздзеянне падпадаў толькі "вышэйшы" зрэз культуры, яе афіцыйная частка – школа, друк, некаторыя прафесійныя



Рэпазіторый ВДУ

віды і жанры мастацтва, сферы дзяржаўнага кіравання – усё тое, з чаго фактычна была “выключана” асноўная частка народа, якая якраз і захоўвала генетычнае ядро самабытнай народнай культуры, якое ў пачатку 1990-х гг. стала асновай для нацыянальна-культурнага адраджэння. Гэта ядро – этнаграфічная культура – зафіксавала сябе ў звычаях і абрадах, якія, у сваю чаргу, вызначалі змест і форму грамадскага жыцця, заснаваныя на прынцыпах агульначалавечых крытэрыяў адбору. Ад пакалення да пакалення пераходзілі толькі прагрэсіўныя традыцыі, тыя, што садзейнічалі развіццю творчага духа народа і стымулявалі імкненне да прыгожага, вечнага і разумнага. Да ліку неабходных звычаяў, якія былі выпрацаваны нашым народам на працягу тысячагоддзяў, і якія патрабуюць свайго захававання, развіцця і перадачы наступным пакаленням, належаць тыя, што ўзвышаюць чалавека, вучаць яго справядлівасці, сумленнасці, добразычлівасці, адданасці абавязку, умацоўваюць пачуццё калектывізму, бескарыслівасць, таварыства, абуджаюць любоў да роднай мовы, зямлі, працоўнага народа – сапраўднага творцы матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей.

Жыццядзейнасць традыцыйнай культуры, абуджэнне цікавасці да гэтай сферы народнай творчасці, у многім залежыць ад узроўня прапагандысцкай і папулярызатарскай работы. Як паказалі экспедыцыйныя даследаванні, гутаркі з удзельнікамі фальклорных калектываў, народнымі майстрамі, носьбітамі традыцый і работнікамі культуры, вельмі важным стымулам з’яўляецца прапаганда іх дзейнасці не толькі на мясцовым, але і на больш шырэйшым узроўні. Гэта павышае значнасць носьбітаў традыцый у вачах іх бліжэйшага акружэння, спрыяе жаданню іншых людзей таксама займацца вывучэннем і папулярызацыяй народнай творчасці, у іх фарміруецца неабходнасць у больш глыбокім вывучэнні гісторыі і культурных традыцый свайго народа, магчымасці асабістай творчай самарэалізацыі, спрыяе выхаванню патрыятычных пачуццяў маладога пакалення. Стварэнне ж новых тыпаў устаноў культуры магчыма толькі пры актуалізацыі культуратворчай актыўнасці насельніцтва, стварэння і прадстаўлення ўмоў для дзейнасці розных суб’ектаў культуры (ініцыятыўных самадзейных груп і асобных людзей).

Галоўнае ў пераарыентацыі дзейнасці сучасных дзяржаўных устаноў культуры, на наш погляд, заключаецца ў зменах мэтавай устаноўкі з “работы на сябе” (статыстычная справаздача) на “работу для чалавека, асобы (задавальненне існуючых запытаў і фарміраванне духоўных патрэбнасцей і каштоўнасцей) у цеснай непарыўнасці з існуючымі культурнымі і духоўнымі традыцыямі грамадства. Таму асноўнай фігурай у клубнай установе новага тыпу становіцца чалавек, асоба, яе інтарэсы і культурна-духоўныя запатрабаванні. Практыка

стварэння ўстаноў культуры новага тыпу і прафілізацыі клубаў сведчыць, што іх дзейнасць у новым выглядзе ў значнай ступені дазваляе больш уважліва адносіцца да інтарэсаў і запатрабаванняў насельніцтва, а таксама больш рацыянальна выкарыстоўваць матэрыяльную базу, творчыя і інфармацыйныя рэсурсы. Падтрымка і развіццё станоўчых традыцый, звычаяў і абрадаў заўсёды патрабавалі і зараз патрабуюць больш мэтанакіраванай работы. Таму асноўная мэта дзейнасці ўстаноў культуры і клубных фарміраванняў на сучасным этапе – падтрымліваць жыццё традыцый, надаваць новыя імпульсы для існавання ўсіх відаў аўтэнтычнага фальклору. У гэтай сувязі паўстае найважнейшая задача: неабходна стварыць нарматыўную базу для сферы культуры – з аднога боку, аказваць усялякую падтрымку носьбітам і знаўцам народных традыцый – з другога боку, займацца навуковым даследаваннем і адраджэннем забытых або рэдкіх тэхналогій народных рамёстваў.

Праблемам удасканалення дзейнасці па фарміраванню новых мадэляў і тыпаў былі прысвечаны рэспубліканскія семінары для кіраўнікоў і спецыяльных органаў кіравання культурай на абласным і раённым узроўнях (чэрвень 1999 г. і снежань 2000 г.). Сёння дзяржаўная сістэма ўстаноў клубнага тыпу налічвае больш 40 розных мадэляў і варыянтаў арганізацыйна-структурнага рэфарміравання клуба.

Сярод новых профільных устаноў культуры раённага і сельскага ўзроўню і клубных фарміраванняў галіны традыцыйнай культуры можна вылучыць наступныя тыпы:

- **аднапрофільныя ўстановы культуры**, змест дзейнасці якіх тычыцца народных промыслаў і рамёстваў (Дамы рамёстваў);
- **установы комплекснага характару**, да якіх адносяцца Дамы (Цэнтры) фальклору, народнай творчасці і іншыя, дзе адначасова надаецца ўвага формам матэрыяльнай і духоўнай культуры (народныя рамёствы, абрады, песні, музыка, танцы);
- **школы народнай творчасці, што існуюць у форме клубных фарміраванняў**, і, як правіла, на сяле, якія працуюць у напрамку арганізацыі навучання дзяцей розным відам народнай творчасці (нярэдка з далучэннем мясцовых носьбітаў традыцый – майстроў, спевакоў, знаўцаў абрадаў і т.п.).

Найлепшай формай задавальнення сацыяльна-культурных запатрабаванняў сельскага насельніцтва з'яўляецца арганізацыя і функцыяніраванне шматпрофільных сацыяльна-культурных цэнтраў. Яны як бы ўрастаюць у прыроднае асяроддзе і сістэму камунікацый, і, адначасова, вырастаюць "знутры", з інфраструктуры культурнага асяроддзя, якое сфарміравалася гісторыка-культурнымі традыцыямі, спектрам эстэтычных запатрабаванняў дадзенага субрэгіёна.



Рэпазіторый ВГУ

Сацыяльна-культурны цэнтр можа ўключаць клуб, бібліятэку, школу мастацтваў, Дом фальклору, народны музей, спартыўна-аздараўленчы комплекс і г.д., у залежнасці ад субрэгіянальных магчымасцей.

У сельскай мясцовасці часта ўстановы культуры (клубы, школы мастацтваў, музычныя школы) дубліруюць пазакласную работу агульнанадукацыйных школ, яе змест і формы работы з бацькамі і насельніцтвам у цэлым.

Рэгіянальная культурная палітыка ў кожным з шасці субрэгіёнаў нашай краіны дзейнічала ў гэтым напрамку згодна з існуючай сітуацыяй, набытым вопытам, рэгіянальнымі і мясцовымі традыцыямі. У выніку з пачатку 1990-х гг. ў Беларусі пачала фарміравацца сетка новых тыпаў устаноў культуры раённага і сельскага ўзроўню, дзейнасць якіх была накіравана на захаванне і засваенне розных відаў народнай мастацкай культуры. Значную ролю ў гэтым працэсе адыграла мясцовая ініцыятыва і наяўнасць на месцах энтузіястаў і высокакваліфікаваных спецыялістаў. З гэтага перыяду пачалі працаваць такія новыя тыпы ўстаноў культуры, як Дамы рамёстваў, фальклору, народнай творчасці і г.д.

Размеркаванне новых тыпаў устаноў культуры ў галіне традыцыйнай культуры па абласцях – не аднароднае. Так, у Віцебскай вобласці самае шырокае распаўсюджанне атрымалі Дамы рамёстваў; на Гомельшчыне – Дамы (Цэнтры) фальклору, народнай творчасці; у Брэсцкай вобласці – школы народнай творчасці (у выглядзе клубных фарміраванняў); у Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай абласцях такія ўстановы новага тыпу не атрымалі вялікага пашырэння.

У аснову іх работы пакладзены "Статут" і "Палажэнні", зацверджаныя на ўзроўні раённых выканаўчых камітэтаў. І нездарма першы Дома рамёстваў быў заснаваны на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая да 1939 г. знаходзілася пад уладай Польшчы, і дзе народныя майстры з Браслаўскага, Глыбоцкага, Шаркаўшчынскага і Верхнядзвінскага раёнаў памяталі аб рабоце рамесных школ-майстэрняў.

Адным з найбольш папулярных новых тыпаў устаноў культуры, якія сумяшчаюць у сваёй дзейнасці дабравольны прынцып стварэння і адраджэння народных культурных традыцый з'яўляюцца Дамы (Цэнтры) рамёстваў. Па статыстычных дадзеных сёння ў Беларусі працуе 50 адзінак, прычым, 17 з іх – у сельскай мясцовасці. У Дамах рамёстваў, як спецыялізаваных установах, склалася трохузроўневая сістэма адукацыі:

- Гурткі на базе Дома рамёстваў у раённых цэнтрах.
- Філіялы Дома рамёстваў, дзе гурткі працуюць на базе клубаў, бібліятэк і сярэдніх школ.
- Школы майстра на даму.



Репозиторий ВГУ

Першапачаткова Дамы рамёстваў ствараліся і працавалі як грамадскія клубы майстроў, але пры наяўнасці матэрыяльна-тэхнічнай базы, паступова рашэннямі раённых выканаўчых камітэтаў пераўтвараліся ў новы тып устаноў культуры – Дамы рамёстваў. Сёння яны маюць сваю базу (прыстасаванае памяшканне, класы, майстэрні для правядзення гуртковай работы, работы выстаў, продажу гатовых вырабаў народных майстроў і іх вучняў).

На сённяшні дзень найбольшае распаўсюджанне Дамы рамёстваў атрымалі ў Віцебскай вобласці. Першы з іх быў заснаваны ў снежні 1989 года згодна з пастановай Глыбоцкага райвыканкама аб адкрыцці новай мадэлі ўстановы клубнага тыпу Дома рамёстваў (ДР) у г. Глыбокае на базе клуба народных майстроў "Крыніца", які ў сваю чаргу быў створаны па прапанове метадыстаў Віцебскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы ў 1986 годзе разам з загадчыкам раённага аддзела культуры М.К. Паляк і дырэктарам метадычнага цэнтра А.В. Юргель. Выдатныя арганізатарскія здольнасці праявіў мастак А.С. Дубіна, які і ўзначаліў клуб народных майстроў. Адначасова ён займаўся і адраджэннем кавальскай справы. Сёння А. Дубіна – адзін з нешматлікіх майстроў кавальскай справы ў рэспубліцы. У 2001 годзе ў в. Дудуткі Мінскай вобласці прайшоў рэспубліканскі конкурс па кавальскаму рамяству, у якім майстар і яго сын сталі пераможцамі.

За 11 гадоў работы Глыбоцкім ДР асвоена 14 відаў народных рамёстваў, сярод якіх такія рэдкія, як кавальская справа, 4-х і 8-мі нітовае ткацтва, выцінанка, роспіс па палатне. На сённяшні дзень у ДР працуе 12 гурткоў, у якіх займаецца больш 200 чалавек. Усе яны працуюць па раней распрацаванай праграме, напрыклад, па ткацтве, вышыўцы, саломапляценні, лазапляценні, разьбе па дрэве. Праграма разлічана на тры гады. Для прапаганды традыцыйных рамёстваў і павышэння майстэрства 2 разы ў год праводзяцца агляды-конкурсы на лепшыя вырабы майстроў і іх вучняў. Выпускнікі атрымліваюць пасведчанне аб заканчэнні Дома рамёстваў. Калі ў першыя гады галоўнай задачай было навучанне дзяцей і дарослых народным рамёствам і арганізацыя выстаў, то цяпер майстрамі праводзіцца і вялікая даследчая работа па вывучэнні тэхналогій традыцыйных відаў дэкарацыйна-прыкладнога мастацтва. Дом рамёстваў і па сённяшні дзень працуе ў цесным кантакце з народным клубам "Крыніца". У г.п. Падсвілле існуе філіял Глыбоцкага ДР.

Вопыт работы Глыбоцкага Дома рамёстваў быў пашыраны па вобласці і з 1992 г. вядзе адлік сваёй гісторыі Лепельскі народны Дом рамёстваў, у якім на сённяшні дзень асвоена 19 традыцыйных відаў рамёстваў, такіх як: ткацтва, габелен, саломапляценне, выцінанка,

Репозиторий ВГУ

пляценне з лазы, лыка, ганчарства і іншыя. У в. Домжарыцы створаны яго філіял – Дом ткацтва.

У гуртках Лепельскага ДР напрацягу года займаецца больш за 150 вучняў. Згодна з палажэннямі дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2011–2015 гады, частка гурткоў рэарганізавана ў творчыя майстэрні, якімі кіруюць лепшыя майстры нашай краіны, члены Саюза майстроў Рэспублікі Беларусь. У гэтых майстэрнях вядзецца не толькі засваенне традыцыйнай тэхнікі і перадача асаблівасцей тэхналогій народных рамёстваў, але і стварэнне новых мастацкіх каштоўнасцей. Адным з накірункаў работы майстэрняў з'яўляецца рэканструкцыя і абнаўленне фондаў раённага краязнаўчага музея. Пры Доме рамёстваў працуе салон "Скарбонка", дзе пастаянна праводзяцца выставы работ мастакоў, майстроў і іх вучняў. Толькі ў 2013 годзе прайшло 28 такіх выстаў. У цяперашні час калектыў Лепельскага Дома рамёстваў актыўна працуе над калекцыяй беларускага нацыянальнага адзення па ўласна распрацаванай праграме "Белая Русь".

У Браславе працуе музейнае аб'яднанне як установа культуры новага тыпу. У 1987 г. пры краязнаўчым музеі пачаў сваю работу клуб "Ля возера", які аб'ядноўваў майстроў народнай творчасці і самадзейных мастакоў Браслаўшчыны. На базе клуба (з 1989 г. – "Народная самадзейная студыя"), пачаў ствараецца Дом рамёстваў, які быў адкрыты ў 1995 г. у памяшканні адрэстаўрыраванага млына. Да адкрыцця Дома рамёстваў заняткі праводзіліся ў музеі і дома ў народных майстроў. У 1997 г. створана Браслаўскае музейнае аб'яднанне.

На Віцебшчыне працуе 19 Дамоў рамёстваў, многія з якіх маюць філіялы. Іх дзейнасць характарызуецца комплексным падыходам.

Яны займаюцца не толькі навучаннем народным рамёствам, але і навукова-даследчай і навукова-метадычнай працай.

Дзейнасць многіх беларускіх Дамоў рамёстваў заснавана на навуковай базе: дзейнасці супрацоўнікаў мясцовых краязнаўчых музеяў і метадычныя распрацоўкі. Некаторыя з іх сабралі спецыялізаваныя бібліятэкі па розных відах народных рамёстваў і этнаграфічнай культуры беларусаў. Браслаўскі, Гарадоцкі і Лепельскі ДР валодаюць таксама метадычнымі фондамі, якія складаюцца з этнаграфічных матэрыялаў, ствараюць ўласныя відэаархівы, назапашваюць фотаматэрыялы аб майстрах, праведзеных выставах, фіксуюць творы народнага мастацтва.

Згодна з праведзеным даследаваннем А.М. Боганевай і В.А. Лабачэўскай, самым папулярным рамяством у Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца вышыўка (46 гурткоў). На другім месцы – саломапляценне (32 гурткі), далей – ткацтва на станку (26 гурткоў) і разьба па дрэве (21 гурток), ганчарства, мастацкая апрацоўка гліны



Репозиторий ВГУ

або кераміка – 17 гурткоў, таксама як і вязанне на прутках або кручком. Лазапляценнем на вызначаны год займаліся 13 гурткоў. Аплікацыя саломкай прывабіла стваральнікаў і ўдзельнікаў 9 гурткоў, гліняная цацка і роспіс па дрэве – 6, пляценне паясоў – 7.

Меншую папулярнасць атрымалі такія рамёствы, як бондарства (1), пляценне лапцей (1), роспіс па палатне (1), народны малюнак (1), вышыўка дываноў (1), набіванне дываноў іголкай (1), льняная цацка (1), арнаментальнае вязанне на прутках (1), выцінанка (3).

Найбольш шырокі выбар традыцыйных відаў прапаноўваюць Дамы рамёстваў Віцебшчыны. Гэта ткацтва, саломапляценне, ганчарства, разьба па дрэве, вышыўка, выцінанка і інш. У сельскіх Дамах рамёстваў на Гомельшчыне пераважаюць розныя віды рукадзелля. З традыцыйных відаў сустракаюцца толькі разьба (3) і роспіс па дрэве (1).

Хуткі рост колькасці новых тыпаў устаноў культуры ў сферы традыцыйнай культуры выклікаў патрэбу ў падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў. На сённяшні дзень гэта пытанне вельмі актуальнае, асабліва для раённых і сельскіх устаноў культуры, дзе востра адчуваецца недахоп высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Эфектыўнымі формамі павышэння кваліфікацыі з’яўляюцца творчыя майстэрні і лабараторыі, заняткі ў школах народных майстроў, стажыроўкі на базе лепшых устаноў культуры, навучальных устаноў, прафесійных і аматарскіх калектываў, абменныя выезды спецыялістаў, курсы, семінары. Цікавы вопыт работы ў гэтым накірунку маецца ў Віцебскай вобласці. Там склалася трохступенчатая (вобласць–раён–сяло) сістэма курсаў народных промыслаў і рамёстваў (тэрмін дзеяння – 2 тыдні). Пры Віцебскім АНМЦ НТ і КАР такія курсы працуюць з 1992 года. Навучанне праводзіцца па 12 відах традыцыйных рамёстваў: саломапляценні, ткацтве паясоў, ганчарстве і інш. За 8 год (на студзень 2000 года) сярод работнікаў культуры курсы павышэння кваліфікацыі прайшлі 396 чалавек. Заняткі вядуць высокакваліфікаваныя педагогі, народныя майстры, перыядычна выкарыстоўваецца база Віцебскага вышэйшага вучылішча народных промыслаў (ганчарства, разьба па дрэве, ткацтва на станках). Па заканчэнні вучобы курсанты атрымліваюць пасведчанне. Сістэма адукацыі прадстаўлена праграмамі ў залежнасці ад базавай падрыхтоўкі ад 2-х тыдняў да 2-х месяцаў. Асноўная задача дзейнасці курсаў народных рамёстваў – у павышэнні кваліфікацыі кіраўнікоў гурткоў, студый, аб’яднанняў, звязаных з дэкаратыўна-прыкладной творчасцю, рамёствамі, а таксама курсы даюць магчымасць атрымаць спецыяльнасць, якая з аднаго боку дапаможа (хаця б часткова) вырашаць праблемы кадраў і матэрыяльныя праблемы, асабліва сацыяльна-незабяспечаных катэгорый грамадзян (беспрацоўных і інвалідаў), а

Рэпазіторый ВДУ

з другога боку, стварыць неабходныя ўмовы для творчай самарэалізацыі. На наш погляд, гэта дапамагае курсантам пашырыць свае магчымасці на прафесійным рынку працы і ў шырокім сэнсе спрыяе іх мабільнасці ў асабістым самавызначэнні.

Пры ўсёй рознасці тэхнік выканання твораў народнага мастацтва ёсць у дзейнасці ўсіх курсаў і нешта агульнае – акрамя максімума практычных заняткаў і навыкаў курсантам, якія не маюць базавай мастацкай адукацыі, даюцца агульныя паняцці аб колеры, кампазіцыі, форме, тэарэтычныя прадстаўленні аб прафесіі і базавыя практычныя заняткі аб матэрыялах і інструментах, з якімі ім прыдзецца працаваць. Майстры-настаўнікі бачаць галоўную задачу менавіта ў тым, каб перадаць навыкі рамяства, раскрыць магчымасці і таленты дарослых вучняў, дапамагчы ім набыць упэўненасць у сабе, асабістых сілах. Дзеля таго каб вызначыць, з аднаго боку, эфектыўнасць навучання на курсах народных рамёстваў, а з другога – выявіць, наколькі можна выканаць задачы, пастаўленыя перад настаўнікамі курсаў, намі было праведзена апытанне курсантаў без базавай мастацкай адукацыі агульнай колькасцю 47 чалавек. З іх: 33 працавалі ў клубных установах вобласці. Анкетаванне праводзілася ў два этапы: 1) з тымі, хто толькі пачынаў навучанне і 2) з выпускнікамі. У першую чарну трэба было адказаць на пытанне “Якія мэты ставілі перад сабой курсанты перад пачаткам навучання?”. Мы чакалі, што ў такі эканамічна нестабільны час галоўным матывам вучобы будзе жаданне зарабіць. Аднак на практыцы выявілася, што ніхто з навучэнцаў не быў настроены на хуткія заробкі. Дзве трэція апытаных дастаткова асцярожна выказаліся адносна будучай заработнай платы. Будучая праца хутчэй прадстаўлялася ім магчымасцю заняць сябе карыснай дзейнасцю (98%), атрымаць уяўленне аб малавядомай, але цікавай прафесіі (99%). У асноўным яны разлічваюць пры дапамозе атрыманых ведаў зрабіць бытавое, звыклае асяроддзе больш святочным, прыгожым, і тым самым, прынесці карысць сваёй сям’і. Духоўнае ўзбагачэнне, пашырэнне сваіх магчымасцей, такім чынам, прадстаўляецца ім больш каштоўным.

Апытанне паказала, што для курсантаў створаны псіхалагічны камфорт, добразычлівая атмасфера, якая выклікае прыхільнасць да пазітыўнага ўспрыняцця іншых людзей: 80% курсантаў адказалі, што ў працэсе навучання ў іх склаліся сяброўскія адносіны са сваімі сакурснікамі, 60% спадзяюцца, што гэтыя кантакты захаваюцца і пасля заканчэння курсаў. Навучанне дапамагло “адчуць сябе больш упэўнена” (48%), “атрымаць якую-небудзь надзею ў жыцці” (34%), а таксама “знайсці ўнутраны камфорт”, “разбудзіць душэўныя сілы” (65%). Больш паловы апытаных прызналіся, што яны пайшлі вучыцца ў надзеі хаця б на час вызваліцца ад хатняй руціны, а ў выніку



Репозиторий ВГУ

навучання 52% курсантаў убачылі ўласны дом “у новым свеце”. З нашага пункту гледжання, гэта сведчыць не толькі аб пазітыўным уплыве курсаў у плане атрымання прафесійных навыкаў, але і аб пэўных рухах у духоўным і псіхалагічным стане. Курсанты адзначылі, што ў працэсе навучання інтарэс да выбранага рамяства не толькі не падае, а і ў пэўнай меры ўзрастае. Магчыма, што гэта звязана з суб’ектыўным адчуваннем недастатковасці часу навучання, кароткатэрміновасцю курсаў. Пры гэтым выпускнікі пакідаюць курсы з жаданнем працягваць работу самастойна, па магчымасці зноў жа ў навукова-метадычным цэнтры народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы, а таксама працягваць засваенне не толькі выбранай, але і новай прафесіі на аснове народных рамёстваў. Напрыклад, 7 чалавек з 15 знайшлі працу па профілю рамяства. Таму дзейнасць падобных курсаў прадстаўляецца нам, безумоўна, паспяховай і перспектыўнай.

Калі Дамы рамёстваў атрымалі найбольшае распаўсюджанне на Віцебшчыне, то Дамы і Цэнтры фальклору і народнай творчасці пераважаюць на Гомельшчыне (17 адзінак). Асноўнымі напрамкамі іх дзейнасці на сённяшні дзень з’яўляюцца: работа з калектывамі мастацкай самадзейнасці, правядзенне і ўдзел у традыцыйных святах, работа з аўтэнтычнымі фальклорнымі групамі, арганізацыя пераймання народных мясцовых традыцый дзецьмі, дзейнасць па збору і вывучэнні фальклорнай творчасці.

Перапрафіляванне сельскіх клубаў у Дамы фальклору адначасова вырашылі дзве практычныя задачы: захаванне гэтых устаноў у дзеючай сетцы і дзейнасць у рэчышчы дзяржаўнай палітыкі нацыянальна-культурнага адраджэння. Пры гэтым для перапрафілявання ў напрамку работы з фальклорным калектывам мелася і логіка і ўсе прадпасылкі: тэрыторыя Гомельшчыны – гэта рэгіён, дзе да сённяшняга часу многія віды і формы традыцыйнага мастацтва захаваліся ў «жывой» шматвобразнасці ў сувязі з Чарнобыльскай аварыяй 1986 г. і міграцыяй насельніцтва ў іншыя рэгіёны.

Аднак у працэсе перапрафілявання сельскіх клубаў ў Дамы фальклору, і па сённяшні дзень не ўсе праблемы вырашаны канчаткова. Напрыклад, Дамы фальклору ўдзяляюць мала ўвагі выдавецтву метадычных распрацовак і рэпертуарных зборнікаў песенных і музычных твораў народнага мастацтва. Не ўсе маюць аўдыя- і відэазапісы правядзення мясцовых святаў, фанатэкі з запісамі ўзораў вуснай народнай творчасці, мясцовых носьбітаў песеннай і музычнай традыцыі.

Цікавай і перспектыўнай формай работы з’яўляецца стварэнне школ народнай творчасці (традыцыйнай культуры). Як асноўны метад работы яны выкарыстоўваюць прыёмы і сродкі народнай педагогікі. Галоўным яе крытэрыям адпавядаюць гуманістычныя і



Рэпазіторый ВГУ

дэмакратычныя ідэалы народа. Можна сказаць, што народная педагогіка непасрэдна служыць справе выхавання маладога пакалення. Да сродкаў народнай педагогікі адносяцца ўсе віды творчасці. Галоўным патрабаваннем да арганізацыі выхаваўчай работы на аснове народных педагагічных традыцый з’яўляецца выкарыстанне такіх прынцыпаў, як сувязь з жыццём, з навакольным светам, пераемнасць выхавання, гуманізм, працоўнае выхаванне, заахвочванне творчай і працоўнай ініцыятывы дзяцей і падлеткаў.

У народнай педагогіцы вялікую ролю іграе практычная дзейнасць. Бацькі імкнуліся прывучыць дзяцей да вырабу простых бытавых рэчаў, да ўдзелу ў традыцыйных святах і абрадах, зыходзячы з іх узроставых асаблівасцей, творчых здольнасцей і магчымасцей. Тут назіралася непарыўная сувязь паміж слоўнымі тлумачэннямі і самім працэсам, дзеяннем, іншымі словамі, вынік навучання матэрыялізаваўся ў прадмеце дзейнасці.

Школы народнай творчасці сталі стварацца ў пачатку 1990-х гадоў, прычым у асноўным, у Брэсцкай вобласці – рэгіёне Заходняга Палесся, дзе лепш за ўсё захаваліся песенныя і танцавальныя традыцыі.

Паняцце “школа народнай творчасці” ў сучаснай культуралагічнай і педагагічнай практыцы – шматбаковае як па змесце, так і па тыпах. Канцэпцыі падобных школ уваходзяць у рэгіянальныя праграмы адраджэння, захавання і развіцця культурнай спадчыны. Школы традыцыйнай культуры тыпалагічна розныя: адны ствараюцца на базе сельскіх Дамоў культуры, Дамоў рамёстваў, фальклору; другія – на базе канкрэтна вызначаных дзіцячых фальклорных калектываў; трэція – на базе школ мастацтваў (напрыклад, в. Стаі Лепельскага раёна Віцебскай вобласці).

Гэта школа была створана ў 1990 годзе. У ёй працуе 2 аддзяленні: музычнае і харэаграфічнае. На першым займаюцца 40 чалавек, а на другім – 68 чалавек. Яна працуе па індывідуальнаму вучэбнаму плане. Мастацкая праграма навучання будуецца на аснове мясцовых фальклорна-абрадавых традыцый. На занятках па харэаграфіі і спевах разам з выкладчыкамі спачатку працавала носьбіт традыцыйнай культуры Г.С. Фокіна, якая выкладала аўтэнтычную манеру выканання спеваў і танцаў. Сёння гэта школа мастацтваў вядома ў Беларусі сваім фальклорным ансамблем «Сунічкі». Калектыў быў створаны на базе харэаграфічнага адзялення школы ў 1996 годзе. У яго склад уваходзяць тры групы: старэйшая (13–14 гадоў – 20 удзельнікаў), сярэдняя (9–10 гадоў – 14 чалавек) і малодшая (6–7 гадоў – 16 чалавек).

Усе тыпы школ народнай творчасці звязаны тым, што яны імкнуцца забяспечыць магчымасць доступу дзяцей да традыцыйнай

Рэпазіторый ВГУ

культуры ва ўсей яе шматвобразнасці (вусная народная творчасць, музычнае, танцавальнае, песеннае, інструментальнае, гульнявое, абрадавы фальклор і рамёствы) зыходзячы з мясцовай (лакальнай) традыцыі. Таму і формы работы ў такіх школах могуць быць самымі рознымі ў залежнасці ад мясцовых умоў, магчымасцей, колькасці ўдзельнікаў і наяўнасці кіраўнікоў.

Структура школ традыцыйнай культуры з'яўляецца адкрытай. Гэта значыць, што ў школу прымаюцца ўсе жадаючыя, без папярэдняга праслухоўвання, незалежна ад таго, маюць яны слых ці не. Заняткі праводзяць мясцовыя носьбіты традыцыі або патомныя майстры. Галоўны прынцып навучання – вусная форма традыцыі, імітацыя, імправізацыя. Напрыклад, народны танец развучваецца цалкам, без разбіўкі на асобныя элементы. Увогуле, народнае мастацтва як сродак праяўлення пачуццяў, запатрабаванняў душы, пошукаў прыгожай формы, гармоніі, фантазіі, з'яўляецца масавым, даступным сродкам мастацкага выяўлення патрэб асобы, спрыяе далейшаму развіццю яе творчага патэнцыялу.

Сярод кіраўнікоў і ўдзельнікаў дзіцячых фальклорных калектываў Віцебскай вобласці намі было праведзена сацыялагічнае даследаванне з мэтай вывучэння думак аб лёсе народнай спадчыны, выяўлення ўнутраных матываў удзелу ў фальклорным калектыве. У даследаванні прымалі ўдзел 35 кіраўнікоў і 250 дзяцей. З іх 130 чалавек займаюцца ў фальклорна-этнаграфічных калектывах.

У выніку высветлілася, што цікавасць хлопчыкаў і дзяўчынак да фальклорнай спадчыны тлумачыцца шэрагам прычын. Па-першае, заняткі фальклорнай творчасцю дапамагаюць больш глыбока зразумець духоўныя ідэалы народа, выхоўваць пачуццё патрыятызму, любові да роднага краю, прыроды, беражлівых адносінаў да культурных каштоўнасцей (56,8%).

Па-другое, прымаючы ўдзел у фальклорнай творчасці, дзеці атрымліваюць магчымасць задавальняць свае эстэтычныя запатрабаванні (36%) і толькі 7,2% дзяцей займаюцца ў фальклорным калектыве таму, што не ведаюць, чым яшчэ можна заняцца ў вольны час.

Цікава было даведацца аб меркаваннях рэспандэнтаў: у чым праяўляецца нацыянальная своеасаблівасць беларусаў. На думку ўдзельнікаў калектываў, якія працуюць з апрацаваным фальклорам, больш за ўсё рысы беларускага народа праяўляюцца ў наш час у песнях, музыцы і танцах (43,4%). На другім месцы – абрады і звычаі (36,6), на трэцім – мова (20%).

Па-іншаму адказалі на гэта пытанне ўдзельнікі і кіраўнікі фальклорных калектываў: на першым месцы – мова (43,1%) і (51,4%), на другім – песні, музыка, танцы (31,5%) і (31,4%), на трэцім месцы – абрады і звычаі (25,4%) і (17,2%). Сапраўды, зберагчы і даць новае



Репозиторий ВГУ

жыццё фальклору немагчыма, калі мы не захаваем мясцовую мову, бо менавіта мова дае жыццё фальклору.

Анкетаванне паказала, што ў якасці асноўных крыніц перадачы традыцый абраднасці названы: бацька і маці (38,5%), бабуля і дзядуля (34,6%), работнікі культуры (13,8%), настаўнікі (10%). Улічваючы, што пераемнасць традыцый аб'ектыўна можа ажыццяўляцца ў першую чаргу праз сям'ю, можна сказаць, што 13,8% – гэта даволі высокі працэнт і работнікі культуры выконваюць сёння вельмі адказную ролю. Як паказвае вопыт, падцверджаны і сацыялагічнымі дадзенымі, калі бацькі падтрымліваюць дзяцей у іх занятках (76,4%), прыходзяць на мерапрыемствы, дзе выступаюць іх дзеці (57,2%), то і дзеці займаюцца з большай высокай аддачай, у іх ніколі не бывае пропуску заняткаў без уважлівых прычын. На жаль, ёсць катэгорыя бацькоў, якіх не цікавяць захапленне іх дзяцей (20%), а 3,6% бацькоў выбралі б іншы занятак для сваіх дзяцей.

Адказы на пытанне "Як вашы сябры адносяцца да вашага захаплення фальклорам?" размеркаваліся наступным чынам: станоўча – 40%, адмоўна – 12%.

У рамках даследавання на традыцыйным святкаванні Каляд мы вырашылі звярнуцца да гледачоў з пытаннем: "Якія запатрабаванні задавальняюцца падчас удзелу ў мясцовых традыцыях і каляндарных святах?" Часцей за ўсё рэспандэнты тлумачылі свой удзел тым, што гэтыя традыцыі з'яўляюцца неад'емнымі элементамі іх ладу жыцця. Кожны чацвёрты апытаны адзначыў, што яму падабаецца глядзець і слухаць, як праходзіць свята, асабліва калі ў ім прымаюць удзел блізкія, знаёмыя і сябры. Святы і абрады з'яўляюцца крыніцай добрага настрою для многіх людзей.

Сярод пытанняў анкеты для ўдзельнікаў фальклорных калектываў было і такое: "Што табе больш падабаецца: а) толькі спяваць; б) спяваць і танцаваць; в) спяваць і расказваць; г) спяваць, танцаваць і расказваць".

Меркавалася, што адказ на гэта пытанне пацвердзіць думку, што ў самім жыцці выканальніцкая асаблівасць сінкрэтызму фальклору заключаецца ва ўзаемасувязях усіх жанраў. Так і здарылася. З усіх адказаў, ніводны ўдзельнік не выказаў думку, што яму падабаецца толькі спяваць. Адказы размеркаваліся наступным чынам: найбольшая колькасць станоўчых адказаў выпала на песенны і танцавальны жанры (41,2%), далей ішлі песенны, танцавальны і апавядальны (35,2%) і, нарэшце, песенны і апавядальны (23,6%). Што тычыцца інтарэсу да беларускамоўных і рускамоўных друкаваных і электроных сродкаў масавай інфармацыі, то сярод дзяцей тут практычна аднолькавы ўзровень інтарэсу (каля 60%). Разам з тым трэба адзначыць, што руская мова часцей, чым беларуская, ужываецца

Рэпазіторый ВГУ

як сродак зносін у горадзе. Дзеці значна часцей чытаюць кнігі на рускай мове (62,4%), чым на беларускай (37,6%).

Мы зацікавіліся пытаннем, ці ёсць розніца паміж дзецьмі, якія займаюцца ў фальклорным калектыве, і дзецьмі, якія не маюць ніякага дачынення да гэтай справы. Для гэтага звярнуліся да класных кіраўнікоў і настаўнікаў, якія адзначылі: у дзяцей, што займаюцца ў фальклорным калектыве, узровень ведаў значна адрозніваецца ад узроўню ведаў аб вуснай народнай творчасці, маралі, маральных каштоўнасцей тых вучняў, якія не прымаюць удзел у занятках па фальклоры.

Акрамя гэтага, аб'ектам увагі першых становяцца станоўчыя маральныя якасці, якія заўсёды прапагандавала вусная народная творчасць. Гэтыя якасці – дабрыня, гасціннасць, міласэрнасць, ветлівасць, шчырасць, добразычлівасць, павага да старэйшых, паслухмянасць і іншыя.

Заняткі ў фальклорным калектыве спрыяюць паляпшэнню настрою дзяцей, якія пачынаюць ганарыцца тым, што як і іх продкі яны могуць працягваць традыцыі нашага народа, адкрываюць для сябе духоўны сэнс яго звычаяў, абрадаў, у сваім жыцці дзейнічаюць так, каб не выклікаць асуджэння з боку іншых членаў грамадства.

Акрамя таго, заняткі фальклорнай творчасцю вельмі слынна ўплываюць на фарміраванне і развіццё асабістых здольнасцей удзельнікаў калектываў. На аснове праведзенага апытання і назірання, можна гаварыць аб тым, што ў дзяцей, якія займаюцца фальклорам (у параўнанні з вучнямі, што там не займаюцца) значна палепшылася памяць, фантазія, увага, паспяховасць у вучобе, узрасла патрабавальнасць да сябе, развіліся і творчыя дадзеныя (слых, голас, пластыка), павысілася самаацэнка.

Адбываюцца пэўныя змены і ў паводзінах дзяцей. Вучні становяцца больш самастойнымі і ініцыятыўнымі, з большай павагай пачынаюць адносіцца да старэйшых і малодшых, пашыраецца ўзаемадапамога паміж членамі класнага калектыву, калі некалькі ўдзельнікаў вучацца ў адным класе.

Відавочна, што асноўным напрамкам дзейнасці органаў і ўстаноў культуры і адукацыі павінна стаць падтрымка існуючых і стварэнне новых гуртоў народнай творчасці, у першую чаргу – дзіцячых.

Што тычыцца кіраўнікоў фальклорных калектываў, то на пытанне "Чаму вы сталі кіраўніком менавіта фальклорнага калектыву?" чвэрць ад агульнай колькасці апытаных (24,8%) жадае, каб дзеці выхоўваліся на традыцыях народа. Яшчэ чвэрць апытаных лічаць, што добра ведаюць традыцыі і жадаюць перадаць свае веды іншым, у першую чаргу моладзі (25,3%). Рэспандэнты характарызуюцца рознымі

Рэпазіторый ВГУ

матывамі, у адпаведнасці з якімі яны выбралі гэту прафесію, але часцей за ўсё адзначылі такі матыў, як жаданне адраджэння нацыянальнай культуры (35,8%). А 14,3% апытаных добра ведаюць традыцыі і жадаюць захаваць іх ад разбурэння.

Вядучай формай работы з фальклорным калектывам з'яўляюцца сцэнічныя паказы абраду (53,7%), на другім месцы канцэртная дзейнасць (20,8%), потым ідзе правядзенне каляндарных святаў у натуральных умовах (13,3%) і апошняе месца займае арганізацыя навучання і пераймання фальклору, на рэгіянальным матэрыяле працуе 35% калектываў, а большасць кіраўнікоў (65%) выкарыстоўваюць сцэнічны матэрыял з розных крыніц.

Трэба адзначыць, што ў час правядзення апытання кіраўнікоў дзіцячых фальклорных калектываў большасць іх з цікавасцю ставіліся да магчымасці ўзбагаціць педагагічны працэс здабыткамі народнай педагогікі. Але амаль што ўсе (82,4%) адзначылі, што не маюць дастатковых ведаў у гэтай галіне, не сустракалі спецыяльнай літаратуры, пабудаванай на прынцыпах этнапедагогікі.

Аналіз вынікаў сацыялагічнага даследавання дазваляе зрабіць вывад, што 90% рэспандэнтаў у той ці іншай ступені адчуваюць патрэбу ў самападрыхтоўцы. Колькасць апытаных, якія прытрымліваюцца супрацьлеглай пазіцыі – 1–2%.

З прапанаваных формаў самападрыхтоўкі найбольш эфектыўнымі рэспандэнты лічаць наступныя:

- абмеркаванне з калегамі – 65%;
- кансультацыі са спецыялістамі – 58%;
- чытанне спецыяльнай літаратуры – 56%;
- наведванне канцэртаў, святаў, фестываляў – 26% апытаных.

Такім чынам, з праведзенага намі сацыялагічнага даследавання відаць, што творчасць дзіцячых фальклорных калектываў шчыльна спалучаецца з такой формай засваення фальклору, як стылізацыя, да якой адносяцца розныя пастаноўкі. Творчая роля кіраўніка тут надзвычай адказная. Няўдалыя стылізацыі выклікаюць пачуццё незадаволенасці ў слухачоў. На жаль, іншы раз народная традыцыя паўстае ў іх як "суцэльны феерверк", як відовішча ці забава. Таму стваральнікі стылізацыі і апрацовак павінны беражліва ставіцца да захавання фальклорнага ўзору, каб добра ведаць этнаграфічную спецыфіку твора, яго традыцыйныя мясцовыя асаблівасці, трэба знаёміцца з адпаведнай літаратурай. Эстэтычныя і мастацкія веды кіраўніка, які займаецца аднаўленнем і захаваннем фальклору, павінны спалучацца з педагагічнымі.

Таму ў 1999 г. Віцебскім АНМЦ НТ і КАР былі арганізаваны курсы "Школа фальклору" для кіраўнікоў фальклорных калектываў і клубных работнікаў, якія працуюць у сферы народнай культуры. Тэрмін

Рэпазіторый ВГУ

навучання – 1 год з трыма цыкламі па 2 тыдні (лістапад, люты, красавік). Намі была распрацавана педагагічная праграма “Спадчына”, згодна з якой і вялася работа ў школе фальклору. У яе аснове ляжыць глыбокае вывучэнне гісторыі і традыцый народнай культуры Віцебшчыны. Метадалагічным абгрунтаваннем праграмы “Спадчына” паслужылі даследаванні этнографаў, фалькларыстаў, гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў і этнапедагогаў. Праграма складалася з наступных радзелаў:

I.“Вытокі” (паходжанне беларусаў, дахрысціянскія вераванні).

II. “Мінуўшчына” (гісторыя культуры Віцебшчыны).

III. “Дыханне Паазер’я” (народная педагогіка. Асноўныя сродкі і метады: лічылкі, загадкі, казкі, прыказкі, прымаўкі, легенды, паданні, музычна-песенная творчасць, народная харэаграфія, гульні).

IV. “Ад Каляд да Піліпаўкі” (святочна-абрадавая культура Беларусаў Паазер’я; абрадавая атрыбутыка, нацыянальная кухня).

V. “Узоры Паазер’я” (народныя мастацкія промыслы і рамёствы; народны касцюм).

VI. “Крыніцы Паазер’я” (узаемасувязь прыроды і нацыянальнага характару, экалагічныя праблемы, прыродныя і гісторыка-культурныя помнікі Віцебшчыны).

VII. “Фальклорная вандроўка” (практычныя навыкі збору, апрацоўкі і захоўвання фальклорнага матэрыялу).

VIII. “Майстэрства кіраўніка” (методыка і вопыт арганізацыі і дзейнасці фальклорных калектываў).

Курс пачынаўся заняткамі, на якіх давалася агульная характарыстыка культуры Беларусі, узаемасувязь яе з іншымі культурамі. Мэта заключных заняткаў – дыягностыка ўзроўню ўспрыняцця, замацавання і асэнсавання вучэбнай інфармацыі. Як уводныя, так і заключныя заняткі з’яўляліся самастойнымі блокамі педагагічнай праграмы “Спадчына”.

Трэба заўважыць, што па статыстыцы на студзень 1999 г. у Віцебскай вобласці налічвалася 46 калектываў. Пасля курсаў, на якіх навучаліся кіраўнікі фальклорных калектываў і клубныя работнікі, іх налічваецца ўжо больш 60 (на 2001 г.).

Такім чынам, у выніку даследавання атрымана пацвярджэнне, што значная роля ў працэсе адраджэння і развіцця традыцыйнай культуры належыць удзельнікам дзіцячых фальклорных калектываў і іх кіраўнікам. Што тычыцца школ народнай творчасці (традыцыйнай культуры), то па змесце сваёй дзейнасці (асабліва тыя, што працуюць на базе школ мастацтва), маюць усе магчымасці стаць самастойнымі ўстановамі культуры. З прыведзеных намі прыкладаў добра відаць, што новыя тыпы ўстаноў культуры – гэта не столькі новыя будынкі, а, галоўным чынам, – гэта новая форма культурнага жыцця, арыентаваная на інтарэсы і патрэбы насельніцтва.



Репозиторий ВГУ

### *3.3.2. Развіццё клубаў на камерцыйнай аснове*

Напрыканцы XX стагоддзя вялікую ролю пачалі адыгрываць клубныя ўстановы і фарміраванні прыватнага накірунку, якія ўсё больш прадстаўляць альтэрнатыву клубным установам сістэмы Міністэрства культуры.

Сацыяльная прырода чалавека мяркуе, што ён імкнецца ў соцыум (супольнасць), да ўключэння ў яго іерархію і, разам з тым, да выдзялення з гэтага соцыума ў якасці індывідуальнасці. Пачуццё прыналежнасці заклікае выконваць важныя сацыяльныя і сацыяльна-псіхалагічныя функцыі: забяспечваць падпарадкаванне індывіда сацыяльнай групе, вызначаць крытэрыі ацэнкі і самаацэнкі і таксама забяспечваць групавую абарону.

Спецыфічныя механізмы сацыяльнай ідэнтыфікацыі існуюць у клубных супольнасцях, якія ўяўляюць сабой аб’яднанне людзей, узаемазвязаных агульнымі інтарэсамі, статуснай пазіцыяй і тэрытарыяльнай блізкасцю. Асаблівае месца ў клубных супольнасцях займаюць тыя, якія ўмоўна можна назваць статуснымі, паколькі яны фарміруюцца ў клубах, арганізаваных на аснове прыналежнасці да пэўных статусных колаў (дзелавых, прафесійных, саслоўных і г.д.).

Клубы, якія аб’ядноўваюць супольнасці з высокім сацыяльным і прафесійным статусам у дзелавой, творчай і іншых сферах, з’яўляюцца актуальнай формай захавання статусных сістэм у бізнесе, адпачынку і іншых інфраструктурах. Клубнае жыццё такога тыпу бярэ сваю пераемную традыцыю з дваранскіх клубаў XIX ст.

Такім чынам, у першай чвэрці XXI стагоддзя заканамернымі і абгрунтаванымі з’яўляюцца наступныя вызначэнні паняццяў “клуб” і “клубная культура”:

**Клуб** – гэта інстытуцыяналізаваная ці віртуальная добраахвотная супольнасць, аб’яднаная інтарэсамі ўключаных у яго людзей, на аснове агульных каштоўнасцей, камунікацыйнага адзінства і сацыяльнай камфортнасці. Клуб мае характэрныя знешнія (рэгістрацыя клубаў у афіцыйных органах, абавязак членаў рабіць рэгулярныя ўзносы, статут) і ўнутраныя (наяўнасць суб’ектаў, якія ўваходзяць у супольнасць, іх камунікатыўнае ўзаемадзеянне, наяўнасць прыватных інтарэсаў, лакалізаваны сацыякультурны прастор) прыкметы.

**Клубная культура** – гэта сістэма каштоўнасцей, каштоўнасных арыентацый, якія дыктуюць стыль жыцця, накіраваны на рэалізацыю інтарэсаў і прыватных пераваг яе носьбітаў, самаактуалізацыі асобы, якая прадстаўляе магчымасць адчуць сацыяльную камфортнасць з аднадумцамі, якая культывуе такія каштоўнасці, як індывідуалізм, бязмежная свабода зносін.

Рэпазіторый ВГУ

**Клубнае жыццё,** clubbing, як сістэма і працэс з'яўляецца асаблівай сацыяльнай практыкай. Клабінг як стыль жыцця, падпарадкаваны імпульсіўнасці і жаданню свабоды, пры якім вялікая частка вольнага часу прысвячаецца наведванню клубаў, нефармальным зносінам, надзвычайнаму захапленню музыкай, танцам, рухам. Культура маладзёжных інтэлектуальных клубаў утрымлівае ў сваёй аснове дакладную сістэму каштоўнасцей, галоўнай з якіх можа быць названа асобаснае інтэлектуальнае развіццё і веды, якія адпавядаюць сучаснаму ўзроўню развіцця навукі, тэхнікі, сацыяльна-эканамічнай сферы. Культура інтэлектуальных клубаў разумее элітарны накірунак дзейнасці і супрацьстаіць дэградацыі і дэструкцыйнасці асобы ў грамадстве. Яна фарміруе сацыяльна і інтэлектуальна значныя каштоўнасці дадзенага грамадства, яго каштоўнасныя арыентацыі: веды, прафесіяналізм, кампетэнтнасць, творчасць.

Асаблівасцю клубнага жыцця ў грамадстве выступае захаванне вядомых фармальных правілаў паводзін. Гэта дапамагае чалавеку знайсці сваё месца ў соцыуме, арыентавацца ў прафесійнай, рэгіянальнай і нават нацыянальна-этнічнай сацыяльнай прасторы. Пры гэтым назіраецца наступная тэндэнцыя: чым больш спецыялізаваны клуб па змесце дзейнасці і менш дыферэнцыраваны па сацыяльным складзе, тым мацней бар'еры і працэдуры для доступу ў такое клубнае аб'яднанне, як аб'ектыўныя – паводле сацыяльнага статуса і пэўнай сферы дзейнасці, так і суб'ектыўныя – зацікаўленасць.

У нашай краіне падобныя клубы пачалі стварацца адносна нядаўна, хоць яшчэ ў савецкі час існавалі клубы творчай інтэлігенцыі, якія называліся дамамі акцёра, літаратара, мастака і г.д., знаходжанне ў якіх было прэстыжным і статусным, а доступ абмежаваным.

Вылучым сферы жыццядзейнасці грамадства, у якіх на сённяшні час існуюць больш развітыя клубныя сістэмы і формы клубных аб'яднанняў. У першую чаргу падставамі для такой класіфікацыі згодна П. Бурдзье выступаюць: сфера, від дзейнасці і лад жыцця, ступень даступнасці да матэрыяльных сімвалічных рэсурсаў [6, с. 21]. На падставах гэтага можна вылучыць:

– клубы, сфарміраваныя ў рамках арганізацыі пэўнай тэрыторыі або жылой прасторы (клубныя дамы або жылыя комплексы з закрытай тэрыторыяй, клубныя пасёлкі, катэджныя пасёлкі);

– дзелавыя клубы, якія аб'ядноўваюць прафесіяналаў у пэўнай сферы дзейнасці і інтарэсаў (клубы кіраўнікоў, уласнікаў, топ-мэнеджараў, клубы ўладальнікаў элітных аўтамабіляў і інш.);

– творчыя клубы, якія аб'ядноўваюць прафесіяналаў у такіх сферах дзейнасці, як мастацтва, культура, літаратура, фатаграфія, тэатр і г.д.;



Рэпазіторый ВДУ

– клубы, якія аб’ядноўваюць інфраструктуру прасторы адпачынку і забаў (турыстычныя клубы і клубы спартыўнай накіраванасці, дыскаклубы і г.д.);

– клубы, якія аб’ядноўваюць спажывецкую сферу (клубныя рэстараны, кафэ, салоны прыгажосці, фітнес-цэнтры, гандлёвыя цэнтры і буцікі);

– клубы, якія злучаюць прадстаўнікоў індустрыі прафесійнага навучання і перападрыхтоўкі.

Калі параўнаць два віды клубаў, якія выступаюць сёння ў якасці статусных для розных узростаў і сацыяльных груп – маладзёжныя начныя і дзелавыя клубы, то для першых характэрна пераемнасць рэйв-культуры (пратэстная, андэрграўндная па паходжанні, заснаваная на афектыўных пачуццях і каштоўнасцях адзінства).

**Культура дзелавых клубаў** – культура вышэйшага свету, культура абраных, якія не афішыруюцца, кулуарная. Пры гэтым абедзве культуры звязаныя з пэўным дасягненнем: імкненнем да атрымання статуса, адборам абраных. Абедзве культуры маюць унутрыклубную прастору і сацыяльную іерархію, дзе кожная накіравана на абмежаванае кола грамадскай супольнасці.

Клубнае жыццё складаецца з наведвання рэстарана або бара, гульні ў казіно, більярд, рулетку. Кожны клуб мае спецыяльна прыстасаваныя пакоі для гульні.

У ходзе апытання мы выяўлялі долю рэспандэнтаў, якія ўсведамляюць сваю прыналежнасць да пэўных сацыяльных колаў, свой статус у грамадстве, а таксама іх уяўленні аб статусных клубах і механізмах ідэнтыфікацыі ў іх.

Апытанне паказала, што сярод эканамічна актыўнай часткі насельніцтва толькі 36% лічаць, што належаць да вызначанага сацыяльнага кола людзей, а 45% рэспандэнтаў хутчэй за ўсё не могуць азначыць гэтага. Гэта з’яўляецца пацверджаннем таго, што для сучаснага чалавека вобласць самавызначэння “свайго кола” і сваёй сацыяльнай ідэнтыфікацыі да блізкіх людзей па статусе (апрыёры) звужаецца галоўным чынам на аснове каштоўнаснай матывацыі, вызначэння “блізкасці” іншага як “свайго” праз разуменне, прыняцце, агульнасці інтарэсаў.

Калі звярнуцца непасрэдна да статусных дзелавых клубаў, якія вызначаюцца высокай ступенню закрытасці, то сярод рэспандэнтаў, якія прынялі ўдзел у апытанні, большая частка (68%) паказала, што ведаюць пра існаванне падобных клубаў і значная доля (44%) пагадзілася, што клуб – “гэта самая распаўсюджаная форма ўзаемадзеяння ў сучасным грамадстве для абмежаванага кола людзей”.

Варта растлумачыць, што характарыстыка “закрыты” ўжываецца да паняццяў “клуб”, “супольнасць” і з’яўляецца

Репозиторий ВГУ

сацыяльным канстрыктам, які ствараецца для вызначэння межаў сацыяльнай прасторы, звязанай з абмежаваннем колькасці, што ўваходзіць у супольнасць.

Удзельнікі апытання сярод прычын закрытасці клубных супольнасцей вылучылі пераважнае “абмежаванне кола аўдыторыі для патрэбных людзей “ (79%) і “стварэнне пэўнай атмасферы” (32%). Але ў той жа час рэспандэнты не змаглі адназначна пацвердзіць, што “прыналежнасць да клуба ў сучасным грамадстве прадугледжвае нейкае выключнае і асаблівае становішча”.

Захаванне традыцый клубнай супольнасці на працягу доўгага часу, умоў яе існавання звязана, як правіла, з рэалізацыяй групавых патрэб і з мэтамі наведвання клуба.

Мэты наведвання клуба на прыкладзе маладзёжнай клубнай культуры – гэта зносіны з сябрамі (55,9%), жаданне патанцаваць (43,6%), атрымаць зарад новых эмоцый (40,6%). Рэспандэнтамі сярод іншых мэт называліся: павесяліцца ў кампаніі, завесці знаёмства, «адарвацца», знаходзіцца ў патрэбным месцы і з патрэбнымі людзьмі. Яны з’яўляюцца ўсвядомленымі патрэбамі, у якіх паказваецца характар і спосабы пажаданых дзеянняў і стратэгій паводзін, напрыклад, падчас наведвання начнога клуба.

Для прадстаўнікоў дзелавых клубаў мэты, выдзеленыя ў моладзевай клубнай культуры, адыходзяць на другі план. Для іх мэты прафесійнай дзейнасці з’яўляюцца вядучымі ў наведванні клуба і неабходныя для эфектыўнага вырашэння дзелавых пытанняў, творчай працы, набыцця вопыту і яго падзелу ў коле неабходных, роўных і выбраных.

Матывацыя наведвання клубаў для пастаянных наведвальнікаў з’яўляецца дасканала выпрацаванай і існуючай практыкай клабінга ў інфраструктуры, створанай для “камфортнага існавання сярод роўных сабе”.

Як у клубе XIX, так і ў клубе XXI стагоддзя існуе свая іерархія: заснавальнікі і кіраўнікі клуба, далей пастаянныя члены, якія зарэкамендавалі сябе ў дзейнасці і маюць станоўчае рэнамэ (сярод іх існуе градацыя па прафесійным статусе, узроўні кампетэнцый і адказнасці, узроўні даходу). Ніжэй па іерархіі знаходзяцца члены клуба, якія ўліваюцца ў клубную супольнасць і праходзяць перыяд ацэнкі і працы над сваім рэнамэ, набліжаныя да гэтай супольнасці людзі.

У працэсе вывучэння вопыту дзейнасці прыватных клубаў, мы б хацелі засяродзіць увагу на арганізацыі і вопыце дзейнасці музычна-танцавальных клубаў, таму што яны з’яўляюцца самымі папулярнымі сярод моладзі на сённяшні дзень. Дадзеная культурная адзінка мае адкрыты характар, статут, у якім вызначаны асноўныя накірункі дзейнасці. Аднак яны не характарызуюцца зафіксаванай колькасцю

Репозиторий ВГУ

ўдзельнікаў і па прынцыпу арганізацыі нагадваюць клубы-кафэ, якія былі распаўсюджаны на тэрыторыі Беларусі яшчэ з часоў Рэчы Паспалітай, часткова захаваліся ў Гродне і Вільні ў XIX стагоддзі. На тэрыторыі Заходняй Беларусі яны мелі назву “аўстэрыі” і “кандытэрыі”, а прынцыпы іх арганізацыі і дзейнасці нагадвалі рымскую харчэўню, англійскую таверну або рускія чайныя.

У канцы XX стагоддзя трацяць сваю актуальнасць звыклыя дыскатэкі, якія на сённяшні дзень ужо не могуць цалкам задаволіць запыты моладзі. Галоўнай праблемай становіцца багацце і разнастайнасць музычных напрамкаў. Таму ў мэтах задавальнення гэтых запытаў і стварэння ўмоў для зносін па інтарэсах маладых людзей сталі папулярнымі джаз, рок, тэхна, рэгі і іншыя клубы. На сённяшні дзень разнастайнасць такіх музычных клубаў, дзе выконваецца музыка ад рамансаў да рока, могуць прапанаваць амаль усе буйныя гарады Беларусі.

Клубная культура на цяперашні час перажывае перыяд ўздыму. Папулярнасць начных клубаў, рэстаранаў і асабліва бараў за апошні час узрасла. Клубы сталі асноўным месцам правядзення вольнага часу для большасці людзей ад 20 да 40 гадоў. Расце колькасць танцавальных клубаў. У сталіцу ўсё часцей прыязджаюць вядомыя клубныя дыджэі і музыканты з іншых краін, на сусветным рынку ўжо прысутнічаюць запісаныя беларускімі дыджэямі трэкі і рэміксы.

Паводле сусветнай статыстыкі, больш за 15% насельніцтва буйных гарадоў-мегаполісаў рэгулярна наведваюць клубы, месцы, дзе працуюць дыджэі і буйныя танцавальныя мерапрыемствы. Наведвальнікі клубаў уяўляюць сабой пласт сацыяльна актыўных і паспяховых людзей, якія не абмяжоўваюць сябе рамкамі штодзённасці.

Людзьмі рухае атмасфера свята, добразычлівасці, разняволення зносін з сябрамі і малазнаёмымі людзьмі. Вось менавіта за гэта наведвальнікі і “пераплачваюць” у клубах, рэстаранах і барах.

Тут усё мае значэнне: інтэр’ер, персанал, музыка, святло, атмасфера свята. І ад таго, наколькі добра прадстаўлены дадзеныя складнікі, залежыць поспех справы ў цэлым.

У нашым даследаванні мы паспрабуем разгледзець начныя клубы абласных гарадоў і сталіцы, іх спецыялізацыю, напрамкі ў музыцы, ахарактарызуем кожны клубны накірунак, іх узровень, сэрвіс, а таксама раскажам пра асноўныя тэматычныя вечарыны, якія праводзяцца ў клубах Беларусі.

**Клубныя вечарыны** з’яўляюцца неад’емнай часткай сучаснай клубнай і маладзёжнай культуры. З’явіўшыся ў нашай краіне нядаўна, вечарыны ў клубах знаходзяцца сёння на піку сваёй папулярнасці. Галоўнае, што адрознівае клубную вечарыну ад стандартнага адпачынку ў начным клубе, – гэта наяўнасць тэмы, якая задае тон усяму мерапрыемству, прычым тэмы для клубных вечарын могуць быць самымі рознымі.

Рэпазіторый ВДУ

Самы просты прыклад клубнай вечарыны – гэта вечарыны аднаго колеру. Калі ўсім гасцям мерапрыемства прадпісваецца прыйсці на свята ў вопратцы пэўнага колеру, і ў той жа каляровай гаме дэкарыруюць залу. У астатнім такая вечарына нічым не адрозніваецца ад звычайнай святочнай вечарыны з танцамі, музыкай і лёгкімі алкагольнымі напоямі.

Акрамя таго, вечарына ў клубе можа прайсці ў форме чайнай цырымоніі, калі гучыць этнічная музыка, а госці свята дэгустуюць сапраўдны японскі чай, седзячы на кінутых на падлогу плеценых цыноўках. Для змешанай дзіцяча-дарослай аўдыторыі цікавай падасца вечарына пад назвай "Жывёльны свет" з запрашальнымі квіткамі ў выглядзе розных жывёл, развешанымі на сценах плакатамі з выявай экзатычных пейзажаў, а самае галоўнае – касцюмамі тых ці іншых звяроў, у якія трэба будзе апрануцца гасцям свята.

У моладзі вялікім поспехам карыстаюцца пенныя вечарынкі, для правядзення якіх у памяшканні клуба ўсталёўваецца адмысловы апарат, які выкідвае кубаметры пены. Традыцыйны дрэс-код пеннай вечарынкі – гэта купальнікі і парэа, але для прахалодных дзён можна зрабіць выключэнне і дазволіць гасцям прыйсці ў звычайным клубным уборы. Аматарам фантастыкі спадабаюцца клубныя вечарыны на тэму міжгалактычных падарожжаў з іх танцамі ў бязважкасці і са спецыфічным касмічным гумарам.

Таксама ўсё большае распаўсюджванне ў нашай краіне атрымліваюць ужо даўно папулярныя ў Еўропе клубныя вечарыны флірту. Рамантычная абстаноўка, танцы, адпаведныя конкурсы і вялікая колькасць розных людзей, якія жадаюць пазнаёміцца, – ідэальная вечарына для маладых і вольных.

Ну, а алкапаці ці кактэйльныя вечарыны не страцяць сваіх прыхільнікаў ніколі. Усе вышэйпералічаныя вечарыны праходзяць гарантавана паспяхова і выклікаюць вострую цікавасць, калі маюць зададзеную тэму.

Пры правядзенні вечарыны ў гавайскім стылі, перш за ўсё, трэба будзе паклапаціцца аб уборах усіх запрошаных – падыдуць шорты і яркія летнія кашулі (майкі) для мужчын, квяцістыя пляжныя сукенкі і сарафаны для жаночай паловы. Галоўнае – стварыць нязмушаную атмасферу свята, калі госці маюць зносіны, жартуюць, смяюцца і калі ў канцы вечарыны не хочацца разыходзіцца.

Асаблівая атмасфера і максімальна камфортны прытулак – вось асноўныя прынцыпы функцыянавання сучасных клубаў.

Сучасны клуб – гэта, як правіла, прасторнае памяшканне, выкананае ў пэўным вытрыманым стылі, якое абсталявана сучасным гукам і святлом, а таксама добрай вентыляцыйнай устаноўкай. Клуб, як правіла, мае сваю выразную канцэпцыю і накіраваны на пэўны сег-

Репозиторий ВГУ

мент наведвальнікаў. Арганізатары ладзяць шоу-праграмы, запрашаюць да супрацоўніцтва групы пэўнага (адпаведнага канцэпцыі клуба) музычнага накірунку, ствараюць незабыўную, характэрную менавіта для іх установы атмасферу. У сучасным клубе маецца на ўвазе наяўнасць добрага бара, нават не аднаго, розных магчымасцей правесці вольны час. Добрым тонам лічыцца ўстаноўка сталоў для більярда, гульнявых аўтаматаў, дарожак боўлінга. У клубе часта працуе некалькі ўзроўняў або залаў, у кожным з якіх круцяць пэўную музыку, працуе бар. Паказчыкамі выдатнай працы арт-менеджараў з'яўляюцца апроч пастаянна імі арганізаваных шоу штодзённыя канцэрты розных груп з сусветнымі і мясцовымі "зоркамі". Акрамя гэтага звычайна клуб мае некалькіх рэзідэнтаў, якія стала працуюць у ім: дыджэяў, дзяўчат і юнакоў для танцаў, стрыптыз групы. Клубы амаль працуюць увесь тыдзень, з ночы да самай раніцы, а днём як кафетэрыі і рэстараны. Акрамя гэтага клуб жыве вельмі актыўным жыццём: запрашае групы, падтрымлівае новыя каманды, арганізоўвае выставы і прэзентацыі. Вакол такога клуба стварaецца пастаянная "свая" група прыхільнікаў і пастаянных наведвальнікаў.

Калі параўноўваць кошт абслугоўвання, то нельга сказаць, што ў сталіцы ён істотна вышэй, чым у рэгіёнах. Часта практыкуецца бясплатны ўваход, розныя бонусы і скідкі, клубныя картачныя сістэмы і г.д.

Музычныя клубы таксама праводзяць шэраг буйных акцый, тыпу "Мы – супраць наркотыкаў", "Рок супраць СНІДу" і інш. Найбольшай папулярнасцю сярод моладзі г. Мінска карыстаюцца начныя клубы: "Макс-шоу" (кінатэатр "Кастрычнік"), "Парадзіз" (кінатэатр "Масква"), дыска-клуб "Юла". З новых таксама можна назваць "STEP", "Танэль" з іх шоу-праграмамі. Неабходна адзначыць, што ўсе канцэрты ў клубах праходзяць толькі з так званым "жывым гукам".

Напрыклад, праграма начнога клуба "Макс-шоу" ўключае ў сябе вар'етэ, арыгінальныя нумары і міні-пастаноўкі тэатра жахаў або такі незвычайны від мадэрнавага мастацтва, як бодзі-арт.

На жаль, утрымліваць арыгінальны па змесце работы прыватны клуб вельмі складана з фінансавага пункту гледжання. Таму апошнія, якія не маюць грашовай падтрымкі ні з боку дзяржавы, ні з боку спонсараў, пакрыху радзеюць і ў выніку перастаюць існаваць (за невялікім выключэннем). У тых жа, дастаткова нешматлікіх у цяперашні час людзей, якія маюць смеласць распрацоўваць і рэалізоўваць асабістыя нестандартныя праекты, проста не хапае грошай нават на тое, каб гэтыя праекты акупіць. Адсутнасць грошай фактычна стала асноўнай прычынай адыходу ў небыццё першай хвалі музычных клубаў, якія дастаткова гучна заявілі пра сябе, але хутка зніклі. На самай справе, мала каму прыемна трапіць на музычна-танцавальны вечар у непрыстасаванае памяшканне, напрыклад

Репозиторий ВГУ

дзіцячага кінатэатра, мастацкае выкананне якога здзейснена ў духу сацрэалістычнага мастацтва, з нізкім дахам, без спецыяльнай падлогі для танцаў, сцэны для дыджэя, з дрэнным гукам, акустыкай і без адпаведнага гэтаму мерапрыемству асвятлення. Пры гэтым, за права правесці вольны вечар у гэтым памяшканні, трэба заплаціць дастаткова многа грошай, асабліва для моладзі, як асноўнага кантынгенту наведвальнікаў дадзеных музычна-танцавальных клубаў.

Новыя клубы сталі на ўзровень вышэйшы за папярэднія. Напрыклад, начны клуб НЛА забаўляльнага цэнтра «НЛА» – гэта лепшая ў Беларусі sound сістэма, незвычайны інтэр'ер, сучаснае светлавое абсталяванне і live VJ-show. Да паслуг наведвальнікаў 2000 квадратных метраў, 2 паверхі і 8 тэматычных зон; рэстаран, більярд, боўлінг – 24 гадзіны бясконцага задавальнення. Стыльны інтэр'ер, вытрыманыя колеры.

У асноўным музычна-танцавальныя клубы можна падзяліць на дзве катэгорыі:

клуб-рэстаран, які арыентаваны на максімальнае задавальненне густаў наведвальнікаў (як гастранамічных, так і музычных). У межах дзейнасці такіх клубаў – выступленні расійскіх папулярных спевакоў, лепшых беларускіх выканаўцаў эстраднай песні ад традыцыйных шлягераў да хіп-хопу. У вялікай пашане – выступленні выканаўцаў так званай "блатной лірыкі", рокераў з Масквы і Санкт-Пецярбургу. З "нежывой музыкі" гучаць: тэхна, дыска, рок-н-рол. Дыджэі лічаць правілам добрага тону "круціць" у гэтых клубах поўны набор навінак MTV. У гэтую катэгорыю ўваходзяць клубы рознага ўзроўню (ад "квітнеючых", заможных клубаў "Гудвін", "Овертайм", "Мулен Руж show" да клуба "Alcatraz");

клуб па інтарэсах, які разлічаны на дакладна вызначаны стыль публікі. Такія музычныя клубы – новая з'ява ў культурным жыцці рэспублікі. У іх "жывая музыка", з якой скаардынавана ўся праграма, утульны бар, прафесійныя дыджэі, сяброўская (амаль хатняя) атмафера. На афішы аднаго з такіх клубаў значыцца "Толькі сярод сваіх сэрца адпачывае". У гэтым выказванні сапраўды заключаецца сэнс работы любога такога слушнага клуба. Кожны падобны клуб мае свой "твар", свой імідж, статут, арыгінальную эмблему, дэвіз, рэкламу і аўдыторыю (у залежнасці ад музычных прыхільнасцей), атмасферу, традыцыі і патрабаванні. Структура такога клуба выглядае наступным чынам:

- адміністацыйны аддзел;
- гаспадарчы аддзел;
- інжынерна-тэхнічная частка;
- бухгалтэрыя.

Штат такіх клубаў: дырэктар, менеджар па рэкламе, менеджар канцэртнай дзейнасці, менеджар па забеспячэнні, бухгалтар, гукарэжысёр, мастак па асвятленні, дыджэй, бармэны, ахова і іншы



Рэпазіторый ВГУ

абслугоўваючы персанал. Абавязковае патрабаванне, якое прад'яўляецца да музыкантаў, што абслугоўваюць работу гэтых клубаў, – наяўнасць гадзіннай праграмы для сольнага канцэрта і 3-хвіліннай – для вольнага выступлення. "Прайшлі тыя часы, калі публіка наведвала клуб на пэўныя мерапрыемствы або канцэрты. Сёння клуб – гэта, найперш, месца сацыяльных зносін. Стварыць утульную атмасферу для добрага адпачынку – асноўная наша задача", – лічыць дырэктар музычнага клуба "Рыф" В. Шаблінскі. Клуб павінен стаць "тусоўкай" у добрым сэнсе слова, "паркам пад дахам", дзе людзі змогуць збірацца і летам, і зімой. "Клубны рух – сімвал свабоднага, цывілізаванага свету", – гэта думка І. Варашкевіча, лідэра гурта "Крама".

Сярод найбольш цікавых музычных клубаў, якія сёння працуюць у Мінску і абласных гарадах, можна выдзяліць:

– "Пілот" – працуе пераважна на поп- і тэхнавечарынах для моладзі, запрашае вядомых дыджэяў з Масквы, Санкт-Пецярбургу, Германіі і Галандыі. У праграму часта ўключаюцца выступленні маладых, але папулярных беларускіх і расійскіх гуртоў і выканаўцаў. "Пілот" быў створаны для маладых людзей, якія аддаюць перавагу прагрэсіўным музычным накірункам. Мэта дзейнасці гэтага клуба – не толькі рэлаксацыйная, але і адукацыйная, асветная: пазнаёміць моладзь з сучаснымі стылямі музыкі. Інтэр'ер памяшкання выкананы ў лепшых клубных традыцыях, у адпаведнасці з назвай. Не так даўно, акрамя верхняй залы была адчынена ніжняя, так званы "чыл-аўт", з адпавядаючай адпачынку абсталяваннем, гульнявой залай і адкрытай пляцоўкай з барам;

– "Касмапалітэн" – самы стары і дэмакратычны ў Мінску клуб, які размясціўся ў былым палацы піянераў Цэнтральнага раёна. Асноўныя наведавальнікі – падлеткі. Тут адбываюцца выступленні толькі айчынных гуртоў рознай музычнай накіраванасці. Цікавай і значнай формай работы клуба з'яўляецца падтрымка маладых талентаў;

– клуб "X-RAY" – лічыцца самым закрытым клубным месцам Мінска, вядомы сваімі зачыненымі мерапрыемствамі, на якіх не раз працавалі лепшыя дыск-жакеі Масквы, у тым ліку Шушукын, List, Spyder, Fish. Для таго каб патрапіць у гэтую ўстанову, недастаткова купіць уваходны білет, бо "X-RAY" па праве можа лічыцца VIP-клубам. Нават пасля жорсткага "фэйс-кантролю" ад наведвальніка спатрэбіцца пацвердзіць права прыналежнасці да "сваёй тусоўкі". І толькі тады ў досыць невялікім, але вельмі стыльным памяшканні яго чакаюць выдатны гук, лепшыя дыджэі, цікавая музыка, дарагі і ўтульны бар, і галоўнае – пастаянная клубная публіка ва ўзросце ад 20 да 35 гадоў. Адным словам, "X-RAY" – клуб "для сваіх";

Репозиторий ВГУ

– клуб “BRONX” – адкрыты ў чэрвені 2003 года дзякуючы шэрагу буйных паспяховых акцый таксама ўпэўнена заваяваў пазіцыю “клубнага месца”. Нягледзячы на тое, што гэта вялікае і прыгожае памяшканне, чыстае і непракуранае паветра, добрае абслугоўванне, наяўнасць більярда і вельмі высокі кошт звычайна прыцягваюць у клуб даволі дарагую публіку, раз у два месяцы ў “Бронксе” праходзяць сапраўды дэмакратычныя-клубныя мерапрыемствы. І тады, можна атрымаць асалоду ад музыкі выдатных дыджэяў, сярод якіх было заўважана нямала замежных “зорак”. Менавіта ў такія дні публіка “Бронкса” ператвараецца са стыльных мужчын (ад 30 гадоў і вышэй) і стыльных дам у самую сапраўдную “клубную моладзь”;

– клуб-казіно “Белая вежа”, які знаходзіцца па суседстве таксама рэгулярна праводзіць спецыяльныя вечарыны з удзелам запрошаных дыджэяў, якія звычайна радуюць цікавай, а галоўнае – свежай клубнай музыкай. Выдатны гук і асвятленне, зручны бар з невысокім коштам абслугоўвання і, мабыць, самыя лепшыя ў горадзе танцоркі “go-go” заўсёды трымаюць поўную аўдыторыю, прыцягваючы публіку ва ўзросце 20–30 гадоў, большую частку з якой звычайна складаюць дзяўчаты. А ў звычайныя, “не клубныя” дні, музыка ва ўстанове часцей за ўсё разводзіцца “расійскай эстрадай”, а публіка становіцца больш разнамаснай;

– клуб “Ямайка” лічыцца клубам для спакойнага адпачынку, гэта ўстанова, дзе па пятніцах і суботах, звычайна пасля 2 гадзін ночы, збіраюцца маладыя людзі (у сярэднім ад 18 да 25 гадоў) для гульні ў боўлінг і няспешных зносін. Гэтаму спрыяюць даволі добры гук, нядрэннае абслугоўванне і галоўнае – бясплатны ўваход. Да вартасцей установы можна аднесці магчымасць зайсці ў клуб у любы час, не асцерагаючыся недахопу месцаў. Выснова – нядрэнны клуб для спакойнага адпачынку;

– клуб “Лео” – выдатна падыдзе аматарам так званых After-party (“вечарынак пасля вечарынак” у народзе – “ранішнікаў”);

– “West World Club” унікальны тым, што сумяшчае ў сабе і дыскатэку, і эратычнае шоў, і казіно з залай гульнявых аўтаматаў, і нават добры рэстаран;

– “Рэактар” – гэта сапраўдны дыскатэчны клуб, які сваёй атмасферай нагадвае эпоху дыска 1980–1990-х гадоў;

– начны клуб “Madison Club” – уяўляе сабой не толькі дыскаклуб, але і боўлінг-цэнтр;

– клуб “Рабінзон” – клуб аформлены ў стылі экзатычнай выспы, дзе праводзяцца эратычныя шоў;

– начны клуб “Афрыка”. Умяшчальнасць клуба каля 1000 чалавек. “Афрыка” – гэта адзін з нешматлікіх клубаў Мінска, дзе гарманічна спалучаюцца ўсе элементы клубнай культуры;



Рэпазіторый ВДУ

– начны клуб “Next Club” – клуб прэміум-класа, дзе ўсе наведвальнікі – VIP, але не па статусе, а па адносінах да кліента;

– начны клуб “Гагарын” прапагандуе house-музыку.

– начны клуб “Графіці” – “месца тусоўкі творчых піпл”, дзе праводзяцца канцэрты гуртоў у стылях: Jazz, аўтарская песня і Rock.

Вядома, у гэты агляд патрапілі далёка не ўсе начныя танцавальныя ўстановы Мінска, а толькі самыя характэрныя з іх. У Мінску маецца мноства начных клубаў, як вядомых так і не вельмі, з шырокім выбарам музычных напрамкаў і вузкай спецыялізацыі. Папулярнасць таго ці іншага клуба вымяраецца прысутнасцю вядомых асоб, якія наведваюць гэты клуб.

Клубнае жыццё рэгіёнаў нашай краіны прадстаўлена наступнымі клубамі:

маладзёжны дыска-клуб “Stop Line” ў Гродне. Сучасная электронная, танцавальная, папулярная музыка. Дзве танцавальныя залы. Більярд – руская піраміда. Начны клуб “Мавва” змяшчае ў сабе: прагляд 3d фільмаў і тэлепраграм, правядзенне вечарын, дзіцячых святаў, прэзентацый, дзелавых перамоў, фуршэтаў.

Адным з лепшых клубаў горада лічыцца начны клуб “Калізей 2000”. Працуе з 2000 года. Клуб прымае ўдзел у фестывалях і падтрымлівае дзіцячыя і маладзёжныя культурна-масавыя мерапрыемствы.

Клубныя карты (бясплатны ўваход) для лепшых тусоўшчыкаў і пераможцаў конкурсаў з’яўляюцца візітнай карткай невялікага “Начнога клуба Казанова” ў кінатэатры “Кастрычнік”. Там гучаць сучасная электронная музыка, поп-музыка. Праводзяцца рэтра-вечарыны. Конкурсы, бар, більярд – неад’емная частка работы клуба.

Папулярны кафэ-бар – начны клуб “Флінт”: модныя дыджэі з Беларусі, блізкага і далёкага замежжа – сучасная электронная музыка розных стыляў і кірункаў: House, Euro Dance, R & B і іншыя, забаўляльныя праграмы, стрыптыз-шоу, конкурсы, вечарыны.

**Начныя клубы г. Магілёва** прадстаўлены начнымі клубамі “Мацярык”, “Joker”, “Форум”, “CUBA”.

Сярод жыхароў Магілёва даўно папулярны начны клуб “Ліга”, які актыўна наведваюць як мясцовыя жыхары, так і госці горада.

Начны клуб “На Дуброўцы”. Візітная картка і галоўная адметнасць гэтага клуба – выдатны 10-кегельны боўлінг.

Начны клуб “Эльдарада”. Дыскатэка клуба вельмі вабіць выдатным падборам музычных кампазіцый і досыць ёмістым танцполам. У інтэр’еры клуба кожная дэталь з’яўляецца элементам старанна прадуманага стылю.

Начны клуб “Метро”. Гэты начны клуб шырока вядомы ў асяроддзі “залатой моладзі” Магілёва. Вялікай перавагай гэтай уста-

Рэпазіторый ВДУ

новы з'яўляецца даступнасць практычна любых забаў. Арыгінальны дызайн сапраўды нагадвае метрапалітэн.

**Начныя клубы г. Віцебска:** бітлз-клуб "Чардачок". Дыска-бар "Зебра" – невялікі клуб у цэнтры горада. Дыджэі круцяць у асноўным электроніку і поп-музыку. У клубе арганізуюцца конкурсы, забаўляльныя праграмы і стрыптыз. Часта "Зебра" з'яўляецца месцам правядзення вечарын і рок-фэстаў. У аўторак да 23:00 хлопцы ўваходзяць у клуб бясплатна. У той жа час у сераду – дзяўчаты. Субота – дзень клубных вечарын.

Начны клуб "Вегас". Два паверхі клуба "Вегас" уключаюць: дыскатэку з якасным гукам і асвятленнем, паслугі бара; кафэ з кухняй у стылі "fusion", піцэрыю, залы гульнявых аўтаматаў. Кожную ноч запрошаныя дыджэі прадстаўляюць музыку розных стыляў і накірункаў.

Начны клуб "Энергія" – найбуйнейшы клуб Віцебска, які здольны змясціць да 5 тысяч чалавек. Дзве танцпляцоўкі. У клубе ёсць більярд, рэстаран і некалькі асобных залаў для карпаратыўных вечарын. Дазволена курэнне ў спецыяльна адведзеным месцы. Уваход толькі для паўналетніх (18 +), у спрэчным выпадку фэйс-кантроль патрабуе пашпарт ці іншае пасведчанне асобы. Асноўныя музычныя стылі: рэтра, поп, рытм-і-блюз, рэйв, электра. Кожны дзень прысвечаны аднаму з напрамкаў, афішу можна знайсці на афіцыйным сайце. У клубе працуюць віцебскія і запрошаныя дыджэі. Перыядычна праходзяць тэматычныя і конкурсныя вечарыны: "Дзень нараджэння "Еўропы +", Конкурс "Miss Energy Club" і іншыя. Да паслуг наведвальнікаў 5 клубных бараў і арыгінальная барная стойка даўжынёй больш за 40 метраў – рэкорд Беларусі. Уражвае колькасць столікаў, агульная колькасць месцаў – 2 тысячы.

Кошт клубнага квітка: ≈ 2–8 $, у залежнасці ад дня тыдня і тэматыкі вечарыны.

Чацвер – "Ноч студэнцкіх хітоў"; пятніца – "Рэтравечарына"; субота – "Адчуйце сілу прыцягнення POP-музыкі ў выкананні рэзідэнтаў клуба". Нядзеля – "Pop Electro Party" – ноч хітоў.

**Начныя клубы г. Гомеля** прадстаўлены:

Начны клуб "NEMO CLUB" – адзін з першых начных клубаў горада, вядомы сваім утульным інтэр'ерам і непаўторнай атмасферай. Рэгулярна радуе знаўцаў забаў знакавымі вечарынамі і гучнымі імёнамі дыджэяў. "PLAZA Club" (Плаза клаб) – гэта сучасны забаўляльны цэнтр, які ўключае ў сябе кафэ, бар, рэстаран і танцпляц. Клубнае жыццё пачынаецца ў 22.00 і заканчваецца ў 5.00. Цудоўная музыка, святло і эксклюзіўныя шоу-праграмы.

Закрыты клуб "Tower" уяўляе сабой цікавае месца г. Гомеля, значна адрозніваецца ад іншых клубаў прадстаўленымі там шоу, дзе

Рэпазіторый ВДУ

рэгулярна выступаюць музычныя калектывы, праходзяць шоу, у тым ліку і эратычныя.

**Начныя клубы г. Брэста:**

начны клуб "Планета Рок" – незвычайная абстаноўка, утульнасць і стыль залы, упрыгожанай выявамі замежных эстрадных зорак 70–80-х гадоў, выдатна спалучаюцца з сучасным гукавым, светлавым і мультымедыйным абсталяваннем. 7 дзён на тыдзень – музыка, шоу, забавы.

"Планета Рок" – гэта тэматычныя вечарыны, эксклюзіўныя мерапрыемствы, прэзентацыі і паказы. Унікальную атмасферу дапаўняюць экспромты дыджэяў. Танцпол таксама абсталяваны мультымедыйным абсталяваннем. Дыджэі імкнуцца задаволіць музычныя пажаданні ўсіх наведвальнікаў і зрабіць разнастайным іх вольны час пры дапамозе конкурсаў.

Для забеспячэння камфорту наведвальнікаў дыска-бар "Планета Рок" абсталяваны сістэмамі кандыцыяніравання, мае адмысловы пакой для курэння, паркоўку аўтамабіляў. Да паслуг наведвальнікаў шырокі асартымент меню, карты він і кактэйляў. У распараджэнні аматараў більярда і гульнявых аўтаматаў спецыяльная зала на другім паверсе дыска-бара.

Дыска-бар "Арлекіна". Насычаныя рытмы сучасных танцавальных кампазіцый акунаюць у эмоцыі і дораць новы настрой, для выражэння якога ў клубе існуе танцпол на двух узроўнях. Па выхадных на дыскатэцы праводзяцца шоу-праграмы, стрыптыз. Добра арганізаваны гук і арыгінальнае светавое рашэнне.

Начны клуб "Шайба" моладзь Брэста наведвае па суботах, дзе збіраецца ў холе Лядовага палаца спорту на завадную дыскатэку "Шайба". Для гасцей – сучасная танцавальная музыка, прафесійнае абсталяванне, вясёлыя конкурсы, звонкае караоке і многае іншае. Рэтра-дыскатэка праходзіць з 19.00 да 23.00.

Начны клуб "CITY" праводзіць вечарыны, паказы мод, прэзентацыі.

Забавы: боўлінг, гульнявыя аўтаматы, мужчынскі стрыптыз, стрыптыз-шоу.

Яркі і незвычайны інтэр'ер клуба ў спалучэнні з якасным гукам і асвятленнем стварае казачную атмасферу. Серада ў "CITY" – гэта дзень студэнтаў або калі дакладней, то дзень студэнцкіх вечарынак. Студэнтам 2–5 курсаў да 24.00 уваход вольны (па прад'яўленні дакумента). Чацвер – дзень цікавых тэматычных мерапрыемстваў. Пятніца – для дзелавых людзей. Субота дзеля самых вытанчаных гурманаў клубнага жыцця, ноч хітоў. У нядзелю начны клуб "CITY" адорыць "выдатную палову" бясплатным уваходам да 24.00.



Рэпазіторый БГУ

Акрамя гэтых папулярных клубаў, у сталіцы і рэгіёнах можна знайсці і велізарную колькасць іншых устаноў з самымі рознымі музычнымі напрамкамі. Для мінчан і гасцей сталіцы таксама заўсёды адкрыты і гей-клубы, і дыскатэкі для тынэйджараў і іншыя ўстановы, якія цяжка аднесці да нейкага канкрэтнага тыпу.

У залежнасці ад геаграфіі начнога клуба, кожны наведвальнік сутыкаецца з праходжаннем фэйс-кантролю і дрэс-коду, што найбольш сур'ёзна адрознівае начныя клубы паміж сабой.

Пастаянныя наведвальнікі начных клубаў або проста – клаберы (cluber), напрыклад, еўрапейцы аддаюць перавагу зручнасці абутку і вопратцы, якая не замінае рухам падчас танцаў і не перашкаджае расслабляцца. У клуб можа быць не дапушчаны чалавек у моцна абношанай або бруднай вопратцы. Некалькі іншая палітыка ў расійскіх начных клубах. Калі вы ў простай вопратцы і спартыўным абутку, то ў асноўную масу клубаў вы проста не трапіце. Гэта некалькі супярэчыць здароваму сэнсу, аднак, так яно і ёсць. Каб наведваць начныя клубы Мінска і рэгіёнаў, неабходна спецыяльнае адзенне для клубаў. Такая палітыка шмат у чым абумоўленая тым самым рускім менталітэтам, які безумоўна спрацоўвае ў тым плане, што калі мы ідзем у клуб – мы ідзем "сябе паказаць", ну і на "людзей паглядзець", у Еўропе ж клубы наведваюць для таго, каб патанчыць, паслухаць музыку і проста расслабіцца, у рэшце рэшт.

Варта адзначыць, што само паняцце "Dress-Code" азначае не інакш як форму адзення, якая неабходна пры наведванні пэўных мерапрыемстваў або ўстаноў. Але ў дадзеным выпадку абавязковая наяўнасць строгага Dress-Code і фэйс-кантролю ажыццяўляюць функцыю падтрымання статусу ўстановы. Гэта дазваляе ўстановам больш старанна рабіць адбор сваіх наведвальнікаў на прадмет іх неадпаведных паводзін, стылю адзення і абутку. Часам, здаецца, што патрапіць у любы начны клуб, у залежнасці ад яго статусу, можна, быўшы ахайна апранутым, але ў гэтым і заключаецца некаторы зман нашых грамадзян. Але ніхто пры гэтым не ўлічвае, што ў прэстыжных начных установах сталіцы дзейнічае жорсткая ўнутраная клубная сістэма, дзе асноўныя госці клуба праходзяць па клубных картках, астатнім жа загадзя неабходна заказваць месцы па тэлефоне, карыстацца запрашальнымі або рэкамендацыямі членаў клуба. Не так часта, але для таго, каб прыўнесці некаторае ажыўленне, у начны клуб могуць прапускаць і цалкам новых гасцей, часцей за ўсё гэта адбываецца далёка за поўнач, калі патрабаванні да наведвальнікаў па фэйс-кантролю і дрэс-коду некалькі зніжаюцца.

Такім чынам, сучасны начны клуб – гэта публічная прастора, пазбаўленая любой ідэалогіі, акрамя ўласна клубнай, калі клубнае жыццё становіцца сферай забаў у іх чыстым выглядзе. Клубная прастора



Рэпазіторый ВГУ

стала тэрыторыяй свабоды, дзе магчымыя практычна любыя забавы, дзе настрой, унікальная атмасфера і драйв дапамагаюць атрымаць наймацнейшы эмацыйны ўздым і “адцягнуцца” ад дзённых праблем.

### *3.3.3. Дзейнасць аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах*

Працэс індывідуалізацыі клубнай дзейнасці на аснове інтарэсаў наведвальнікаў клубаў пачынае пранікаць у клубную практыку ўстаноў культуры. На сённяшні дзень адной з самых папулярных формаў арганізацыі вольнага часу насельніцтва Беларусі з’яўляюцца аматарскія аб’яднанні. Творчая дзейнасць удзельнікаў дзяржаўных аматарскіх аб’яднанняў і клубаў па інтарэсах якасна паляпшае ўсю работу ўстаноў культуры, робіць яе больш разнастайнай, змястоўнай і насычанай. Пераканаўчы ў гэтых адносінах вопыт работы клубаў мастацкага напрамку (аб’яднанні самадзейных мастакоў, паэтаў, кампазітараў, клубы творчай інтэлігенцыі, выяўленчага мастацтва, фотамастацтва, фларыстыкі, цікавых сустрэч, якія працуюць у форме салонаў).

Пад “клубам” мы разумеем добраахвотнае аб’яднанне людзей на аснове адзінства іх мэт, задач, інтарэсаў, дзейнасці, месца і часу зносін. Важна адзначыць, што клубам называюць толькі такое аб’яднанне, у якім свабодная калектыўная дзейнасць людзей носіць грамадска значны характар, не з’яўляецца асацыяльнай. Клуб ствараюць для таго, каб задаволіць духоўныя патрэбы, развіць прыродныя задаткі і здольнасці, рэалізаваць разнастайныя інтарэсы і, у выніку – творчы патэнцыял асобы.

У аснову клубнага руху пакладзена аматарства, неабходна звярнуцца да трактоўкі гэтага тэрміна. У.І. Даль дае вызначэнне “аматара” як “охотник до чего-нибудь”, “любящий что-нибудь”, а таксама, “дилетант, т.е. человек без должной специальной подготовки, которую он восполняет опытом” [8, с. 120].

Шырока распаўсюджаныя сёння тэрміны “аматарская творчасць” і “мастацкая самадзейнасць” упершыню з’явіліся ў канцы XIX стагоддзя і характарызавалі значную цікавасць розных слаёў грамадства да мастацкай творчасці. Звязана гэта было з масавым укараненнем у культуру і побыт грамадства арганізаваных формаў заняткаў рознымі відамі аматарскага мастацтва (тэатры, духавыя аркестры і аркестры народных інструментаў, хоры, выяўленчае мастацтва, прыкладная творчасць). Гэта была шырока спланаваная праграма ўключэння народных мас у розныя віды творчасці, так як менавіта ў ім можна было знайсці шляхі выхаду з крызісу ў вырашэнні многіх сацыяльных праблем (барацьба з п’янствам, беспрацоўе).

Даследчыкі гісторыі і тэорыі клубнай дзейнасці У.Я. Трыодзін і Я.І. Смірнова [48; 52; 53] прапаноўвалі назвы “клуб па інтарэсах” і

Репозиторий ВГУ

“аматарскае аб’яднанне” вызначаць як “клубныя аб’яднанні” раўназначнага характару, але “клубнасць” у дадзеным выпадку не толькі звязвалася з месцам іх дзейнасці, а хутчэй вызначала характар гэтай арганізацыі. “Аб’яднанне” па сэнсе вызначае той жа клуб, але з больш складанай арганізацыяй і функцыянальнай структурай. Ужыванне слоў “аматарскі” або “па інтарэсах” сведчыць аб тым, што ў аснове ляжыць цікавасць чалавека да чаго-небудзь, яго захопленасць, прызванне, схільнасці, закладзены у ім творчы патэнцыял. Часта сам удзельнік клуба не можа растлумачыць прычыну і прыроду свайго захаплення (хобі).

У Палажэнні аб аматарскім аб’яднанні і клубе па інтарэсах, прынятым яшчэ ў 1986 годзе, сказана, што аматарскае аб’яднанне, клуб па інтарэсах з’яўляюцца арганізаванай формай грамадскай самадзейнасці насельніцтва, створанай на аснове добраахвотнасці, агульных творчых інтарэсаў і індывідуальнага членства удзельнікаў, з мэтай задавальнення разнастайных духоўных запытаў і інтарэсаў людзей у сферы вольнага часу.

Пад тэрмінам “аматарства” сёння разумеецца такі стан дзейнасці, дзякуючы якому павялічваецца ўпэўненасць у сябе, умацоўваецца вера ў сваю здольнасць “тварыць”, імкнуцца да канкрэтнай маральнай мэты.

Аматарскія заняткі ўзбагачаюць таварыства новымі творчымі асобамі.

У выніку імі ствараюцца матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці. У працэсе аматарскай дзейнасці чалавек стварае сваё мікраасяроддзе, тым самым здымаючы напружанне, стрэсы. Аматарства – гэта своеасаблівы зыход ад аднастайнасці і рэчаіснасці. Яно не звязана з рэалізацыяй дасягненняў у прафесійнай дзейнасці. Аднак аматарства – гэта не толькі адпачынак, але і праца, так як індывід у выніку рэкрэацыі заняты працай. Гэта актыўнае расслабленне, пераключэнне на тую сферу, якая не закранута асноўным відам жыццядзейнасці чалавека, яго прафесіяй. Аматар – творца – “сам сабе гаспадар”, “сам сабе рэжысёр”, які стварае свой уласны свет, што выяўляецца ў індывідуальных і масавых формах. Той свет, які ствараецца ў працэсе творчасці і які звязаны з паўсядзённай рэчаіснасцю і ўнутраным суб’ектыўным адчуваннем чалавека. Творчая неабходнасць, якая прадстаўляе ўнутраны стан чалавечага пазнання, выяўляецца ў здольнасці ўяўлення і з’яўляецца адным са шляхоў да мастацкага выхавання. Аматары – гэта тыя, хто “ўрастае” у сферу культурна-творчай дзейнасці, дзе існуюць традыцыі народнай мастацкай творчасці. Засваенне культурных традыцый і мастацкіх формаў дзейнасці, а менавіта аматарскіх (спевы, музіцыраванне, занятак мастацка-прыкладной творчасцю і г.д.) з’яўляецца арыенцірам дзейнасці

аматара. Самадзейнасць у працэсе пазнання ператвараецца ў эстэтычныя перакананні, нормы і прынцыпы паводзін. Асноўным, нязменным ядром яго з'яўляецца чалавечая індывідуальнасць, заахвочванне асобы да руху, імкненне праявіць сябе ў занятках творчасцю. Мастацкая творчасць аматара больш за ўсё імкнецца да індывідуальных формаў культурна-дасугавай дзейнасці, аднак можа ўключаць і калектыўныя формы (самадзейнасць).

Самадзейныя арганізацыі, а менавіта аматарскія аб'яднанні і клубы па інтарэсах, маюць больш высокую форму ўнутрыклубных аб'яднанняў. У іх аснове закладзена задавальненне маральных, унутраных патрэб і здольнасцей асобы.

У аматарскіх аб'яднаннях ацэньваюцца жаданне, энтузіязм, якія ўключаюць чалавека ў арганізацыйную дзейнасць сродкамі мастацкай творчасці. Захапленне мастацкай творчасцю ў такіх калектывах фарміруе новыя здольнасці, бо ў іх збіраюцца групы людзей, якія маюць шмат агульнага, незалежна ад узроўню адоранасці. Менавіта "інтарэс", "запал" у мастацкай творчасці могуць даць значны вынік, які будзе непаўторны, арыгінальны і непасрэдны. Яго выніковым праявай з'яўляюцца розныя формы прадстаўлення творчасці на суд гледачоў, слухачоў.

Зыходзячы з аналізу розных падыходаў да праблемы аматарскай творчасці можна зрабіць выснову, што аматарскае аб'яднанне – гэта сукупнасць аматарскіх ведаў, захапленняў, крыніца духоўнага ўзбагачэння асобы, дзе адбываецца новае паслядоўнае ўключэнне творчага аспекту дзейнасці аматараў у працэс сацыяльнага вопыту, у тым ліку ў форме індывідуальнага сяброўства, пры рэалізацыі самаразвіцця і самаадукацыі кожнага індывіда ў вольнай часавай прасторы.

Клубнае аб'яднанне, або клуб па інтарэсах – гэта форма сумеснага задавальнення сацыяльных і культурных патрэб груп, блізкіх па інтарэсах; удзел у гуртках, студыях, клубах, пры стварэнні ўмоў для духоўных зносін і заахвочванні да самадзейнай творчасці, дзе зможа самаарганізавацца мноства розных аматарскіх аб'яднанняў.

Да існуючых відаў аб'яднанняў адносяць: ініцыятыўныя клубы, клубныя аб'яднанні (гурткі, студыі, секцыі і г.д.), клубы па інтарэсах, аматарскія аб'яднанні і інш. Развіваюцца новыя арганізацыйныя формы клубаў – дзіцячыя, шматпрофільныя, забаўляльныя, сямейнага адпачынку, якія працуюць па аўтарскіх праграмах. Іх шмат і яны падзяляюцца ў залежнасці ад мэтавай устаноўкі, узроставых асаблівасцей, а галоўнае – па напрамках дзейнасці.

Сучасны даследчык беларускіх клубных аб'яднанняў Т.І. Стружэцкі [49, с. 9–10] прапаноўвае выдзяляць наступныя характэрныя прыметы клубнага аб'яднання, якія, на наш погляд, пабудаваны на сусветных клубных традыцыях:



Репозиторий ВГУ

- супольнасць людзей на аснове цікавасці да канкрэтнага віду грамадскай дзейнасці ў вольны час;
- агульнасць матываў дзейнасці, супадзенне грамадскіх і асабістых інтарэсаў;
- доўгі або дастаткова ўстойлівы кантакт удзельнікаў аб'яднання, адносная стабільнасць складу ўдзельнікаў;
- арганізацыйнай афармленасці дзейнасці пэўнай групы людзей (наяўнасць органаў самакіравання, праграмы, статута і г.д.) [49, с. 9–10].

Прыкметамі клуба называюць: стабільны склад удзельнікаў, наяўнасць сумеснай дзейнасці на падставе агульнага інтарэсу, свабодны выбар заняткаў, афармленасць групы, рэгулярнасць сустрэч і інш.

У адрозненне ад клубаў па інтарэсах або аматарскіх аб'яднанняў, дзе кіраўніцтва ажыццяўляецца органам самакіравання, дзе прэзідыум (рада, бюро, кіраванне) выбіраецца агульным сходам усіх членаў клуба – гурткі маюць больш простую структуру і функцыі. Асноўная задача гуртка ў клубных установах – арганізацыя заняткаў па навучанні аднаму з жанраў самадзейнай творчасці. Праца гуртка рэгулюецца праграмай, разлічанай на год, таму склад удзельнікаў перыядычна мяняецца, па меры асваення прапанаванага матэрыялу.

Разгледзім асноўныя віды аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах, якія афіцыйна зафіксаваны ў палажэнні аб аматарскіх аб'яднаннях і клубах па інтарэсах:

– **грамадска-палітычныя** (палітычныя клубы, клубы выбаршчыкаў, клубы філосафаў, клубы міжнароднікаў, клубы рэвалюцыйнай і баявой славы, інфармацыйна-асветныя клубы, прававыя, інтэрнацыянальнай дружбы, воінаў-абаронцаў). Праца па арганізацыі гэтых розных клубаў вядзецца ў парках, музеях, інтэрнатах, на прадпрыемствах, зялёных пляцоўках па месцы жыхарства, у дамах культуры. У многіх гарадах Беларусі дзейнічаюць маладзёжныя грамадска-палітычныя клубы, якія арганізуюць сустрэчы з ветэранамі, ствараюць пошукавыя атрады. Пры многіх школах створаны музеі баявой славы;

– **вытворча-тэхнічныя** (тэхнічнай творчасці, рацыяналізатараў, вынаходнікаў, наватараў вытворчасці, мадэлявання, канструявання і праектавання камп'ютарнай тэхнікі і т.п.);

– **натуральна-навуковыя** (аматараў астраноміі, акеаналогіі, падарожжаў, агароднікаў, садоўнікаў, кветкаводаў, акварыумістаў, птушкагадоўцаў, сабакаводаў і т.п.);

– **мастацкія** (аматараў музыкі, тэатра, літаратуры, кіно, выяўленчага мастацтва, песні, танца, фотамастацтва, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і т.п.);

**– фізкультурна-аздараўленчыя** (клубы загартоўвання, аматараў бегу, турызму, клубы "заўзятараў", гісторыі савецкага спорту, алімпійскага руху і т.п.);



Репозиторий ВГУ

– **калекцыйныя-збіральніцкія** (філатэлістаў, філафаністаў, філакартыстаў, нумізматаў, фалерыстаў і т.п.). Могуць таксама стварацца клубы ветэранаў вайны і працы, падлеткаў, моладзі, жаночыя, цвярозасці, знаёмства, маладых спецыялістаў, творчай інтэлігенцыі, сямейнага адпачынку, дамаводства і т.п.

На сучасным этапе адбываюцца радыкальныя змены ва ўсіх сферах жыцця грамадства. Мы з'яўляемся сведкамі змены грамадскай думкі, разам са змяненнем сістэмы каштоўнасцей.

Дзейнасць аб'яднанняў можа ажыццяўляцца па наступных асноўных відах: пазнавальная, прапагандысцкая, вучэбная, пошукава-даследчая, мастацка-творчая, спартыўна-аздараўленчая.

Даволі шырокае распаўсюджанне атрымалі гісторыка-краязнаўчыя аб'яднанні: клубы аматараў гісторыі, рыцарства і культуры сярэднявечча, клубы па вывучэнні гісторыі роднага краю. Напрыклад, у студзені 1997 г. у г. Наваполацку энтузіястамі, якія цікавіліся гісторыяй Беларусі, быў створаны ваярска-гістарычны рыцарскі клуб "Жалезны воўк". Пазней яго месцам знаходжання стаў старажытны Полацк. Згодна са статутам, гэты клуб з'яўляецца добраахвотным аб'яднаннем, здольным згуртаваць аматараў нацыянальна-гістарычнага напрамку, і існуе пры цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур горада Полацка. Асноўнай задачай дзейнасці клуба з'яўляецца выхаванне беларускай моладзі на аснове рыцарскіх ідэалаў і агульначалавечых каштоўнасцей, развіццё творчасці моладзі ва ўсіх яе праявах. Гэта – развіццё і падтрымка талентаў (асабліва ў галіне сярэднявечных рамёстваў), выставачная дзейнасць, адраджэнне нацыянальнай культуры, гісторыя духу і ідэалаў беларускага рыцарства сярод моладзі, культурна-асветніцкая дзейнасць (тэатралізаваныя спектаклі-відовішчы, фільмы, шоу), стварэнне агульнабеларускай рыцарскай федэрацыі. Вышэйшым органам кіравання "Жалезным ваўком" з'яўляецца Рада, якая ўстанаўлівае парадак прыёму ў сябры клуба, вызначае асноўныя напрамкі дзейнасці, заслухоўвае справаздачы аб іх рабоце, прызначае Старшыню клуба. Сябрам клуба можа стаць кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які цікавіцца гісторыяй нацыянальнай культуры, які прайшоў кандыдацкі тэрмін і выканаў усе кандыдацкія патрабаванні, вызначаныя Радай.

Сярод шматлікіх аматарскіх аб'яднанняў асабліва значнае месца займаюць клубы традыцыйнай культуры. Новым накірункам у традыцыйнай культуры лічыцца дзейнасць клубаў беларускай нацыянальнай кухні.

Трэба падкрэсліць, што паняцці "клуб", "аматарскае аб'яднанне", "клуб па інтарэсах" і па сённяшні дзень разумеюцца то як паняцці раўназначныя, то як поўныя супрацьлегласці. Безумоўна,

Рэпазіторый ВДУ

што яны маюць агульныя рысы, таму што любое правядзенне вольнага часу ў групе з іншымі людьмі заснавана не толькі на “сама-дзейнасці” (г.зн. дзейнасці самой асобы), а і на прынцыпах аматарства, агульных інтарэсаў, са-дзейнасці, са-творчасці з іншымі людзьмі. Калі чалавеку не цікавы той ці іншы від заняткаў, калі яго не будзе задавальняць атмасфера ў тым ці іншым калектыве, ён ніколі не пойдзе ні ў клуб, ні ў Дом ці Палац культуры, ні ў якую іншую ўстанову культуры.

Аб’ектыўна ж клубы, і як сацыяльныя інстытуты, і як аматарскія аб’яднанні, адлюстроўваюць узровень цывілізаванасці краіны, эканамічную стабільнасць і матэрыяльныя магчымасці чалавека і грамадства. Яны маюць шматлікую сетку сваіх тыпаў там, дзе людзі жывуць дастаткова забяспечана і правядзенне вольнага часу займае дастойнае месца ў жыцці чалавека. Там, дзе грамадства развіваецца стабільна, раўнамерна, паступова, клуб з’яўляецца натуральнай формай арганізацыі адпачынку людзей. Але калі грамадства займае адносна клуба пазіцыю ўмяшання, забароны, тады клуб становіцца альтэрнатыўнай формай адпачынку. Яго “адмежаванасць” ад сацыяльных праблем рэзка павялічваецца ў лепшым выпадку, а ў горшым – дзейнасць носіць асацыяльны характар.

На сучасным этапе адбываецца збліжэнне “попыту” і “прапановы” ў клубнай сферы, што прадугледжвае ўлік хоць бы самых агульных асаблівасцей арыентацый людзей у культурнай сферы вольнага часу, якія складаюцца стыхійна, незалежна ад дзейнасці той ці іншай клубнай установы. У гэтай сувязі прадуктыўна звяртанне да тыпалогіі формаў паводзін у правядзенні вольнага часу. З гэтай нагоды была распрацавана тыпалогія формаў паводзін з разлікам на максімальнае збліжэнне запытаў насельніцтва і работы ўстаноў культуры.

Гэтую тыпалогію можна прадставіць у выглядзе наступнай табл. 3:

Табліца 3

**Тыпалогія формаў паводзін у правядзенні вольнага часу**

| **Тыпы арыентаваных паводзінаў з пункту гледжання самакаштоўнасці прадмета заняткаў** | **Формы арыентаваных паводзінаў з пункту гледжання вызначанасці прадмета заняткаў** |
|---|---|
| Культурна-арыентаванае<br>Сацыяльна-арыентаванае<br>Рэкрэацыйна-арыентаванае | Мэтавая форма<br>Пошукавая форма |

***Рэкрэацыйна-арыентаваныя паводзіны*** – тып паводзінаў, які прадугледжвае аднаўленне біяпсіхічных рэсурсаў асобы, патрачаных у сферы выканання абавязкаў (на вытворчасці, у побыце і г.д.). Тут вельмі часта не столькі значны дасягнуты ўзровень валодання навыкамі ў тым ці іншым відзе дзейнасці, колькі вельмі рэкрыацыйны, аздараўленчы эфект, звязаны са зняццем стамлення, атрыманнем яркіх уражанняў, барацьбой з гіпадынаміяй, псіхафізічнымі перагрузкамі і г.д. Але гэта не азначае, што дадзенаму тыпу забаўляльных паводзін (як і іншым, якія будуць разглядацца намі ніжэй), можна прадпісаць жорсткі выбар заняткаў. Напрыклад, для чалавека з развітым музычным слыхам рэкрэацыйны эфект можа быць дасягнуты і пры ўспрыняцці класічнай музыкі. Гаворка можа ісці хутчэй аб некаторай пераважаючай тэндэнцыі запаўнення “рэкрэацыйных ніш” аздараўленчымі і забаўляльнымі праграмамі, якія традыцыйна адносяць да з’яў “масавай культуры”. Але галоўная характарыстыка рэкрэацыйна-арыентаваных паводзін усё ж не ў гэтым.

Значнай (у незалежнасці ад складу заняткаў) з’ўляецца самаарыентацыя на ўласнае здароўе, псіхічнае самаадчуванне, станоўчыя эмоцыі. У свядомасці чалавека гэта арыентацыя ўсведамляецца як патрэба у гульнявым, відовішчным, аздараўленчым адпачынку. Можна сцвярджаць, што ў сілу сацыяльных і эканамічных прычын (сацыяльная напружанасць, псіхафізічныя перагрузкі, няпоўная занятасць насельніцтва, наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС і інш.) роля забаўляльных праграм, якія рэалізуюць рэкрэацыйную арыентацыю, будзе ўзрастаць.

Мы згодны з думкай, выказанай вядомым беларускім культуролагам А.І. Смолікам, што “...ва ўмовах адсутнасці неабходнай колькасці псіхатэрапеўтаў у нашай краіне тэатральна-відовішчныя, канцэртныя, клубныя ўстановы, бібліятэкі могуць актыўна ўздзейнічаць сродкамі мастацтва і культуры на пацярпелага (ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС) шляхам фарміравання ў яго жыццесцвярджальных, аптымістычных ідэалаў і памкненняў, якія садзейнічаюць перадольванню хваравітага песімізму, даюць сілу для барацьбы з трагедыяй”. Таму, сцвярджае далей гэты культуролаг, “... кадры ўстаноў культуры павінны прайсці спецыяльную падрыхтоўку па вывучэнні прынцыпаў арганізацыі арттэрапеўтычнай службы”.

Другі беларускі навуковец В.А. Салееў лічыць, што ў практыцы сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі можа эфектыўна выкарыстоўвацца тэрапія творчым самавыяўленнем.

Гэтых жа поглядаў прытрымліваецца і сацыёлаг А.І. Ляўко: траўміраваная асоба ўспрымае свае праблемы праз прызму адпаведных культурных і іншых традыцый.



Рэпазіторый ВДУ

***Сацыяльна-арыентаваныя паводзіны*** – гэта паводзіны ў культурнай сферы вольнага часу, аснову якіх складае цікавасць да іншага чалавека. Асноўная форма такой цікавасці – нефармальныя зносіны, якія не залежаць ад тых або іншых "афіцыйных" роляў у грамадстве (у першую чаргу ад вытворчых роляў, абавязкаў). Менавіта гэта арыентацыя з'яўляецца асноўным клубным "ферментам", які забяспечвае ўзнікненне і самазахаванне клубных супольнасцей, якія аб'ядноўваюць людзей па самых розных прыметах (пол, узрост, нацыяльнасць, светапогляд і г.д.). У гэтым выпадку тыя ці іншыя заняткі значныя ў той ступені, у якой яны спрыяюць паглыбленню і пашырэнню міжасабовых кантактаў, якія аб'ядноўваюць людзей і іх сацыяльна-культурнай самаідэнтыфікацыі.

У арганізацыйным плане да такіх аб'яднанняў адносяцца салоны, гасцінныя, клубы з зафіксаваным сацыяльна-дэмаграфічным складам. Пры ўліку сацыяльнага расслаення грамадства, якое ў сучасных гісторыка-культурных, сацыяльных і эканамічных умовах усё ўзмацняецца, можна сцвярджаць, што значнасць такіх аб'яднанняў будзе ўзрастаць і ў XXI стагоддзі.

***Культурна-арыентаваныя паводзіны*** – дамініруе арыентацыя на набыццё ведаў, уменняў і навыкаў у тым ці іншым выглядзе заняткаў у вольны час. У гэтым выпадку менш значнымі для ўдзельнікаў дасугавай праграмы з'яўляюцца рэкрэацыйны элемент і сацыяльны склад аб'яднання. Галоўным застаецца працэс навучання або асветы. Нельга не адзначыць рост колькасці новых вучэбных адзінак, якія ствараюцца ў клубе, і з'яўляюцца "дзецішчам перабудовы": курсаў менеджараў, замежных моў, праграміравання, бізнеса і г.д. Акрамя таго, зняцце многіх цэнзурных ідэалагічных бар'ераў дазваляе бесперашкодна вывучаць культурныя і гістарычныя традыцыі свайго народа, філасофскія і рэлігійныя вучэнні, розныя палітычныя ідэалогіі і іншае.

Дэмакратызацыя грамадскага жыцця адбіваецца і ў выглядзе ўзмацнення арыентацыі наведвальніка клуба на самастойны выбар заняткаў у вольны час, імкненне авалодаць новымі тэхналогіямі сацыяльна-культурнай актыўнасці, уласцівых "таварыству спажыўцоў": турызм, садаводства і агародніцтва, бытавы дызайн, рамонт жылля, аўтасправа і г.д. Адпаведна ўзрастае запыт і на навучальныя праграмы па павышэнні "дасугавай і бытавой кваліфікацыі" ў розных відах дасугавай актыўнасці, якая цікавіць розныя групы насельніцтва.

Крызіс сямейнага выхавання і дзяржаўнай гуманітарнай адукацыі выклікае да жыцця розныя альтэрнатыўныя методыкі і вучэбныя праграмы, якія кампенсуюць недасканаласць дзеяння гэтых сацыяльных інстытутаў (сям'я, школа). Найбольш тыповае



Рэпазіторый ВДУ

ажыццяўленне гэтай тэндэнцыі прадстаўлена ў дзіцяча-падлеткавай мастацкай самадзейнасці, краязнаўстве, фальклоры, цэнтрах эстэтычнага выхавання.

Акрамя тыпаў арыентацыі паводзінаў у культурнай сферы вольнага часу з пункту гледжання самакаштоўнасці прадмету заняткаў у ёй прадстаўлены формы арыентацыі паводзінаў паводле вызначанасці прадмета заняткаў. У табліцы выдзяляюцца дзве такія формы: **мэтавая і пошуковая.** Мэтавая форма азначае, што ўдзельнік той ці іншай сацыяльна-культурнай дзейнасці ясна ўсведамляе сваю цікавасць у яе рэчавым, “матэрыяльным” увасабленні (канкрэтная кніга, атракцыён, другі чалавек, аздараўляльная праграма і гэтак далей). Пры пошукавай форме паводзінаў у вольны час індывід фіксуе ў сваёй свядомасці гэты інтарэс, але не звязвае яго з канкрэтным прадметам сацыяльна-культурнай актыўнасці.

Перасячэнне тыпаў арыентацыі паводзінаў у культурнай сферы вольнага часу з пункту гледжання **самакаштоўнасці выбраных заняткаў** і формаў арыентацыі з пункту погляду **прадмета дзейнасці** ў культурнай сферы вольнага часу нараджаюць наступныя спалучэнні:

**1. Рэкрэацыйна-арыентаваныя мэтавыя паводзіны**, што азначае арыентацыю на раней выбраны канкрэтны від рэкрэацыі, забаў.

**2. Рэкрэацыйна-арыентаваныя пошукавыя паводзіны** – наведванне аб’екта забаў, адпачынку без раней вызначанай праграмы.

**3. Сацыяльна-арыентаваныя пошукавыя паводзіны** – запланаваны раней сацыяльны кантакт з канкрэтнай асобай або групай людзей.

**4. Сацыяльна-арыентаваныя пошукавыя паводзіны** – імкненне завязаць новыя знаёмствы, пашырыць сацыяльныя кантакты.

**5. Культурна-арыентаваныя мэтавыя паводзіны** – наведаванне раней выбранай культурнай праграмы.

**6. Культурна-арыентаваныя мэтавыя паводзіны** – імкненне пашырыць свой кругагляд, узбагаціцца новымі ведамі без запланаванай раней арыентацыі на канкрэтны від заняткаў.

Безумоўна, магчыма і спалучэнне ўсіх гэтых тыпаў арыентацыі (іх атрымліваецца дастаткова многа, калі мець на ўвазе і камбінацыі па прыкмеце “мэтава-пошукавыя паводзіны”).

Мы абмяжуемся прыведзеным на гэтых старонках пералікам зыходнай тыпалогіі паводзін у культурнай сферы вольнага часу, якая дазваляе ацаніць магчымасці перакрыжавання “клубаў-супольнасцей” і “клубаў-устаноў”. У свеце гэтай тыпалогіі прадстаўляе цікавасць разглядзець “клубы-супольнасці”. А на гэтай аснове – тыпалогію

Репозиторий ВГУ

развіцця клубнай сеткі, якая можа выкарыстоўвацца ў рэальнай клубнай практыцы (табл. 4).

Табліца 4

**Тыпалогія развіцця клубнай сеткі**

| **Тып паводзін у культурнай сферы вольнага часу** | **Тып клуба-супольнасці** | **Тып клуба-ўстановы** |
|---|---|---|
| **1. Рэкрэацыйна-арыентаваныя мэтавыя паводзіны** | Падлеткавыя клубы-супольнасці з забаўляльнай накіраванасцю, аматары якога-небудзь віду забаў у групе, аздараўленчы клуб і г.д. | Клубная ўстанова з дамінаваннем аднаго віду паслуг або роднасных відаў рэкрэацыйных паслуг (напрыклад: відэа-салон, дыскатэка, аздараўленчы комплекс і г.д.) |
| **2. Рэкрэацыйна-арыентаваныя пошукавыя паводзіны** | Часовы гульнявы калектыў, які ўзнік у працэсе наведвання рэкрэяцыйна-забаўляльнай праграмы (напрыклад: каманды ўдзельнікаў гульні і інш.) | Клубная ўстанова з наборам розных відаў рэкрэатыўных паслуг (напрыклад: клуб-кафэ, забаўляльны цэнтр, кабарэ і г.д.) |
| **3. Сацыяльна-арыентаваныя мэтавыя паводзіны** | Сацыяльна-арыентаваныя клубы-супольнасці, аформленыя арганізацыйна (членства, праграмы, прававы статус) | Клубная ўстанова, арыентаваная на аднародны па якой-небудзь сацыяльна-дэмаграфічнай прымеце, складу ўдзельнікаў (пол, узрост, нацыянальнасць, сацыяльнае палажэнне, рэлігія і г.д.) |

Репозиторий ВГУ

*Заканчэнне табл. 4*

| | | |
|---|---|---|
| **4. Сацыяльна-арыентаваныя пошукавыя паводзіны** | Сацыяльна-арыентаваныя клубы-супольнасці, не аформленыя арганізацыйна (аб'яднаныя, у асноўным, па вобразу жыцця і сацыяльных праблемах). Напр., "лімітчыкі" ў горадзе і г.д. | Клубная установа, арыентаваная на ўзаемадзеянне розных сацыяльна-дэмаграфічных груп для рашэння разам агульнай сацыяльнай праблемы (напр., клубы знаёмстваў і г.д.) |
| **5. Культурна-арыентаваныя мэтавыя паводзіны** | Калектыў самадзейнай творчасці, пастаянная аўдыторыя асветных, вучэбных праграм | Клубная ўстанова як сістэма гурткоў, клубаў, курсаў |
| **6. Культурна-арыентаваныя пошукавыя паводзіны** | Дыскусійны клуб, клуб цікавых сустрэч і г.д. | Клуб як сістэма гасцёўняў, выстаў і канцэртных пляцовак, выставачных залаў і г.д. |

Аналіз дзейнасці клубаў паказвае, што ў практыцы работы клубных установ найменш распаўсюджаны пошукавыя праграмы. Між тым, значная частка насельніцтва арыентавана ў першую чаргу на іх. Гэтыя абставіны неабходна ўлічваць у рабоце клубаў, пры стварэнні шматступеньчатай сістэмы клубнага абслугоўвання па дзвюх прычынах: **ад рэкрэацыі праз сацыяльную да культурнай актыўнасці** і **ад пошукавых да мэтавых формаў паводзін**. Пры гэтым зусім не абавязкова, каб кожны наведвальнік клуба прайшоў усе гэтыя этапы (для некаторых дастаткова і разавага ўдзелу ў асобных тыпах праграм). Важна, каб ўсе гэтыя клубныя магчымасці былі прадстаўлены ў тым ці іншым рэгіёне, горадзе, вёсцы, каб яны забяспечвалі захаванне дэмакратычных пачаткаў у арганізацыі клубнай работы.

Нельга не падкрэсліць, што некаторыя развітыя аматарскія аб'яднанні прадстаўляюць сваім наведвальнікам адначасова ўсе віды правядзення вольнага часу, прыведзеныя намі ў табліцы. Але, на жаль, яны часта могуць паспяхова існаваць і па-за межамі клубных установ, а таксама з'яўляюцца дастаткова ўнікальнай з'явай, калі адпавядаюць сваёй назве. Неабходна наяўнасць разгалінаванай клубнай сеткі, якая прадугледжвала б сацыялізацыю ўваходзячых у яе ўстаноў без



Репозиторий ВГУ

залежнасці ад характару сацыяльна-культурных арыентацый мясцовых жыхароў.

У залежнасці ад мясцовых умоў магчыма аб’яднанне розных тыпаў клубаў-устаноў у адзіныя культурная комплексы. Прапанаваная намі тыпалогія не прэтэндуе на ўсеагульны нарматыў, а з’яўляецца хутчэй паказам некаторых агульных тэндэнцый клубнай дзейнасці.

Падводзячы **вынікі**, адзначым, што:

- далейшае развіццё клубнай работы звязана ў першую чаргу з узмацненнем узаемадзеяння супольнасцей у культурнай сферы вольнага часу рознага тыпу і клубных устаноў. У выніку чаго клуб стане не толькі ўстановай, але і сацыяльным інстытутам, які забяспечвае рознабаковы адпачынак насельніцтва ў групавых формах;
- рознабаковасць арыентавання насельніцтва ў культурнай сферы вольнага часу дазваляе гаварыць аб неабходнасці далейшай дыферэнцыяцыі клубаў. Можна сцвярджаць, што неабходна развіваць як мінімум шэсць тыпаў клубных устаноў (і іх спалучэнне) замест існуючай раней агульнай уніфіцыраванай мадэлі клуба;
- агульнай жа, дамінуючай, тэндэнцыяй развіцця клубных устаноў з’яўляецца стварэнне на іх аснове складаных культурных комплексаў пры захаванні клубнай дзейнасці ў якасці базавай і вядучай.



Репозиторий ВГУ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

У працэсе аналізу фарміравання і развіцця клубных традыцый мы выявілі і даказалі, што аб’яднанні клубнага тыпу зарадзіліся яшчэ ў першабытна-абшчынным грамадстве, трансфармаваліся і развіваліся ў старажытныя часы ў Грэцыі і Рыме, дасягнулі апагею свайго развіцця ў Англіі, адкуль трапілі на тэрыторыю Расіі і Беларусі. Салонная форма была перанесена ў Беларусь з Польшчы.

Пры вывучэнні гісторыі станаўлення і развіцця дваранскіх клубаў і салонаў, якія з’явіліся на тэрыторыі Беларусі ў XIX стагоддзі, мы высветлілі, што клубныя традыцыі вышэйшых слаёў насельніцтва нашай краіны мелі іншанацыянальнае паходжанне, развіваліся пераважна ў форме аб’яднанняў па саслоўных статусах і інтарэсах. Дзейнасць іх насіла пераважна рэкрэацыйны, камунікатыўны і забаўляльны характар, хоць не выключалася і дабрачыннасць. Актуальнасць звароту да вывучэння гэтых клубных фарміраванняў была выклікана: па-першае, недаследаванасцю гісторыі станаўлення і развіцця дваранскіх клубных традыцый на Беларусі, а па-другое – узнаўленнем у канцы XX стагоддзя дзейнасці клубаў і аб’яднанняў закрытага (“элітнага”) тыпу, работа якіх накіравана на рэкрэацыю і камунікацыю найбольш забяспечаных грамадзян Беларусі.

У працэсе правядзення даследавання мы вызначылі асноўныя перадумовы для стварэння сеткі клубных устаноў культуры савецкага часу. Найбольш спрыяльнымі перадумовамі з’яўлялася з аднаго боку – дастаткова высокае развіццё народнай традыцыйнай культуры і рамёстваў у сельскіх мясцовасцях Беларусі, а з другога – сетка пазашкольнай адукацыі, якая пачала стварацца ў 1911 г. і ўключала ў сябе чайныя-чытальні, хаты-чытальні і Народныя дамы, якія ствараліся камітэтамі папячыцельстваў аб народнай цвярозасці ў мястэчках і больш буйных сёлах. Менавіта на аснове вопыту дзейнасці гэтай сеткі пазашкольных устаноў і пачалося стварэнне сеткі ўстаноў культуры ў 1920-я гады. Пры гэтым вельмі значную ролю на станаўленне і развіццё клубных традыцый савецкага часу і развіццё прафесійных формаў нацыянальнага мастацтва аказалі менавіта аматарскія фарміраванні і аб’яднанні 1920–1930-х гг.

Даследаванне сучаснага становішча (канец XX – пачатак XXI стагоддзя) клубных традыцый на Беларусі немагчыма без вывучэння ўплыву сацыяльна-культурнай сітуацыі, раскрыцця ролі дзяржаўнай культурнай палітыкі (у тым ліку, і рэгіянальнай), разумення ролі гістарычнай памяці ў галіне вывучэння, захавання і памнажэння здабыткаў і каштоўнасцей народнай традыцыйнай духоўнай і матэрыяльнай культуры. Гэта дае магчымасць прасачыць пераемнасць

Рэпазіторый ВДУ

і паслядоўнасць у станаўленні і развіцці розных формаў і мадэляў сацыяльна-культурных паводзінаў насельніцтва ў сферы вольнага часу, вывучыць асаблівасці арганізацыі адпачынку не толькі насельніцтва ўсёй Беларусі, але і кожнага яе рэгіёна, і кожнай мясцовасці, магчымасці рэкрэацыйна-забаўляльнай, аматарска-творчай і выхаваўчай дзейнасці, заснаванай на аснове шматвекавых здабыткаў і каштоўнасцей этнапедагогікі.

З другога боку, неабходна таксама вывучаць і, па магчымасці, выкарыстоўваць вопыт дзейнасці прыватных беларускіх клубаў першай трэці XXI стагоддзя.

Аналіз вопыту стварэння і дзейнасці новых тыпаў устаноў культуры, што былі арганізаваны на аснове народных традыцый і пачыналі сваю дзейнасць як аматарскія аб'яднанні (Дом фальклору, Дом рамёстваў), паказаў, што гэта – вельмі перспектыўны напрамак для далейшага развіцця нашай нацыянальнай культуры і культуры прадстаўнікоў іншых народаў, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі. Таму што менавіта ў дзейнасці гэтых тыпаў устаноў культуры індывідуальныя каштоўнасці і арыенціры асобы ўдзельніка клубнага фарміравання супадаюць з сацыяльнымі, агульнаграмадскімі, а суб'ект-суб'ектныя зносіны ўзмацняюць гэтыя сувязі.

Репозиторий ВГУ

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

**Гісторыка-тэарэтычныя асаблівасці фарміравання клубных традыцый**

1. Анішчанка, Я.К. Беларусь у часы Кацярыны ІІ (1772–1796) / Я.К. Анішчанка; пад рэд. І.А. Сосна. – Мінск: ЗАО "Веды", 1998. – 220 с.
2. Антология педагогической мысли Древней Руси и Русского государства XIV–XVIII вв. / под ред. С.Д. Бабишина, Б.И. Митюрова. – М.: Педагогика, 1985. – 367 с.
3. Арнольдов, А.И. Введение в культурологию / А.И. Арнольдов. – М.: НАКиОЦ, 1993. – 349 с.
4. Баллер, Э.А. Преемственность в развитии культуры / Э.А. Баллер. – М.: Наука, 1969. – 295 с.
5. Барышев, Г.И. Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г.И. Барышев // Союз театральных деятелей Республики Беларусь. – Минск: Навука і тэхніка, 1992. – 290 с.
6. Благотворительный бал в имении «Адамово» Витебской губернии // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Адз. зах. 53734. – Арк. 162–163.
7. Блонский, П.П. Избранные педагогические произведения / П.П. Блонский. – М.: Изд-во АПН СССР, 1961. – 695 с.
8. Бокань, Ю.И. Человеческий фактор: традиции и новаторство / Ю.И. Бокань, А.Н. Антонов. – М.: Моск. рабочий, 1988. – 150 с.
9. Болотов, А.Т. Жизнь и приключения Андрея Болотова, описанные самим им для своих потомков / А.Т. Болотов. – М.: Современник, 1986. – 768 с.
10. Бондарчик, В.К. Традиции и их сущность: тезисы докладов / В.К. Бондарчик // Традиции в многонациональном обществе: Всесоюз. науч. конф., г. Минск, 12–16 нояб. 1990 г. / Академия наук СССР, Ин-т искусствоведения, этнографиии фольклора. – Минск, 1990. – С. 22–24.
11. Боннар, А. Греческая цивилизация: в 3 т. / А. Боннар; пер. с фр. О.В. Волкова; предисл. проф. В.И. Авдиева. – М.: Искусство, 1992. – Т. 1: От Илиады до Парфенона. – 269 с.
12. Борович, В. Как читать народные лекции. Опыт методологии / В. Борович. – Харьков: Тип. 8-я Советская, 1922. – 38 с.
13. Бромлей, Ю.В. Новая обрядность – важный компонент советского образа жизни / Ю.В. Бромлей // Традиционные и новые обряды в быту народов СССР / отв. ред. И.А. Кривелев, Д.М. Коган. – М.: Наука, 1981. – 233 с.
14. Буева, Л.П. Человек: деятельность и общение [Текст] / Л.П. Буева. – М.: Мысль, 1978. – 216 с.



Репозиторий ВГУ

15. Булгарин, Ф. Воспоминания / Ф. Булгарин. – М.: Захаров, 2001. – 784 с.
16. Вахтеров, В.П. Всенародное школьное и внешкольное образование. Дорогу таланту. Общедоступное даровое обязательное обучение. Внешкольное образование / В.П. Вахтеров. – М.: Изд. т-ва Сытина И.Д. – С. 3.
17. Вожгальский, А.Л. Первые шаги политико-просветительной работы в деревне (Заметки деревенского культурника) / А.Л. Вожгальский. – 3-е изд. – М.: Книгоизд-во Г.Ф. Мириманова Тип. «Пролетарий у Руля», 1925. – 32 с.
18. Гадамер, Г.-Г. Актуальность прекрасного / Г.-Г. Гадамер. – М.: Искусство, 1991. – 368 с.
19. Генкин, Д.М. Идейно-политическое воспитание в клубе: дис. ... канд. пед. наук / Д.М. Генкин // ЛГИК. – Л., 1967. – С. 3.
20. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000. – Т. 1: Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – 351 с.
21. Глан, Б.Н. Праздник всегда с нами / Б.Н. Глан. – М., 1988. – 191 с.
22. Гуд, П.А. Беларускі кірмаш / П.А. Гуд, Н.І. Гуд. – Мінск: Полымя, 1996. – 270 с.
23. Даль, В.И. Толковый словарь живого великорусского языка: в 4 т. / В.И. Даль. – М.: Русский язык, 1989. – Т. 2. – С. 120.
24. Даль, В.И. Толковый словарь живого великорусского языка: в 4 т. / В.И. Даль. – М.: Русский язык, 1989. – Т. 3. – С. 380–381.
25. Дзейнасць устаноў культуры па мінімізацыі наступстваў Чарнобыльскай трагедыі: манаграфія / А.І. Смолік, У.А. Мамонька, А.Р. Маісеенка [і інш.]. – Мінск: Бел. ун-т культуры, 1999. – 160 с.
26. Дюркгейм, Э. Метод социологии / Э. Дюркгейм // Социология, ее предмет, метод, предназначение. – М.: Канон, 1995. – 352 с.
27. Ерасов, Б.С. Социальная культурология: пособие для студ. высш. учеб. заведений / Б.С. Ерасов. – М.: Аспект-Пресс, 1994. – 355 с.
28. Зеленков, А.И. Научные революции и стабилизирующие функции культурной традиции / А.И. Зеленков // Вопросы философии. – 1985. – № 8. – С. 79.
29. Игнатович, П.Г. Культура этнонациональных отношений в Республике Беларусь на этапе трансформации общества / П.Г. Игнатович // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: сб. науч. трудов. – Гродно: ГрГУ им. Я. Купалы, 2008. – С. 3–6.
30. Ионин, Л.Г. Социология культуры: учеб. пособие / Л.Г. Ионин. – М.: Логос, 1996. – 280 с.
31. История древнего мира / под ред. И.М. Дьяконова, В.Д. Не-

Репозиторий ВГУ

роновой, И.С. Свенцицкой. – 3-е изд., исправ. и дополн.; отв. ред. И.М. Дьяконов. – М.: Наука, 1989. – Кн. 1: Ранняя древность. – 470 с.

32. История Польши: в 3 т. / под ред. В.Д. Королюка, И.С. Миллера, П.Н. Третьякова. – М.: Изд-во АН СССР, 1954. – Т. 1. – 583 с.

33. Ігнатовіч, П.Р. Культурная палітыка Рэспублікі Беларусь на этапе трансфармацыі грамадства / П.Р. Ігнатовіч // Культура Беларусі: стан і перспектывы развіцця: зб. арт. / пад рэд. Я.Д. Грыгаровіч, П.Р. Ігнатовіча. – Мінск, 2001. – 251 с.

34. Каган, М.С. Мир общения / М.С. Каган. – М.: Политиздат, 1988. – 319 с.

35. Каиров, В.М. Традиции и исторический процесс / В.М. Каиров. – М.: Луч, 1994. – 190 с.

36. Калач, Е.Б. Преемственность в культуре. Традиции и инновации: учеб. пособие / Е.Б Калач. – Гомель: БГУТ, 1995. – 33 с.

37. Керженцев, П.М. Памятка организатора / П.М. Керженцев. – М.: Красная новь, 1923. – 40 с.

38. Керженцев, П.М. Англия и англичане. Очерки современной Англии / П.М. Керженцев. – Пг.: Книга, 1918. – С. 107.

39. Клуб / Ф. Брокгауз, И. Ефрон // Энциклопедический словарь. – СПб.: Энцикл. словарь, 1895. – Т. 29. – С. 424–428.

40. Клуб / А. Гранат, И. Гранат // Энциклопедический словарь: в 58 т. – 7-е изд. – М., 1909. – Т. 24. – С. 351.

41. Клуб // Даль, В.И. Толковый словарь живого великорусского языка / В.И. Даль: в 4 т. – М.: Русский язык, 1978. – Т. 2. – С. 120–121.

42. Клуб // V Словарь русского языка, составленный вторым отделением императорской Академии наук. – СПб.: Типография Императорской Академии наук, 1910. – Т. 4. – Вып. 4. – С. 1053.

43. Клубоведение: учеб. пособие для ин-тов культуры / А.Г. Соломоник, Д.М. Генкин, М.А. Ариарский [и др.]; под ред. С.Н. Иконниковой, В.И. Чепелева. – М.: Просвещение, 1980. – 397 с.

44. Коган, Л.Н. Клуб 1990 года / Л.Н. Коган // Клуб и художественная самодеятельность. –1976. – № 4. – С. 12–13.

45. Комиссаренко, С.С. Клуб как социально-культурное явление. Исторические аспекты развития: учеб. пособие / С.С. Комиссаренко. – СПб., 1997. – 158 с.

46. Кон, И.С. Социологическая концепция Герберта Спенсера / И.С. Кон // История буржуазной социологии XIX – начала XX века; под ред. И.С. Кона. – М.: Наука, 1979. – С. 40–52.

47. Кошелева, О.Е. Педагогические традиции православия / О.Е. Кошелева // Российское образование: история и современность; под ред. С.Ф. Егорова. – М.: ИТП и МИО РАО, 1994. – С. 195–224.

48. Красносельский, А.А. Традиции самодеятельного

Репозиторий ВГУ

художественного коллектива как средство воспитания его участников: автореф. … дис. канд. пед. наук / А.А. Красносельский. – Л.: ЛГИК им. Н.К. Крупской,1983. –16 с.

49. Крупская, Н.К. Чем должен быть рабочий клуб / Н.К. Крупская // Пед. соч.: в 10 т. – М., 1959. – Т. 8. – С. 7–12.

50. Крупская, Н.К. Что такое клуб / Н.К. Крупская // Пед. соч.: в 10 т. – М., 1959. – Т. 8. – С. 17–19.

51. Лакомб, П. История Франции / П. Лакомб, А. Белоусов. – М.: Крафт, 2009. – 464 с.

52. Левада, Ю.А. Сочинения: социологические очерки 1993–2000 / Ю.А. Левада; [сост. Т.В. Левада]. – 2-е изд., перераб. – М.: Изд. Карпов Е.В., 2011. – 506 с.

53. Лотман, Ю.М. Беседы о русской культуре: Быт и традиции русского дворянства (XVIII–XIX вв.) / Ю.М. Лотман. – СПб.: Искусство, 1994. – 415 с.

54. Луначарский, А.В. Собрание сочинений: в 8 т. Эстетика, литературная критика / А.В. Луначарский. – М.: Художественная литература, 1967. – Т. 7. – 736 с.

55. Макарава, А.А. Культурная сфера вольнага часу: пытанні тэорыі і практыкі / А.А. Макарава // Культурная сфера вольнага часу: стан, праблемы, пошукі: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., 1995 г. – Мінск, БелІПК, 1997. – С. 78–83.

56. Макарава, А.А. Сацыяльна-культурная дзейнасць у сферы вольнага часу: стан, праблемы, пошукі / А.А. Макарава // Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы. – Мінск: БелІПК, 1995. – Вып. 3–4. – С. 1–8.

57. Макаренко, А.С. О воспитании / А.С. Макаренко. – М.: Изд-во политической литературы, 1990. – 416 с.

58. Мальдзіс, А. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі / А. Мальдзіс. – Мінск: Лімарыус, 2001. – 384 с.

59. Маркарян, Э.С. Узловые проблемы теории культурной традиции / Э.С. Маркарян // Сов. этнография. – 1981. – № 2. – С. 80.

60. Медынский, Е.Н. Методы внешкольной просветительской работы / Е.Н. Медынский. – М.: Профиздат, 1918. – 171 с.

61. Мертон, Р.К. Социальная теория и социальная структура / Р.К. Мертон. – М.: АСТ: ХРАНИТЕЛЬ, 2006. – 873 с.

62. Некрашэвіч-Кароткая, Ж.В. Нясвіжская Мельпамена: Драматургія Францішкі Уршулі Радзівіл / Ж.В. Некрашэвіч-Кароткая. – Мінск: ЕГУ, Прапілеі, 2002. – 212 с.

63. Орлова, Э.А. Социология культуры / Э.А. Орлова. – Киров: Константа, 2012. – 574 с.

64. Основы клубоведения: теория и методика клубной работы /

Репозиторий ВГУ

А.В. Сасыхов, Ю.А. Стрельцов. – Улан-Удэ: Бурятское кн. изд-во, 1969. – 531 с.
65. Парето, В. Компендиум по общей социологии / В. Парето. – М.: Изд. дом ГУ ВШЭ, 2008. – 515 с.
66. Парсонс, Т. О структуре социального действия / Т. Парсонс. – М.: Академический проект, 2000. – 880 с.
67. Патоцкі, Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л. Патоцкі. – Мінск: Полымя, 1997. – 270 с.
68. Педагогический энциклопедический словарь / редкол.: М.М. Безруких, В.А. Болотов, Л.С. Глебова [и др.]; гл. ред. Б.М. Бим-Бад. – М.: Больш. рос. энцикл., 2002. – 528 с.
69. Петров, А.А. Народные клубы (Рабочие и крестьянские) / А.А. Петров. – М.: Изд-во журнала «Народный учитель», 1918. – 96 с.
70. Петровский, М.В. Принципы и методы клубной работы / М.В. Петровский. – М.: Госиздат, 1925. –182 с.
71. Плахов, В.Д. Традиции и общество: опыт философско-социологического исследования / В.Д. Плахов. – М.: Мысль, 1982. – 219 с.
72. Плутарх. Избранные жизнеописания: в 2 т. / Плутарх; пер. с древнегр. М. Томашевской. – М.: Правда, 1987. – Т. 1. – 592 с.
73. Пыляев, М.И. Старый Петербург. Рассказы из былой жизни столицы / М.И. Пыляев. – 3-е изд. – СПб.: Изд-во А.С. Суворина, 1889. – 508 с.
74. Радзівіл, М.К. Дыярыюш князя Міхала Казімера Радзівіла Ваяводы Віленскага, Гетмана Вялікага ВКЛ / М.К. Радзівіл // Спадчына. – 1995. – № 6. – С. 187.
75. Сарсенбаев, Н.С. Обычаи, традиции и общественная жизнь / Н.С. Сансербаев. – Алма-Ата: Казахстан, 1974. – 224 с.
76. Свирида, И.И. Польская художественная жизнь конца XVIII – первой трети XIX века / И.И. Свирида. – М.: Наука. – 262 с.
77. Смелзер, Н. Социология / Н. Смелзер; под ред. В.А. Ядова. – М.: Феникс, 1994. – 688 с.
78. Смирнова, Е.И. Теория и методика организации самодеятельного творчества трудящихся в культурно-просветительных учреждениях / Е.И. Смирнова. – М.: Просвещение, 1983. – 192 с.
79. Смолик, А.И. Белорусская культурология как научная дисциплина: становление и развитие / А.И. Смолик // Искусство и культура. – 2011. – № 1(1). – С. 83–89.
80. Соколов, Э.В. Понятие, сущность и основные функции культуры / Э.В. Соколов. – Л.: ЛГИК, 1989. – 83 с.
81. Спиркин, А.Г. Философия: учебник / А.Г. Спиркин. –

Репозиторий ВГУ

2-е изд. – М.: Гардарики, 2006. – 736 с.
82. Суханов, В.И. Обычаи, традиции и переемственность поколений / В.И. Суханов. – М.: Политиздат, 1976. – 216 с.
83. Товарищество любителей отечественной словесности // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Адз. зах. 51055. – Арк. 172.
84. Тимбс, Д. Club life of London, with anecdotes of the clubs, coffee-houses and taverns of the metropolis during the 17th, 18th and 19th centuries (1866) [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://archive.org/details/clublifeoflondon01timbuoft. – Дата доступа: 26.06.2013.
85. Триодин, В.Е. Клуб и свободное время / В.Е. Триодин. – М.: Профиздат, 1982. – 136 с.
86. Туев, В.В. Феномен клуба: Историко-педагогический анализ: автореф. … дис. д-ра пед. наук / В.В.Туев. – М.: МУК, 1998 [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.dissercat.com/content/fenomen-kluba-ist-ped-analiz. – Дата доступа: 26. 06.2013.
87. Уледов, А.К. Духовная жизнь общества. Проблемы методологических исследований / А.К. Уледов. – М.: Мысль, 1980. – 271 с.
88. Устав Гродненского Дворянского собрания (1867 г.) // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у Гродна). – Фонд 1. – Воп. 6. – Адз. зах. 545. – Арк. 30–31.
89. Фаресов, Б. Новые пути рабочего клуба / Б. Фаресов. – М.: Знание, 1925. – 246 с.
90. Философский энциклопедический словарь / гл. ред.: Л.Ф. Ильичев, П.Н. Федосеев, С.М. Ковалев, В.Г. Панов. – М.: Сов. энцикл., 1983. – 840 с.
91. Філаматы і філарэты: зборнік / уклад., пер. польскамоўных твораў, прадм., біяграф. даведкі пра аўтараў і камент. К. Цвіркі. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 1998. – 400 с.
92. Цеханавецкі, А. Міхал Казімір Агінскі і “яго сядзіба музаў” у Слоніме / А. Цеханавецкі; пер. з ням. У. Сакалоўскага; навук. рэд. пер. і тэкст прадм. А. Мальдзіса. – Мінск: Беларусь, 1993. – 176 с.
93. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі / В.С. Цітоў. – Мінск: Беларусь, 1996. – 208 с.
94. Чабанный, В.Ф. Педагогическое руководство хоровой самодеятельностью: автореф. … дис. д-ра пед. наук: 13.00.05 / В.Ф. Чабанный; ЛГИК им. Н.К. Крупской. – Ленинград: [б. и.], 1990. – 35 с.
95. Чарнолуский, В.И. Внешкольное образование // Энциклопедический словарь Т-ва «Бр. А. и И. Гранат и Ко». – 7-е соверш. перераб. изд. – СПб., 1911. – Т. 10. – С. 490–493.
96. Человек и общество: справ. пособие / С.В. Решетников, Я.С. Яскевич, Н.П. Денисюк; ред. С.В. Решетников. – Минск: Тетра-Системс, 1998. – 336 с.

Репозиторий ВГУ

97. Чернявская, Ю.В. Народная культура и национальные традиции / Ю.В. Чернявская. – Минск: Беларусь, 2000. – 199 с.

98. Шацкий, Е. Утопия или традиция: пер. с пол. / Е. Шацкий; общ. ред. и послесл. В.А. Чаликовой. – М.: Прогресс, 1990. – 456 с.

99. Шацкий, С.Т. Что такое клуб? / С.Т. Шацкий // Пед. соч.: в 4 т. – М.: Просвещение, 1964. – Т. 2. – С. 44–54.

100. Шепилов, Г.А. Условия оптимизации творчества личности в самодеятельном хоровом коллективе: автореф. … дис. канд. пед. наук / Г.А. Шепилов. – Л.: ЛГИК им. Н.К. Крупской, 1979. – 16 с.

101. Шилз, Э. Общество и общества: макросоциологический подход / Э. Шилз // Американская социология: перспективы, проблемы, методы. – М.: Прогресс, 1972. – С. 341–359.

102. Bartoszewich, J. Ignacy Krasicki: Znakomici mezowie Polscy w XYIII w. / J. Bartoszewich. – Petersburg, 1856. – T. III. – S. 44.

103. Kaleta, R. Obiady czwartkowe na dworze Stanislawa Augusta (Proba monografii) / R. Kaleta. – W., 1973. – Z. 2. – S. 20–21.

104. Libera, Z. Zycie lbterackie w Warshawie w czasah Stanislawa Augusta / Z. Libera. – W., 1971. – S. 63–68.

105. Skibinski, K. Pamietnik aktora: Wspomnienia aktorow / K. Skibinski. – W., 1963. – T. 1. – 174 s.

106. Polskich i w Polsce dzialajacych: slownik artystow. Wroclaw, 1975. – T. II. – S. 521.

107. Zando, A. Russische Zustande im Jahre 1850 / A. Zando. – Hamburq, 1851. – S. 250.

**Асноўныя напрамкі развіцця клубных традыцый на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.**

1. Абецэдарская, А.Л. Дзейнасць таварыства аматараў прыгожых мастацтваў у Мінску (1898–1806) / А.Л. Абецэдарская // Весн. БДУ. – Сер. 3. – 1996. – № 1. – С. 21–24.

2. Алфавитная книга дел благородного общества г. Гродно за 1913 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 948. – Воп. 1. – Адз. зах. 20. – Арк. 1–5.

3. Благотворительный бал в имении «Адамово» Витебской губернии // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Адз. зах. 53734. – Арк. 162–163.

4. Благотворительный бал в пользу Красного креста // Виленский вестн. – 1900. – № 17. – С. 13.

5. Благотворительный вечер // Виленский вестн. – 1900. – № 24. – С. 10.

6. Блонский, П.П. Избранные педагогические произведения / П.П. Блонский. – М.: Изд-во АПН СССР, 1961. – 695 с.

7. Бобровский, П.О. Материалы для географии и статистики

Репозиторий ВГУ

России: Гродненская губерния / П.О. Бобровский. – СПб.: Типография генштаба, 1863. – Ч. 2. – 1074 с.

8. Брест-Литовское городское Благородное собрание // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 1. – Воп. 18. – Адз. зах. 241. – Арк. 583–584.

9. Брест-Литовский кружок «Досуг» для лиц интеллигентных профессий // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 103. – Воп. 1. – Адз. зах. 116. – Арк. 10 адв.

10. Велотрек для любителей велосипедов // Гомельская мысль. – 1913. – 28 мая. – С. 3.

11. Витебский женский клуб. Устав // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 2649. – Воп. 1. – Адз. зах. 209. – Арк. 1–5.

12. Витебское дворянское собрание // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Адз. зах. 51055. – Арк. 3.

13. Витебское общество благородного Собрания. Устав. – Витебск: Губернская Типо-литография, 1857. – 17 с.

14. Витебское общество любителей изящных искусств // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Адз. зах. 46377. – Арк. 21.

15. Внешкольное образование в Быховском уезде // Вестн. Могилевского земства. – 1914. – № 13 – С. 13–16.

16. Вопросы внешкольного образования // Вестн. Могилевского земства. – 1915. – № 12. – С. 12.

17. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі / В.К. Бандарчык [і інш.]; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; навук. рэд. В.К. Бандарчык. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 248 с.

18. Гродненский Народный Дом // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 20. – Воп. 1. – Адз. зах. 17. – Арк. 11–12 адв.

19. Гродненское Благородное собрание // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 1. – Воп. 17. – Адз. зах. 1639. – Арк. 26.

20. Гродненское Дворянское собрание // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 1. – Воп. 6. – Адз. зах. 545. – Арк. 26 адв.

21. Гродненское общество любителей драматического и музыкального искусства «Муза» // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 103. – Воп. 1. – Адз. зах. 111. – Арк. 16–17.

22. Деятельность губернских и уездных управлений по органи-

Репозиторий ВГУ

зации внешкольного образования // Вестн. Могилевского земства. – 1914. – № 19. – С. 14.

23. Дзейнасць гуртка беларускай моладзі // Наша ніва. – 1913. – № 3. – С. 4.

24. Живописная Россия: отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении / под ред. П.П. Семенова. – СПб.: Издание книгопродавца – типографа М.О. Вольфа, 1883. – Т. 3, ч. 2: Белорусское Полесье. – 282 с.

25. Журналы постановлений благородных обществ г. Бреста за 1903 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 978. – Воп. 1. – Адз. зах. 1. – Арк.1–4.

26. К 100-летию А.С. Пушкина // Гродненские губернские ведомости. – 1899. – 27 июля. – С. 3.

27. Капілаў, А. Л. Музычнае таварыства ў Мінску / А.Л. Капілаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1980. – № 4. – С. 24.

28. Керженцев, П.М. «Памятка организатора» / П.М. Керженцев. – М.: «Красная новь», 1923. – 40 с.

29. Клуб – «Семейный кружок» г. Лепель // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 2649. – Воп. 1. – Адз. зах. 692. – 62 арк.

30. Крупская, Н.К. О работе в деревне в области внешкольного образования / Н.К. Крупская // О культурно-просветительной работе / Н.К. Крупская. – М.: Просвещение, 1969. – 245 с.

31. Культурно-просветительный клуб Н. Михайловского // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд. 890. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 437.

32. Лепельское общественное собрание // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Адз. зах. 1. – Арк. 44.

33. Литературно-артистическое общество: г. Минск 1906–1910 гг. // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 306. – Воп. 1. – Адз. зах. 2. – 29 арк.

34. Литературно-танцевальный вечер в первой чайной // Гродненские губернские ведомости. – 1899. – 7 сент. – С. 4.

35. Литературный вечер к 100-летию А.С. Пушкина // Гродненские губернские ведомости. – 1899. – 15 июля. – С. 3.

36. Лотман, Ю.М. Беседы о русской культуре: Быт и традиции русского дворянства (XVIII–XIX вв.) / Ю.М. Лотман. – СПб.: Искусство, 1994. – 415 с.

37. Луначарский, А.В. Собрание сочинений: в 8 т. / А.В. Луначарский. – М.: Художественная литература, 1967. – Т. 7: Эстетика, литературная критика. – 736 с.

Репозиторий ВГУ

38. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск: НКФ “Экаперспектыва”, 1996. – 453 с.
39. Любительский музыкально-драматический кружок г. Полоцка // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 2649. – Воп. 1. – Адз. зах. 126. – Арк. 17.
40. Макаренко, А.С. О воспитании / А.С. Макаренко. – М.: Изд-во политической литературы, 1990. – 416 с.
41. Медынский, Е.Н. Методы внешкольной просветительской работы / Е.Н. Медынский. – М.: Профиздат, 1918. – 171 с.
42. Минская губерния (1906–1917). Губернские по делам об обществах и союзах присутствия // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 306. – Воп. 1. – Арк. 1.
43. Минское общество сельского хозяйства. Журнал общего собрания (дек. 1905 г.) // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 299. – Воп. 2. – Адз. зах. 13342а. – Арк. 82–95.
44. Музыкально-драматический кружок г. Витебска // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 2649. – Воп. 1. – Адз. зах. 126. – Арк. 16.
45. Музыкально-драматическое общество в г. Бресте // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 1. – Воп. 17. – Адз. зах. 511. – Арк. 1–42.
46. Народные чтения в местечке Индуры // Гродненские губернские ведомости. – 1899. – 5 окт. – С. 4.
47. Народный Дом в с. Нежкова Могилевского уезда // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 2085. – Воп. 1. – Адз. зах. 46. – 30 арк.
48. Народныя гулянні на Юр’евай горцы // Віцебскі край. – 1917. – № 10. – С. 7.
49. Народныя майстры // Наша ніва. – 1908. – № 19. – С. 2.
50. Несвижское польское общественное собрание «Огниско» // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 306. – Воп. 1. – Адз. зах. 1. – Арк. 31–76.
51. Никифоровский, Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1899. – 250 с.
52. Новогрудское Общественное собрание // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 295. – Воп. 1. – Адз. зах. 2582. – Арк. 21.
53. Новое в спортивной жизни // Минский листок. – 1899. – № 47. – С. 4.
54. О Пинском профессиональном обществе приказчиков и конторщиков // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 306. – Воп. 1. – Адз. зах. 14. – Арк. 3.

Репозиторий ВГУ

55. Общества, или отделения обществ, имеющие целью распространение образования или грамотности в народе // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Адз. зах. 41827. – Арк. 15–17.

56. Общества, или отделения обществ, имеющие целью распространение образования или грамотности в народе на 1894 г. // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд. 1430. – Воп. 1. – Адз. зах. 41827. – Арк. 15–17.

57. Общество «Образование» в г. Витебске // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 2649. – Воп. 1. – Адз. зах. 126. – Арк. 31.

58. Общество благородного собрания г. Слуцка // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 295. – Воп. 1. – Адз. зах. 983. – 10 арк.

59. Отчет о благотворительных делах Витебской губернии за 1910 г. // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Адз. зах. 53734. – 1081 арк.

60. Отчет о деятельности Минского общества любителей спорта за 1899 г. – Минск: Типолит. Тасьмана, 1900. – 21 с.

61. Отчет о деятельности правления попечительного общества о доме трудолюбия за 1902 год. – Минск: Губернская Типо-Литография, 1903. – С. 3–5.

62. Отчет по внешкольным учреждениям Витебской губерни // Государственный архив Витебской области (ГАВО). – Фонд 246. – Оп. 3. – Ед. хр. 4. – Л. 3.

63. Памятная книжка Гродненской губернии на 1907 г. – Гродно: Губерн. тип., 1907. – LXIV, 424. – С. 254.

64. Памяць: гіст.-дакумент. хроніка Віцебска: у 2 кн. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2002. – Кн. 1. – 648 с.

65. Петровский, М.В. Принципы и методы клубной работы / М.В. Петровский. – М.: Госиздат, 1925. – 182 с.

66. Пинское еврейское музыкально-литературное общество «Газомир» 1908 г. // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 306. – Воп. 1. – Адз. зах. 21. – 6 арк.

67. Положение о Гродненском военном собрании // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 1. – Воп. 17. – Адз. зах. 881. – Арк. 9–26.

68. Польское спортивно-гимнастическое общество «Сокол» (1907–1911 гг.) // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 306. – Воп. 1. – Адз. зах. 19. – Арк. 186.

69. Помощь нашим братьям // Гомельская мысль. – 1913. – № 16. – С. 2.

70. Попечительства о народной трезвости // Нацыянальны

Репозиторий ВГУ

гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 983. – Воп. 3. – Адз. зах. 1. – Арк. 14–18.

71. Просветительные общества Витебской губернии на 18 августа 1908 г. Витебский родительский кружок // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 2649. – Воп. 1. – Адз. зах. 194. – Арк. 24–24 адв.

72. Работа школы садовых рабочих Могилевской губернии // Вестн. Могилевского земства. – 1916. – № 20. – С. 10–14.

73. Режицкий историко-этнографический кружок (1917 г.) // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 2649. – Воп. 1. – Адз. зах. 707. – Арк. 10–15.

74. Сведения о количестве просветительных организаций за 1908 г. // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 2649. – Воп. 1. – Адз. зах. 194. – 38 арк.

75. Слонимский Народный Дом // Гродненские губернские ведомости. – № 24. – 1905. – 24 июня. – С. 14.

76. Танцевальный вечер на Занеманском форштате г. Гродно // Гродненские губернские ведомости. – № 111. – 1899. – 31 июля. – С. 13.

77. Трызна, Д.С. Беларускія дываны і габелены / Д.С. Трызна. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 78 с.

78. Устав Брест-Литовского городского Благородного собрания // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 103. – Воп. 1. – Адз. зах. 139. – Арк. 1–15.

79. Устав Гродненского речного яхт-клуба // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 103. – Воп. 1. – Адз. зах. 114. – Арк. 5–11.

80. Устав Минского Купеческого собрания // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 299. – Воп. 2. – Адз. зах. 13342 а. – Арк. 33–45.

81. Устав музыкального общества в г. Минске. – Минск: Скоропечатня Р. Дворжеца, 1880. – 18 с.

82. Устав собрания гродненских чиновников // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 103. – Воп. 1. – Адз. зах. 141. – Арк. 1–13 адв.

83. Устав Собрания под названием «Рессурса» г. Кобрина. – 1843 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі г. Гродна (НГАБ у г. Гродна). – Фонд 1. – Воп. 20. – Адз. зах. 926. – Арк. 6.

84. Устройство бала с целью сбора пожертвований в пользу еврейского госпиталя (1851 г.) // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 24. – Воп. 1. – Адз. зах. 441. – Арк. 1.

85. Устройство лотереи в г. Минске с благотворительными целями (1869 г.) // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 295. – Воп. 1. – Адз. зах. 1974. – Арк. 1–28.

Репозиторий ВГУ

86. Филантропическая деятельность товарищества императрицы Александры Федоровны // Гомельский вестн. – 1909. – № 64. – С. 1.
87. Циркуляр Министерства внутренних дел № 140 от 18 декабря 1874 г. // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Адз. зах. 1. – Арк. 1.
88. Циркуляры губернатора по устройству библиотек и клубов (1899–1900 гг.) // Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Беларусі (ЦДГА). – Фонд 2555. – Воп. 1. – Адз. зах. 10. – Арк. 5–36.
89. Шебеко, З.Б. Страницы жизни дореволюционного города / З.Б. Шебеко, С.Ф. Шебеко. – Мінск: Полымя, 1990. – 352 с.
90. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – Императорская Академия Наук, 1889. – Т. 1–3. – 1872 с.
91. Шпилевский, П.И. Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П.И. Шпилевский. – Минск: Полымя, 1992. – 251 с.
92. Шчаўлінскі, М. “Беларуская хатка” ў Мінску / М. Шчаўлінскі // Беларуская думка. – 1999. – № 8. – С. 160–162.
93. Jankowska-Orynzyna, J. Sztuka ludowa na P. W. K. / J. Jankowska-Orynzyna // Tygodnik ilustrowane 5. – 1929. – № 38. – S. 738–739.

**Тэндэнцыі развіцця клубных традыцый у савецкі і постсавецкі перыяд на Беларусі**

1. Автономова, Н.С. Культура, история, память / Н.С. Автономова, Ю.Н. Караулов, Ю.А. Муравьев // Вопросы философии. – М.: Правда, 1988. – № 3. – С. 73.
2. Афанасьев, Ю. Память истории / Ю. Афанасьев // 50/50. Опыт словаря нового мышления; под общ. ред. М. Ферро и Ю. Афанасьева. – М.: Прогресс, 1989. – 560 с.
3. Белорусский Правовой Портал / Законодательные и нормативные акты, принятые в Беларуси республиканскими и местными органами законодательной и исполнительной власти [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pravoby.info/search.php. – Дата доступа: 20.06.2014.
4. Блонский, П.П. Избранные педагогические произведения / П.П. Блонский. – М.: Изд-во АПН СССР, 1961. – 695 с.
5. Боганева, А.М. Новыя тыпы ўстаноў культуры / А.М. Боганева // Інфармацыйныя матэрыялы Рэспубліканскага семінара “Новыя падыходы да праблем сельскай культуры”, 14–15 снежня 2000 г., Мінск. – Мінск: БелІПК, 2001. – С. 7–14.
6. Бурдье, П. Социальное пространство в генезис «классов» / П. Бурдье // Вопросы социологии. – 1992. – Т. 1, № 1. – С. 17–33.
7. Віцебскае таварыства “Прыхільнікі дзяцей” пры Віцебскай акружной камісіі // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 7. – Воп. 1. – Адз. зах. 240. – Арк. 30–32.

Репозиторий ВГУ

8. Даль, В.И. Толковый словарь живого великорусского языка: в 4 т. / В.И. Даль. – М.: Русский язык, 1989. – Т. 2. – С. 120.

9. Ерасов, Б.С. Социальная культурология: пособие для студ. высш. учебных заведений: в 2 ч. / Б.С. Ерасов. – М.: «Аспект-Пресс», 1994. – 384 с.

10. Закон Белорусской Советской Социалистической Республики «О культуре в Белорусской ССР» // Нормативно-правовые акты Республики Беларусь в сфере культуры. – Вып. 1. – Минск, 1996. – 64 с.

11. Ігнатовіч, П.Р. Культурная палітыка Рэспублікі Беларусь на этапе трансфармацыі грамадства / П.Р. Ігнатовіч // Культура Беларусі: стан і перспектывы развіцця: зб. артыкулаў пад рэд. Я.Д. Грыгаровіч, П.Р. Ігнатовіча. – Мінск, 2001. – 251 с.

12. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года (са зmяненнямі і дапаўненнямі), прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 года. – Мінск: Полымя, 2001. – 94 с.

13. Керженцев, П.М. «Памятка организатора» / П.М. Керженцев. – М.: «Красная новь», 1923. – 40 с.

14. Ключевые аспекты Послания Президента Республики Беларусь А.Г. Лукашенко белорусскому народу и Национальному собранию Республики Беларусь «Обновление страны – путь к успеху и процветанию» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://cenadm.gov.by/dfiles/000422_791050_.doc. – Дата доступа: 20.06.2014.

15. Количество внешкольных учреждений на 1 июля 1919 // Государственный архив Витебской области (ГАВО). – Фонд. 246. – Оп. 3. – Д. 4. – Л. 6.

16. КПБ в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. – Минск: Институт истории партии при ЦК КПБ, 1987. – Т. 2. – С. 48.

17. КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. – М.: Политиздат, 1970. – Т. 2. – С. 81.

18. КПСС о культуре, просвещении и науке. – М.: Политиздат, 1960. – С. 148–149.

19. Крупская, Н.К. О работе в деревне в области внешкольного образования / Н.К. Крупская // О культурно-просветительной работе. – М.: Сов. Россия, 1969. – 163 с.

20. Ленин, В.И. I Всероссийский съезд по внешкольному образованию 6–19 мая 1919 г. / В.И. Ленин // Полн. собр. соч. – М.: Издательство политической литературы, 1969. – Т. 38. – С. 327–372.

21. Ленин, В.И. Речь на I Всероссийском съезде работников просвещения и социалистической культуры. 31 июля 1919 г. / В.И. Ленин // Полн. собр. соч. – М.: Изд-во политической литературы,

Репозиторий ВГУ

1970. – Т. 39. – С. 131–138.

22. Ленин, В.И. Речь на Всероссийском совещании политпросветов губернских и уездных отделов народного образования. 3 ноября 1920 г. / В.И. Ленин // Полн. собр. соч. – М.: Изд-во политической литературы, 1981. – Т. 41. – С. 398–408.

23. Ленин, В.И. Рабочим и служащим государственной электрической станции «Электропередача» / В.И. Ленин // Полн. собр. соч. – М.: Изд-во политической литературы, 1970. – Т. 45. – С. 271.

24. Ленин, В.И. Речь на III Всероссийском совещании заведующих внешкольными подотделами губернских отделов народного образования 25 февраля 1920 г. / В.И. Ленин // Полн. собр. соч. – М.: Изд-во политической литературы, 1974. – Т. 40. – С. 160–165.

25. Лихачев, Д.С. Экология культуры / Д.С. Лихачев // Прошлое – будущему. – Л.: Наука, 1995. – С. 51.

26. Луначарский, А.В. Собрание сочинений: в 8 т. / А.В. Луначарский. – М.: Художественная литература, 1967. – Т. 7: Эстетика, литературная критика. – 736 с.

27. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск: НКФ Экаперспектыва, 1996. – 453 с.

28. Макарава, А.А. Клуб: мадэль XXI стагоддзя (аб выніках работы творчай лабараторыі) / А.А. Макарава // Культурная сфера вольнага часу: стан, праблемы, пошукі: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 1995 г. – Мінск: БелІПК, 1997. – С. 78–83.

29. Макарава, А.А. Сацыяльна-культурная дзейнасць у сферы вольнага часу: стан, праблемы, пошукі / А.А. Макарава // Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы. – Мінск: БелІПК, 1995. – Вып. 3–4. – С. 1–8.

30. Макарава, А.А. Сацыяльна-культурныя пераўтварэнні ў дзейнасці сучасных клубных устаноў / А.А. Макарава // Новыя падыходы да праблем сельскай культуры: інфармацыйныя матэрыялы рэспубліканскага семінара, Мінск, 14–15 снеж. 2000 г. – Мінск, 2001. – С. 15–24.

31. Макаренко, А.С. О направлении и формах клубной работы (на 1930–1931 годы) // Соч. в 7 т. / А.С. Макаренко. – М.: Изд-во Академии педагогических наук, 1960. – Т. 7. – С. 473–479.

32. Макаренко, А.С. О воспитании / А.С. Макаренко. – М.: Изд-во политической литературы, 1990. – 416 с.

33. Марцелев, С.В. К духовному расцвету. Исторический опыт развития белорусской Советской культуры / С.В. Марцелев. – Минск: Беларусь, 1974. – 408 с.

34. Медынский, Е.Н. Методы внешкольной просветительской работы / Е.Н. Медынский. – М.: Госучпедгиз, 1918. – 171 с.

35. Медынский, Е.Н. Энциклопедия внешкольного образования:

Репозиторий ВГУ

в 3 т. / Е.Н. Медынский. – М.; Л.: Госиздат., 1925. – Т. 2. – 167 с.
36. Николов, Н. Загадка тысячелетий: Что мы знаем о памяти / Н. Николов, Г. Нешев. – М.: Мир, 1988. – 144 с.
37. Новикова, Л.И. Цивилизация как идея и как объяснительный принцип исторического процесса / Л.И. Новикова // Цивилизации: сб. ст. Рос. акад. наук; Ин-т всеобщей истории. – Вып. 1. – М.: Наука, 1992. – С. 9–26.
38. Отчет для Белорусского национального комиссариата / Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4. – Воп. 1. – Адз. зах. 77. – Арк. 46.
39. Отчет по Березовской волости / Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4. – Воп. 1. – Адз. зах. 11. – Арк. 9.
40. Отчет по клубным учреждениям системы Министерства культуры на 1.01.71 г. / Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 974. – Воп. 2. – Адз. зах. 644. – Арк. 1.
41. Отчет товарищества любителей белорусского народного искусства в Петрограде / Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4. – Воп. 1. – Адз. зах. 86. – Арк. 2.
42. Положение об организации проведения дискотек и работы культурно-развлекательных (ночных) клубов в Республике Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pravo.by/main.aspx?guid=3871&p0=C20700582&p2={NRPA}. – Дата доступа: 20.06.2014.
43. Приказ № 119 по Главполитпросвету Беларуси 16 сентября 1921 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 101. – Воп. 1. – Адз. зах. 76. – Арк. 2.
44. Ребане, Я.К. Информация и социальная память: к проблеме социальной детерминации познания / Я.К. Ребане // Вопросы философии. – 1982. – № 8. – С. 45–46.
45. Садовская, В.С. Народные университеты: проблемы и перспективы развития: лекции / В.С. Садовская / Моск. гос. ин-т культуры. – М.: МГИК, 1989. – 30 с.
46. Сеть клубных учреждений БССР // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 974. – Воп. 2. – Адз. зах. 2. – 60 арк.
47. Сеть клубных учреждений системы Министерства культуры на 1 января 1966 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 974. – Воп. 2. – Адз. зах. 369. – Арк. 61.
48. Смирнова, Е.И. Любительские объединения / Е.И. Смирнова. – М.: Просвещение, 1977. – 191 с.
49. Стружецкий, Т.И. Клубные объединения: метод. пособие / Т.И. Стружецкий. – Минск: РНМЦ НТ и КПР, 1983. – С. 9–10.
50. Татищева, М.Д. Культурно-просветительная работа в Бело-

Репозиторий ВГУ

руссии в восстановительный период (1921–1925 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / М.Д. Татищева. – М.: МГУ, 1979. – 18 с.

51. Триодин, В.Е. Клуб и свободное время / В.Е. Триодин. – М.: Профиздат, 1982. – 136 с.

52. Триодин, В.Е. Клуб, клубное объединение, клубное учреждение / В.Е. Триодин // КПР. – 1981. – № 11. – С. 29–32.

53. Триодин, В.Е. Организация и методика работы клубных объединений: учеб. пособие / В.Е. Триодин. – Л.: ВПШК, 1982. – 116 с.

54. Трубников, Н.Н. Время человеческого бытия / Н.Н. Трубников; отв. ред. В.А. Лекторский; АН СССР, Ин-т философии. – М.: Наука, 1987. – 255 с.

55. Усенко, С.Б. Культура и память / Российская культура глазами молодых ученых / С.Б. Усенко // Сб. тр. молодых ученых-культурологов. – СПб.: МП РИЦ «Культ-информ-пресс», 1993. – С. 5–28.

56. Устав товарищества любителей белорусского народного искусства в Петрограде // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4. – Воп. 1. – Адз. зах. 89. – Арк. 1.

Репозиторий ВГУ

Навуковае выданне

**КАРАЛЬКОВА** Ларыса Віктараўна

# КЛУБНЫЯ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСІ: ГІСТОРЫКА-ПЕДАГАГІЧНЫ ПАДЫХОД

Манаграфія


Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*
Карэктар *Т.У. Образава*
Камп'ютарны дызайн *Т.Я. Сафранкова*

Падпісана ў друк .2014. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 9,64. Ул.-выд. арк. 10,01. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 ад 31.03.2014 г.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.


Репозиторий ВГУ